**Уладзімір Гніламёдаў**

# Як само жыццё

*Кніга бягучай крытыкі*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1980

## Гары, агонь Кастрычніка, гары!

Гаворку пра Вялікі Кастрычнік у беларускай паэзіі хочацца пачаць з першых год рэвалюцыі, якія зварухнулі ўвесь свет, паскорылі хаду гісторыі, прымусілі па-новаму ўспрымаць бег часу. Рэвалюцыя ўскалыхнула ўсе сферы народнага жыцця — эканоміку, культуру, ідэалогію і палітыку, усе пласты сацыяльна-грамадскага быцця. Беларускі народ атрымаў дзяржаўнасць і шырокія перспектывы развіцця, будаўніцтва новай, сацыялістычнай культуры.

Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя напоўніла творчы пульс нашай літаратуры.

Прызнанне рускага паэта 20-х гадоў У. Кірылава — «Рэвалюцыя 1917 года з'явілася для нашых паэтаў найвялікшым святам» — можна было б аднесці і да Янкі Купалы, і да Якуба Коласа, і да іншых, хто валодаў талентам «сэрца мільёнаў падслухаць біцця» і каму дарагі і родны быў лёс гэтых мільёнаў. Янка Купала і Якуб Колас, якія заўсёды былі разам з працоўным народам, выказнікі самых глыбінных ягоных спадзяванняў, адчулі рэальнасць гістарычных даляглядаў, што адчыняліся перад родным краем з перамогай рэвалюцыі.

Я. Колас у дні Кастрычніцкага перавароту знаходзіўся ў Курскай губерні, адтуль ён пісаў:

Браты! Вялікая дарога
Чакае нас і родны край —
Жніво настала, працы многа,—
Навукі семя засявай!

Гэта радкі з вядомага верша «Да працы!», упершыню надрукаванага ў газеце «Вольная Беларусь» 8 лістапада 1917 года.

Узыход «сонца залатога» ўбачыў Я. Купала. Незвычайнасць, урачыстасць, гістарычнае значэнне гэтага моманту перададзены ў вершы «Час!», напісаным у 1918 годзе, калі паэт жыў у Смаленску:

Доўга людзі ўдзень блудзілі,
Крыўду, слёзы, кроў пладзілі,
Ўсё не ўмелі жыць,—
А сягоння ўжо не тое,—
Ўсходзе сонца залатое
Роўна ўсім свяціць.
Ходзіць ходырам свет цэлы,
Смела ў бітву гідзе нясмелы,
Ў бой за лепшы час.
Дык і нам цапы і косы
Час браць з вышак, покі росы

Воч не згрызлі ў нас.

З часам разуменне паэтам рэвалюцыі, праўды новага ладу, які даў народу зямлю, вольную бацькаўшчыну, перспектывы для ўсебаковага нацыянальнага развіцця, будзе паглыбляцца і канкрэтызавацца. З'яўляюцца новыя купалаўскія вершы «На сход!», «Світае», «Паязджане», «У вырай!», дзе паэт спрабуе асэнсаваць розныя бакі рэвалюцыйнай праблематыкі, суадносячы яе з самабытна-нацыянальнымі асновамі народнага жыцця, са шматвекавой спадчынай.

Кастрычніцкая рэвалюцыя закранула ўсіх і кожнага. Жыццё з усё нарастаючай хуткасцю рушыла наперад.

Першыя, непасрэдныя, часам наіўныя, але надзвычай эмацыянальныя водгукі на Кастрычніцкія падзеі дала масавая самадзейная паэзія, народжаная грозным часам класавых бітваў. Узоры гэтай агітацыйнай паэзіі — вершы, частушкі, байкі, вершаваныя фельетоны — знаходзім у газетах, лістоўках і пракламацыях перыяду рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Яе прыкметы — шчыры пафас, грамадзянская натхнёнасць, баявітасць.

...І хай шчэ ляскочуць пяруны —
Мы верым ў Пабеду з табой!
Вялікі збавіцель — Камуна,
Пануй над паўстаўшай зямлёй!

(Подпіс — Адам Чырвоны)

Гэтая паэзія паспяхова выконвала сваю задачу — узнімала палітычную свядомасць народных мас, клікала на змаганне, выкрывала аблічча контррэвалюцыі.

Адбывалася класава-палітычнае размежаванне, палярызацыя сіл і ў асяроддзі мастацкай інтэлігенцыі. Перад пісьменнікамі, асабліва тымі, чые творчыя індывідуальнасці сфарміраваліся ў дакастрычніцкую пару, востра паўстала пытанне пра адносіны да рэвалюцыі. Гістарычная праўда вымагае сказаць, што не ўсе яны адразу зразумелі эпахальнае значэнне і сэнс кастрычніцкіх падзей. Некаторыя разгубіліся, не адразу асэнсавалі, разгледзелі за знешнімі праявамі глыбінны сэнс рэвалюцыйных перамен. І шлях іх далейшага росту — гэта шлях больш хуткага і арганічнага для адных, больш запаволенага і складанага для другіх набліжэння да новай рэчаіснасці, зразумення і прыняцця новых гістарычных задач, якія паставіў перад сабой народ. Шлях да «радасці новых дзён» быў звязаны з характарам светапогляду, жыццёвым вопытам і ходам саміх гістарычных падзей.

Адным з першых, хто, не вагаючыся, натхнёна вітаў і ўслаўляў рэвалюцыю, звязваў з ёю ажыццяўленне спрадвечных спадзяванняў

народа, быў Цішка Гартны — «барабаншчык рэвалюцыі», як яго называлі ў 20-я гады.

Гары ж, агонь Кастрычніка, гары!
Свой промень зыркі раздувай,
Няхай ён ззяе з краю ў край...
Хто спіць да гэтае пары — ўставай! —

горача заклікаў ён у вершы «Работніцкая і сялянская рэвалюцыя», напісаным у 1918 годзе. Гэтыя радкі актуальна і надзейна гучаць і ў наш час.

Кастрычнік з'явіўся для паэта падзеяй сусветнай гісторыі, а таксама фактам уласнай біяграфіі. Гартны прымаў удзел у стварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, быў першым старшынёй Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі.

Жыццёвую праграму сучасніка ён бачыць у нястомнай працы на карысць народа.

Жыць і бачыць сэнс выразны
Свайго ў свеце бытавання —
Гэта праца і змаганне
Безадгукна, безвыказна.

(«Не трацЬ часу ні хвіліны», 1918)

Паэт адчуў рух жыцця і кірунак гэтага руху і энергію сваіх пачуццяў увасобіў у лозунгавыя заклікі.

Сацыялістычныя ідэі ў беларускай паэзіі першай палавіны 20-х гадоў часта знаходзілі сваё выяўленне ў патэтыка-рамантычным стылі, у формах абагульненых сімвалаў. Пры гэтым многім паэтам, у тым ліку і Ц. Гартнаму, яўна не ставала асабовага падыходу да велічнай тэмы века, чым тлумачацца недахопы ў яе асэнсаванні. Тым не менш вершы Гартнага («Гадавіна 25-га кастрычніка 1917 г.», «Далакопам рэвалюцыі», «Таварышу», «Замацуйма!», «Будзь пярэднім», «Ад сахі, ад станкоў», «Наперад, гэй!», «Дэманстрацыя», «Чырвоны сцяг»,« многія іншыя) як мастацкія дакументы эпохі даносяць у наш час жывое дыханне атмасферы таго перыяду, размах рэвалюцыі («Мы ўсясветнай Камуны ганцы — вестуны!»), пафас рашучага руйнавання старога свету.

Паэт радаваўся, як вірыць жыццё, і сам браў дзейсны ўдзел у яго абнаўленні, «будаванні».

Адзнакі яго паэтыкі — сімволіка, абагульненасць вобразаў, прыўзнятасць і ўрачыстасць.

Ўкол руйнуюцца ўціску муры,
Ападаюць жалезныя краты;

Дні прыгонныя цяжкай пары
Адыходзяць у вечныя страты.
А слядамі Камуна ідзе,
Панаванне навекі будуе...
І жыццё, нібы пушча, гудзе,
І жыццё, нібы мора, бушуе.
(«Будаванне», 1921)

Усё гэта першыя, надзвычай яркія, эмацыянальныя водгукі паэта на выкліканыя рэвалюцыяй сацыяльна-гістарычныя зрухі ў свеце. Аднак у цэлым аб'ектыўная абстаноўка ў Беларусі ў першыя пасля-рэвалюцыйныя гады, у перыяд грамадзянскай вайны, уплыў буржуазна-нацыяналістычнай ідэалогіі ўскладнялі агульны працэс ідэйна-мастацкага фарміравання новай, народжанай рэвалюцыяй беларускай савецкай паэзіі.

Цяжка вызваляўся ад ідэйных супярэчнасцей З. Бядуля. У вершах «Новы год», «У гадаўшчыну рэвалюцыі», у першай рэдакцыі паэмы «Беларусь» (1921) ён, па сутнасці, выявіў сваё неразуменне стваральнага характару Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Правільны напрамак у паглыбленні светапогляду, у набыцці ідэйнай яснасці падказвала само жыццё. Якім бы супярэчлівым яно ні было ў першыя паслярэвалюцыйныя гады (каласальны палітычны і духоўны ўздым працоўных мас і, з другога боку, вострае супраціўленне капіталістычных элементаў, якія яшчэ мелі некаторую перавагу ў эканоміцы), рэчаіснасць усё шырэй раскрывала перад пісьменнікамі свае гістарычныя перспектывы і перавагі.

Вялікай рабочай кузняю ўяўлялася рэвалюцыйная сучаснасць Алесю Гурло. «Цяжкаю працай заняты тут волаты: жыццё куюць кавалі» («У жыццёвай кузні», 1922). «Даўняга бяссілля ўжо ў грудзях няма!» —вось яно, новае «самаадчуванне» паэта. Біяграфія А. Гурло — радавога байца рэвалюцыі — адлюстравалася ў яго паэзіі. Крыху пазней ён пісаў:

Я штурмам браў палац і крэпасць,
Ламаў сцяну вінтовак, пік,
І, нібы шкуматы, атрэп'е,
Нізаў я юнкераў на штык.
Я дань прынёс, хоць і малую...
Прымі яе, жыві, красуй!
Я сцяг чырвоны пацалую
І ўдаль адважна панясу...
(«Ленінград»)

Алегарычны ўзыход сонца, якое «пажарам заззяла, усюды паклала барвовы свой след», малюе Янка Журба ў вершы «Гімн сонцу» (1918), імкнучыся выявіць свае адносіны да падзей, асэнсаваць веліч змен, што адбыліся ў свеце.

У паэзіі пачатку 20-х гадоў тэма Кастрычніка ўзбагачаецца новымі фарбамі, як, скажам, у паэзіі таго ж Я. Журбы:

Апрані, Беларусь,
Свой святочны убор:
Назаўсёды ўжо знішчаны здзекі!
Сабяры ты ўсю моц
І сягні аж да зор:
Не убачыш ярма ты навекі!
З дапамогай братоў,
Што з усходу прыйшлі,
Ты дзяржаўнасць сваю збудавала.

(«Савецкая Беларусь», 1921)

Учарашняя мара стала здабыткам жыцця.

Чырвоная праца, ясны дзень, агнякветны прамень, праклятую вораг, чорныя дні, новы свет, светлая будучыня, вольны люд, вялікая праца, сусветная камуна — падобныя вобразы і паняцці, своеасаблівая святочная паэтыка, характэрны не толькі вершам Я. Журбы, а ўсім паэтам, што спявалі песню «будаўнікам новага жыцця».

А рэчаіснасць абнаўлялася проста на вачах, сцвярджалася бурна, энергічна, усё больш і больш звяртаючы на сябе ўвагу пісьменнікаў. Ва ўсім адчуваўся жывы, хуткі рытм, гул, напружанне.

Мянялася жыццё...

Прайшоў пэўны час, і «кропляю вялікага творчага мора» адчуў сябе З. Бядуля. У яго творах 1923 года і некаторых ранейшых — хоць і крыху прыпознена — гучаць новыя матывы. У другой і трэцяй частках паэмы «Беларусь» (другая рэдакцыя — 1923) апяваецца веліч і гістарычнае значэнне Кастрычніцкай рэвалюцыі, чый вобраз змяшчае цэлы шэраг паэтычна-канкрэтных асацыяцый:

Праз дым, пажар магнацкіх гнёзд прынадных,
Праз крык, праз гнеў і праз бяссілля злосць
Паноў, мяшчан пры Кер申шчыне здраднай
Да нас Акцябр прымчаў — чаканы госць!
Бы Святагор славуты з казкі сівай,
Ён родны край ператварыў у дзіў;
Свабодны гімн запеў на рабскай ніве,
І казку будучыні спарадзіў.

Барацьбу, гнеў народных мас Бядуля паэтызуе і рамантызуе і ў паэме «З сказаў буры і віхораў» (1924), хаця яна і не пазбаўлена супярэчлівасцей, у тым ліку стылёвых.

Трэба сказаць, што ў 20-я гады побач існавалі, нанова ўзнятыя Кастрычнікам, розныя эстэтычныя пласты: жыццёва-бытавы, сімволіка-рамантычны, фальклорны і г. д. Падобная стракатасць характэрна і для іншых літаратур тых год, гэта агульная заканамернасць, уласцівая этапу першапачатковага станаўлення. Кастрычніцкая рэвалюцыя адыграла ролю магутнага паскаральніка мастацка-стылявога развіцця беларускай паэзіі, выпрацоўкі новай паэтычнай «мовы».

Калі акінуць рэтраспектыўным поглядам развіццё сённяшняй беларускай савецкай паэзіі, то нельга не заўважыць яе стылёвай шматколернасці, поліфанізму, здзіўляючай мастацкай разнастайнасці, у якой адлюстравалася багацце і разнастайнасць жыцця, пафас нашага будаўніцтва. Яна — такая карціна — вядома, утварылася не адразу. Гісторыя паэтычнага стылю — гісторыя паэзіі. Месца і роля 20-х гадоў у гэтым працэсе (як і некаторых пазнейшых перыядаў) вельмі значная.

Беларуская паэзія 20-х гадоў заявіла аб сабе як мастацтва, якое было звязана з нацыянальнымі традыцыямі і адначасова імкнулася адпавядаць эстэтычным патрэбам новай рэчаіснасці. Новая эпоха запатрабавала новых сродкаў мастацкага выяўлення, разлічаных на «мільённы маштаб абагульнення». «Пра новае трэба гаварыць і новымі словамі. Патрэбна новая форма мастацтва»,— гаварыў Маякоўскі (газета «Искусство Коммуны», Москва, 1918, № 4).

Нельга не ўлічваць таго, што беларуская літаратура мела сваю гісторыю, але яе традыцыі ў мінулым не атрымалі багатай эстэтычнай распрацоўкі, як, скажам, у рускай літаратуры. Паэзія, напрыклад, стварыла традыцыю дэмакратычнай творчасці, абапіраючыся на фальклор, аднак ёй не ставала мастацка-стылявой разнастайнасці. Былі прыклады і інтэлектуальнай паэзіі (Максім Багдановіч), але яны не мелі шырокага распаўсюджання ў літаратуры. І толькі пасля рэвалюцыі, калі беларусы атрымалі сапраўдную магчымасць для развіцця культуры, калі кантакты з духоўнымі набыткамі іншых народаў станавіліся ўсё больш рэальнымі, у нашай літаратуры ўзмацніліся — на новай аснове — пошукі і эксперыментатарства.

Пытанне аб мастацкіх традыцыях і наватарстве стаяла надзвычай востра. Не абыходзілася без «архірэвалюцыйных» крайнасцей, «гвалту над формай», як назваў адзін са сваіх твораў паэт М. Грамыка.

«Узарваць, разбурыць, сцерці з твару зямлі старыя мастацкія формы — як не марыць пра гэта новаму мастаку, пралетарскаму мастаку, новаму чалавеку»,— крычалі футурысты (газета «Искусство Коммуны». Москва, 1918, № 1).

Што датычыцца беларускай літаратуры, то яе наватарства, якое ахапіла ўсе галіны мастацкай творчасці, у тым ліку і сферу выяўленчых сродкаў, нічога агульнага не мела з форматворчасцю пераспелай, перасычанай культуры. Гэта былі пошукі на пачатку шляху. Яны мелі свае моцныя і слабыя бакі, маюць і свае ўрокі, павучальныя для нашага часу, нясуць у сабе вопыт, карысны для любога этапа развіцця літаратуры.

Цвет і будучыню літаратуры складала моладзь — таленавітая, заўзятая, рамантычная, што закрасавала на «беларускіх загонах, узораных плугам Кастрычніцкай рэвалюцыі».

Мы дзеці Рэвалюцыі, Кастрычніка сыны,
Ў дзень радасці кіпучае на свет з'явілісь мы,
Над нашаю калыскаю не сумны матчын спеў —
Грымелі дні агністыя, змагання гром гудзеў,—

пісаў пра сябе і сваё пакаленне адзін з маладых — Алесь Дудар (часопіс «Маладняк», 1924, № 2).

«Нашай краіне,— пісаў А. М. Горкі ў сярэдзіне 20-х гадоў,— патрэбны тысячы пісьменнікаў, і вось яны ідуць. Нязграбна, крыклівa,— але смела і з вялікай сілай. У многіх шапкі набакір, мазгі — таксама, але гэта пройдзе».

Прыток маладых у літаратуру быў сапраўды незвычайны! У мастацтва, культуру пераліваліся творчыя сілы народа.

К. Крапіва, У. Дубоўка, А. Александровіч, М. Грамыка, А. Дудар, Я. Пушча, потым, па меры ўступлення ў літаратуру, да іх далучаюцца П. Трус, П. Глебка, П. Броўка, М. Лужанін, М. Багун, Ю. Лявонны, А. Вольны, С. Дарожны, З. Астапенка, Ю. Таўбін, А. Куляшоў, А. Звонак, У. Хадыка, М. Хведаровіч, Т. Кляшторны і іншыя — якая бліскучая плеяда маладых талентаў, добрых і розных, часта з сур'ёзнай жыццёвай школай, з вялікім жаданнем змагацца за рэвалюцыйныя ідэалы, прыгажосць якіх яны адчувалі ўсім сэрцам! «Акрыленыя рэвалюцыяй», яны адчулі сябе гаспадарамі і будаўнікамі новага свету. «Наш Кастрычнік прыйшоў — азарыліся далі, пад сцягамі яго да жыцця мы ўставалі»,— успомніць праз гады П. Броўка. Моладзь жадала працаваць з вялікай аддачай сіл і абавязкова па-наватарску. Але патрабаванне наватарства не ўсе з іх разумелі правільна.

Колькі было дыскусій, спрэчак і рознагалоссяў! Коп'і ламаліся на літаратурных вечарах, на старонках газет і часопісаў, у пісьменніцкіх колах і перад шырокай чытацкай аўдыторыяй.

«Рытмы вершаў вынікаюць з рытмаў новага жыцця»,— сказаў адзін з паэтаў таго часу. Гэта правільна. Але хто дакладна ведаў — якімі яны павінны быць — новыя «рытмы», стылістыка, характар вобразнасці, лексіка і сінтаксіс — словам, усё тое, што павінна было найбольш адэкватна выявіць новы, рэвалюцыйны змест? Уся паэтыка знаходзілася пад знакам эксперыменту. Ад паэзіі патрабавалі «нервова-рашучага тэмпу», «тэлеграфна-адрывістага стылю», як быццам бы адзіна сугучных рытмам часу. Паэзіі шкодзіла рамантычная абстрактнасць, эмацыянальная агульнасць стылю. Пра гэта сведчаць нават самыя назвы паэтычных зборнікаў: «Раніца рыкае», «Празалаць», «Пунсовае ранне», «Чарнакудрая радасць», «І залацісцей і сталёвей», «Зорнасць», «Кляновыя завеі», «Настроі» — вось характэрныя кніжкі 20-х гадоў. Грамадзянскасць, нягледзячы на суб'ектыўна добрыя намеры аўтараў, нярэдка проста патанала ў гэтай агульнай стылёвай «празалаці», размытасці зместу, арнаментальнасці, якія прадвызначалі свайго роду стылёвы канон паэзіі гэтага перыяду.

Няма, аднак, сумнення, што творчыя задумы паэтаў былі падпарадкаваны страснаму жаданню ўславіць рэвалюцыю, сцвердзіць новую рэчаіснасць, якая па-свойму непаўторна адлюстравалася ў іх кнігах.

Лідэрам творчай моладзі, адным з пачынальнікаў беларускай савецкай паэзіі, выдатным песняром рэвалюцыі быў Міхась Чарот — кіраўнік літаратурнай арганізацыі «Маладняк» (утворана ў 1923 годзе). У яго паэмах, вершах, драматургічных творах, апавяданнях чуцён голас абуджанага рэвалюцыяй народа. Чарот прыйшоў у літаратуру з грамадзянскай вайны. Цікава расказвае пра яго Яўген Рамановіч у сваёй кнізе «Знаёмыя сілуэты»:

«Па распараджэнні Рудзенскага рэўкома Кудзелька (сапраўднае прозвішча М. Чарота.— У. Г.) застаецца ў тыле нямецкіх войск з заданнем уключыцца ў арганізацыю народнага супраціўлення захопнікам. Запявалу лясных братоў-партызан і баявога разведчыка Міхася Кудзельку пачалі шукаць нямецкія і белапольскія акупанты.

Прыхапіўшы з сабою наган, Кудзелька ідзе ў Мінск, у бальшавіцкае падполле.

— Іду ў заўтра! — гаворыць ён».

«Той Чарот,— піша пра яго Н. Гілевіч у кнізе «Акрыленыя рэвалюцыяй»,— якім ён увайшоў у нашу свядомасць,— палымяны

пясняр кастрычніцкай «завірухі», «мяцежны бунтар», бясстрашны ўдзельнік «сонечнага паходу»,— пачаўся ў 1920 годзе».

Яго паэзія наскрозь прасякнута тэмай рэвалюцыйнага пераўтварэння жыцця, страснага сцвярджэння ідэй Кастрычніка, «чырвонагвардзейскай атакі на капітал».

Трымай жа моцна, родны брат,
Свой сцяг здабытай волі,—

звяртаецца ён да «аратага», выкарыстоўваючы энергію прамоўчых, лозунгавых заклікаў.

М. Чарот па-новаму падышоў да рэвалюцыйнай тэмы. Яна атрымала ў яго большую ступень сацыяльна-класавай, палітычнай акрэсленасці. Ён услаўляе непарушны саюз рабочага класа і сялянства, якія могуць ажыццявіць свае адвечныя спадзяванні толькі разам, агульнымі сіламі.

Бура, навальніца, завіруха, агонь, што крышаць стары свет,— гэтая вобразнасць выяўляла рэвалюцыйны змест паэзіі М. Чарота.

Найбольш выдатныя дасягненні беларускай паэзіі 20-х гадоў звязаны ў першую чаргу з лірычным эпасам — эпасам рэвалюцыі, у якім, паводле выразу Б. Пастарнака, быў схоплен «буйны план часу». Уклад М. Чарота ў яго стварэнне вельмі значны. Яго паэма «Босыя на вогнішчы» (1921) — расказ аб народзе і рэвалюцыі — стала класічным творам беларускай савецкай паэзіі, наватарскім па змесце і форме. Аўтар падкрэслівае народныя карані рэвалюцыі. Кастрычнік асэнсоўваецца ў паэме як магутны выбух энергіі сацыяльных нізоў, разняволеных сіл народа, як стыхія народнага гневу.

Яны — байцы вялікай рацi.
Іх хата там, дзе ёсць прастор.
Няволя, крыўда — вось іх мацi!
Ідуць яны да сонца й зор.

Вобразы-сімвалы, шырокія абагульненні, што плывуць магутнай ракой разняволеных рытмаў, суседнічаюць з каларытнымі, выхапленымі з жыцця дэталямі і сітуацыямі.

«Паэма,— паводле сведчання сучасніка,— зрабілася любімым творам тагачаснай моладзі, і нават у тыя не спрыяльныя для кнігадрукавання гады разрухі вытрымала шмат выданняў».

У творчасці М. Чарота (таксама як і З. Бядулі і іншых паэтаў) тэма рэвалюцыі самым цесным, арганічным чынам яшчэ ў 20-я гады сплялася з ленінскай тэмай. Паэма «Ленін» (1925) — яго значнае дасягненне. У ёй раскрываецца вялікая любоў беларускага працоўнага сялянства да правадыра рэвалюцыі. У справе Леніна, у здзяйсненнях партыі і Савецкай улады паэт бачыў новую эру гісторыі.

20-я гады — не лёгкі перыяд. Яны ведалі трагедыі войнаў, пажары і разбурэнні нямецкай і белапольскай акупацыі, налёты бандаў Булак-Балаховіча, цяжкі час нэпа.

Тэма рэвалюцыі, беларускай дзяржаўнасці, БССР — адна з самых прыцягальных у сучаснай паэзіі. Вобраз гэтага часу выразна паўстае ў вершы М. Танка «Савецкая Беларусь»:

Табе прарочылі ворагі,
Як выстрал, кароткі век,
Зямлю табе адмяралі
Рыдлёўкі магільшчыкаў іх.
Штыком цябе перакрэслівалі
І асуджалі на здзек.
Твой голас бунтарны глушылі
З гармат і званіцаў усіх.
Але ты свой лёс злучыла
З партыяй Ільіча,
З громам прызыўным «Аўроры»
І векапомных баёў,
З песнямі Рэвалюцыі,
Што перамогай гучаць,
З зорамі пяцікрылымі,
З дружбай народаў-братоў...

Ніякія цяжкасці і выпрабаванні не маглі зменшыць рэвалюцыйную радасць пакалення. Паэзія жыла прадчуваннем блізкай сусветнай рэвалюцыі як працягу Вялікай Кастрычніцкай. Гэтая ідэя ўвасоблена ў паэме-фантазіі Чарота «Чырванакрылы вяшчун», у якой савецкі чалавек-інтэрнацыяналіст узнімаецца на фантастычным самалёце над краінамі і мацерыкамі, каб заклікаць народы свету на барацьбу з эксплуататарамі, каб наблізіць перамогу сусветнай рэвалюцыі.

«Радасць мая — Рэвалюцыі час!» — усклікае У. Дубоўка ў сваёй паэме «Кругі» (1927). Паэт надзвычай актыўна працаваў у 20-я гады, асабліва ў жанры паэмы: «Кляновыя лісты» (1925), «Плач навальніцы» (1926), «І пурпуровых ветразей узвівы...» (1929). Пры ўсёй «эксперыментальнасці» некаторых з іх (што падкрэсліваў, між іншым, сам аўтар), яго паэмы — цікавая спроба шматпланавага даследавання праблемы «рэвалюцыя і народ», пераходу краіны «да вышэйшых форм жыцця — да калектывізацыі, да індустрыялізацыі».

З нас кожны рэвалюцыяй праняты,
кладзём шляхі да новых дасягненняў,
Узвышшы высім з пралетарыятам,
здзяйсняючы квяцістыя імкненні.

Аўтар добра ўсведамляў, што «на нашых вачах адбываюцца працэсы найвялікшага гістарычнага значэння. Паэты, пісьменнікі не могуць, не павінны заставацца пасіўнымі суглядальнікамі,— яны павінны быць актыўнымі ўдзельнікамі нашага будаўніцтва».

Тэма Кастрычніка ў Дубоўкі вызначаецца радасным успрыняццем новага жыцця, верай у светлую будучыню роднага народа, у тым ліку Заходняй Беларусі, што знаходзілася тады ў паднявольным становішчы. Яму, дарэчы, адзінаму з беларускіх паэтаў пашчасціла ўдзельнічаць у святкаванні першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Маскве, калі перад працоўнымі, што сабраліся на Краснай плошчы, выступаў У. І. Ленін. Паэту на ўсё жыццё запомнілася гэта падзея. Да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ён напісаў верш «Мы заваёў сваіх не аддадзім», у якім ёсць такія радкі:

Паўсотні год, паўвека прамінула.
Былі даліны і былі узвышшы.
Быў я пасля не раз на Краснай плошчы.
Але навек зайшлі мне ў памяць словы,
якія мы тады ўсе паўтарылі,
нібыта урачыстую прысягу,
з якімі я канчаю шлях жыццёвы:
«Ніколі Рэвалюцыі не здрадзім!»

Беларуская паэзія 20-х гадоў мысліла шырокімі, маштабнымі катэгорыямі: клас, маса, мільён... «Паўстаў мазольны міліён і ператрос зямныя шулы»,— пісаў М. Грамыка ў вершы «Восьмы Кастрычнік» (1925).

Не адзін быў у школе вялікай, трэці раз нарадзіўся на свет,— сотняй зваць яго, гасячай клікаць, мільёны ідуць услед —

такім уяўляўся герой У. Дубоўку (паэма «Студэнт», 1924) і іншым паэтам. Такое «маштабнае» ўспрыняцце рэчаіснасці ў большасці выпадкаў не падмацоўвалася, не апладнялася непаўторнасцю яе асабовага, індывідуальнага, інтымнага асэнсавання. Гэта — істотны недахоп творчага метаду многіх твораў лірычнай паэзіі 20-х гадоў, які збядняе яе мастацкае значэнне.

Надзвычай прыхільна ставіўся да творчасці маладых Я. Купала:

«Усіх іх я вельмі люблю і цаню, а калі ёсць у каго з іх асобныя недахопы ў сэнсе даравання, апраўдваецца гэта іх маладосцю. Рэзка вылучаюцца з гэтай плеяды малодшых са станоўчага боку М. Чарот і У. Дубоўка»,— так сказаў ён пра маладнякоўцаў, прысвяціўшы ім і ўсёй беларускай моладзі свой векапомны верш «Арлянятам» (1923) з яго, паводле слоў А. В. Луначарскага, «іскрыстай рэвалюцыйнай рада-

сцю». Гэта — купалаўскі падарунак юнацтву, помнік новаму чалавеку, народжанаму ў Кастрычніцкім штурме, запавет савецкай моладзі.

Ролю Купалы і Коласа ў фарміраванні беларускай савецкай паэзіі, яе асноватворных мастацка-стылёвых напрамкаў немагчыма перабольшыць. Глыбокі след яны пакінулі ў літаратурным працэсе 20-х гадоў.

Купалаўская паэзія ў 20-я гады мае нямала агульных рыс з паэзіяй маладнякоўцаў. Купала натхняўся радасцю новых дзён. Ён, а разам з ім іншыя старэйшыя пісьменнікі, выходзілі ў творчы авангард беларускай савецкай літаратуры.

Дваццатыя гады — асабліва значны і плённы перыяд у творчасці Я. Купалы. Яго зборнік «Безназоўнае» (1925) стаў вялікай падзеяй у творчай біяграфіі паэта і ў літаратурным жыцці рэспублікі. Ён засведчыў, што паэт прыйшоў да глыбокага разумення сацыяльна-гуманістычных ідэалаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і выразна ўбачыў «новага жыцця сцягі». «Права і закон» беларускага народа, светлая доля маладой рэспублікі, якая атрымала ў выніку кастрычніцкіх баёў дзяржаўную самастойнасць,— тэма і пафас лірычнай паэмы Я. Купалы «Безназоўнае» (1924), аднаго з найбольш таленавітых твораў беларускай паэзіі.

Каму не вядомы радкі:

Беларусь на куце
Ў хаце сваёй села,—
Чарка мёду ў руцэ,
Пазірае смела...
На галоўцы вянок
З сініх васілёчкаў,
А чырвон паясок
Стан абвіў дзявочы.

Небывалы духоўны ўздым перажывае ў гэты час творчасць Я. Коласа. У 1922 годзе выходзіць яго этапны зборнік «Водгулле».

Паэт шмат працуе. Ён завяршае свае капітальныя паэмы «Новая зямля» (1923) і «Сымон-музыка» (1925), адчуваючы, як і Я. Купала, жыццятворны ўплыў сацыялістычнай рэвалюцыі і новай рэчаіснасці, якая, уласна кажучы, і падказала паэту і яго героям выйсце з зачараванага кола жыццёвых супярэчнасцей. Вялікія коласаўскія паэмы створаны на пераломе гісторыі. Не з'яўляючыся «эпасам рэвалюцыі», яны тым не менш вельмі і вельмі звязаны са сваім часам, з новай доляй вызваленага з-пад уціску народа. «Колас,— падкрэслівае І. Я. Навуменка,— савецкі пісьменнік, далягляды новага жыцця ён вымяраў ідэаламі, якія маюць трывалую апору ў свядомасці народа, у

яго духоўным вопыце». Абедзве паэмы — пра лёс беларускага чалавека на шляхах блуканняў у пошуках лепшай долі, у пошуках «бацькаўшчыны ў бацькаўшчыне». Усёй логікай сваіх вобразаў аўтар пераканаўча даводзіць, што эксплуататарскія класы варожыя народу, яго мастацтву, культуры, мове, што доля народа пры капіталізме трагічная, што толькі новы лад — сацыялізм — можа даць працоўнаму беларусу зямлю і вольную бацькаўшчыну. Паэт усё глыбей пранікаецца гэтай думкай. Адсюль ідзе нарастанне творчай актыўнасці, жадання — нароўні з маладымі — удзельнічаць у будаўніцтве новага жыцця. У вершы «Да 10-й гадавіны БССР» ён з пачуццём удзячнасці, радасці і гонару ўсклікае:

Былы нявольнік і падданы,
Ты вольным стаў, наш край, цяпер,
К жыццю Кастрычнікам прызваны,
Жыві ж, красуй, БССР!

Тэма рэвалюцыі стала замацоўваецца ў яго творчасці.

У паэзіі 20-х гадоў адлюстраваўся сусветна-гістарычны размах рэвалюцыі, знайшла вобразнае ўвасабленне ідэя непарыўнага, вечнага саюза «молата і плуга», «сясцёр сялянкі і пралетаркі» («Дзве сястры» Я. Купалы, 1924), была паэтычна выказана вышэйшая мэта рэвалюцыі, яе гуманістычная сутнасць — усё для народных мас, на карысць працоўнаму чалавеку.

Адзін з лепшых твораў 20-х гадоў пра рэвалюцыю — паэма П. Труса «Дзесяты падмурак», прысвечаная тэме сацыялістычнай індустрыялізацыі рэспублікі. Яе радкі гучалі на XII з'ездзе Кампартыі Беларусі ў 1929 годзе, калі прымаўся першы пяцігадовы план. «Мне думаецца,— гаварыў у справаздачным дакладзе Я. Б. Гамарнік, маючы на ўвазе вядомыя радкі «Край легенд, адвечных песень-казак...»,— што гэты тон сугучны настроям усяго партыйнага з'езда, усёй КП(б)Б і ўсіх працоўных мас БССР».

У такіх эпічных творах, як «Безназоўнае» Я. Купалы, «Босыя на вогнішчы» М. Чарота, у паэмах Я. Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка», У. Дубоўкі «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы...» і «Штурмуйце будучыні аванпосты!», А. Александровіча «Нараджэнне чалавека» і іншых творах, замацаваўся новы эстэтычны стан, ідэйна-мастацкі тып беларускай літаратуры як мастацтва савецкай эпохі. Іх эпічнасць узмацнялася тым, што гэтыя творы сваімі мастацка-эстэтычнымі сродкамі падводзілі вынік значнаму перыяду, насычанаму рэвалюцыйнымі падзеямі і зрухамі гістарычнага значэння.

На шырокім грамадска-палітычным і літаратурным фоне 20-х гадоў адбываўся складаны працэс фармавання ідэйна-мастацкага

адзінства савецкай паэзіі. Актыўнае сцвярджэнне ідэй рэвалюцыі ўзбагачала літаратуру тэматычна і эстэтычна. У беларускай, ад вытокаў сялянскай, паэзіі загучалі — ва унісон з гудкамі новых заводаў — матывы горада, прамысловай вытворчасці, індустрыі.

Усё гэта было вельмі знамянальна, але, нягледзячы на відавочныя поспехі, паэзія 20-х гадоў у цэлым усё яшчэ стаяла перад неабходнасцю мастацка-эстэтычнага асваення вялікага сацыяльна-гістарычнага вопыту сучаснасці, а таксама класічнай культурнай спадчыны, якую той-сёй з паэтаў яўна недаацэньваў. Пастаяннае пашырэнне сферы сацыялістычнага жыцця, пэўныя складанасці працэсу станаўлення новага грамадства, праблемы фармавання новага чалавека запатрабавалі ад паэзіі ўдасканалення яе ідэйна-мастацкай палітры, пераходу да большай натуральнасці, канкрэтнасці, прастаты і праўдзівасці ў эстэтычным асэнсаванні рэчаіснасці таго часу і — што яшчэ больш важна — узмацнення асабовага характару мастацкага бачання.

Шмат якія наспеўшыя ў 20-я гады творчыя праблемы павінны былі вырашыць 30-я гады. Яны сталі новым этапам у практычнай рэалізацыі ідэалаў Кастрычніка, у далейшым развіцці беларускай паэзіі.

Заўсёды цікава і павучальна сачыць за тым, да чаго паэты імкнуліся, ад чаго адмаўляліся на працягу свайго творчага шляху, да чаго ўрэшце прыходзілі. У развіцці беларускай паэзіі ад дваццатых гадоў да трыццатых наглядаецца паступовы спад хвалі эксперыментатарства, адмаўленне ад занадта нервовых мастацкіх шуканняў. У многіх паэтаў назіраецца зварот да эстэтычнага вопыту Купалы і Коласа, узнікае і хутка ўзрастае цікавасць да творчасці Максіма Багдановіча, якога «адкрылі» ў канцы дваццатых гадоў, калі ўпершыню быў выдадзены двухтомнік, дзе былі сабраны найбольш значныя яго творы. Цікавасць да Багдановіча была звязана з гераічнасцю самога жыцця паэта, напружанасцю творчых пошукаў, духоўнай насычанасцю, інтэнсіўнай інтэлектуальнасцю яго асобы.

Беларуская паэзія ў 30-я гады становіцца больш строгай, сур'ёзнай, удумлівай; памеры і рыфмы, уся паэтыка набліжаюцца да класічных. Самыя актыўныя наватары, такія, як Аркадзь Куляшоў, звяртаюцца да перакладаў Пушкіна на беларускую мову, што таксама сведчыць аб пераарыентацыі інтарэсаў.

Паэзію завуць сейсмографам часу. Праўда, у яе «чуйнасці» заўсёды меліся свае, адпаведныя кожнаму перыяду адценні: грамадзянскасць эвалюцыяніравала разам з самой паэзіяй, з нашым грамадствам, узмацняючы сваю эстэтычную аснову і гуманістычны пафас.

Ідэалы Кастрычніка, заваёвы рэвалюцыі сцвярджаюцца ў 30-я гады з не меншай страснасцю, але паэты 30-х гадоў успрымаюць і асэнсоўваюць рэвалюцыю інакш — больш як з'яву сацыяльна-заканамерную, падрыхтаваную гістарычным развіццём краіны, стваральную па сваёй сутнасці, без перабольшання яе стыхійнага элементу. Эстэтычна актыўная грамадзянскасць паэзіі 30-х гадоў была найбольш звязана з лірыкай канкрэтных перажыванняў, з імкненнем да дэталізацыі, індывідуалізацыі. У канцы 20-х, у 30-я гады паэзія інтэнсіўна засвойвала новы жыццёвы змест, пашыраліся яе грамадскія, палітычныя далягляды, павышалася творчая культура.

Спраўджваліся прарочыя словы У. І. Леніна, што «з Расіі нэпаўскай будзе Расія сацыялістычная». Хто з паэтаў мог стаяць у баку ад велічнага будаўніцтва, якое выклікала ў сучасніка вялікі душэўны ўздым?! Яны былі актыўнымі і непасрэднымі ўдзельнікамі ўсіх падзей. Апошняе і вызначала іх творчую пазіцыю.

Гэту непаўторную эпоху, відаць, глыбей можна зразумець у святле думкі выдатнага савецкага пісьменніка М. М. Прышвіна: «Сакрэт і сэрца паэзіі ёсць пачуццё сучаснасці ў тым сэнсе, што не праходзім з часам, а самі ствараем новы час». Сапраўды, паэзія дапамагае грамадству фарміраваць свядомасць, сістэму адносін і ацэнак, перакананняў і поглядаў. Рух літаратуры наперад і магчымы толькі праз творчае засваенне сучаснасці. «Тащить вперед понятое время», як сказаў пра гэта паэт.

Яшчэ ў 1929 годзе Я. Купала стварае сваё вядомае, цяпер хрэстаматыйнае «Сыходзіш, вёска, з яснай явы». Новае процістаўляецца мінуламу, старому. Старая вёска, «як сон маркотны, нежаданы», адыходзіць у мінулае, выцясняецца новай «яснай явай». У гэтым працэсе паэт бачыў далейшае развіццё рэвалюцыі, сённяшняе яе аблічча. Тэма вёскі, па-новаму зразуметая вялікім паэтам, выступала ў яго творчасці як тэма ўсёпераможнай рэвалюцыі. У 30-я гады разгорнутае наступленне сацыялізма набірае новыя тэмпы і дынаміку. Лозунгам дня стала: «За сацыялістычную індустрыяльна-калгасную Беларусь!» Паўсюль адчувалася грымотная хада часу.

Характарызуючы асаблівасці савецкай літаратуры тых год, А. М. Горкі адзначаў такія яе якасці, як шырыню ахопу рэчаіснасці, актыўную і дзейсную сувязь з сучаснасцю. «Мы маем права сказаць,— пісаў ён ужо ў 1930 годзе,— што ніколі яшчэ і нідзе літаратура не ішла так нага ў нагу з жыццём, як яна ідзе ў нашы дні ў нас».

Літаратары, журналісты імкнуліся ў глыбіню народнага жыцця, хацелі бачыць на свае вочы нараджэнне яго новых форм.

Вось як успамінае пра гэта М. Лужанін:

«Быў пачатак 1930 года. З камандзіроўкай літаратурнага згуртавання «Узвышша» я аб'ездзіў немалую прастору Палесся.

Ішла калектывізацыя. Пастрэльвалі, выходзячы з лясоў, банды, сыпаліся з-за мяжы варожыя адозвы. На голас царкоўных званоў збягаліся вёскі не пускаць прызначаныя для высылкі на поўнач заможныя сем'і. З вялікім намаганнем створаныя ўвечары калгасы — на раніцу рассыпаліся».

30-я гады насычаны не меншым драматызмам рэвалюцыйна-класавага змагання, чым мінулы перыяд. Літаратура актыўна ўдзельнічала ў барацьбе, якую партыя і народ вялі з буржуазнымі і кулацкімі элементамі, з трацкізмам і буржуазным нацыяналізмам, з правымі на ідэалагічным фронце.

Рэвалюцыя разгортвалася ў новых формах.

Не лёгка было. Паэзія жыла ідэаламі Кастрычніка, пафасам тварэння новага свету — будаўніцтва сацыялізме.

Паэзію 30-х гадоў востра хвалявалі задачы дня. Актыўная грамадзянскасць, звязаная з народнасцю і партыйнасцю мастацкай творчасці, стала яе выдатнай якасцю.

Рамантычна-абагульненая стылістыка (калі цаніўся «паэт-калектывіст») была вядучай плынню паэзіі 20-х гадоў. Стылёвае развіццё мае свае заканамернасці. «Эвалюцыя стылю як сістэмы мастацкіх сродкаў ці прыёмаў цесна звязана са зменай агульнага мастацкага задання эпохі» — гэтая думка выдатнага савецкага літаратуразнаўцы В. Жырмунскага мае метадалагічны характар.

Гаворачы пра «стыль жыцця» 30-х гадоў, неабходна адзначыць такія яго рысы, як павышаны энтузіязм працоўных мас, іх самаадданасць у будаўніцтве, энергію, натхненне, творчасць, паскораны пульс жыцця, фарсіраванне тэмпаў, прамфінплан, сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, пэўны аскетызм побыту, барацьба за новы быт — гэтыя паняцці сталі адзнакай жыццёвага стылю 30-х гадоў. Будучыня збліжалася з буднямі, сцвярджала сябе ў канкрэтных справах дня. «Барацьба за стыль» — гэты выраз належыць якраз 30-м гадам. Своеасаблівасць часу, паводле законаў мастацкай спецыфікі, уплывала на літаратуру.

Дэкларацыйнасць, адцягнены рамантызм дваццатых гадоў, абстрактнасць і касмізм саступаюць месца лірыцы канкрэтных, індывідуальных перажыванняў. Павышэнне эстэтычнай культуры, паглыбленне рэалізму паэзіі на глебе далейшага пашырэння грамадзянскіх далягладаў, узбагачэння новым жыццёвым зместам — усё гэта надзвычай характэрна 30-м гадам. Выпрацоўвалася, па сутнасці, новая якасць лірызму — эстэтычна крыху сухаватага, падпарадка-

ванага задачам моманту, але насычанага псіхалагічна, больш індывідуалізаванага.

Узмацняецца публіцыстычнасць. Паэзія арыентуецца на «прамову фактамі», не заўсёды раскрываючы іх гуманістычную сутнасць. Жанравую своеасаблівасць лірыкі складаюць вершы-рэпартажы, звароты, афарыстычныя лозунгі (накшталт «Няхай бетоннымі нагамі шагае гордая эпоха» (П. Броўка), якія недастаткова насычаліся эмацыянальна, па-мастацку.

Асаблівую ўвагу набываюць традыцыі Маякоўскага — выдатнага песняра Кастрычніка. Інтанацыі Маякоўскага загучалі ў творчасці многіх паэтаў. Шмат вучыліся ў яго П. Броўка, М. Лужанін, П. Глебка і іншыя.

Паэзія і рэвалюцыя — адно і другое творацца ў найвышэйшым напружанні духоўных творчых сіл. 30-я гады пацвярджаюць гэтую думку.

Паэзія адлюстравала своеасаблівы каларыт часу.

Гамоняць фабрычныя трубы:
«Каб рукі сахой не вярэдзіць,
Пытанне пастаўлена рубам —
Дагнаць,
Перагнаць,
Апярэдзіць!»

(П. Глебка)

«Калісь Рэвалюцыю мы зрабілі, цяпер Рэвалюцыя робіць нас!» — натхнёна пісаў М. Багун (верш «Рэвалюцыі», 1930). Тэма рэвалюцыі супала з тэмай сучаснасці.

У творчым імпэце пачатку 30-х гадоў нярэдка «фарсіравалася», ігнаравалася сама эстэтычная прырода паэзіі, спецыфічнасць яе вобразных сродкаў. Гэта — характэрная рыса пачатку 30-х гадоў, якім уласціва высокая творчая напружанасць, рэвалюцыйнае гарэнне ва ўсіх галінах жыццядзейнасці савецкага чалавека.

Для паэта мала быць толькі сведкам, ён — актыўны і непасрэдны ўдзельнік усіх падзей,— так у шматлікіх паэтычных дэкларацыях 30-х гадоў мысліліся фігура паэта і яго задачы. Пры гэтым, на жаль, часта спрашчаліся эстэтычныя адносіны мастацтва і рэчаіснасці. Лічыць найпершым абавязкам паэзіі «падносіць цэглу» — значыць звужана разумець яе мастацкую задачу — пазнанне і выхаванне чалавека («Не было і не будзе ад паэзіі трактарам нафты»,— мудра пісаў крыху раней У. Дубоўка).

Словам, было б не правільна ўяўляць развіццё паэзіі 30-х гадоў аднабакова, як суцэльны шэраг перамог і поспехаў. Не, паэзія —

асабліва ў пачатку 30-х гадоў — зведала на сваім шляху не мала цяжкасцей, звязаных з памылковай тэорыяй адміранння лірыкі, арыентацыяй выключна на «агітацыйны» верш, недаверам — у процівагу 20-м гадам — да эмацыянальнага элементу ў паэзіі. Аднак пастунова гэтыя недахопы пераадольваліся: адлюстраванне жыцця ішло ўшырыню і ўглыбіню. Менавіта яно — жыццё — дыктавала эстэтычнае заданне часу, падштурхоўвала пошукі новых выяўленчых сродкаў, прасіла «знайсці такое слова залатое, каб пець народжаны ў змаганні свет, каб з новай эраю вітаць зямлю» («За строем дат і рубрык» У. Хадыкі).

Уладзімір Хадыка — адзін з самых цікавых, таленавітых паэтаў 30-х гадоў, паэт — шукальнік новых слоў і форм, якога высокаацаніў у свой час выдатны рускі савецкі паэт Мікалай Асееў. Сацыяльныя працэсы 30-х гадоў, такі, скажам, як калектывізацыя, Хадыка разумеў як працяг Кастрычніка, як гістарычную неабходнасць.

Будаўніцтва сацыялізме ў 30-я гады — гэта гераічны подзвіг савецкіх людзей, натхнёных ідэямі Кастрычніка.

У літаратуру прыходзілі новыя і новыя людзі. У пачатку 30-х гадоў заявілі аб сабе паэты А. Жаўрук, А. Ушакоў, В. Вітка, А. Зарыцкі, С. Грахоўскі, С. Ліхадзіеўскі, А. Русецкі, С. Шушкевіч, А. Бялевіч, А. Астрэйка, Э. Агняцвет, Р. Няхай. У другой палавіне — П. Панчанка, М. Сурначоў, М. Аўрамчык, А. Вялюгін, К. Кірэенка, М. Калачынскі, А. Бачыла, Л. Гаўрылаў, А. Коршак.

Людзі здольныя, таленавітыя, бязмежна адданыя справе партыі, сацыялізма, яны фармавалі свае творчыя індывідуальнасці пад уплывам Кастрычніка і яго ідэй, актыўна ўдзельнічаючы ў будаўніцтве сацыялізма.

Нагадаем (як мы гэта зрабілі для 20-х гадоў) назвы некаторых кніг. Назвы, нават самі па сабе, могуць пра многае расказаць. Іх стылістыка даволі рэзка разыходзіцца з папярэднім дзесяцігоддзем.

«Гады як шторм», «Прамова фактамі», «Урачыстыя дні», «Росквіт зямлі», «Штурм», «Рытмы», «Нараджэнне чалавека», «Цэхавыя будні», «Праз шторм — на штурм», «Галасуе вясна за вясну», «Разбег», «Рабочы пульс», «Трактар», «Радасны будзень», «Песня будаўніцтву», «Вясновыя будні» і г. д.— кнігі 30-х гадоў. Яны даносяць у наша сёння героіку сацыялістычнага будаўніцтва, яго дыханне, напружанасць, дынаміку, самі «акорды дзён».

Маладых паэтаў падтрымліваў, заахвочваў тварыць Я. Купала.

Паэзія 30-х гадоў — арыгінальны перыяд у развіцці беларускай літаратуры, якому характэрны свае тыпалагічныя рысы і асаблівасці, свой гістарычны каларыт. Паэты пачалі разумець сваю задачу больш

глыбока, сур'ёзней ставіцца да выхавання грамадскай свядомасці, думак і пачуццяў. Паступова яны пачалі ўсведамляць, што такой высокай мэты нельга ў поўнай меры дасягнуць плакатна-лозунгавай манерай, просталінейнай дыдактычнасцю. Задачу паэзіі трэба было адчуць эстэтычна, знайсці ідэям паўнацэннае мастацкае ўвасабленне, каб яны глыбей пранікалі ў свядомасць чытача.

Шмат працуюць у гэты час над увасабленнем кастрычніцкай тэмы, тэмы сучаснасці Я. Купала і Я. Колас.

Тэма Кастрычніка гучыць у філасофска абагульненых вядомых вершах Купалы «Дыктатура працы», «Песня будаўніцтву», «Вялікаму Кастрычніку», Коласа — «Да 15-й гадавіны Кастрычніка», «Шаснаццатая гадавіна», «Раскуты Праметэй»:

Цуды творыць сіла тая
На зямлі, на моры
Ды за воблакі ўзлятае
К зорам у дазоры.
Разнімае плечы-крылы
Праметэй раскуты.
Нашы дні — паэмы-былі,
Сказ нідзе нячуты.

У паэзіі 30-х гадоў, асабліва ў сярэдзіне і ў другой палавіне, як у люстры, адбілася шырокая панарама жыцця з яго вялікімі заваёвамі і поспехамі і адначасова са складанымі канфліктамі новага тыпу, з цяжкасцямі, напружанасцю перадваеннага дзесяцігоддзя, з памылкамі, абумоўленымі культам асобы...

І гаворачы пра паэзію гэтага часу, трэба мець на ўвазе, што менавіта вобразы новай, сацыялістычнай рэчаіснасці, новы савецкі чалавек, духоўнае аблічча якога ўсё выразней паўставала з кожнай перамогай сацыялізме, вызначылі сабой яе наватарскае багацце. Незабыўная працоўная героіка пяцігодак, вострая барацьба з класавымі ворагамі, радасць дасягнутых поспехаў, адчуванне шырокіх магчымасцей, якія адкрыліся перад чалавекам, надалі лепшым творам беларускай паэзіі 30-х гадоў той высокі пафас і эмацыянальную праўдзівасць, з якімі яны па праву ўваходзяць у скарбніцу савецкага паэтычнага мастацтва.

Тэма савецкага чалавека, да якой — на новай аснове — звярнулася літаратура 30-х гадоў, была непасрэдна і апасродкавана звязана з тэмай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Лірыка выяўляла свет яго пачуццяў і дум, дапамагаючы гэтым самым працэсу «перакоўкі» чалавека, выхаванню свядомых будаўнікоў сацыялізме, гатовых на подзвіг у імя здзяйснення ідэалаў новага грамадства.

Калі тэма рэвалюцыі ў 20-я гады бралася ў аспекце «рэвалюцыя і народ», «рэвалюцыя і сусвет», то далей, у 30-я гады, яе акцэнт часцей перамяшчаецца на асобу: «рэвалюцыя і чалавек». Былі, вядома, свае цяжкасці ў раскрыцці чалавечых характараў. «Не людзі — індустрыі богі!» — гаворыць пра рабочых паэт 30-х гадоў Ю. Лявонны, жадаючы ўславіць чалавека і яго працу. Такі агульны падыход да. вырашэння праблемы героя не быў плённы, бо збядняў шматмернасць яго ўнутранага свету. Сучаснасць уносіла свае карэктывы. У паэтаў другой палавіны 30-х гадоў павышаецца цікавасць да рэальнага, звычайнага характару беларуса, які выступае актыўным будаўніком сацыялізме. Расце ўвага да яго шматаб'ёмнага псіхалагічнага, духоўнага жыцця. Сфера чалавечага становіцца ўсё больш даступнай ва ўсёй сваёй складанасці і глыбіні, ва ўсім багацці ўнутранай дыялектыкі.

Паэзія 30-х гадоў прымала самы актыўны ўдзел у бурлівых сацыяльных працэсах свайго часу. Яны патрабавалі мастацкага абагульнення. Узмацняецца эпічнасць, з'яўляюцца новыя ўзоры маштабнага, звязанаге з Кастрычніцкай тэмею эпасу, у якім асэнсоўваліся героіка-рэвалюцыйныя падзеі часу. «Над ракою Арэсай» Я. Купалы, «На шляхах волі» Я. Коласа, «Праз горы і стэп» П. Броўкі (1932), «Антон Шандабыла» А. Куляшова (1934), «За строем дат і рубрык» У. Хадыкі (1934), «Баранаў Васіль» і «Песня аб разведчыках» А. Куляшова (1937), «У тыя дні» П. Глебкі (1937) і іншыя — гэтыя паэмы, прысвечаныя розным падзеям народнага жыцця і гісторыі, малююць імклівы вобраз часу, расказваюць аб пражытым і перажытым.

Паэма Я. Купалы «Над ракою Арэсай» (1933) нарадзілася па гарачых слядах часу. Яна паказвае, як на сацыялістычных пачатках перабудоўваліся самыя глухія куткі Беларусі. Твор мае канкрэтныя «прататыпы»: Камуну імя Беларускай Ваеннай акругі і саўгас імя Дзесяцігоддзя БССР. Абедзве гаспадаркі знаходзіліся на Любаншчыне. Больш месяца Купала жыў сярод калгаснікаў, назіраў радасныя змены ў народным жыцці, вывучаў сваіх герояў-камунараў. Аўтар будуе свой твор — гэты своеасаблівы паэтычны рэпартаж — на супастаўленні мінулага і сучаснасці, услаўляе рэвалюцыйныя пераўтварэнні, мэтаімклівасць савецкага чалавека, яго «жаданне ладзіць новы лад».

Разам з тым Купала бачыць і канфлікты, што ўзнікаюць пры гэтым, спрабуе расказаць пра тых камунараў, якія спалохаліся цяжкасцей, супрацьпаставілі калектыву свой індывідуальны «інтарэс» і пакінулі будаўніцтва...

«Над ракою Арэсай» — пры некаторай абмежаванасці традыцыйна-фальклорнай паэтыкі — мастацкая ўдача Купалы ў асэнса-

ванні новага матэрыялу, перамога яго выдатнага таленту, умення «слухаць рэвалюцыю», адчуваць яе крокі. Творчы вопыт паэта аказаўся надзвычай каштоўны — паэма была адразу ж перакладзена на многія мовы братніх народаў нашай краіны.

Многія гады (з 1925 па 1935) Я. Колас працаваў над паэмай «На шляхах волі». Гэтае шырокае эпічнае палатно аб пакручастых чалавечых лёсах «на шляхах да волі» ў перыяд паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі засталося незавершаным. Лёс чалавека і лёс народа на пераломе гісторыі — вось што імкнецца асэнсаваць аўтар. Паэма цікавая сваёй «падзейнасцю», эпічнай насычанасцю, яна храналагічная. Аднак усё гэта недастаткова асветлена промнямі аўтарскай асабістасці, суб'ектыўнасці, непаўторнасці; твору яўна шкодзіць апісальнасць. Яго паэтыка быццам бы канфліктуе са сваім часам, не зусім адпавядае яго патрабаванням.

Разам з пашырэннем ідэйна-тэматычных абсягаў творчасці паэзія шырока адчыняе дзверы чалавеку гераічнай біяграфіі, працаўніку, барацьбіту за народнае шчасце. Першымі вобразы герояў рэвалюцыі стварылі ў 20-я гады Я. Купала, М. Чарот, Я. Колас, З. Бядуля. Многія з гэтых герояў, як былінны асілак Янка Віхрабурны з паэмы З. Бядулі «З сказаў буры і віхораў» ці кампалка Паддубны (паэма «Каршун» А. Звонака), нават купалаўскі Сцяпан Булат, што «сніў думку аб Пяруне», былі надзелены ўзнёсла-рамантычнымі, нават звышчалавечымі рысамі. Цяпер паэты больш рэалістычна, праўдзіва і натуральна вырашаюць праблему героя, з усведамленнем таго, што подзвігі здзяйснялі і здзяйсняюць людзі звычайныя, простыя, але высокасвядомыя, адданыя справе рэвалюцыі.

Героіцы грамадзянскай вайны П. Броўка прысвяціў адну з лепшых сваіх паэм 30-х гадоў «Праз горы і стэп», напісаную «паводле гістарычных матэрыялаў Самарскай кавдывізіі». У паэме праўдзіва паказаны гераічны паход Самарскай дывізіі, вобраз абуджанага і выхаванага рэвалюцыяй народа, які свядома змагаецца са сваім класавым ворагам, контррэвалюцыяй.

Вышэйшыя дасягненні беларускай паэзіі перадваеннага дзесяцігоддзя, непасрэдна ці апасродкавана звязаныя з тэмай рэвалюцыі,— ляўкоўскі цыкл Я. Купалы (вершы, напісаныя ім на дачы ў вёсцы Ляўкі пад Оршай летам 1935 года), «Лісты з поўдня» У. Хадыкі, лепшыя вершы і паэмы А. Куляшова (перш за ўсё яго нізка «Юнацкі свет», паэма «Хлопцы апошняй вайны»), лірыка і эпас П. Броўкі, маладога П. Панчанкі. Гэтыя творы, вельмі розныя па ідэйна-мастацкаму ўвасабленню сацыялістычнай рэчаіснасці і рэвалюцыйнай тэмы, адкрывалі новыя далягляды ў развіцці беларускай паэзіі. Савецкая

паэзія 30-х гадоў сцвярджала быццё як творчасць, скіраваную на развіццё ўсяго грамадства і асобнага чалавека. Кіпенне страсцей, мноства самых разнастайных фактаў, новых, нечаканых, часам супярэчлівых, непаўторны працоўны энтузіязм — усё гэта патрабавала ад пісьменнікаў вялікай творчай аддачы.

Ляўкоўскія вершы Я. Купалы («Беларусі ардэнаноснай», «Госці», «Алеся», «Вечарынка», «Хлопчык і лётчык», «Лён», «Сыны» і інш.) — канцэнтраванае выяўленне жыццёвага і творчага вопыту паэта, прыклад натуральнай, вельмі дасканалай узгодненасці таленту і светапогляду, гарманічнасці рэальнага і ідэальнага ў яго творчасці, пераканаўчае паэтычнае сведчанне таго паўнакроўнага гуманістычнага сінтэзу, якога пачынаў дасягаць малады савецкі лад. Героям Я. Купалы невядомы канфлікт паміж жаданым і магчымым, паміж марай і рэчаіснасцю. Пафас чалавека супадае з яго асобаю, думка— з пачуццём. Гэта тып новага, гарманічнага чалавека, які знаходзіцца ў душэўным кантакце і адзінстве з новым, сацыялістычным жыццём. Паэзія Я. Купалы выразна перадавала адчуванне паўнакроўнасці жыцця, сталасці, шырыні далягляду, росквіту матэрыяльнага і духоўнага жыцця народа. І ў гэтым яскрава выяўляўся яе рэвалюцыйна-гуманістычны пафас.

Беларускія паэты высока ўзносяць постаць простага савецкага чалавека — героя сацыялістычных будняў, самаахвярнага працаўніка, разумнага гаспадара сваёй зямлі. Усім сваім зместам лірыка і эпас выхоўвалі ў людзей чалавечую годнасць, высакародства, упэўненасць у сваіх магчымасцях, разуменне высокага абавязку на зямлі.

Паэзія перадваеннага дзесяцігоддзя ўступала ў пару сваёй сталасці і ў творчасці А. Куляшова, П. Панчанкі і многіх іншых паэтаў, якія, абапіраючыся на дасягнутыя поспехі беларускай і ўсёй савецкай літаратуры, па-свойму расказалі пра час і пра сябе, пра новае пакаленне. Галоўныя прыкметы гэтага «расказу» — юнацкая радасць пазнання свету, здзіўленне і сардэчнае захапленне яго навізною, душэўная шчодрасць і бадзёрасць у лепшым сэнсе гэтага слова, здзіўляючая непасрэднасць лірычнага пачуцця, адчуванне адказнасці, гатоўнасць абараняць сваю сацыялістычную Радзіму.

Перачытваючы кнігі 30-х гадоў, можна бачыць, як крок за крокам узрастае ўвага літаратараў да адлюстравання тонкага свету чалавечай душы, душэўных памкненняў і ацэнак у іх рэальным, канкрэтным бытаванні, да адкрыцця сацыяльна-значнага ў «сваім», інтымным, да разумення непадзельнасці свайго і грамадскага, якое ў лірыцы і праяўляецца толькі як асабістае, непаўторнае, сваё. У гэтым таксама трэба бачыць рэвалюцыйнае заданне эпохі.

Сцвярджаючы ідэі Кастрычніка, беларускія паэты славяць перамогу ленінскай нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі, дружбу савецкіх народаў-братоў. Гэтыя матывы займаюць пачэснае месца ў паэзіі 30-х гадоў. Наглядаецца асабліва актыўная кансалідацыя ўсіх савецкіх літаратур. Канчаткова сцвердзіўся метад сацыялістычнага рэалізму. Пасля Першага з'езда пісьменнікаў прынцыпы ідэйнасці і партыйнасці, прынцып адзінства шматнацыянальнай савецкай літаратуры пры захаванні яе мастацкай шматколернасці перамаглі канчаткова. І гэта было асабліва важна і своечасова перад тымі грознымі выпрабаваннямі, якія насоўваліся на краіну.

Больш мабільна выглядае карціна стылёвых пошукаў. Натуральнасць і прастата лірызму, індывідуальны псіхалагізм — галоўны кірунак стылёвага развіцця беларускай паэзіі другой палавіны 30-х гадоў. Паэты імкнуліся да змястоўнасці мовы, максімальнай сэнсавай нагрузкі, адмаўляліся ад розных упрыгожванняў. У канцы 30-х гадоў у беларускай паэзіі знікаюць «першапачатковая» стракатасць і псеўдабагацце стылістыкі, уласцівыя дваццатым. Манера робіцца стражэйшая, але набывае ў вялікіх майстроў сапраўдную, глыбінную індывідуальнасць.

Рассоўваюцца творчыя далягляды. Далучэнне да культуры іншых народаў набывае для кожнай нацыі ўсё больш важнае значэнне. Такія падзеі, як усесаюзнае святкаванне юбілею «Віцязя ў тыгравай шкуры», эпаса «Давід Сасунскі», узбагачалі ўсе літаратуры, далучалі былыя ўскраіны царскай Расіі да спадчыны іншых нацый, іншых культур. Беларуская паэзія з цягам часу ўсё больш звяртаецца да спадчыны рускай класікі, да культур іншых братніх народаў. Новы эстэтычны матэрыял сучаснасці ўвасабляецца ў вершы, які схіляецца да прастаты і строгасці, класічнай яснасці, дакладнасці псіхалагічнага малюнка. Пры ўсім тым паэзія заставалася стылёва шматстайнай, яркай, багата метафарычнай. Інакш бы яна не здолела ўспрыняць і выявіць пастаянны прыліў новага жыццёвага зместу.

Гэтым самым, паглыбляючыся і ўзбагачаючыся, паэзія ўзнімалася на новую ступень.

На зыходзе 30-х гадоў усё адчувальней станавіўся пярэдадзень вайны. Падзеі ў Еўропе і ва ўсім свеце, дзе ўжо разгаралася полымя новай сусветнай вайны, патрабавалі ад паэтаў быць гатовымі да самых нечаканых ваенных нягод.

Высокага ўзлёту грамадзянскасць нашай паэзіі дасягнула, як вядома, у цяжкія ваенныя гады. Вялікая Айчынная вайна з'явілася самым суровым выпрабаваннем сацыялістычнага ладу, жыццёвасці Кастрычніцкіх ідэй, праверкай нашага спосабу жыцця, ідэалогіі і

маралі. Гэта — адзін з выключна гераічных і цяжкіх перыядаў у нашай гісторыі, калі ўвесь савецкі народ перажыў і жорсткія выпрабаванні, і найвялікшы ўздым духу. Само жыццё ў гэты час было незвычайным па духоўнай напружанасці і насычанасці, па гатоўнасці на подзвіг, па масавасці гераізму. І ўся літаратура перажывала небывалы ўздым.

На фронт пайшла і паэзія. Яна аказалася ідэйна падрыхтаванай да таго, каб паўстаць на абарону нашых заваёў, нашых духоўных каштоўнасцей, нашых ідэалаў. Высокая прастата і мужнасць, гераізм і рашучасць, палымянасць і шчырасць лірычнага перажывання — асноўная асаблівасць нашай ваеннай паэзіі, якая менавіта ў гэты перыяд дасягнула вышэйшага ўзроўню грамадзянскасці і ідэйна-мастацкай дасканаласці. Незабыўнае купалаўскае «Беларускім партызанам», якім, уласна кажучы, і пачалася паэзія ваеннага часу, страсна клікала народ на барацьбу з гітлераўскім фашызмам, да перамогі, усяляла мужнасць і веру.

Гэты перыяд у гісторыі шматнацыянальнай савецкай літаратуры невычарпальны па свайму вопыту і ўроках. Літаратура ўзяла на сябе адказную ролю: у перыяд неверагодна цяжкіх выпрабаванняў умацоўваць у людзях любоў да Радзімы, да нашых ідэйных і маральных каштоўнасцей, заваёў Кастрычніка. У сваім сцвярджальным пафасе паэзія ўзнялася на вялікую вышыню змястоўнасці, дзейснасці слова, а таксама ў сэнсе актыўнага штодзённага ўзаемадзеяння братніх літаратур усіх нашых народаў. Гэта было гарачае, жывое супрацоўніцтва на перадавых, у франтавых рэдакцыях, і на ўласна «творчым» узроўні. Усе жылі адным жыццём, аднымі думкамі і пачуццямі. Каласальны ўздым духу ўсяго савецкага народу даў літаратуру высокага грамадзянскага напалу і мастацкай сілы.

Паэзія актыўна працавала на нашу перамогу, на перамогу ідэй Кастрычніка, ідэй камунізма.

Вершы Я. Коласа, лірычная публіцыстыка П. Броўкі і П. Панчанкі, філасофская паэзія П. Глебкі, балады А. Куляшова, яго выдатная паэма «Сцяг брыгады», гераічны эпас М. Танка, сатыра К. Крапівы, вострадраматычная паэма З. Астапенкі «Эдэм», лірыка К. Кірэенкі, вершы А. Бялевіча, А. Астрэйкі — усё гэта і многае іншае працавала на нашу перамогу.

Сцяг брыгады, які, рызыкуючы жыццём, захоўваюць героі аднайменнай паэмы А. Куляшова,— гэта Кастрычніцкі сцяг. З ім звязаны заваёвы рэвалюцыі, нашы камуністычныя ідэалы, цэлы перыяд даваеннага свабоднага жыцця. Паэт раскрывае глыбокую веру народа ў перамогу над германскім фашызмам і гераізм савецкіх людзей. Паэму

высока ацаніў А. Т. Твардоўскі, які адзначыў вялікую істотнасць і гістарычную значнасць яе зместу ў спалучэнні з багаццем самастойных і арганічна нацыянальных сродкаў формы.

Ваенная паэзія — паэзія яркіх думак і пачуццяў. З незвычайнай сілай, усхвалявана і пранікнёна загаварылі нават тыя паэты, хто ні да, ні пасля вайны не ўзнімаўся на такую лірычную вышыню. Паэты ішлі цяжкімі дарогамі вайны, разам з народам, перажываючы яго гора і страты, горыч паражэнняў і радасць перамог. Паэзія ваенных год — гэта лірыка ваяўнічага гуманізму, высокіх парыванняў і асабістай адказнасці паэтаў за лёс сацыялізма, за лёс краіны: «Я кроў да апошняе кроплі пралью, каб толькі табе палягчэла» (П. Панчанка).

Пераход «на мірныя рэйкі» аказаўся не простым.

Рэспубліка з дапамогай усёй краіны цаўставала з руін і папялішчаў, залечвала раны, нанесеныя вайной, адбудоўвала гарады і сёлы, эканоміку і культуру. І паэты, імкнучыся аператыўна адгукнуцца на падзеі, адлюстраваць рэчаіснасць, не заўсёды адчувалі глыбінную, шматгранную сувязь часу і чалавека. Вельмі часта трацілася тая нітачка, якая звязвае справу чалавека з яго душэўным самаадчуваннем, слова з учынкам, думку з паводзінамі, мінулае з сучасным і будучым. Літаратура недастаткова арганічна спалучала веліч ідэалаў са шматдзённай жыццёвай практыкай.

Небяспека параднасці і афіцыёзнасці ў паэзіі была заўважана некаторымі крытыкамі і пісьменнікамі. Пра падобныя тэндэнцыі пісаў крытык А. Ганчарык у артыкуле «Пра некаторыя хібы нашай літаратуры («Літаратура і мастацтва», 1945, 20 мая), маючы на ўвазе «творы напышлівыя, узнёслыя, так званага «пафаснага» складу. Усё ў іх перабольшана і лепш за ўсё характарызуе азначэнне літаратурнай надзьмутасці. Змест іх вельмі нязначны, а то і зусім адсутнічае, адсутнасць яго прыкрываецца ўяўнай значнасцю і ўзнёсласцю».

Збядненне зместу і формы паэзіі негатыўна адбілася на магчымасцях мастацкага ўвасаблення кастрычніцкай тэмы. Яна загучала ў многіх выпадках суха і заспакоена.

Між тым у літаратуры зараджаліся новыя якасці...

Актыўнасцю і значным творчым ростам адзначана паэзія сярэдзіны і другой палавіны 50-х гадоў. У роздуме паэтаў над грамадскімі праблемамі абвастраецца маральнае ўспрыняцце рэчаіснасці ў святле ленінскіх ідэй, аналітычны падыход да жыцця, цікавасць да чалавечай асобы. Увага і давер да чалавека з'яўляюцца вынікам далейшага развіцця сацыялістычнага грамадства, пашырэння прынцыпаў савецкай дэмакратыі, асабліва характэрнага для нашага часу, калі клопат аб кожным канкрэтным чалавеку выступае на першы план.

Паэзія ўзбагачаецца новым жыццёвым і духоўным вопытам, павялічвае свае пазнаваўчыя магчымасці. Аб'ехаўшы вакол Еўропы, П. Панчанка напісаў паэму «Патрыятычная песня» (1956), у якой моцна прагучала тэма рэвалюцыі.

«Патрыятычная песня», некаторыя іншыя творы нашай літаратуры стаяць ля пачатку новага этапа яе далейшага развіцця.

Веліч, грандыёзнасць мэт рэвалюцыі, чысціня і святасць яе жадання сцвердзіць на зямлі справядлівасць, брацтва, сапраўдную чалавечнасць, яе рашучасць у барацьбе з няпраўдай, прыгнётам уласніцкага свету — усё гэта з новай сілай хвалюе мастакоў у 50-я, 60-я гады і сёння. Усё гэта валодае вялікай прыцягальнай сілай.

Літаратура ведае перыяды, калі з'яўлялася вострая неабходнасць звярнуцца да гісторыі, пагартаць яе старонкі, што выпраменьваюць непагаснае святло ленінскіх ідэй, духоўны вопыт перажытага. Сучасныя ідэйныя крытэрыі і маральныя «эталоны» гуманізму паэзія часта шукае і знаходзіць у традыцыях мінулага. Кастрычніцкая рэвалюцыя, гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, першыя гады Савецкай улады — да іх звяртаюцца маладыя паэты і паэты старэйшых пакаленняў. Ленін па-ранейшаму застаецца з намі, углядаючыся ў свет «адкрыта і далёка», самы просты і самы вялікі. І гэта адчуванне прыдае паэтам асаблівую ўнутраную ўпэўненасць і цвёрдасць духу.

Тэма Кастрычніка заўсёды заставалася надзвычай сучаснай. Цяпер гэта яе асаблівасць стала яшчэ больш відавочнай.

Мітынгі вялікай рэвалюцыі —
Боль адзін,
І стогн адзін,
І гнеў адзін.
Сходы для будзённай рэзалюцыі —
Шум адзін,
І сум адзін,
І сон адзін...

(П. Панчанка)

Векапомная пара дваццатых гадоў! Цікавасць да яе ніколі не прападзе ў беларускай паэзіі. Ленінскія дэкрэты, атрады ЧОНа, латышскія стралкі, рэўкомы, рэвалюцыйныя мітынгі, слаўныя бальшавіцкія камісары і чырвонагвардзейцы — паэты пішуць пра іх шмат і цікава. «З гадоў, калі неба крамсалі узнятыя гневам клінкі, прыходзяць да нас камісары — духоўныя нашы бацькі» (Г. Бураўкін). Духоўная сувязь сучаснасці з рэвалюцыйным мінулым жывіла і жывіць творчыя пошукі мастакоў слова.

Падзеі і вобразы тых незабыўных дзён паўстаюць у творах У. Дубоўкі, М. Хведаровіча, А. Звонака, С. Ліхадзіеўскага і іншых паэтаў. У «Паэме дарог» С. Грахоўскага малюецца тыповая для тых часоў карціна вясковага мітынгу, на якім выступае камісар Максім:

Мітынгавалі. Камісар на ганку
З бінтом на кучаравай галаве,
Накінуўшы пацёртую скуранку,
Паджары, у чырвоным галіфэ,
Рукою сек налева і направа
І ракатаў прастуджаным баском:
— Мы ўсім цяпер валодаць маем права! —
І грукаў аб парэнчы кулаком.
Чытаў адозвы, ўсім даваў парады
Вясёлы і бязлітасны Максім.
Царкоўны хор выконваў па загаду:
«Хто быў нічым, той стане ўсім».

У кожнага — свае ўспаміны, і застаюцца яны на ўсё жыццё...

Адной з самых прыкметных асаблівасцей сённяшняга перыяду ў паэзіі з'яўляецца пастаянны прыток у яе новых творчых сіл. Кожнае пакаленне надае свае фарбы і адценні Кастрычніцкай тэме. Яна з'яўляецца арганічнай пакаленню 50-60-х гадоў, дапамагае ім «рыхтаваць сэрцы да палёту» (Н. Гілевіч). Р. Барадулін падкрэслівае стваральны характар Кастрычніка:

Ты ў кожным сэрцы,
ты ў кожным доме Рабочы
і сейбіт рупны. І на крылатым
ракетадроме Ты сёння —
Галоўны Канструктар.

(«Паэма Кастрычніку»)

Вельмі своеасаблівa вырашаецца гэта тэма ў паэзіі Я. Сіпакова, чыім творам уласцівы народны погляд на вялікія сацыяльна-гістарычныя каштоўнасці, здабытыя працоўнымі ў рашучай класавай барацьбе. Яго лірычны герой — асоба маштабная, па-філасофску абагульненая, якая вядзе размову на шырокім грамадзянскім дыханні. Натуральна гучыць яго раскаваны верлібр:

Затое,
што хлеб, які я еў,—
быў маім хлебам,
што вяселле я справіў,
не выпрошваючы на гэта дазволу ў пана,
і што мяне, сына даяркі і ратая,

ніхто і нідзе не абразіў «мужыччом»,
не пакрыўдзіў
сваёю пагардліваю паблажлівасцю,—
За ўсё гэта
дзякуй табе, Кастрычніцкая Рэвалюцыя!

Ленін, Кастрычнік, Партыя — гэтыя вобразы, якія ў кожнага паэта асэнсоўваюцца індывідуальна, сведчылі і сведчаць пра палітычную і эстэтычную сталасць нашай паэзіі, шырыню яе творчых далягляда ў.

Беларуская паэзія — у руху, у дарозе, у няспынных пошуках. Калі гаварыць пра агульны напрамак яе мастацкіх пошукаў, то яны звязаны перш за ўсё з нашым сучаснікам, з імкненнем глыбей зразумець свет яго перажыванняў, актыўней выхоўваць культуру пачуццяў, уплываць на круг грамадзянскіх інтарэсаў. І ва ўсе перыяды сваёй гісторыі яна натхнялася ідэямі Кастрычніцкай рэвалюцыі. Тэма рэвалюцыі, як бачым, эвалюцыяніравала разам з самой паэзіяй, з нашым грамадствам, узбагачаючы свой гуманістычны пафас, усё больш настойліва падкрэсліваючы значэнне чалавечай індывідуальнасці, у якой сацыялізм мае пільную патрэбу.

Паэзія разам з усім грамадствам стаіць на варце сусветна-гістарычных заваёў Кастрычніцкай рэвалюцыі, яна, гаворачы словамі М. Танка, «не ведае белага сцяга ў каханні, жыцці, рэвалюцыі».

Важнейшая рыса сучаснага паэтычнага асэнсавання Кастрычніцкай тэмы — гуманізм, чалавечнасць. Гэта — асноўная адзнака сацыяльна-маральнага мыслення нашых паэтаў, адзнака іх грамадзянскасці. Яны прыходзяць да пераканання, што чалавечнасць ва ўсёй разнастайнасці свайго праяўлення — не як нешта пасіўна-сузіральнае, а як якасць наступальная, сцвярджальная — самая неабходная ўласцівасць усебакова развітай асобы, «бо без чалавечнасці не будзе вечнасці» (П. Панчанка). Сёння грамадзянскасць усё арганічней спалучаецца з гуманізмам. «Даўно ўвесь боль і клопат чалавечы пакую ў сэрца»,— гаворыць у адным з вершаў М. Лужанін. Падобную думку — выказаную кожны раз па-свойму, непаўторна,— можна сустрэць у творчасці многіх і многіх сучасных паэтаў.

Такая маральная пазіцыя, нашай паэзіі. Грамадзянскай, гуманістычнай спеласцю пазначаны лепшыя яе дасягненні, у тым ліку звязаныя з Кастрычніцкай тэмай.

Яшчэ не так даўно — гадоў дваццаць назад — беларуская паэзія здавалася асобным літаратарам сялянкай у сціплай хусцінцы. Гэта было няправільна і тады, дваццаць гадоў назад. Тым больш сёння, калі незвычайна пашырыліся яе пазнаваўча-эстэтычныя далягляды,

ускладнілася праблематыка, узмацнілася ўнутраная актыўнасць, заклапочанасць. Ідэі Кастрычніка натхняюць паэзію на аналіз духоўнага стану сучаснага сацыялістычнага грамадства. Яна шмат робіць, каб забяспечыць — ідэйна, маральна, эмацыянальна — наш поступ наперад, у будучыню.

Паэты зацікаўлена абмяркоўваюць праблему чалавека, яго маральных вартасцей, суадносін «дабра і зла» ў яго душы. Нашчадкам, відаць, цікава будзе заглыбіцца ў публіцыстычна напружаны роздум нашага сучасніка:

Хоць не парожняя дзяжа ў нас,
І добры хлеб наш не гарчыць,
І Ленін мудрую дзяржаўнасць
Нам даў, што трэба берагчы,
Ды часам думаеш да стомы:
Што нам нясе шалёны век?
А хто такія мы?
А што мы?
Якім ты станеш, чалавек?

Гэта — радкі П. Панчанкі. Матывы не менш абвостранага роздуму сустракаем у кнігах многіх іншых беларускіх паэтаў, хто ўмее мысліць глыбока і маштабна. Такі загад часу. Ён дыктуецца пашырэннем паэтычнага свету мастака, кроўнай далучанасцю да эпохі і яе праблем.

Так, паэтам да ўсяго ёсць справа. Як горача, па-грамадзянску зацікаўлена абмяркоўваюць яны вострыя праблемы сучаснасці. Напрыклад, пытанні экалогіі. «Сасна і бяроза» А. Куляшова, кнігі М. Танка, П. Панчанкі, К. Кірэенкі, П. Макаля, А. Вярцінскага... У іх раскрываецца еднасць чалавека і прыроды, неабходнасць абараняць яе зялёны свет, берагчы «праўду, і пушчы, і рэкі, і святыя сцягі» (П. Панчанка). Паэзія імкнецца быць складанай і разнастайнай, як само жыццё, па-сапраўднаму гуманістычнай, народнай і партыйнай па сваёй ідэйна-мастацкай сутнасці, напоўненай мудрым чалавечым дзеяннем і эстэтычным хваляваннем, прагай мастацкіх адкрыццяў, сцвярджальным пафасам — усім тым, што складае змест яе творчай актыўнасці, па якой можна меркаваць аб духоўнай насычанасці асобы.

Мастацкі свет сучаснай паэзіі надзвычай арыгінальны і шырокі, шматстайны па стылю.

Паэзія — разведчыца будучыні. Яна ўзброена Кастрычніцкімі ідэямі, ідэямі марксізма-леНінізма, якія дапамагаюць ёй пазнаваць жыццё і плённа здзяйсняць сваю выхаваўчую місію.

Калі ў 20-я, 30-я гады тэма Кастрычніка магла існаваць у больш ці менш, так сказаць, «чыстым» выглядзе, то цяпер яна спалучаецца з іншымі буйнымі тэмамі і праблемамі сучаснасці, становіцца ўсёабдымнай тэмай будаўніцтва новага грамадства, якое абавязкова ўключае і багацце духоўных каштоўнасцей, красу чалавечых пачуццяў і інтымных адносін. Савецкі народ стварае гэтае багацце. Сёння ідэі Кастрычніцкай рэвалюцыі гучаць з новай сілай. Тэма насычаецца новым зместам, звязаным з глабальнымі праблемамі нашага веку, з сацыяльнымі пытаннямі і імклівым навукова-тэхнічным прагрэсам. Яна набывае маштабны, інтэрнацыянальны рэзананс.

У 20-я гады ў нашай паэзіі моцна, хаця і адцягнена, гучалі касмічныя матывы. Сёння намаганні ў засваенні касмічнай прасторы — рэальнасць. Тэма космасу зноў, на новай аснове, паўнакроўна ўвайшла ў паэзію, знайшла адлюстраванне ў «Новай кнізе» А. Куляшова, «Паэме расстання» Г. Бураўкіна, паэме «Сын планеты» К. Камейшы і інш. Яна неадлучна ад тэмы рэвалюцыі. «А ты, Кастрычнік, руку трымаеш на пульсе шара зямнога» (Р. Барадулін). Яна сцвярджае рэвалюцыйнае адзінства сацыяльных шляхоў працоўных свету да светлай будучыні.

Узбуйнілася чалавечая асоба.

У маральным і інтэлектуальным свеце асобы адбіваюцца найвастрэйшыя калізіі XX стагоддзя. «Макрабачанне» аб'ядноўваецца з «мікрабачаннем». Пры гэтым эмпірычнае засваенне новых з'яў у літаратуры саступае месца імкненню ўлавіць, кіруючыся марксісцка-ленінскім светапоглядам, глыбінныя прычыны і сувязі сучасных канфліктаў, іх складанасць.

Напружаным лірычным роздумам над карэннымі праблемамі эпохі напоўнена творчасць М. Танка, П. Броўкі, М. Лужаніна, П. Панчанкі, К. Кірэенкі, А. Пысіна, Р. Барадулін, П. Макаля і многіх іншых. Сёння якраз узрос аўтарытэт асабовай мастацкай манеры, больш дыферэнцыраванай (не ў дэкларацыях, а па сутнасці) стала стылістыка. Уся шматнацыянальная савецкая літаратура ўзбагацілася яркімі творчымі індывідуальнасцямі, якія якраз і ўтвараюць яе жывую разнастайнасць. Пра гэта цікава сказаў П. Броўка: «Я ўспамінаю, на жаль, ужо далёкія гады маёй маладосці, тыя самыя 20-я гады, якія былі часам буйнога кіпення літаратурных сіл, што тады нараджаліся, часам вялікай мастацкай разнастайнасці. Праўда, разнастайнасць гэту не трэба і перабольшваць. Яна непараўнальна з сённяшнім; у 20-я гады моцна давала сябе адчуваць нівеліроўка пад агульны стыль, «паэтычны універсалізм» (паводле трапнага выразу аднаго нашага беларускага крытыка)».

Мастацкая разнастайнасць сучаснай нашай паэзіі не толькі ў багацці цікавейшых творчых індывідуальнасцей. Яна і ў мностве родаў і відаў лірычнай, ліра-эпічнай паэзіі. Даўнія, з векавой гісторыяй жанры пераўвасабляюцца, набываюць новыя рысы, і гэта сведчыць пра сілу і вялікія магчымасці нашай паэзіі.

Крытыка адзначае паглыбленне філасофскага пачатку ў лірыцы, рост магчымасцей творчага пазнання рэчаіснасці сіламі пачуццяў і розуму, здольнасць да высокай кандэнсацыі жыцця і шырокіх мастацкіх абагульненняў.

Тэндэнцыя ўзняцца над фактам была характэрна А. Куляшову. Яго паэзія значна ўзбагаціла сваю эстэтыку. Павялічылася полівалентнасць вобразу, заўважны працэс ускладнення лірычнага пачуцця, узмацняецца прытчавая роля ўмоўнасці, драматычная экспрэсія думкі і адначасова яе рацыяналізм.

Герой А. Куляшова раскрываецца ў складаных абставінах XX стагоддзя, «атамнага веку», які патрабуе ад яго максімальнага напружання духоўных сіл, сталасці ідэйнага светапогляду. А. Куляшоў праславіўся як аўтар выдатных паэм «Далёка да акіяна» (1971), «Варшаўскі шлях» (1973), «Хамуціус» (1975). Усе яны — сучасныя.

Паэзія таксама адказвае за дзяржаву, за мір, за жыццё, за мноства рэчаў — і гэта адзін з найважнейшых аспектаў тэмы Кастрычніцкай рэвалюцыі, яе шырокага сацыяльнага гучання. Паглыбляецца інтэрнацыянальнае светаадчуванне паэзіі. Яе герой — не толькі беларус, ён часцей выступае як сучасны савецкі чалавек. Менавіта так бачыць свайго героя К. Кірэенка:

Я — камуніст, я друг усім народам,
Я сею хлеб, кладу ў жыццё масты.
Я стаў у строй — іду за мір паходам,
І ты, мой вораг, мне не страшан ты.
(«Сіла праўды маёй»)

Саўдзел і дынамізацыя перажывання — важнейшы прынцып нашай паэзіі, моцнай сваім інтэрнацыянальным пафасам.

У сучасных вершах беларускіх паэтаў (П. Броўка, А. Куляшоў, М. Лужанін, Я. Сіпакоў, У. Караткевіч, А. Грачанікаў, Р. Барадулін) моцна гучыць голас гісторыі. Паэзія напаўняецца шматпланавым гістарызмам. «Трэба ведаць — сэрца просіць, як дзядам, бацькам жылося»,— слушна гаворыць П. Броўка.

«Дванаццацігадовым сустрэў я Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю,— успамінае ён.— Усім сэрцам адразу адчуў сапраўдную свабоду». Прыезд камісара, стварэнне камсамольскай ячэйкі на вёсцы, дзейнасць «Сіняй блузы», першы трактар на полі — усё гэта незвы-

чайна блізка сэрцу паэта, які быў непасрэдным удзельнікам рэвалюцыйных пераўтварэнняў, іх песняром.

Эстэтычная рэальнасць нашай паэзіі — рэальнасць гістарычная.

Апора на мінулае і погляд у будучыню надаюць паэтычнаму вобразу аб'ёмнасць і пераканаўчасць. Гэта якасць характэрна паэме М. Лужаніна «Як нараджаўся Новы свет».

Паслухайце, прайдзіце следам
За мною. Вы павінны ведаць,
Што я пабачыў на вяку,
Каму я пацiскаў руку,
Каго я ворагам лічыў,
Якія кнігі я вучыў,
Як гінуў каля пераправ,
Як ажываў я і ўзлятаў,
Дзень гадаваў, узносіў гмах —
І прастарнеў Радзімы шлях.

М. Лужанін дае шырокую панараму паслякастрычніцкай гісторыі савецкага грамадства, велічных здзяйсненняў нашага чалавека, паказвае яго стваральную ролю.

Веданне мінулага, таго, як і чым людзі жылі, скажам, у 20-я ці 30-я гады, будзе няпоўным і недакладным без «Босых на вогнішчы» М. Чарота, «Безназоўнага» Я. Купалы, паэзіі «Маладняка», кніг Я. Коласа і К. Чорнага, у якіх з большай або з меншай мастацкай сілай увасоблены ідэі Леніна, ідэі Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як сказаў паэт, «я Рэвалюцыяй з маленства жыў, я дыхаў ёю...» (А. Русецкі). Гэтак можна сказаць пра ўсю беларускую савецкую паэзію. Кастрычніцкія ідэі заўсёды заставаліся, былі і будуць ідэямі новымі, сучаснымі.

Кастрычнік 1917-га для беларускіх паэтаў быў і застанецца сімвалам справядлівасці, сцягам і маяком для ўсяго чалавецтва. Магчымасці мастацкага ўвасаблення Кастрычніцкай тэмы бясконцыя. Паэзія тым больш паспяхова будзе выконваць сваю выхаваўчую місію, чым больш па-мастацку паўнакроўна і таленавіта будзе апладняць ідэі Вялікага Кастрычніка жывым, сучасным вопытам савецкіх людзей.

1977 г.

## Пісьменнік і навізна жыцця

Калі думаеш пра ўсё большую папулярнасць беларускай літаратуры за межамі рэспублікі — у Савецкай краіне і ва ўсім свеце,— прыходзіш да вываду: яна заслугоўвае павагу таму, што імкнецца ў глыбіню народнага жыцця, хоча праўдзіва паказаць чалавека ў шматмернасці яго ўзаемасувязей з грамадствам, людзьмі і светам, з гісторыяй і будучыняй.

Нам ёсць што паказаць і ёсць пра што расказаць свету. Беларусь стала індустрыяльнай рэспублікай у сучасным сэнсе гэтага слова, з высокаразвітая шматгаліновай народнай гаспадаркай і багатай нацыянальнай культурай. Не толькі беларуская бульба, лён ды грыбы, але і беларускі калій, нафта, трактары, поліэтылен, электроніка і г. д. вядомы цяпер далёка. Голас рэспублікі ў абарону міру і сацыяльнага прагрэсу чуцён з трыбуны Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Вырасла, узбуйнілася асоба сённяшняга беларуса. Пашырэнне і паглыбленне сацыялістычнай дэмакратыі садзейнічаюць праяўленню яго грамадзянскай актыўнасці як творцы і будаўніка новых вытворчых сіл і сацыяльна-грамадскіх адносін.

Сучасная мастацкая думка, кроўна далучаная да сацыяльнай, духоўнай праблематыкі века, імкнецца паўней раскрыць чалавечы змест нашага руху наперад, больш і глыбей даследаваць свет асобы. Беларуская проза — гэта цэлы свет герояў, ідэй, гэта жывы, дынамічны працэс, звязаны з надзённымі праблемамі жыцця. Сэнс чалавечага існавання, жыццё і смерць, каханне, адносіны да працы, да зямлі, да прыроды, мінулае і будучыня — сацыяльная і маральная насычанасць гэтай праблематыкі надае вагомасці і значнасці героям нашай літаратуры, іх роздуму і ўчынкам.

У галіне нашай прозы інтэнсіўна працуюць пісьменнікі ўсіх пакаленняў. Толькі ў апошнія некалькі год надрукавана шмат цікавых твораў, якія маглі б упрыгожыць любую сучасную літаратуру. Раман заўчасна пайшоўшага ад нас Івана Мележа «Завеі, снежань», аповесці Васіля Быкава «Дажыць да світання», «Абеліск», «Воўчая зграя», «Яго батальён», новыя рэчы Івана Шамякіна «Шлюбная ноч», «Гандлярка і паэт», раман Івана Навуменкі «Сорак трэці», які завяршыў яго трылогію, «Хатынская аповесць» Алеся Адамовіча, яго ж дакументальная «Блакадная кніга», напісаная сумесна з Д. Граніным, раманы Івана Чыгрынава «Апраўданне крыві» і «Мора Герадота» П. Місько, творы Янкі Брыля, Івана Пташнікава, Віктара Карамазава, раман В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына», аповесць В. Казько «Суд у Слабадзе», творы Анатоля Кудраўца, Алеся Жука і інш.

Асобна хочацца назваць дакументальную кнігу «Я — з вогненнай вёскі...» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка, якую крытыка назвала «унікальнай і беспрэцэндэнтнай ва ўсёй савецкай літаратуры». З яе старонак загаварыў сам народ...

Большасць з пералічаных твораў, як бачым,— аповесці. Трэба сказаць, што перш за ўсё менавіта гэты жанр знаходзіўся ў беларускай літаратуры на лініі пошукаў, эксперыменту, вёў за сабой астатнія, у тым ліку апавяданне, а таксама раман.

Што — з эстэтычнага боку — найбольш характэрна для сучаснай нашай аповесці? На маю думку, перш за ўсё згушчэнне маральнай атмасферы, вастрыня сітуацыі, у пэўным сэнсе выключнасць абставін, унутраны дынамізм, неабходнасць для героя шукаць новыя падыходы, прымаць уласнае рашэнне, рабіць выбар. Гэта, можна сказаць, асаблівасць эстэтычнай структуры нашай прозы.

Высокі ўзровень тэхнічнай аснашчанасці прадпрыемстваў, механізацыі на вёсцы, прымяненне электронікі і апошніх дасягненняў навукі ва ўсіх галінах эканомікі, спецыялізацыя гаспадарак, новыя формы і метады планавання і эканамічнага стымулявання — усё гэта прыкметы сённяшняга дня нашай рэспублікі, якія праз змены ў псіхалогіі, у душэўным свеце людзей аказваюць значны ўплыў на літаратуру, на мастацкае мысленне пісьменнікаў.

Сучаснасць — гэтая душа мастацтва — азначае, як бы шырока яе ні бралі, глыбокае пранікненне ў праблематыку сённяшняга дня ў яго арганічнай сувязі з мінулым і будучым.

Прыклад гэтаму — раман Івана Шамякіна «Атланты і карыятыды», у якім распрацоўваюцца праблема «чалавек і яго справа», узаемаадносіны кіраўніка з людзьмі. Праз вобраз архітэктара Максіма Карнача аўтар сцвярджае чалавечнасць дзелавога кіраўніка, пачуццё адказнасці перад заўтрашнім днём, талент прыносіць людзям дабро, любіць іх дзейснай любоўю. Карнач супрацьпастаўлены такім людзям, як Ігнатовіч, Макаед. Канфлікт паміж імі — гэта канфлікт паміж сацыялістычным светапоглядам і мяшчанскімі, дробнабуржуазнымі поглядамі — уласніцтвам, двудушшам, бюракратызмам і г. д. Пісьменнік вядзе настойлівую «разведку боем», імкнецца паказаць — у быце, у адносінах паміж людзьмі, у чалавечых лёсах — тое новае, перспектыўнае, гарманічнае, што складае маральны патэнцыял асобы сучасніка.

Аўтар ставіць сабе на мэту разабрацца ў складанасцях жыцця, сказаць новае слова аб НТР, выявіць тыповыя канфлікты, дадаць нешта новае ў асэнсаванне рэчаіснасці. Талент мастака ў Шамякіна спалучаецца з назіральнасцю сацыёлага і псіхолага. Ён разумее, што

рэалізм — гэта перш за ўсё мастацкае адкрыццё тыпаў эпохі, адлюстраванне яе тыповых з'яў, тых сувязей, што злучаюць чалавека з грамадствам. Ён умее зазірнуць у душу нашага сучасніка, убачыць яго духоўнае карэнне і сувязі.

Архітэктар Максім Карнач — з ярка выяўленым творчым пачаткам. Праўда, яго характар у нечым і супярэчлівы. Рэдка, але здараецца, што грамадзянская паслядоўнасць яго ўчынкаў падмяняецца «прабіўной сілай» асабістай абаяльнасці. Не ўсё можна ўхваліць у яго інтымных адносінах.

Раман актыўна абмяркоўваўся літаратурнымі часопісамі. У яго адрас выказваліся і папрокі. З некаторымі з іх можна часткова згадзіцца. Крытыка прыкмеціла, што ў распрацоўцы вобразаў пісьменнік не заўсёды строга патрабавальны да самога сябе як мастака. Можна спрачацца і аб тым, наколькі патрэбная ў рамане лінія Карнач — жонка Макаеда, недастаткова псіхалагічна распрацаваны вобраз Ігнатовіча. У рамане ёсць недахопы, нават істотныя. Звязаны яны, відаць, з неабжытасцю самой тэмы, з гарачым матэрыялам сучаснасці.

Па гарачых слядах сучаснасці працуе Л. Гаўрылкін, здольны заўважыць новыя сацыяльныя тэндэнцыі, што ўзнікаюць у жыцці. Кніга Л. Гаўрылкін «Не магу без цябе» паводле сюжэта традыцыйны «вытворчы раман», у якім расказваецца пра гісторыю пошукаў нафты ў Беларусі — на Мазыршчыне. Скептыкі спрабавалі даказаць, што ў Беларусі нафты няма. Канфлікт у рамане разгортваецца з таго моманту, калі на месца галоўнага геолага Ступіча прыязджае вопытны інжынер Круглоў, здольны весці разведку ў складаных геалагічных умовах. Ён абапіраецца на вопытных і добрасумленных працаўнікоў. Усе разам яны бяруць на сябе смеласць і адказнасць свідраваць на суседніх структурах і робяць гэта насуперак некаторым агульнапрынятым тэарэтычным устаноўкам, якіх прытрымліваліся іншыя геолагі. Нястомная праца, добрасумленнасць, настойлівасць прывялі да таго, што нафта была знойдзена. Сюжэт рамана грунтуецца на вядомых фактах, рэальнай гісторыі адкрыцця беларускай нафты. Бяда, аднак, у тым, што аўтар у многіх выпадках не здолеў узняцца над падзеямі, пераадолець ілюстрацыйнасць, асэнсаваць жыццё ў яго глыбінных зрухах, якія часта тояцца пад знешнімі, «відавочнымі» падзеямі.

Людзі паказаны ўсё ж такі больш як спецыялісты, працаўнікі, аўтар не надта заглыбляецца ў складанасць іх характараў, чалавечых лёсаў, глыбіні ўнутранага жыцця, што раманісту недаравальна. Гэта не магло не адбіцца на мастацкай форме: вобразны лад прозы тамсям падмяняецца нарысавасцю, псіхалагічны аналіз саступае месца пераказу падзей, эмацыянальнасць — вялай інфармацыйнасці.

Час наш — дзелавы. Правільна. Чалавек здзяйсняе сябе ў працы з найбольшай паўнатой. Але памятаючы пра гэта, не хацелася б, разам з тым, каб сувязь маральнага аблічча чалавека і яго занятасці разумелася спрошчана, аднабакова, так, быццам чалавек існуе толькі для працы, для вытворчасці. Ва ўмовах нашага грамадства дзейнічае іншы прынцып: праца і вытворчасць для чалавека! У працы савецкі чалавек ярка сцвярджае сваю асобу, жыве ўсёй паўнатой сваёй істоты, творыць. Праца, справа — у шырокім значэнні паняццяў — важнейшая сфера праяўлення характару. Асабліва сёння, калі чалавечая асоба ўскладняецца, дынамізуецца.

Цікавая з'ява — якраз у гэтым сэнсе — творчасць Віктара Карамазава. У лірызме, любві да роднага краю і яго працавітых людзей, у сацыяльна-маральнай насычанасці, душэўнай тактоўнасці заключаюцца галоўныя вартасці яго аповесцей і апавяданняў. Яго героі тонка адчуваюць прыроду, разумеюць і паважаюць яе.

Аповесць пісьменніка «Спіраль» расказвае пра жыццё і нялёгкую працу выпрабавальнікаў магутных самазвалаў, што ствараюцца беларускімі аўтамабілебудаўнікамі, і ўяўляе сабой, па сутнасці, разгорнуты дзённік вадзіцеля, які выпрабоўвае новы тып машын на Крыварожскім жалезарудным кар'еры. Складаны характар Пракопчыка раскрываецца ў дзеянні і ў роздуме, у адносінах з калегамі. Аўтар шчодра выкарыстоўвае няўласна-простую мову, унутраныя маналогі свайго героя, падкрэслівае гераічнасць небяспечнай працы механікаў, іх мужнасць. Тут ёсць той «маральны цэмент, які змацоўвае падзеі», як сказаў адзін крытык.

Даводзіцца, аднак, пашкадаваць, што аповесць не так смела, як хацелася б, выходзіць за межы праблемы «чалавек і яго справа».

Сучасны матэрыял патрабуе ад мастака таленту аналітыка, думка якога развіваецца ў бок даследавання грамадскіх працэсаў, сацыяльнага аналізу ўзаемаадносін чалавека і абставін. Сёння гэта плённая лінія пісьменніцкіх пошукаў. Ад аналізу неад'емны сінтэз, які таксама — у розных формах назіраецца ў рабоце многіх мастакоў слова, даючы адчуванне паўнаты і разнастайнасці жыцця. Апошнім часам ён значна ўзмацніўся, што звязана, на нашу думку, з паглыбленнем гістарызму нашай літаратуры, якая імкнецца сінтэзаваць увесь вопыт пражытага і перажытага савецкім народам.

Сучасную беларускую літаратуру не без падстаў завуць «успамінальнай». Паглыбленне гістарызму — адзін з вынікаў развіцця нашай літаратуры за апошнія гады. Яна бліжэй стала да гісторыі, якая, як вядома, прывучае чалавека ўсведамляць сябе і грамадства ў сувязях з мінулым і будучым. «Вастрэйшым стала адчуванне хады гісторыі са-

мой»,— вельмі дакладна зазначыў Я. Смелякоў. Грамадству, якое дасягнула высокай ступені духоўнай сталасці, натуральна звяртацца да мінулага, да тых жыватворных вытокаў, што абумовілі яго развіццё. Ветры часу пранізваюць індывідуальны чалавечы лёс, гісторыя адлюстроўваецца ў «мікрасвеце» асобы, на яе ўнутраным жыцці.

Апошнім часам выразна абрысавалася ў эстэтычных адносінах такая з'ява, як проза П. Броўкі. Яго апавяданні і аповесці «Донька — Даніэль», «Вечная пляма» — з выражанай у іх незамглёнасцю народнага светаўспрыняцця, багаццем і мудрасцю вопыту істотна ўзбагачаюць ідэйна-стылёвую панараму нашай сучаснай прозы. Вобраз Донькі — Даніэля з аднайменнай аповесці — гэтага вясковага фантазёра, дзівака, своеасаблівага сацыяліста-ўтапіста — цікавая з'ява ў нашай літаратуры. Пачуццё гісторыі — кім мы былі і кім сталі — моцна выражана ў творчасці П. Броўкі, у яго прозе.

Узмацненне гістарызму выразна бачна у творчасці І. Мележа, у яго раманах «Палескай хронікі», дзе праўда гісторыі і праўда характараў выступаюць ключавым прынцыпам рэалізму. Пісьменнік яшчэ раз пераканаўча даводзіць, што сённяшнія нашы здабыткі і дасягненні можна ацаніць і асабліва выразна ўбачыць на фоне гісторыі, на фоне таго, што зроблена яе вядомымі і невядомымі творцамі, духоўныя постаці якіх суадносяцца з ходам гісторыі, з сучаснасцю.

У гэтым сэнсе гістарычнае — частка свядомасці сучасніка. Пра гэта добра сказаў Ю. Бондараў: «Мінулае таксама матэрыяльна, як і сучаснасць. Інакш знікла б сама гісторыя. Яна стала б падобнай на сны мінулых часоў. Без мінулага чалавек адчувае сябе істотай з адсечанай свядомасцю» («Литература и современность». Зборнік 14. М., 1976, стар. 194).

Адзін з момантаў узмацнення гістарызму ў беларускай літаратуры і свядомасці сучасніка — вяртанне ў сённяшні дзень, у духоўны ўжытак напаўзабытых імёнаў пісьменнікаў. Па-сучаснаму прагучала многае са спадчыны М. Гарэцкага, пісьменніка — паплечніка Купалы, Коласа, Багдановіча.

Надзвычай своеасабліва праяўляецца гістарызм у творчасці Янкі Брыля, які ўмее спалучаць сучаснасць з гісторыяй і наадварот. Значны твор беларускай прозы апошняга часу — яго аповесць «Ніжнія Байданы», наскрозь прасякнутая народнасцю, стыхіяй гумару і дасціпнасці, дзе вясёлае чаргуецца з сумным, а жарт мяжуе з трагічнымі момантамі народнага жыцця.

Многае з папярэдняй творчасці было подступам да «Ніжніх Байдуноў».

«Ніжнія Байдуны» складаюцца з ланцуга навел, матэрыял для якіх аўтар узяў «з краіны дзяцінства». Перад намі праходзіць цэлая галерэя каларытных характараў, цікавых партрэтаў, напісаных таленавітым мастаком, прататыпамі для якіх паслужылі аднавяскоўцы і землякі пісьменніка, людзі, сярод якіх рос, якіх ён добра ведаў, любіў. Аўтар імкнецца праз сваіх герояў перадаць рух народнай гісторыі, падысці да жыцця з пазіцый шырокага гістарызму. Пры ўсёй навелістычнасці сваёй формы гэта своеасаблівая паэма ў прозе, маштабная ліра-эпічная панарама цэлай эпохі, з неабходнай шырынёй сацыяльнага, гістарычнага абагульнення, напружанасцю і ўсхваляванасцю пачуцця. Пачуццё гістарызму нясе ў сабе якасці эпічнасці, мемуарнасці.

Матэрыял заходнебеларускага жыцця-быцця ў першыя часы пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы паслужыў асновай для вельмі змястоўнага рамана В. Каваленкі «Падвышанае неба». Аўтар паставіў на мэту прааналізаваць сацыяльную глыбіню самых розных праблем, якія паўсталі перад людзьмі. Пра Заходнюю Беларусь пісалі многія — Пестрак, Калеснік, Бажко, Машара... Каваленка знайшоў свой падыход. Яго адзнакі — аналітызм і філасафічнасць, дзеля якіх аўтар часам ахвяруе жывапіснасцю і некаторымі іншымі элементамі «традыцыйнай» мастацкасці. У яго моцная тэндэнцыя да мадэліравання рэчаіснасці з мэтай глыбейшага пранікнення ў пласты народнага жыцця, тыя яго працэсы, якія часам схаваны ад нашых вачэй і ў якіх дзіўным чынам спалучаецца простае і складанае, выпадковае і заканамернае, радаснае і сумнае. «Вечная» праблема дабра і зла зразумета аўтарам канкрэтна-гістарычна. Таму ў рамане праблемы, аддаленыя ад нас значным гістарычным прамежкам, гучаць надзённа, па-сучаснаму. Гэта — раман-роздум, раман-спрэчка. Спрэчка, скажам, Марціна Ракавецкага з Пронькам Піліпчыкам. Савецкая ўлада дала ім шырокія магчымасці для сацыяльнай актыўнасці. У Марціна ўменне адчуваць, ацэньваць людзей, час. Ён даверлівы, нават праз меру, і вельмі чалавечны. Яго антыпод — Пронька. Ён усіх падазрае, нецярпімы да чужой думкі, упэўнены ў абсалютнай непагрэшнасці сваіх учынкаў. На гэтым канфлікце будуецца значная частка праблематыкі рамана.

На заходнебеларускім матэрыяле пабудаваў свой раман «Чужая Бацькаўшчына» Вячаслаў Адамчык. На нашу думку, гэта значная ўдача аўтара не толькі ў плане мастацкім, але і ў сэнсе цікавай пастаноўкі некаторых пытанняў фармавання грамадзянскай свядомасці маладога чалавека ва ўмовах давераснёўскай Заходняй Беларусі.

Міця Корсак востра адчувае чужы боль, ён надзелены чулай, уражлівай душой, нераўнадушны да несправядлівасці. Твор успрымаецца як таленавіты пачатак буйнога эпічнага палатна пра лёс чалавека і лёс народа ва ўмовах складаных гістарычных акалічнасцей, на пераломе гісторыі.

Супраць! чаго хацелася б перасцерагчы таленавітага мастака — гэта супраць празмернага акцэнту на біялагічным у чалавеку — у процівагу сацыяльнаму. Усё ж такі вызначальным з'яўляецца апошняе.

Крокі гісторыі... Яны сёння гучнейшыя, чым калі. Сувязь часоў, рэвалюцыйная пераемнасць традыцый, пакаленняў прысутнічаюць у літаратуры.

Чым далей у глыбіню гісторыі аддаляецца час найбольшых выпрабаванняў народа — Вялікая Айчынная вайна, тым ярчэй і выразней паўстае перад усім светам веліч і маштабы нашай сусветна-гістарычнай Перамогі над фашызмам. З тэмай вайны звязаны найбольш маштабныя дасягненні беларускай прозы ў адлюстраванні гераічнага мінулага нашага народа.

Васіль Быкаў прынёс у літаратуру сваё асаблівае, абвостранае ўспрыняцце ваеннага вопыту, уразіў чытачоў суровай праўдзівасцю, дакладнасцю франтавога побыту.

Сцвярджэнне асабовага ў чалавеку, яго веры ў свае магчымасці, імкнення распараджацца сабой, стаць вышэй цяжкасцей — гэта характэрна герою сучаснай літаратуры. Яно праявілася ў творах Быкава «Абеліск», «Яго батальён» і многіх іншых. Пісьменнік здолеў адкрыць новы характар чалавека з выключна сканцэнтраваным пачуццём маральнай чысціні, бескампраміснасці. Ён паставіў яго ва ўмовы вайны, умовы, якія маюць у абставінах вайны свае пагранічныя сітуацыі. Гэты характар свеціцца надзвычайнай унутранай чалавечай прыгажосцю. Ён раскрываецца і самой назвай аповесці — «Яго батальён». Пісьменніку вельмі ўласціва пачуццё чалавечай каштоўнасці і непаўторнасці. «Яго батальён» завяршаецца архіўнай даведкай аб гераічнай гібелі камбата Валошына. Аўтар напамінае гэтым, што нам дарагі, незабыўны кожны з тых дваццаці мільёнаў, якіх паглынула вайна.

В. Быкаў быццам бы па сённяшні дзень застаецца там, у акопах, і кожнай сваёй аповесцю прымае новы бой. У яго кнігах заўсёды прысутнічае напружаны маральны аспект: не кожны на вайне, трапіўшы ў яе бязлітасныя жорны, змог бы захаваць у сабе душэўныя сілы і страсную стойкасць чалавека. Гэты матыў атрымлівае развіццё ў аповесці «Яго батальён».

Кажуць, што аповесць «Яго батальён» успрымаецца так, што нагадвае «Праклятую вышыню». Некаторыя папракаюць Быкава за тое, што ён быццам бы паўтарае жыццёвыя сітуацыі, асобныя вобразы ў сваіх творах, што ў іх ёсць пэўная філасофская зададзенасць. Такія заўвагі вымагаюць асцярожнасці. Сусветная літаратура ведае нямала пісьменнікаў, у творчасці якіх паўтараліся — кожны раз на новым «вітку» — пэўныя тыпы, героі, сітуацыі і матывы. Крытык А. Аўчарэнка прывёў наконт гэтага аўтарытэтную думку Л. Лявонава, які сказаў: «Кожны вялікі мастак сам па сабе з'яўляецца носьбітам асабістай, часам добра схаванай праблемы, складаны душэўны вузел якой ён развязвае на працягу ўсяго творчага шляху. Нездарма гавораць, што існуе праблема Гогаля, праблема Талстога, праблема Горкага».

Кнігі В. Быкава высока цэняцца чытачамі і яго калегамі па пяру. «Аповесцям Васіля Быкава,— пісаў вядомы рускі раманіст Ю. Бондараў,— уласцівы і нацягнены нерв развіцця падзей, і жорсткая дынамічнасць; проза гэта нагадвае моцна сціснутую стальную спружыну — імкліва разгортваючыся, яна нясе такі зарад невычэрпнай энергіі, што, здаецца, разам з героямі вы пражылі цэлае жыццё, забыўшы пра кароткі час знаёмства з імі». У творчасці Быкава пульсуе выпакутаваная думка аб нашым часе. Яго героі жывуць напружаным духоўным жыццём.

Поспех рамана «Сорак трэці» І. Навуменкі, у прыватнасці, старонак, звязаных з вобразам Лубана, абумоўлены тым, што пісьменнік ішоў па шляху згушчэння маральнай атмасферы рамана, выпрабавання сваіх персанажаў у розных умовах, каб шматгранней, рэльефней вымалёўваць іх характары. Гэтаму садзейнічаюць і смеласць паваротаў у лёсах герояў, і імкненне вывернуць і паказаць іх інтэлектуальныя, псіхалагічныя, маральныя глыбіні. Міця Птах са сваімі таварышамі-падпольшчыкамі паказаны ва ўсёй сваёй духоўнай цэласнасці, высакароднасці. І гэта дапамагае ім на цяжкіх, віхурных дарогах вайны.

«Сорак трэці» насычаны панарамнасцю, батальнымі сцэнамі, напісанымі рукою пісьменніка, які сам непасрэдна ўдзельнічаў у партызанскай барацьбе. Яго твору ўласціва рэалістычная ёмістасць характараў і эстэтычная доказнасць. Гэта — майстэрскае завяршэнне ўсёй трылогіі.

П. М. Машэраў на XXVIII з'ездзе КП Беларусі гаварыў, што «неўміручы подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне быў і застаецца для ўсіх творчых работнікаў своеасаблівай пробай, і пробай вышэйшага класа, на ідэйную сталасць, на ўзровень мастацкага

майстэрства і дакладнасць грамадзянскіх пазіцый». Такую пробу на «выдатна» вытрымалі раманы І. Чыгрынава «Плач перапёлкі» і «Апраўданне крыві», якія, мне здаецца, падвялі, так бы сказаць, вынікі развіцця ваеннай прозы пэўнага перыяду, эстэтычна абагульнілі іх. У цэнтры твораў лёс чалавека і лёс народа. Асаблівую сімпатыю выклікае Зазыба — чалавек разважлівы, удумлівы, нават, я сказаў бы, дзелавы і пры гэтым вельмі чэсны. Раманы, адзін і другі, заканчваюцца першымі днямі вайны, аднак аўтар намаляваў ясную карціну класавага супрацьстаяння сіл у гэты перыяд. «Першапачатак народнага подзвігу» — так назваў крытык У. Юрэвіч свой артыкул аб рамане «Плач перапёлкі». Гэтак жа можна сказаць і пра «Апраўданне крыві».

Значная ўдача А. Адамовіча — «Хатынская аповесць». Гэта — аповесць-маналог нашага сучасніка, удзельніка партызанскай барацьбы, перажыўшага жахі вайны, яго роздум пра чалавека, аналіз яго псіхалогіі ў цеснай сувязі з рознымі, часам надзвычай жорсткімі абставінамі. Пісьменнік задумваецца над самім феноменам сучаснага чалавека, над яго маральнай прыродай. У яго паглядзе на мінулае абавязкова прысутнічае сучасны аспект. Велізарны эмацыянальны, гераічны і трагічны вопыт народа спалучаецца ў Адамовіча з вопытам «атамнай эры».

«Хатынская аповесць» належыць да тых твораў, якія адкрываюць новыя напрамкі асэнсавання велічы народнага подзвігу.

Шмат і вельмі плённа працуе ў галіне прозы І. Пташнікаў. Аповесць «Найдорф» вельмі арганічная для яго. Жаваранка і Алёша — своеасаблівыя нацыянальныя характары, выпісаныя мастаком з вялікай любоўю і болем. Любоў і боль — маральная аснова яго таленту, які эстэтычна рэалізуецца ў выключнай разнастайнасці мастацкіх фарбаў, у тонкім аналізе перажыванняў герояў. Гэта відаць было і па папярэдніх творах, у тым ліку і рамане «Мсціжы». Стылёвыя кантрасты, рытміка, якая збліжае празаічную мову з вершаванай, метафарычная насычанасць, дынамічная змена эпізодаў і сцэн — гэта вельмі характэрна творчай манеры Пташнікава.

Да ваеннай тэмы вярнуўся І. Шамякін. «Шлюбная ноч», «Гандлярка і паэт» — аповесці, надрукаваныя пасля «Атлантаў і карыятыдаў».

Літаратура, як вядома, не мае права абмяжоўвацца паўтарэннем сваіх ранейшых дасягненняў. Яна павінна — як мастацтва сапраўды наватарскае, передавое — шукаць новыя пазнавальна-эстэтычныя падыходы да традыцыйных тэм, новы матэрыял, свежы, абумоўлены сучаснасцю пункт погляду, выходзіць на больш маштабныя рубяжы мастацка-філасофскіх абагульненняў.

Аповесці І. Шамякіна, пра якія ідзе размова, сучасныя ў такім сэнсе.

Крытыка, між іншым, справядліва заўважыла, што менавіта аповесць сёння з'яўляецца тым — у значнай меры лабараторным — жанрам, які знаходзіцца на самай передавой лініі пошукаў, эксперыменту і такім чынам дапамагае пракладваць шляхі больш буйной форме — раману, эпасу і г. д.

Эксперыментальна-пошукавы момант у значнай меры ўласцівы і названым аповесцям І. Шамякіна. Вопытны раманіст, сталы празаік, ён, зразумела, не можа задаволіцца дасягнутым, настойліва цярэбіць новыя (звязаныя нават з мастакоўскай рызыкай) шляхі да асэнсавання ваенна-гераічных пластоў нашай савецкай гісторыі. І гэта, відаць, той выпадак, калі эксперымент цалкам апраўданы, бо падпарадкаваны выяўленню высакароднага, гераічнага пачатку ў чалавеку.

У чым пэўная навізна творчых пошукаў пісьменніка?

Перш за ўсё, як мне думаецца, у яго звароце да, здавалася б, ардынарнага, у многім нават адмоўнага чалавечага тыпу, які зусім нечакана аказваецца здольным на геройскія ўчынкі. Расказваецца ў аповесцях пра характары дастаткова складаныя, супярэчлівыя, унутрана канфліктныя.

Гаворка ідзе пра Вольгу Ляновіч («Гандлярка і паэт») і Машу Пятрову («Шлюбная ноч»). Яны, вядома, розняцца па сваіх сацыяльна-ідэйных, маральных «параметрах», але ёсць у іх і нешта агульнае, ці, як кажуць літаратуразнаўцы, тыпалагічнае. Абодва характары пазначаны рысамі індывідуалізму, хоць ён па-рознаму ў іх праяўляецца.

Адным словам, абедзве яны — і Маша, і асабліва Вольга — гераіні зусім не «блакітныя», як часам завуць ідэальнага героя. І тут, у пэўнай ступені слушна, некаторыя могуць спытаць: а ці варта іх ставіць на «пасаду» галоўных гераінь, абавязаных несці ў сабе, так сказаць, станоўчы пачатак?

Адказ на гэта пытанне можна даць толькі з улікам таленту пісьменніка, яго вопыту і творчых магчымасцей — яны ў І. Шамякіна якраз вельмі значныя. І самае галоўнае — з улікам яго вельмі сучаснай пазіцыі як мастака-даследчыка, аналітыка, які імкнецца дайсці да каранёў, да сутнасці, прасачыць, як яна, гаворачы мовай філасофіі, «з'яўляецца», рэалізуецца ў пэўных умовах рэчаіснасці.

Тэма выхавання і перавыхавання — адна з цэнтральных у савецкай літаратуры. Да яе і звярнуўся І. Шамякін, паставіўшы сабе на мэце ўсёй логікай развіцця характараў адказаць на пытанне аб

ролі ў чалавечым лёсе такіх каштоўнасцей, як чуласць да чужога болю, глыбокі патрыятызм, высокая ідэйнасць, духоўнасць, свядомы ўдзел ва ўсенароднай барацьбе за перамогу над фашызмам, гатоўнасць на подзвіг.

Ваенны матэрыял — жорсткія абставіны ваеннага часу — якраз спрыяюць вастрэйшай пастаноўцы і высвятленню гэтых фундаментальных праблем чалавечай асобы, што, дарэчы, добра відаць у многіх творах ваеннай тэматыкі, у тым ліку ў творах І. Шамякіна «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч» і ранейшых.

Расказваючы — на самым пачатку — аб жыцці і побыце Ляновічаў, пісьменнік не абмінае іх своеасаблівы дэмакратызм і не страчаную яшчэ ў мяшчанстве народную аснову. Гэта — важна. Важна раскрыць і развіць у чалавеку яго лепшыя якасці. Вольга і Маша — характары неадназначныя. «Ад Вольгі можна чакаць самага нечаканага»,— гаворыць пра яе Алесь. Вольга ад прыроды, што і казаць, здольны чалавек, яна працавітая, энергічная, кемлівая, вынаходлівая, у нечым нават таленавітая. Але яе здольнасці не знаходзілі правільнага, карыснага для ўсіх выйсця, яна, чыё «прыземленае» жыццё і клопаты абмяжоўваліся Камароўскім рынкам, не магла праявіць сябе як грамадска значная асоба. Гэтаму якраз перашкаджаў вузка асабісты інтарэс, бездухоўнасць гандлярскага існавання, імкненне бачыць у іншым чалавеку толькі рыначнага канкурэнта. Пісьменнік імкнецца прасачыць, як, пры якіх умовах вызваляюцца станоўчыя патэнцыі чалавека, лепшае, на што ён здольны, той, інакш кажучы, момант, калі надыходзіць яго «зорная часіна». Такі момант урэшце прыйшоў і для Вольгі Ляновіч, і для Машы Пятровай...

Вользе пашчасціла трапіць у акружэнне сапраўдных людзей, патрыётаў, якія раскрылі ёй вочы на навакольнае, на свет, на жахі фашысцкай акупацыі, на неабходнасць бязлітаснага змагання.

Па меры разгортвання сюжэта, развіцця характараў у дзею ўступаюць усё новыя і новыя героі. Такія, як падпольшчыкі Лена Бароўская, Захар Пятровіч, Андрэй, Яніна Восіпаўна, ваеннапалонны Аляксандр Гапанюк. Апошні — паэт, рамантык, летуценнік, чалавек высокай духоўнасці, як атэстуе яго аўтар,— паўплываў найбольш.

Эмацыянальна насычаныя дыялогі «гандляркі» і «паэта», якія вядуцца па розных прычынах, праліваюць святло на складаныя працэсы, што адбываюцца ў душах абодвух. Сашу «хацелася, нарэшце, зразумець гэтую жанчыну, загадкавую з таго моманту, калі позіркі іх сустрэліся праз калючы лагерны дрот, на дзіва супярэчлівую, такой супярэчлівасці ў чалавечым характары ён не сустракаў за свае дваццаць гадоў, а гэта ўзрост, калі чалавеку здаецца, што ён спазнаў

усе таямніцы свету. Што ж яна такое? Хто яна? Гандлярка? Мяшчанка? Ці Чалавек і Маці? Яму, узнёсламу рамантыку, два словы гэтыя хацелася заўсёды пісаць з вялікай літары».

І. Шамякін заўсёды быў майстар, як часам кажуць пісьменнікі, моцна «закруціць» сюжэт — у добрым сэнсе слова. Гэта — каштоўны бок яго майстэрства. Але робіць ён гэта часцей за ўсё не дзеля таго, каб «прымануць» чытача. Сюжэт аповесці «Гандлярка і паэт» — гэта рост і арганізацыя характараў Вольгі Ляновіч і Сашы Гапанюка. Ён — даследчы па сваёй мастацкай скіраванасці, бо рухаецца наперад імкненнем пісьменніка высветліць характары і абставіны, іх сацыяльную, духоўную сутнасць.

Новыя пачуцці прарасталі нялёгка, пакутліва. Пісьменнік уважліва прасочвае, як Вольга збліжаецца з Сашам, сустракаецца з падпольшчыкамі, як, уласна кажучы, нараджаецца новы чалавек.

Пэўная навізна матэрыялу, падыходу да яго характэрна абедзвюм аповесцям. У «Шлюбнай ночы» аўтар вуснамі гераіні хоча расказаць, «як мы ваявалі і як... кахалі ў вайну...» Гэта рэч сваёй маральна-этычнай праблематыкай звязана, на наш погляд, з раманам «Атланты і карыятыды», дзе таксама абмяркоўваецца праблема грамадзянскага і гераічнага ў паводзінах чалавека ў розныя моманты яго жыцця.

«Шлюбная ноч» з элементамі дэтэктыву, якія, мне здаецца, паслабляюць удачу гэтага твора, саступае першай аповесці па многіх «паказчыках». Трагічная нота, якой яна заканчваецца, мала арганічная для твора. Яна як бы «прыклееная». Хоць ахвотна дапускаем, што ў жыцці магло здарыцца і такое. Можна, відаць, у сувязі з гэтым папракнуць пісьменніка тым, што ён месцамі фарсіруе развіццё падзей у адной і другой аповесцях. Асабліва пры канцы. Пажадана была б большая непаспешлівасць, удумлівасць.

Аднак гэта, думаецца, прыватныя моманты, якія не могуць пахіснуць думку аб гераізме, чалавечнасці, высокай ідэйнасці, веры ў чалавека. Асабліва ўдалая ў гэтым сэнсе аповесць «Гандлярка і паэт».. Яна цікавая і актуальная якраз вострай пастаноўкай праблемы высокай маральнасці чалавечых паводзін. Патрыятычная свядомасць немагчыма без высокаразвітых духоўных запатрабаванняў чалавека. Менавіта з гэтай ідэяй звязаны галоўны напрамак мастацкага пошуку пісьменніка.

Уяўленне аб сучаснай прозе было б няпоўнае без апавядання, якое нездарма завуць разведчыкам жыцця. У гэтым жанры працуюць усе майстры прозы — і раманісты, і дакументалісты, і аўтары аповесцей. Многіх мы ўжо назвалі. Як бліскучыя апавядальнікі вядомы І.

Мележ, І. Шамякін, І. Навуменка, А. Асіпенка, Я. Брыль, А. Кулакоўскі, А. Васілевіч, М. Лужанін, В. Быкаў, А. Пальчэўскі, Я. Скрыган, А. Кудравец, В. Адамчык, Б. Сачанка, А. Жук, Ф. Янкоўскі і многія іншыя, хто імкнецца паспець за нашым хуткаплынным часам. Вазьміце такія, скажам, апавяданні, як «Іван ды Мар'я» І. Навуменкі, «Соль» Б. Сачанкі ці «Зімовая дарога» А. Васілевіч. Якія цікавыя характары падмечаны ў іх, і як тонка яны намаляваны! Гераіня апавядання Навуменкі — пажылая адзінокая жанчына, а паглядзіце, якая яна цікаўная да ўсяго, да ўсіх змен, што адбываюцца, нераўнадушная да чужога болю, здольная на вялікае суперажыванне. Мар'я — цікавы, арыгінальны характар.

У большасці апавяданняў вабіць высокі ўзровень прафесійнага майстэрства, спелая псіхалагічная культура. Сучасная навелістыка надзвычай разнастайная ў жанравым плане. Яна выконвае і эксперыментальную ролю.

Дасканала авалодаў навелістычным жанрам і жанрам мініяцюр Я. Брыль. Частка з іх склала кнігу «Вітраж». Чытаючы яе, я яшчэ раз адчуў, які гэта вялікі дар — жыццё! Якое яно прыгожае і цікавае нават у драбніцах, як не трэба траціць яго на пустое і нязначнае...

Даволі шмат апавяданняў, дакументальных навел, мініяцюр пра сустрэчы на жыццёвых дарогах з цікавымі, адметнымі людзьмі напісаў В. Вітка, старэйшы пісьменнік. Неабходнасць расказаць пра іх, гаворыць ён, «вымагаецца патрэбаю гаварыць не толькі сам-насам з сабою, але і з імі — жывымі, і з тымі, якіх ужо няма на свеце, але якія асталіся ўва мне самім, бо чалавек жыве адначасова ў трох вымярэннях: сучасным, мінулым і будучым».

У апавяданнях А. Васілевіч героі часцей за ўсё асэнсоўваюць сваё мінулае. Рэтраспекцыя выступае як самааналіз, як спрэчка — часам вельмі вострая — з перажытым. Напружана думае пра мінулае мастак Сіўцоў (апавяданне «Адно імгненне»). Некалі ён уступіў лёсу, не змагаўся за свой талент, завяз у быце і цераз гэта навек згубіў душэўную раўнавагу, творчы настрой. Нешта падобнае ёсць у перажываннях і светаадчуванні герояў апавядання «Чужыя вершы». Яны — рэфлектыўныя, больш думаюць, чым дзейнічаюць. Мяккія, інтэлігентныя, яны разам з тым вельмі паслядоўныя ў маральнай ацэнцы чалавечых учынкаў. Атмасфера апавяданняў А. Васілевіч вельмі напружаная і заўсёды выклікае да іх цікаўнасць.

У добрага навеліста вырастае М. Вышынскі. Да гэтага часу ў памяці яго Салавей — герой аднайменнага апавядання. Салавей — дзівак, аднак аўтар пра яго гаворыць (і гэта вынікае з сутнасці характару), што на крутых дарогах свайго жыцця ніколі, здаецца, не

сустракаў ён людзей, дабратою і чуласцю роўных Салаўю. Праўда, дабрата яго нейкая больш сузіральная, нясе на сабе адбітак рэфлексіі. «...Я, сказаць табе,— гаворыць ён Домашу,— часам не сплю, гляджу і думаю: каб мы часцей аціхалі душой, адрываліся ад зямлі ды паболей глядзелі на сябе збоку, то, можа, разумнейшыя былі б у жыцці і між сабой дабрэйшыя...» Нягледзячы на ўсё, гэта — змястоўны, па-майстэрску напісаны вобраз вясковага летуценніка, які па-свойму «ўпрыгожвае зямлю...».

Задача раманіста — адлюстраваць важнейшыя бакі жыцця народа. Аднак такая ж задача стаіць і перад навелістамі! Сярод асаблівасцей «раманнага» мыслення — яго сацыяльнасць, народнасць, тыповасць герояў, глыбіня даследавання. Але ж усё гэта ўласціва і лепшым сучасным апавяданням! У гэтым сэнсе «раманнасць» -— абавязковая якасць літаратуры ва ўсіх яе жанрах.

І ў апавяданне, як і ў раман, аповесць, як і ва ўсю літаратуру, пранікае пачуццё гістарызму. Гэта заўважана, напрыклад, у «абразках» Ф. Янкоўскага, у такой навеле, як «Трэба ж», дзе бацька майструе лаўку загінуўшым сынам, свята захоўваючы памяць аб іх. Абразкі Ф. Янкоўскага — звязаныя з фальклорнай традыцыяй — цікавыя асабліва тым, што яны «нявыдуманыя», дакладна спісаны з жыцця, якое сінтэзуе праўду гісторыі і праўду чалавечых характараў...

Некалькі слоў пра маладую генерацыю.

Маладая беларуская проза — гэта цэлы шэраг шматабяцаючых пісьменнікаў — Алесь Жук, Яўген Радкевіч, Генрых Далідовіч, Васіль Гігевіч, Міхась Тычына, Леанід Калодзежны, Алесь Масарэнка, Леанід Дайнека, Яўген Лецка, Міхась Кацюшэнка, Таццяна Гарэлікава, Аляксей Дудароў, Мікола Воранаў, Адольф Варановіч, Алесь Дзятлаў і цэлы шэраг іншых, хто з першай, другой кніжкай, а некаторыя пакуль што толькі з часопіснымі публікацыямі ўваходзяць у літаратуру, больш і больш адчуваючы вялікую адказнасць, якая кладзецца на плечы сучаснаму мастаку.

Розныя жыццёвыя дарогі вядуць іх у літаратуру. Тут і настаўнікі, і інжынеры, рабочыя, журналісты, геолагі, камсамольскія работнікі, ваеннаслужачыя, студэнты і іншыя людзі — талентаў у нас заўсёды было шмат, іх трэба клапатліва збіраць і ўважліва выхоўваць, прышчапляць ім лепшыя традыцыі савецкай літаратуры, традыцыі грамадзянскага служэння свайму народу.

Маладыя празаікі — хто менш, хто больш актыўна, з большым поспехам — уключаюцца ў даследаванне характару свайго сучасніка, у вызначэнне духоўнага аблічча свайго пакалення. Сёння асабліва востра, на ўвесь рост паўстае пытанне адпаведнасці сацыяльна-

гістарычных тэмпаў нашага жыцця і праўдзівага, духоўна насычанага яго адлюстравання ў літаратуры і мастацтве. Інакш літаратура не здолее выканаць сваю выхаваўчую ролю.

У лепшых сваіх творах маладыя празаікі імкнуцца паказаць развіццё і станаўленне асобы ў сучасным грамадстве, новае ў чалавечых узаемаадносінах, вышыню маральнай культуры нашага сучасніка.

Горад і вёска, абставіны побыту і свет прыроды, штодзённыя чалавечыя клопаты і прага душэўнай гармоніі і раўнавагі — на гэтай лініі дзейнічаюць многія героі і адбываюцца канфлікты ў творах Алеся Жука — аўтара некалькіх кніг, якія былі вельмі прыхільна сустрэты крытыкай.

Крытыка справядліва бачыць адну з асаблівасцей творчага стылю А. Жука і маладой прозы ў цэлым у вастрыні маральных адносін да рэчаіснасці, у непрыняцці індывідуалізму, спажывецкага погляду на працу і грамадства. Героі Жука — сумленныя людзі, якія імкнуцца жыць па законах сумлення, па законах камуністычнай маралі — «чалавек чалавеку — друг, таварыш і брат».

«— Дурныя мы,— разважае па-спажывецку настроеная Марыя з апавядання «Вечар шчасця»,— нам трэба яшчэ столькі вучыцца браць у жыцця прыгожага і прыемнага, а мы толькі і ўмеем, што аддаваць. Трэба ўмець узяць усё, прыгожа ўзяць!»

З такой мяшчанска-спажывецкай, вузка эгаістычнай філасофіяй ніяк не можа пагадзіцца інжынер Задарожны. Яна — варожая яму, яго чалавечай сутнасці, усёй духоўнай культуры, працоўнаму выхаванню. Ён рашуча адвяргае яе і парывае з Марыяй. Вузка зразуметая карысць і шырыня духоўных патрабаванняў несумяшчальныя.

Пісьменнік, як і ўся сучасная літаратура, усё часцей звяртаецца да такіх сітуацый, якія не ўкладваюцца ў рамкі практычнай карысці і звязваюцца з больш шырокай сферай маралі. Герой апавядання «Замеценыя дорогі» бульдазерыст Павел шмат дапамагае іншым. Ён і яго сябар Віктар — бязлітасныя да сябе ў рабоце — ненавідзяць Тараса і яго жонку, якія бачаць сэнс жыцця толькі ў грошах.

Радуе майстэрства Жука. У пасляслоўі да яго кнігі на рускай мове (выдавецтва «Советский писатель») Янка Брыль адзначаў, што «малюнак Жука дакладны, кожны рух у думках, пачуццях, паводзінах яго герояў праўдзівы».

Гэта — высокая ацэнка сталага майстэрства.

Добрай жыццёвай, эмацыянальнай насычанасцю вылучаюцца лепшыя творы Міхася Парахневіча. Парахневіч па прыродзе сваёй апавядальнік. У, здавалася б, невялікім жыццёвым факце ён умее разгледзець багаты чалавечы сэнс. Цяжкі, але дарагі на ўспамін,

уклад жыцця суровых пасляваенных год адкрываецца ў гісторыі кахання Варвары і Косці (апавяданне «Далёкае рэха»), у гісторыі таго, як Варвара, толькі-толькі распісаўшыся, засталася ўдавой. Косця паехаў на лесанарыхтоўкі і падарваўся на міне.

Парахневіч усё далей адыходзіць ад эцюднасці, нарысавасці ў бок сур'ёзнай навелістыкі, багатай на жыццёвую праўду і псіхалагічныя адценні. Асабліва каштоўна ў яго героях, што гэта — разнастайныя народныя характары.

Углыб, да паўнаты народнага жыцця — вось адзіна правільны кірунак усёй нашай літаратуры, якая ведае, што моцнае грамадства ствараецца не падабенствам, а разнастайнасцю яго членаў.

Па-свойму вабяць героі Васіля Гігевіча, якія імкнуцца зразумець сваё становішча ў свеце, хочуць жыць паўнацэнным гарманічным жыццём. Ім уласцівы напружаны самааналіз, высокі маральны рахунак патрабавальнасці да саміх сябе. Некаторыя з іх у гэтым сэнсе могуць здацца нават загадкавымі, як, напрыклад, Сяргей з апавядання «Звычайны дзень».

«Сяргей думаў, што, відаць, жыве неяк не так, бо няма той радасці, таемнасці і захаплення, якія былі калісьці. Ужо каторы год ён плануе загадзя, чаго дасягае праз пэўны час, але ўсё гэта як прэснае есці...

Здавалася б, таго ён і дасягнуў. Жонка была ціхая і ласкавая, яна адразу, са знаёмства дала зразумець, што бачыць у Сяргею чалавека больш разумнага і лепшага за сябе. Дзяцей у іх не было. Работа ў Сяргея была спакойная — ён мала каму падпарадкоўваўся і яму мала хто.

Сяргей любіў сваю работу, яна цікавіла яго так, што ён увесь рабочы дзень ні пра што іншае не думаў, акрамя работы...»

Аднак, працягвае аўтар далей, калі Сяргей «выходзіў з інстытута, калі аставаўся свабодны, і ў ім узнікала пачуццё непатрэбнасці і нягоднасці. Таму ён зноў і зноў кідаўся ў работу, імкнучыся знайсці ў ёй поўны спакой і задаволенасць...

І калі лічыць, што работа для Сяргея галоўнае, то што рабіць з успамінамі, пачуццямі? І хто пакажа меру між адным і другім?»

Цікавы, неардынарны характар знайшоў Васіль Гігевіч, хоць і не вытлумачыў яго як след. Апавяданню бракуе дынамікі, канфліктнасці, разгорнутасці падзей. Малады празаік і яго героі настойліва думаюць над сэнсам чалавечага жыцця. Гэта — добра. Адно ім хочацца падказаць — што сэнс і каштоўнасць жыцця паўней могуць адкрыцца тады, калі роздум спалучыць з практычнай работай, з

творчасцю, з актыўным удзелам у грамадзянскай дзейнасці. Яны павінны ўсвядоміць сябе сацыяльна.

Сэнс і рух жыцця можа адкрыцца толькі ў спалучэнні правільнай думкі і ўчынкаў, падзеі.

Складанасць, шматстайнасць унутранага жыцця чалавека павінна стаць уласцівасцю сённяшняй літаратуры: калі яна хоча раскрыць новае, што з'явілася ў духоўным жыцці грамадства, паказаць адзінства вытворчага і маральнага канфліктаў.

Крытыка адзначала ў свой час як удачу Г. Далідовіча яго аповесць «Усё яшчэ наперадзе», дзе малады настаўнік Павел Мікалаевіч — у працоўных буднях — здае экзамен на чалавечую і грамадзянскую годнасць. Гэта — ваяўнічы характар, які скіраваны супроць такіх перажыткаў, як сацыяльны інфантылізм, пасіўнасць і бездухоўнасць. Высокую маральную культуру і прынцыповасць падтрымлівае ў ім старэйшы таварыш — завуч школы Алесь Трахімавіч, які ў размове з Паўлам гаворыць:

«— Адзін дыплом вы ўжо абаранілі. У інстытуце, як і ўсе. Але трэба абараніць яшчэ дыплом на смеласць, сумленнасць, цярплівасць, настойлівасць. Яго людзі абараняюць усё жыццё. Я толькі цяпер зразумеў, што некалі хацеў сказаць Маркс, калі ў яго запыталі, у чым ён бачыць шчасце. «Барацьба»,— адказаў ён. Я толькі цяпер зразумеў гэтае слова «барацьба»...

Далідовіч паказвае, як у барацьбе з цяжкасцямі і нягодамі гартуецца характар, вырастае асоба, спазнаецца цана чалавечых каштоўнасцей, цана працы, кахання, справядлівасці і дабрыні.

У пошуках героя маладых пісьменнікаў цікавіць перш за ўсё духоўна насычаная асоба, здольная эмацыянальна ўплываць на іншых, вышэй узняць іх свядомасць.

Разнастайныя эстэтычныя функцыі выконвае ў маладой прозе зварот да прыроды. Яна дадае маральных сіл героям Алеся Жука, якія надзвычай крута выпрабоўваюцца сутыкненнем з бытам, з філасофіяй спажывецтва і прыстасавальніцтва. Пісьменнік любіць і востра адчувае свет прыроды.

«А ў Задарожнага,— расказвае ён пра аднаго са сваіх герояў (апавяданне «Вечар шчасця»),— акрамя свайго інжынерскага клопату пра рамонт трактароў і сеялак знайшоўся яшчэ адзін, каб каму сказаць, то і смешны клопат: не прапусціць тую пару, калі пацягнуць вечарам над ляснымі прасекамі слонкі...

Вось гэтае жаданне не прапусціць вясновую цягу, убачыць, як нячутная і амаль не бачная ляціць птушка, і чуць, як хрыплавата, трывожна абзываецца, і ўсё навокал тады незвычайнае: зелянцава-

празрыстае, як шкло, неба, быццам прасвечанае з самае запаветнае глыбіні, і вясновы, яшчэ халаднаваты, востры водар лесу!..»

Зімовы пейзаж з'яўляецца таксама арганічнай часткай эстэтычнай рэчаіснасці ў цікавым апавяданні Міхася Парахневіча «Макарышына вярба», нібыта падкрэсліваючы пустое месца, што засталося пасля чалавека, які жыў толькі для сябе.

Матыў сустрэчы са светам прыроды адыгрывае вялікую ролю ў творах Алеся Масарэнкі. Праўда, аўтар не акцэнтуе ўвагі на яго паэтычнасці, духоўнай сіле, прыраўніваючы прыродныя рэаліі больш да быту. Аднак гэта справа творчай індывідуальнасці мастака.

Алесь Масарэнка — аўтар дзвюх кніг, з якіх, шчыра прызнацца, мне асабліва падабаецца першая — «На бабровых тонях». Яна — аўтабіяграфічная, густа населена землякамі пісьменніка (ён родам са Слаўгарадскага раёна), паляўнічымі-бабраловамі, людзьмі звычайных, але вельмі неабходных прафесій. Пісьменнік актыўна выступае ў абарону прыроды, вучыць яе любіць і паважаць.

З кніжкай апавяданняў з'явіўся перад чытачамі малады паэт Леанід Дайнека. Яго проза — патрыятычная, настраёвая, месцамі рэфлектыўная. Аўтар вучыць паважаць гераічныя і патрыятычныя традыцыі мінулага, яго хвалююць людзі гераічных біяграфій.

Калі гаварыць пра ўсю літаратуру, трэба адзначыць, што мастацкі дыяпазон нашай літаратуры ўвесь час пашыраецца. Яна падымае складаныя і адказныя тэмы, узбагачаецца эстэтычная структура беларускай прозы, паэзіі, драматургіі, публіцыстыкі.

Вельмі важна, каб развіццё маладых талентаў таксама ішло ўпоравень з жыццём, каб адлюстроўваліся новыя чалавечыя адносіны. І асвойваліся новыя пласты і з'явы рэчаіснасці. Так уласцівая беларускай прозе гушчыня і сакавітасць фарбаў адчуваецца і ў маладых. Але яны, на наш погляд, менш, чым трэба было б, заклапочаны творчымі пошукамі ў сферы жанраў, стыляў, мовы, выяўленчых сродкаў... Менавіта празаікі, нам здаецца, не заўсёды надаюць належнае значэнне кампазіцыйнаму майстэрству. А што яно азначае? Мала знайсці, адкрыць у жыцці новыя характары, важна яшчэ распрацаваць іх living разнабакова. Пажадана будаваць характар на перасячэнні некалькіх каардынат. Трэба імкнуцца да шматграннасці ў выяўленні чалавека. Чаму мы не шукаем новых і новых прыёмаў яго раскрыцця? Гэта — недаравальна для мастакоў.

Аналіз пакуль што бярэ верх над сінтэзам. Каларыт, дэталі, бытавы антураж сучаснасці, душэўныя рухі — у аналітычным паказе ўсяго гэтага маладая проза адчувае сябе ўпэўнена, але яна (мы пра гэта гаварылі) недастаткова моцная ў паказе «цэлага» — гэта значыць

сацыяльна-насычанай, шматграннай чалавечай асобы, шчыльна звязанай з рознымі бакамі грамадскага жыцця.

Што яшчэ пажадаць маладым?

Страснасці, творчай апантанасці, захаплення жыццём, нераўнадушша да яго праблем, ідэйнай насычанасці і глыбокай паэтычнасці. Гэта — неабходна. І яшчэ — добрай творчай веры ў сябе, у свой талент.

Як бачым, агульныя рысы літаратурнага жыцця, важнейшыя яго эстэтычныя заканамернасці праступаюць даволі выразна ў мастацкай прозе апошніх гадоў. Яны звязаны з пастаянным пашырэннем пазнаваўчай сферы літаратуры, паглыбленнем яго рэалізму. Сама глеба народнага жыцця ўзнімаецца насустрач сучаснасці. Наша літаратура пераканаўча даказвае, што толькі актыўныя, стваральныя адносіны да жыцця робяць чалавека сапраўднай асобай, дазваляюць яму з поўнай аддачай працаваць на грамадства.

Галоўнае пры гэтым — аўтарскі падыход да жыццёвага матэрыялу, мастакоўскі кут бачання, успрыняцця народнага жыцця ў яго няспынным руху. Заснавальнікі тэорыі навуковага камунізма спецыяльна падкрэсліваюць дынамічнасць і творчую прыроду будучага грамадства сацыяльнай справядлівасці. Яны гаварылі: «Камунізм для нас не стан, які павінен быць устаноўлены, не ідэал, з якім павінна ўзгадняцца рэчаіснасць. Мы называем камунізмам сапраўдны рух, які знішчае цяперашні стан» (К. Маркс и Ф. Энгельс. Соч., т. 3, стар. 34).

Разнастайнасць творчых схільнасцей і тэматычных густаў у літаратуры гаворыць пра багацце і шматмернасць рэчаіснасці — літаратура абавязана перадаць яго паўнату і складанасць, яго сацыяльны аптымізм, багацце і прыгажосць савецкага ладу жыцця. А. Адамовіч у сваёй кнізе «Горизонты белорусской прозы» пісаў: «Сучасная беларуская літаратура надзвычай напружана ў сваіх творчых пошуках: гэта можна ўявіць як спружыну, адзін канец якой замацаваны недзе «на» фальклоры, «на» народна-паэтычнай традыцыі, а другі імкнецца за сучаснасцю, за праблемамі, падзеямі і трывогамі сучаснага свету, чалавека».

І гэта правільна. Трэба шукаць разнастайныя стылёвыя, ідэйна-эстэтычныя структурныя рашэнні, настойліва шукаць новыя формы, якія маглі б з найбольшай паўнатой перадаць і свет рэчаіснасці, якая ўскладнілася, і ўнутраны свет героя-сучасніка. Беларуская проза не губляе «гушчыні» і «сакавітасці» сваіх барваў. Пісьменнікі ведаюць, што высокае майстэрства твора — частка яго ідэйнага, духоўнага патэнцыялу. Невысокае, недасканалае майстэрства духоўна збядняе літаратуру.

Такім чынам, узмацненне яе ўвагі да асобы звязана з больш смелым зваротам пісьменнікаў да складаных і адказных тэм, непрыняццем шаблонных падыходаў да чалавека, сцвярджэннем яго грамадзянскай сталасці і — у такой жа ступені — з інтэнсіўнымі мастацкастылёвымі пошукамі новых «павесційных» структур, элементаў складанай паэтыкі — сімволікі, гратэска, узмацнення творчай суб'ектыўнасці. Адно звязана з другім. Сёння ўжо недастаткова аднаго апісання (хай сабе і вельмі арыгінальнага, рэальнага) факта, выпадка і г. д. Неабходна браць з факта яго духоўную квінтэсенцыю. А гэта немагчыма без эстэтычнай актыўнасці, пошуку індывідуальных падыходаў, разнастайнасці стылёвых почыркаў, шматфарбнасці і ёмістасці думкі.

У літаратуры, якая даўно стала грамадскай думкай часу, як вядома, закон колькасці не дзейнічае. Развіццё нашага грамадства адзначана паслядоўнай барацьбой за якасць, высокую эфектыўнасць работы ўсіх і кожнага. Узросшыя патрабаванні да якасных крытэрыяў, будзем спадзявацца, адлюструюцца ў дзейнасці атрадаў работнікаў культуры, у тым ліку і літаратараў. Гаворка ідзе пра большую творчую самааддачу мастака, пра пастаяннае павышэнне ідэйна-эстэтычнага ўзроўню твораў, напружаную работу па ўдасканаленні майстэрства. А карэнне майстэрства мастака закладзена, як вядома, у дзейснасці яго адносін да жыцця, сацыяльнай пільнасці, у смеласці пастаноўкі вострых жыццёвых праблем, у бескампраміснай патрабавальнасці да самога сябе як мастака.

1977 г.

## Героіка — дакумент – літаратура

У нашы дні поступ гісторыі асабліва чутны. Хада яе бачыцца ва ўсім.

Узрастанне пачуцця гісторыі — адно з самых дарагіх і неабходных у духоўным свеце сучасніка, у палітры яго сацыяльных эмоцый. Гэта — унутраная немагчымасць забыць перажытае, патрэба памятаць духоўны ўздым, здзяйсненні савецкіх людзей, урокі мінулага. Свядомы гістарызм, насычаны актыўнай мараллю, дапамагае савецкаму чалавеку ў яго вялікай стваральнай дзейнасці.

Магутны сродак выхавання пачуцця сацыялістычнай гісторыі — савецкая літаратура мае ў сваім мастацкім арсенале разнастайныя роды, жанры, стылі ўзнаўлення жыццёвай праўды, адлюстравання яе ў найбольш поўным аб'ёме. Важнейшы з іх — той від літаратуры, якую называюць дакументальнай і якая ў сваю чаргу мае шэраг разнавіднасцей.

Адна з іх — літаратура дакументальна-біяграфічная.

Нашы літаратары звяртаюцца да герояў, якія ў сваім характары і асобе яскрава адлюстроўваюць сам час, ход падзей, крокі гісторыі. Нярэдка гэтыя вобразы маюць сваіх рэальных прататыпаў — славутых герояў нашых дзён і дзён мінулых.

Да іх я аднёс бы Ульяну Крышталевіч (галоўную гераіню кнігі Васіля Якавенкі «Пакуль сонца ў зеніце»), якая з былой парабчанкі, пастушкі вырасла ва ўмовах Савецкай улады ў палітычнага і грамадскага дзеяча, стала дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, Героем Сацыялістычнай Працы.

Легендарнаму жыццю Кірылы Пракопавіча Арлоўскага прысвечана кніга Валянціна Панамарова «Мяцежнае сэрца». Біяграфія Арлоўскага — гэта этапы жыцця краіны, хвалюючы расказ пра гераічную гісторыю народа, які адстаяў сябе ў гадзіну цяжкіх выпрабаванняў.

Дакументальна-біяграфічных кніг у нас выходзіць шмат. Адна з найбольш арыгінальных — аповесць лётчыка-касманаўта, двойчы Героя Савецкага Саюза Пятра Клімука. У аснове яе — уражанні, назіранні і роздум, звязаныя з яго работай у цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў, а таксама з двума палётамі ў космас. Жыццёвы шлях П. Клімука — гэта шлях сённяшняга беларуса, перад якім адкрыліся захапляльныя перспектывы стваральнай дзейнасці.

З вялікай цікавасцю чыталіся «Лісткі календара» М. Танка, «Колас расказвае пра сябе» і «Дванаццаць вячорных вогнішчаў» М. Лужаніна, «Лічыла дні турма» П. Пестрака, «Рудабельская рэспубліка»

С. Грахоўскага, ваенныя дзённікі І. Мележа, лісты з фронту Л. Гарэцкага, кнігі Р. Мачульскага «Вечны агонь», Д. Цябута «Скрозь агонь» і многія іншыя.

Літаратурны працэс характарызуецца сваімі заканамернасцямі. Адна з іх — пераадоленне featured тыпу крайнасцей у развіцці літаратуры, калі, скажам, цікавасць да «мастацкасці» замяняецца цікавасцю да нявыдуманай праўды дакументальнага факту.

Часам здараецца так, што тое, над чым аўтар працаваў, так сказаць, з устаноўкай на «шэдэўр» (ці «шэдэўральнасць», як выказаўся адзін беларускі крытык), з цягам часу забываецца, а нешта іншае, што магчыма нават не прызначалася для друку, а толькі «для сябе» (дзённікі, запісныя кніжкі, накіды, размаітыя нявыдуманыя апавяданні, «непрычэсаныя думкі» і г. д.), застаецца, перажываючы некаторыя «шэдэўры» — вялікія панарамныя палотны прозы і паэзіі.

Парадокс гэты, вядома, складаны. Тут, відавочна, у ролі мастака выступае сам час, сама надзённасць, якая падымае на ўзровень мастацтва тое, што раней ім не было.

Пры гэтым неабходна, каб у тым, што мы называем дакументам, змяшчалася максімальная мера праўды. Час ператварае праўду ў паэзію і даносіць яе ў нашы дні. Толькі праўда здольна наталіць духоўную смагу чытача.

Задача літаратуры ў гэтым плане — нястомна ісці да новага ўзроўню праўды. А. В. Луначарскі натхнёна казаў некалі: «Праўда ляціць, праўда ёсць развіццё, праўда ёсць барацьба, праўда — гэта заўтрашні дзень».

Сёння ў рашэнні гэтай задачы дзейсна ўдзельнічае дакументальная літаратура — гэтая паэзія «нехлусні» ва ўсіх сваіх жанрах.

Наша гераічная гісторыя — новая і даўнейшая — удзячны матэрыял для дакументалістаў.

Ні для каго не сакрэт, што дакументальная літаратура — і перш за ўсё літаратура аб вайне, аб гераізме савецкіх людзей — ужо не адно дзесяцігоддзе займае сур'ёзныя пазіцыі ў сучасным літаратурным працэсе.

Дакументалістыку называюць «паролем літаратуры нашага часу» (Л. Аннінскі). Яе праблемы часта і востра абмяркоўваюцца ў друку. Чым вытлумачыць незвычайную актывізацыю гэтага віду літаратуры? У чым прычына яе незвычайнага поспеху ў чытачоў? Як павысіць яе выхаваўчую ролю? Наколькі яна ўплывае на іншыя віды літаратуры? Чаму гэты жанр прыцягвае да сябе столькі пісьменнікаў? Якім павінен быць літаратурны запіс, апрацоўка дакументальнага матэрыялу?

Вось толькі невялічкая частка пытанняў, па якіх ідзе гарачая спрэчка і якія патрабуюць глыбокай увагі.

У 1978 годзе ў Мінску Саюз пісьменнікаў СССР сумесна з праўленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі правялі пад старшынством Канстанціна Сіманава за «круглым сталом» нараду на тэму «Гераізм савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны і дакументальная літаратура». З дакладам выступіў Алесь Адамовіч. У абмеркаванні прынялі ўдзел Анатолій Бачароў, Юрый Збанацкі, Уладзімір Юрэвіч, Іван Навуменка, Данііл Гранін, Віктар Каваленка і іншыя, у тым ліку Канстанцін Сіманаў і Іван Шамякін.

Незадоўга перад гэтым савецкія людзі прачыталі хвалюючыя ўспаміны таварыша Л. І. Брэжнева «Малая зямля». З'яўленне іх прыдало нарадзе дакументалістаў асаблівую значнасць і адказнасць.

«Круглы стол» пісьменнікаў-дакументалістаў у Мінску канстатаваў, што ў апошні час значна павысілася ідэалагічная роля і выхаваўчае значэнне дакументальнай прозы, што яна знаходзіцца сёння на самым вастрыі ідэалагічнай барацьбы, што, як сказаў Алесь Адамовіч, дакументальнасць не супрацьстаіць высокаму «мастацтву», а паспяхова рэалізуе сябе ў ім, надае яму пераканаўчасць праўды.

Папулярнасць мастацка-дакументальнай літаратуры, трэба думаць, непарыўна звязана з тымі аграмаднымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі зрухамі (і адпаведна зрухамі ў свядомасці людзей), якія адбыліся ў нашай краіне ў апошнія дваццаць год і якія выклікалі новую хвалю незвычайнай творчай актыўнасці народных мас. Людзі імкнуцца пранікнуць у самую сутнасць навакольных з'яў. У арбіту ўвагі мастакоў трапляюць новыя і новыя гістарычныя асобы, героі, значныя эпізоды.

Эмацыянальную сілу і праўдзівасць дакумента не можа перасягнуць нават самая багатая фантазія. Добра вядома, што дакументалістыка прымае незвычайна актыўны ўдзел у развіцці сучаснай прозы. Сёння дакументальныя творы асабліва вабяць да сябе чытача. Яны сталі патрэбаю часу.

Адной з галоўных крыніц развіцця мастацкай дакументалістыкі з'яўляецца бяспрыкладны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, гераізм нашых людзей на фронце, у абставінах тылу, у партызанскай барацьбе і блакадных умовах, гераізм, які меў сваім вытокам высокую самасвядомасць савецкага чалавека.

Подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — невычэрпная тэма для мастакоў-дакументалістаў. Пра нашу Перамогу, пра тое, чаго яна нам каштавала, напісаны тысячы кніг. Яшчэ больш —

будзе напісана. Шмат надзей у гэтым сэнсе ўскладаецца на дакументалістыку.

Вялікая Айчынная вайна — цэлая эпоха ў нашым жыцці, глабальная падзея сусветна-гістарычнага значэння.

З дня Перамогі прайшло больш за 30 год, але памяць не маўчыць...

Значнымі з'явамі, што атрымалі шырокі водгук у краіне і за мяжой, сталі ўспаміны Маршалаў Савецкага Саюза Г. К. Жукава («Воспоминания и размышления»), А. М. Васілеўскага («Дело всей жизни»), В. І. Чуйкова («Крах Третьего рейха»), іншых буйных савецкіх палкаводцаў і военачальнікаў.

Цікавасць чытачоў да іх — выключная.

Выдатнае месца ў літаратуры аб вайне займаюць кнігі ўспамінаў кіраўнікоў партызанскай барацьбы, беларускіх партызан і падпольшчыкаў: В. Казлова, У. Лабанка, П. Калініна, Р. Мачульскага, С. Ваўпшасава, І. Ветрава, І. Клімава, В. Лівенцава, І. Сацункевіча, А. Караткевіча, А. Жураўскага, А. Дзенісевіча, М. Джагарава, Г. Храмовіча... Спіс гэты можна было б працягваць і працягваць: у беларускіх выдавецтвах выйшла за апошнія гады каля ста такіх кніг.

Дакументальная літаратура аб вайне — невычарпальная. Пачала яна стварацца адразу ж пасля вайны. Аўтары асвятлялі паасобныя яе старонкі, раскрывалі прыроду гераічнага. Можна ўспомніць у гэтай сувязі кнігі Д. Мядзведзева, І. Казлова, іншых аўтараў, чые творы не страцілі свайго значэння дагэтуль.

Недзе адразу ж пасля вайны з'явілася дакументальна-аўтабіяграфічная кніга Г. Лінькова «Вайна ў тыле ворага». Сёння перачытваючы яе і некаторыя іншыя кнігі таго часу, выразна бачыш іх недахопы. Асабліва ў параўнанні з лепшымі ўзорамі сучаснай дакументалістыкі. Перадаючы, здавалася б, асабісты вопыт аўтараў (самастойна ці ў літаратурным запісу), яны шмат у чым застаюцца ілюстрацыйнымі, не заўсёды ўлічваюць паўнату жыццёвай праўды, яе гуманістычны змест, менш, чым хацелася б, удзяляюць увагі чалавеку, раскрыццю яго ўнутранага свету.

Часта замінала рыторыка, пахвальба, непатрэбнае «майстэрства», якое больш працавала ўхаластую, белетрыстыка, залішняе «шчыраванне» рэдактараў, калі жывое, разгалінаванае дрэваператваралася ў гладкі тэлеграфны слуп.

Пасля вайны выйшла вядомая кніга «Ніколі не забудзем», у якой былі сабраны расказы беларускіх дзяцей пра перажытае,— правобраз сённяшняй «Я — з вогненнай вёскі...» і іншых работ сучасных дакументалістаў.

У блакнотных запісах Я. Брыля, пазначаных 1969 годам, ёсць нататка:

«Перачытваю «Ніколі не забудзем».

Відно, як тыя расказы дапрацоўваліся, з усімі белетрыстычнымі напластаваннямі. А потым блісне штосьці непаўторна, таленавіта дзіцячае — ажно за сэрца возьме. «Я чатыры дні нічога не ела, толькі ваду піла». «Назаўтра нас дапытвалі — спачатку маму, а потым мяне». «Нямецкія дзеці на нас плявалі, а мы сціскалі кулакі ў сваіх рукавах...» З якой ахвотай прачытаў бы я чарнавік гэтай кнігі!.. А яшчэ лепш — паслухаў расказы тых дзяцей!.. Рэдактары-апрацоўшчыкі нашпігавалі жывыя, каравыя, з залацінкамі жыцця (таленавітасць праўды!) расказы дзяцей, што не зусім яшчэ былі паадыходзілі ад жахаў вайны,— нашпігавалі са шчодрасцю слабога адчування мастацтва рознымі словамі, моднымі ў той час, адзелі тую шчырасць у літаратурны шырпатрэб...»

Ілюстрацыйнасць, прыхарошванне, гладкапіс даволі шырока пранікалі ў дакументалістыку саракавых, пяцідзесятых гадоў.

Новы падыход да дакументалістыкі, да гістарычных фактаў пазначылі творы С. Смірнова пра Брэсцкую крэпасць, І. Новікава пра Мінскае падполле. Гэта — высокі грамадзянскі ўчынак пісьменнікаў, якія адваявалі ў небыцця гераічныя ўзоры мужнасці, здзіўляючыя чалавечыя лёсы.

Сёння да дакументальных жанраў звярнуліся буйнейшыя савецкія пісьменнікі, імкнучыся адлюстраваць рэальнасць дакументальна, небелетрызавана, вярнуць літаратуры ўсю паўнату жыццёвай праўды, на якую яна мае права. Праўды, якая часам аказваецца сенсацыйнай, пераўзыходзіць самую смелую фантазію.

Сустракаюцца, безумоўна, і сёння творы сярэднія і слабыя, у якіх шмат літаратурных клішэ, белетрыстыкі, агульшчыны.

Істотных недахопаў не пазбег А. Бялевіч на некаторых старонках сваёй кнігі «Хатынь: боль і гнеў». Ёй яўна шкодзіць залішняя «паэтычнасць», імкненне расчуліць чытача. І гэта, думаецца, зніжае яе значэнне.

Даволі «сярэдняй», залішне агульнай атрымалася брашура пра Дальву — «Дальва — сястра Хатыні» (аўтар — Н. Гірыловіч, літаратурны запіс — А. Кейзерава). У ёй недастаткова рэалізаваны тыя багатыя магчымасці, якія давалі матэрыял і жанр, сама тэма.

Вобраз вайны, уяўленне пра чалавека на вайне ў памяці наступных пакаленняў будуць жыць дзякуючы літаратуры і мастацтву. Цікавасць да твораў на ваенную тэматыку выклікана не толькі патрэбамі сённяшняга дня, але і будучыняй чалавецтва, якое павінна

ведаць, што такое вайна, і ўсё зрабіць дзеля прадухілення гэтай жахлівай трагедыі.

Вайна і ўсё, што з ёю звязана, быццам бы асела ў чалавечых генах, перадаецца ў наступныя пакаленні.

Мастак В. Грамыка пісаў у часопісе «Коммунист Белоруссии» (1975, № 6):

«Чым далей ад нас вайна, тым філасофскі больш апраўдана, эпічна абагульнена раскрываецца сапраўдны сэнс духоўнага подзвігу савецкага чалавека. Тэма вайны далёка не вычарпана, а правільней — яна невычарпальная. Не выпадкова цягнецца да яе цяпер моладзь, як да жывой гісторыі, з якой выйшаў і дзень сённяшні, і яна сама. Не выпадкова моладзь прагне сустрэч з ветэранамі, жывымі сведкамі вайны...»

Павялічыўся попыт на мемуарна-дакументальныя выданні. Толькі ў нашай рэспубліцы цяпер штогод выпускаецца 20-25 назваў такіх кніг, сярэднія тыражы якіх за апошнія гады ўзраслі ў два-тры разы. Сабраныя ў іх па крупінках жывыя сведчанні непасрэдных удзельнікаў тых «векапомных дзён» сваёй, так сказаць, непасрэднай праўдзівасцю ўваскрашаюць у памяці людской нязгасныя эпізоды мінулай вайны і нясуць зарад велізарнай эмацыянальнай, аптымістычнай выхаваўчай сілы.

У гэтай літаратуры апісваюцца баі, партызанскія аперацыі, разглядаюцца рашэнні і выкананні загадаў камандзіраў, падрабязна гаворыцца пра пошук разведчыкаў і дзеянні падпольшчыкаў. Асабліва вялікая ўвага надаецца пачатковаму перыяду барацьбы, які ахоплівае другую палавіну 1941 — пачатак 1942 года. Аўтары імкнуцца паказаць арганізуючую і кіруючую ролю партыі. Без непасрэднага ўдзелу камуністаў не абыходзіўся ні адзін значны бой, дыверсія ці дальні пошук разведкі.

У апошні час заўважаецца тэндэнцыя да пашырэння тэматыкі. Больш апісваецца работа людзей, якія забяспечвалі дзеянні байцоў і камандзіраў. Напрыклад, у 1975 годзе выйшла кніга ўспамінаў партызанскага ўрача І. Л. Друяна «Клятву стрымалі». Рыхтуюцца да выдання кнігі, прысвечаныя жанчынам-партызанкам, падпольшчыцам, разведчыцам, сувязнымд

З успамінамі часцей і смялей пачалі выступаць камандзіры невялікіх падраздзяленняў — рот, узводаў, дыверсійных і разведвальных груп, радавыя партызаны і падпольшчыкі. У камандзіра высокага рангу шырэй дыяпазоны ахопу і асвятлення падзей, затое ў радавога глыбей і дакладней паказ канкрэтных баёў. Усе разам робяць паўнейшай агульную карціну.

Дакументалістыка, як бачым, настойліва пашырае свае межы ў сучаснай літаратуры, мастацтве, дапамагае ім быць больш праўдзівымі, чулымі да духоўных патрэб грамадства.

Аўтары, работнікі выдавецтваў імкнуцца пашыраць тэматыку, паўней і яскравей паказваць ролю партыі ў дасягненні перамогі над хітрым і каварным ворагам, якім была гітлераўская Германія, больш пераканаўча перадаваць гераізм савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў. Неабходна таксама клапаціцца пра тое, каб мемуарныя творы былі вольныя ад налёту суб'ектывізму, што, на жаль, часам мае месца, каб яны грунтаваліся на праверанах фактах.

Відаць, не варта захапляцца ў кнігах выключна аўтабіяграфічнымі звесткамі, не супаставіўшы іх з агульнай карцінай. Нельга дапускаць самарэкламу, неабгрунтаваную крытыку суседзяў і прыпісванне іх заслуг сабе.

Развіваючы традыцыі ўсёй савецкай літаратуры, беларускія пісьменнікі тым не менш не паўтараюць творчыя дасягненні сваіх калег з братніх рэспублік. У іх творах — адлюстраванне вопыту свайго народа, умоў рэспублікі, дзе загінуў кожны чацвёрты, дзе лёс Хатыні падзялілі многія і многія вёскі, дзе партызанская вайна набыла незраўнаны па маштабах размах.

Характар гэтай партызанскай барацьбы вынікаў з агульнага характару вайны, якая для нашага народа стала Айчыннай.

У Беларусі ў партызанскай барацьбе так ці іначай прымала ўдзел бадай усё патрыятычна настроенае дарослае насельніцтва акупаваных абласцей. Толькі непасрэдна ў радах народных мсціўцаў знаходзілася блізка палавіны мільёна чалавек. А тых, хто садзейнічаў ім у барацьбе, і пералічыць нельга.

Партызанская вайна была састаўной часткай усенароднай, Вялікай Айчыннай вайны. Такой яе і паказвае наша літаратура.

За «круглым сталом» указвалася, што праўда дакумента ўзмацняе літаратуру ідэйна і мастацкі, забяспечвае сувязь часоў і эпох.

Адзін з прамоўцаў — Юрый Збанацкі — вытокі дакументалістыкі адносіць да літаратуры Кіеўскай Русі. У гэтым, магчыма, і ёсць сэнс. Але наўрад ці правільна лічыць, што жанравыя рамкі дакументалістыкі настолькі шырокія, што ўключаюць, скажам, «Вайну і мір», у якой расказваецца пра многія рэальныя падзеі, пра гістарычных асоб. Не, жыццёвая аснова яе куды шырэй за тыя элементы дакументалізму, якія ў ёй ёсць. Свет гэтай магутнай эпапеі ўключае масу прыдуманых сітуацый і персанажаў, што праясняюць шмат якія талстоўскія ідэі.

У літаратуразнаўстве ёсць паняцце: факт і яго асэнсаванне. Дакументальная літаратура заканчваецца там, дзе асэнсаванне пераходзіць цалкам у вымысел. Далей пачынаецца ўласна мастацкая літаратура.

Але і дакументальная праўда абавязкова павінна быць пазначана індывідуальнасцю аўтарскай асобы.

У сучаснай дакументалістыцы стала вельмі адчувальна асабовасць аўтара, яго суб'ектыўнасць, нават калі ён свядома адыходзіць на другі план, даючы слова героям і дакументам. Роля светапогляду, палітычнай, маральнай пазіцыі пісьменніка тут надзвычай вялікая. Гэта характэрна ўсім формам і жанрам дакументальнай літаратуры — уласна дакументальнай, мастацка-дакументальнай, навуковай.

Дакументальны пачатак у розных формах яго эстэтычнага ўвасаблення атрымаў вельмі выразнае гучанне ў нашай літаратуры і мастацтве. Павялічылася ўдзельная вага факта ў сучаснай прозе, у пошуках пісьменнікаў, актывізуецца мемуарная плынь. Мастацкая форма даволі часта набліжаецца да публіцыстыкі, эсэ, рэпартажу, а часам нават да навуковага даследавання.

Разнастайны фактычны матэрыял праходзіць праз прызму прафесійнай пісьменніцкай свядомасці, уважліва аналізуецца, адбіраецца, кампазіцыйна арганізуецца, усебакова асэнсоўваецца. Пошук фактаў становіцца пошукам новых дакументальных і мастацка-дакументальных выяўленчых сродкаў, новых жанраў. Усё гэта абумоўлівае поспехі дакументальнага слова.

Дакументальныя жанры багатыя на разнастайныя адценні. Сюды ўваходзяць дзённікавыя, публіцыстычныя, нарысавыя кнігі, гісторыка-мемуарныя творы, навукова-даследчая літаратура.

Кніга Б. Сруогі «Лес багоў», ваенныя дзённікі К. Сіманава, І. Мележа, Б. Палявога, У. Вішнеўскага, «Лісты з фронту» Леаніда Гарэцкага, «Берлин, май 1945» Е. Ржэўскай, «Как кончаются войны» В. Субоціна, «Я должна рассказать» М. Ральнікайтэ, «Я — з вогненнай вёскі...» А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка, «Блакадная кніга» А. Адамовіча і Д. Граніна, дакументальная трылогія І. Новікава «Мінскі фронт», нарысавыя кнігі «Бездна» і «Потусторонние встречи» Л. Гінзбурга, дакументальна-аўтабіяграфічныя рэчы Ю. Збанацкага, С. Грахоўнага, іншыя работы — гэта літаратура адпавядае патрабаванню У. І. Леніна, які, паводле аўтарытэтнага сведчання А. В. Луначарскага, казаў, што «ў мастацкім творы важна тое, што чытач не можа сумнявацца ў яго праўдзівасці. Чытач кожным нервам адчувае, што ўсё іменна так адбывалася, так было ад чута, перажыта, сказана» (А. Луначарский. Собр. соч. в восьми томах, т. 6. М., 1965, стар. 276).

Цяпер пачынаюць з'яўляцца творы навукова-даследчага плану. Гэта — добра. Звярнулі на сябе ўвагу кнігі М. Якубоўскага «Дапамога савецкага тылу партызанам» і Я. Паўлава «Ленін і партызанскі рух». У 1976 годзе з'явілася даследаванне А. Цітова «Баявое партызанскае братэрства», прысвечанае інтэрнацыянальнаму характару партызанскага руху ў Беларусі.

Наша дакументальная літаратура пра вайну, пра геразм савецкіх людзей прасякнута гістарычным, сацыяльным, маральным зместам. Такімі нам уяўляюцца ваенныя дзённікі Івана Мележа. Іх аўтар — радавы вялікай бітвы з фашызмам на першым этапе вайны. Ён запісваў тое, што яму было даступна, што ён бачыў сам у межах дзеянняў сваёй часці, палка, які вёў жорсткія баі з праціўнікам на Збручы, пад Уманню, на Дняпры, ля Сінельнікава... Дзённік гэты не прэтэндуе на шырыню абагульненняў, але нам вельмі важны і дарагі адлюстраваны ў ім асабісты вопыт аўтара. Гэта вопыт чалавека, які воляй лёсу і неабходнасці стаў воінам-франтавіком, радавым працаўніком вайны. Сурова і бязлітасна вучыла яна яго і яго таварышаў мужнасці і стойкасці. «Ты ж салдат!» — паўтарае ён самому сабе ў цяжкія мінуты.

У ягоным характары ярка раскрываецца ўсё тое лепшае, што вынес ён з мірнага жыцця, узяў з духоўных багаццяў сацыялістычнага грамадства, яго ідэалаў. Быццам бы падрахоўваючы свой роздум у першыя дні вайны, аўтар запісвае ў дзённіку: «Адно я цвёрда ведаю — нас не перамогуць».

Спатрэбілася аяшо трыццаць гадоў, каб спачатку здагадацца, што патрэбна такая кніга, як «Я — з вогненнай вёскі...», а потым — зрабіць тое, што зрабілі А. Адамовіч, Я. Брыль і У. Калеснік. Сама літаратура павінна была дайсці да ўсведамлення таго, што, як гаварыў К. Сіманаў на Усесаюзнай нарадзе пісьменнікаў і крытыкаў у Мінску ў 1978 годзе, ніводзін не мае права сказаць, што ён ведае ўсю вайну. Усю вайну ведае народ, а абавязак пісьменніка і літаратуры — запісваць памяць народа і даць магчымасць з'явіцца ёй на старонках кніг.

Аўтары чуйна ўлавілі патрэбу літаратуры — даць выйсце народнай памяці аб вайне, аб перажытым. Яны праявілі сапраўдны мастацкі такт, калі самі як аўтары адышлі на задні план, даўшы магчымасць гаварыць сваім героям. Пісьменнікі бачаць сваіх герояў у цесных узаемадачыненнях з абставінамі, асяроддзем, дзе высвечваюцца розныя іх якасці — і генетычныя, і псіхалагічныя, і сацыяльна-грамадскія. Глыбінны змест кнігі складае яе псіхалагічная праўда. Яна

і абагульняе сабраны ў кнізе матэрыял і прымушае чытача зняць шапку перад памяццю расстраляных, спаленых фашыстамі людзей.

Пекла «Боскай камедыі» Дантэ не можа зраўняцца з тым, што апісана ў «Я — з вогненнай вёскі...». Гэтую кнігу нездарма называюць фактам грамадзянскага подзвігу трох пісьменнікаў.

«Я — з вогненнай вёскі...» — значны набытак беларускай дакументалістыкі.

Сённяшняя дакументалістыка разам з усёй літаратурай актыўна ўдзельнічае ў дыскусіі аб чалавеку. Нездарма яе называюць «літаратурай чалавечага дакумента». Яе гуманізм, праўдзівасць абумоўлены беражлівымі адносінамі да асобы, разуменнем яе вялікіх магчымасцей і маральнай прыгажосці. Яна развіваецца ў рэчышчы той комплекснай цікавасці да чалавека, што так уласціва творчым намаганням сучасных пісьменнікаў, якія імкнуцца глыбока, у розных «рэжымах» спазнаць чалавека, разабраць яго «па калёсіках і вінціках» і зноў сабраць, выпрабаваўшы ў самых адказных, пагранічных сітуацыях. Тут — у чалавечай змястоўнасці факта, дакумента — корань мастацкасці, звязаны з тым, што чалавек павінен усвядоміць свае магчымасці, сілы, здольнасць перамагаць трагедыю, смерць.

Пра сённяшнюю дакументалістыку можна сказаць: гэта чалавеказнаўства па самой сваёй сутнасці.

Дабро і зло... Як суіснуюць у чалавеку гэтыя пачаткі?

Адзін з чытачоў «Хатынскай аповесці» Алеся Адамовіча — Барыс Кулай з Брэсцкага раёна — пытаецца:

«Што ж адбываецца з чалавекам? Пры якіх умовах? Прыўносіцца гэта вар'яцтва звонку ці яно дрэмле ў чалавеку і трэба з апасеннямі ўглядацца сабе ў душу?»

Пісьменнік павінен гаварыць пра чалавека праўду, выхоўваць яго праўдай, нават калі яна страшная, пра якую гаворыць А. Адамовіч, маючы на ўвазе таго чалавека, «які, жадаючы стаць звышчалавекам, «надчалавекам», ператвараецца ў звышзвера». Пісьменнікі-дакументалісты бачаць сваю задачу ў тым, каб духоўна ўздзейнічаць на чалавека, сцвярджаць гераічнае ў яго асобе, народнае ў яго характары.

Чалавек і абставіны... Не ставячы гэтай праблемы спецыяльна, дакументалісты тым не менш настойліва аналізуюць яе. Часам ім падуладна тое, перад чым бездапаможна самая дасціпная мастацкая фантазія.

У кнізе «Я — з вогненнай вёскі...», у «Блакаднай кнізе» і іншых падобных ім таленавітых творах, гаворачы словамі з дзённікавага запісу Л. М. Талстога пра аповесці Пушкіна, «цікавасць падрабяз-

насцей пачуцця» і «цікавасць саміх падзей» зліты ў адзіным пафасе. Пошукі аўтараў ідуць у глыб псіхалогіі чалавека, да дэтальнага даследавання яго паводзін перад творам небяспекі і смерці.

Дакументалістыка яшчэ і яшчэ раз звяртаецца да аналізу капітальных праблем «чалавек і час», «чалавек і народ».

Вобраз народа, веліч яго чалавечнасці паўстае з твораў «Я — з вогненнай вёскі...», «Блакадная кніга», іншых работ нашых дакументалістаў. Думка чалавечая, узбагачаная тым, што перажыў народ, вырастае ў думку народную — глыбокую, неабвержную...

Дакументалістыка настойліва пашырае свае межы ў сучаснай літаратуры, дапамагае ёй быць больш праўдзівай, чулай да духоўных патрэб грамадства.

Некаторыя крытыкі б'юць трывогу з той прычыны, што дакументалістыка, маўляў, запалоніць усю літаратуру.

Такой небяспекі — эстэтычнага пераходу ўсёй літаратуры ў «дакумент» — на мой погляд, не існуе. Сувязь тут — дыялектычная. Дакументальнасць уздзейнічае на мастацкую літаратуру, якая нярэдка выкарыстоўвае форму дакумента. І наадварот: дакументальная рэч часта белетрызуецца, убірае ў сябе адзнакі твора мастацкага, пабудаванага з удзелам творчай фантазіі, выдумкі, абагульнення, тыпізацыі. Такая плённая сувязь бачна ў некаторых празаічных рэчах М. Лужаніна, якія, думаецца, прымыкаюць да сучаснай дакументальнай плыні. І не толькі ягоны публіцыстычны «Рэпартаж з рубцом на сэрцы», а ў першую чаргу вельмі цікавая ў многіх адносінах кніга «Людзі, птушкі, прастор», адзначаная тонкай назіральнасцю і роздумам сталага майстра. «Дзе ж мяжа паміж будзённым і гераічным?» — такое пытанне ставіцца ў аповесці «Лісты Харужай». Чалавек не можа існаваць без гераічнага пачатку, даводзіць пісьменнік, без узнёслага складу думак, без асяроддзя, адкуль ён убірае сокі гераізму.

Дакументальная проза ў многім аўтабіяграфічная. Аўтабіяграфічны вопыт выкарыстоўвае У. Карпаў у апавяданнях з кнігі «Прызнанне ў нянавісці і любві» — «Жывое сячэнне», «О, гэтая шчырасць!» і іншых. Перад вачамі праходзяць сапраўдныя, вельмі павучальныя чалавечыя лёсы перыяду ваеннага ліхалецця.

Дакументальнасць як метадалагічны прынцып ахапіла, так сказаць, цэлыя раманы. Напрыклад, антырэлігійны па сваёй скіраванасці «Вершалінскі рай» А. Карпюка, вядомы раманічны цыкл М. Машары пра падзеі ў Заходняй Беларусі на працягу 20-30-х гадоў.

Сюды, да гэтай плыні, у многім адносіцца аповесць-хроніка У. Дамашэвіча «Порахам пахла зямля», дзе ўзнаўляецца складаная біяграфія Глеба Кліменка, у чыім чалавечым лёсе адбіліся цэлыя этапы

нашай сацыялістычнай гісторыі. Праўда, прыземленасць пісьма, пэўная скаванасць думкі не далі магчымасці перадаць усё багацце сувязей чалавека з часам і гісторыяй на паўнацэнным эстэтычным узроўні.

«Туман над стэпам» — аповесць Р. Няхая — таксама расказвае пра непрыдуманыя падзеі партызанскага руху на Украіне, удзельнікам якіх быў сам аўтар.

Падобных твораў шмат...

Мастацкая дакументалістыка як адзін з відаў вялікай літаратуры мае сваё разгалінаванне жанраў, звязаных агульнай сістэмай з жанрамі ўласна мастацкімі — раманам, аповесцю, п'есай, паэмай і г. д., нікольні не адмяняючы іх, а наадварот — узбагачаючы.

Дакумент забяспечвае літаратуру праўдай, паэзіяй «нехлусні». Літаратура можа параўноўваць сябе з дакументалістыкай — гэта для яе важна.

Дакументальны матэрыял заўсёды плённа ўплываў на прозу, раман, даючы ім амаль, так сказаць, «гатовы змест» і напрамак далейшых пошукаў, актыўна ўплываючы на мастацкую форму.

Наватарскі пафас дакументалістыкі, якая разбурае клішэ, стэрэатыпнасць мыслення, несумненны. Дакументалісты ўмеюць браць «павесційную» форму з самога жыцця. Менавіта жыццёвы матэрыял вызначыў форму кнігі «Я — з вогненнай вёскі...». Маналогі яе герояў — гэта застыўшая плынь іх свядомасці, беражліва захаваны аўтарамі кнігі.

«Я вельмі перакананы,— прызнаецца Алесь Адамовіч,— што ніякая літаратура нават наблізіцца не здолее да той праўды, якая ў вачах, голасе, у словах тых людзей. Яны самі, адчуваецца, баяцца ўсёй сваёй памяці: уся не дазволіла б жыць...» («Вопросы литературы», 1970, № 6),

Мастацкая літаратура многае бярэ ў дакументалістыкі. Дастаеўскі знаходзіў у факце «глыбіню, якой няма ў Шэкспіра... Бо не толькі каб стварыць і пісаць мастацкія рэчы, але і каб толькі прыкмеціць факт, патрэбен таксама ў сваім родзе мастак». Некаторыя — магчыма, часткова ў сувязі з гэтай думкай Дастаеўскага, лічаць, што «сучасны» Шэкспір (г. зн. мастак яго маштаба) магчымы толькі на дакументальнай аснове. Не, думаецца, эстэтычная аснова сучаснай літаратуры ўсё ж такі шырэй, яна ўключае багаты свет уяўлення, здольны многае праясніць у самой рэчаіснасці. Будучы Шэкспір абавязкова выкарыстае і гэтыя паэтычныя магчымасці.

Дыялектыка дакументальнага і мастацкага складаная. Крытыка падкрэслівала аўтабіяграфізм і зварот да дакументальных форм у

Мележа, Быкава, Шамякіна, Чыгрынава, Сачанкі, што ў многім абумовіла пільнасць іх рэалізму. Ёсць свая заканамернасць і ў тым, што шэраг пісьменнікаў пасля стварэння раманаў, іншых традыцыйна-мастацкіх палотнаў звярталіся да рэчаў дакументальных. Не гаворачы ўжо пра тое, што дакументы, факты арганічна ўводзяцца ў жывую тканіну твора, не дазваляюць чытачу сумнявацца ў яго праўдзівасці.

«Схільнасць да сапраўднасці,— пісаў вядомы крытык І. Дзядкоў,— да «простай мовы», да максімальнай забяспечанасці літаратуры страсцю, мужнасцю, болем вельмі зразумелая і вельмі надзённая». Адзін са шляхоў сцвярджэння гэтай якасці ў літаратуры — дакументалізм. Яго рэзервы і магчымасці яшчэ далёка не вычарпаны. Памяць аб вайне — народная памяць — зберагае масу падзей, фактаў, сітуацый, думак, вобразаў, палажэнняў, якія патрэбна адшукаць, асэнсаваць, зрабіць набыткам сучаснага чытача. Мінуць гады і дзесяцігоддзі, а героіка-эпічныя пласты народнага жыцця, накшталт невычарпальнай крыніцы, заўсёды будуць жывіць нашу літаратуру і мастацтва, а лепшыя творы ў сваю чаргу будуць перадаваць, як эстафету, з пакалення ў пакаленне, ад сэрца да сэрца, залатыя россыпы яркага чалавечага лёсу, гераічных подзвігаў, неўміручых патрыятычных здзяйсненняў нашага народа.

Ганаровы абавязак літаратараў — усё зрабіць, каб дакументалістыка стала магутнай сілай духоўнага выхавання чалавечай асобы.

1978 г.

## Традыцыі Талстога і шляхі беларускага мастацкага слова

Імя і слова Талстога ў Беларусі былі заўсёды акружаны вялікай павагай і пашанай. «Леў Талстой,— сцвярджаў Кузьма Чорны,— пісьменнік сусветны, яго мастацкія вобразы пераўзышлі нацыянальнае, рускае. І таму ён быў адным з тых «вялікіх пісьменнікаў зямлі рускай, якія ўзнімалі беларускі народ да агульначалавечай культуры, укладваючы ў яе сваё нацыянальнае багацце».

Творы Талстога напоўнены мастацкімі прароцтвамі. У яго знаходзім тое, што літаратура XX стагоддзя прызнала за норму: паток свядомасці (напрыклад, маналог Анны па дарозе на станцыю, дзе яна кінецца пад поезд), «цякучасць» чалавечага характару, падсвядомая плынь дыялога, ёмістасць раманнай формы, вылучэнне і ўзбуйненне дэталяў (дуб Андрэя Балконскага, карэнінскія вушы і г. д.), якія раскрываюць унутраны свет герояў.

Вядомы французскі пісьменнік Андрэ Маруа наконт гэтага вельмі трапна сказаў: «Мы ўжо знаходзім у яго ўсё, што ў нашы дні аб'яўляюць наватарствам. Пачуццё адчужанасці, адзіноцтва. Душэўную трывогу. Хто адчуў гэта пачуццё мацней за Левіна, які, па цэлых днях працуючы з сялянамі, гаварыў сам сабе: «Што ж я такое? Дзе я? І нашто я тут?» А Фрэйд з яго тэорыяй падсвядомага — прачытайце: «Сцяпан Аркадзьевіч узяў капялюш і спыніўся, прыгадваючы, ці не забыў ён чаго. Аказалася, што ён нічога не забыў, акрамя таго, што хацеў забыць,— жонку». А Пруст і яго кніга «Паблізу дзяўчат у квецені»? Успомніце атмасферу таямнічасці, што акружыла ў свядомасці Левіна сёстраў Шчарбацкіх і канчаткова запаланіла яго. Сапраўды ўсё, што мы любім у літаратуры,— ужо было ў Талстога» («Литературное наследство», т. 75, I, М., 1965, стар. 220).

Добра вядома, што з чужога літаратура засвойвае толькі тое, што падрыхтавана мясцовай нацыянальнай глебай.

Беларуская літаратура, як і кожная іншая, развівалася перш за ўсё на падставе сваіх традыцый.

Глыбокі дэмакратызм, гуманізм, народнасць — вось сацыяльна-эстэтычныя рысы беларускага рэалізму пачатку XX стагоддзя, звязанага з традыцыйнымі матывамі сялянскай нядолі. Узнікаючы як літаратура пераважна «сялянская», яна, асабліва ў далейшым, змагла шырока адлюстраваць рэчаіснасць, новыя павевы і буйныя зрухі ў народнай свядомасці.

Паэтыка мастацкага слова — гэта яго эстэтычныя магчымасці, асаблівасці адлюстравання рэчаіснасці, мастацка-гістарычнае існаванне ў літаратуры такіх катэгорый, як свет прыроды і свет чалавека,

жыццё, прастора, час. Катэгорыі гэтыя гістарычна зменлівыя, рухомыя. У іх — шмат патэнцый развіцця, скрытых рэзерваў, неспазнаных сіл і магчымасцей.

Вобразнае пазнанне рэчаіснасці сіламі слоўнага мастацтва — літаратуры — вядзе да ўдасканалення самога слова, павелічэння кола шматстайных асацыяцый, якія выклікаюцца словам.

Навука не адмаўляе таго, што слова, мова, у якой адбываецца пастаянная праца духу, дыктуе чалавеку нормы пазнання, мыслення і сацыяльных паводзін: мы можам асэнсаваць, зразумець і здзейсніць толькі тое,— даводзяць вучоныя,— што закладзена ў нашай мове.

Вучоныя вылучаюць у мове дзве плыні: адна праяўляецца ў ажыўленні і канкрэтызацыі мовы, другая вядзе да абстрагавання. А. Патабня справядліва бачыў у слове зародак мастацкага твора. Такім было і беларускае слова — вобразным, прадметным, не страціўшым сваю «ўнутраную форму», але разам з тым даволі не спрактыкаваным у спасціжэнні сацыяльна-асабовых людскіх, чалавечых вузлоў. Яно знаходзілася па цяперашніх маштабах недзе на пачатку свайго мастацкага развіцця і мела надзённую патрэбу ў пашырэнні ўласнага кантэксту, асацыяцый, у якіх маглі б адбіцца прыкметы часу.

Вызваляючыся ад фальклорызму, сентыментальнасці, становячыся ўсё больш і больш асабовай, духоўна напоўненай, беларуская літаратура ўсё часцей звярталася да мастацкага вопыту буйнейшых пісьменнікаў сусветнай літаратуры, што значна паскарала яе развіццё.

Як дадатную якасць беларускай культуры трэба адзначыць яе адкрытасць разнастайным інтэрнацыянальным уплывам, у выніку якіх яна не толькі не страчвала сваё нацыянальнае аблічча, але і ўзбагачалася.

Проза наша, моцна настоеная на быце, шукала блізкіх сабе, роднасных традыцый. Пры гэтым нельга закрываць вачэй на далёка не аднолькавы характар і ўзровень рэалізму ў беларускай літаратуры ў параўнанні з суседнімі. Беларускія пісьменнікі-рэалісты, тыпізуючы жыццёвыя з'явы, радзей, чым хацелася б, спыняліся перад непаўторнасцю адзінкавага, асаблівага, прыватнага, больш аддаючы перавагу агульнаму, масаваму. Перад літаратурай стаялі задачы асветніцтва, агітацыі, абуджэння народнай свядомасці. Паступова гэтыя задачы ўскладняюцца: пашыраецца сацыяльна-эстэтычная аснова беларускай літаратуры, паглыбляецца мастацкае асэнсаванне той «вялікай патаемнасці, назва якой — жыццё» (Я. Ф. Карскі). Літаратура, пры ўсёй неадналінейнасці свайго развіцця, ішла да так уласцівай творчасці Талстога маштабнасці чалавечых, вобразных параметраў, да асэнсавання характэрных сацыяльна-псіхалагічных калізій XX ста-

годдзя, хоць пакуль што знаходзілася і на далёкай адлегласці ад гэтай мэты.

Уплыў Талстога на беларускую літаратуру ахопліваў усе формы сувязей — і кантактныя, і тыпалагічныя ў іх разнастайных адценнях, ён закранаў не толькі яе эстэтыку, але і сферу ідэйную. Творы яго друкаваліся ў свой час на старонках «Нашай нівы». Не толькі сярод сялян надзвычай папулярныя былі яго так званыя народныя апавяданні.

У літаратуразнаўстве ёсць паняцце «стыль напрамку». На ўзроўні гэтага паняцця можна гаварыць аб пэўнай тыпалагічнасці такіх з'яў, як творчасць Талстога і беларуская літаратура ў яе, зразумела, найбольш рэалістычнай частцы. Пры ўсёй іх мастацкай фенаменальнасці, непадабенстве.

У чым мне бачыцца агульны тыпалагічны ключ да гэтых з'яў?

З боку паэтыкі — у наяўнасці аб'ектыўнай тэндэнцыі ў стылі, тэндэнцыі, якая вядзе да адлюстравання жыцця, а не да яго пераўтварэння ці завастрэння.

Талстой бачыць жыццё ў яго цэласнасці і адлюстроўвае яго ў яго ж формах. Томас Ман вельмі тонка прыкмеціў: «Свет, магчыма, не ведаў другога мастака, у кім вечнаэпічны, гамераўскі пачатак быў бы такім моцным, як у Талстога». Гамераўскія падрабязнасці ў апісаннях, раўнамернасць святла, канкрэтнасць дэталяў, нагляднасць, пластычнасць — гэта даволі характэрна і для стылю Талстога. Гамераўскі размах, жыццялюбства, далучанасць да паэзіі жыцця, натуральнасць — гэта ёсць і ў Талстога.

Любімым героям Талстога адкрываюцца крыніцы простых жыццёвых радасцей. «Тут (маецца на ўвазе знаходжанне П'ера Бязухава ў палоне.— У. Г.), цяпер толькі, упершыню П'ер урэшце ацаніў асалоду яды, калі хацелася есці, пітва, калі хацелася піць, сну, калі хацелася спаць, цяпла, калі было холадна, гаворкі з чалавекам, калі хацелася гаварыць і паслухаць чалавечы голас».

Агульны паэтычны прынцып творчасці Талстога патрабаваў ад мастака цэласнасці пасціжэння свету, аб'ектыўнасці, сувязі яго з першаасновамі быцця, народнага погляду на рэчы. Ці не такі і наш Колас? Сувязь Якуба Коласа з эпічнымі прынцыпамі Талстога бачна, напрыклад, у «Новай зямлі». Усенародная маштабнасць мыслення, уяўленне аб карэнных каштоўнасцях народнага жыцця, унутраная стабільнасць, актыўнасць памяці і вострае адчуванне часу. Паэтыка пісьменніка арганічна звязана з яго ідэйнымі задумамі, светапоглядам. «Стыль гэтага пісьменніка,— казаў пра Коласа Алесь

Адамовіч,— просты і адначасова шматгранны і складаны. Гэта тое дзённае сонечнае святло, у складзе якога — усе колеры спектру».

Наследаванне Талстому адчувальна ў імкненні Я. Коласа ўсебакова паказаць свет сваіх герояў, далучанасць іх да паэзіі жыцця, уменні пісаць прыроду, быт, чэрпаць з жывой гаворкі. Колас арганічна спалучае высокі лірызм з прозаю будзённага жыцця, імкнецца да натуральнасці ў паказе свету.

Пры ўсім гэтым важна мець на ўвазе, што Гамер — свет міфалогіі. Талстой і Колас — рэальная гісторыя нашага часу.

Гамер сутыкаў асабістыя інтарэсы багоў і герояў. У творах Талстога і Коласа — сутыкненне, процістаянне грамадскіх, палітычных, класавых сіл. Яны вывелі на сцэну народ. Талстой ішоў да народа, парываючы з устоямі свайго класа, не прызнаючы мастацтва для выбраных, прадстаўнікі беларускай літаратуры ўзніміліся з самых народных нізоў.

Народны погляд на жыццё — асаблівасць светаўспрыняцця многіх беларускіх пісьменнікаў таго часу. Зрэшты, не толькі таго. У артыкуле «З думкай аб народзе» І. Мележ пісаў: «Галоўная думка, якая вызначае сэнс маіх кніг — і той, якая выйшла, і той, над якой я працую (гаворка ідзе пра «Палескую хроніку.— У. Г.), — гэта, калі карыстацца словамі Л. М. Талстога,— думка народная». І мы добра ведаем — гэта не дэкларацыя.

Апошнім часам мы часта дзелім нашу літаратуру, асабліва прозу, на «вясковую», «гарадскую», «ваенную» і г. д.— у гэтым ёсць, на мой погляд, значная доля ўмоўнасці, лакальнасці, якая нярэдка сур'ёзна перашкаджае пісьменнікам пазнаваць жыццё, ставіць больш агульныя праблемы, звязаныя карэннямі сваімі з глыбінямі народнага жыцця. Ёсць сучаснасць тэматыкі, а ёсць сучаснасць праблематыкі. Галоўны напрамак паступальнага руху нашай літаратуры, як мне ўяўляецца, праходзіць праз паглыбленне праблематыкі, маральнага пункта гледжання, выяўленне духоўнага патэнцыялу асобы. Гэта — таксама талстоўскі запавет. Літаратура, аналізуючы ўзаемадзеянне асобы і грамадства, павінна адказаць, як, у чым змяніўся сам чалавек, што каштоўнае ён набыў, што страціў і наколькі захаваў генетычную сувязь з часамі былымі, з народнымі вытокамі. У сучасным герою нам вельмі дарагі маштабны народны характар, абумоўлены рознымі бакамі грамадскага жыцця і працы, чалавек, якога не пакідае пачуццё адказнасці.

«Л. М. Талстой,— пісаў пра яго У. І. Ленін,— вялікі як выразнік тых ідэй і тых настрояў, якія склаліся ў мільёнаў рускага сялянства перад надыходам буржуазнай рэвалюцыі ў Расіі» (В. И. Ленин. Полн.

собр. соч., т. 17, стар. 210). Ён ставіў у сваіх творах, паводле выразу Уладзіміра Ільіча, «вялікія пытанні» — карэнныя праблемы чалавечага быцця: вайна і мір, антаганізм «вярхоў» і «нізоў», асоба і грамадства, роля мас у гістарычным працэсе. Беларус таксама пачынаў задумвацца над сваім лёсам, над асноўнымі пытаннямі быцця.

Важнейшая рыса позняга Талстога — рэзкае абвастрэнне сацыяльнага аналізу, сацыяльнага крытыцызму. Падобныя працэсы мелі месца і ў беларускай літаратуры — у творах Коласа, Бядулі, Гарэцкага, Цёткі, Ядвігіна Ш., Каганца, Гартнага. Яна брала на ўзбраенне талстоўскі «самы цвярозы рэалізм», як назваў яго У. І, Ленін. Рэалізм беларускай літаратуры паслядоўна ўзмацняў сваю сацыяльна-аналітычную скіраванасць, пераадольваў этнаграфічна-бытавую абмежаванасць, шукаў новыя падыходы да жыцця. У творах усё больш выразна адчуваецца асабовае, індывідуальнае. А хіба гэта не характэрна для рамана «Уваскрасенне» Талстога, дзе на кожнай старонцы бачна аўтарская суб'ектыўнасць (у найлепшым сэнсе гэтага слова), умяшанне ў падзеі, ацэнка.

Вывучэнне суб'ектыўна-асабовага пачатку, як ён выяўляецца ў творчасці, стылі,— адна з цэнтральных праблем паэтыкі.

Вобраз чалавека на вайне — самога аўтара, пісьменніка — мы ўбачылі ў дакументальным творы М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне». Я. Ф. Карскі трапна падкрэсліў яго ўменне «даходзіць да дэтальнай анатомікі, да фатаграфавання атамаў».

У Гарэцкага, які імкнуўся да дакладнасці, няма боязі перад словам паняційным, празаічным, нявобразным. Высокая дакладнасць і праўдзівасць у паказе душэўнага свету чалавека на вайне і самой вайны ў Гарэцкага (пра гэта пісалі А. Адамовіч, В. Каваленка і іншыя) мае свае маральныя і эстэтычныя вытокі ў «Севастопальскіх апавяданнях» і «Вайне і міры». У Талстога і Гарэцкага, у іх індывідуальнай пазіцыі прысутнічае народны пункт гледжання, адмаўленне імперыялістычнай бойні як вялікай народнай бяды.

Станаўленне беларускай літаратуры адбывалася праз настойлівае ўдасканаленне індывідуальнага мыслення пісьменнікаў. М. Гарэцкі ў сваёй «Гісторыі беларускай літаратуры» адзначаў, што развіццё яе ў XX стагоддзі было звязана з узмацненнем індывідуальных перажыванняў, з выпрабаваннем, як казаў Леў Мікалаевіч, матэрыялу на сабе. Нездарма пра яго творчасць гавораць як пра творчасць аўтабіяграфічную.

Рэвалюцыя 1905-1907 гадоў узняла на новы, значна больш высокі ўзровень развіцця беларускую літаратуру з усімі яе мастацкімі магчымасцямі, прадвызначыўшы з'яўленне і жанравае ўзбагачэнне

прозы, публіцыстыкі, крытыкі. У нашай літаратуры з'явіўся новы тып пісьменніка-барацьбіта за народную справу, непасрэднага ўдзельніка рэвалюцыйнага руху.

Эпічнасць, народнасць прозы не супярэчылі выяўленню індывідуальнага пачатку, які выступаў у складаных формах. Герой нярэдка аказваўся незалежным ад аўтара, часцей і часцей прад'яўляў права на ўнутраны маналог, самастойнасць. Рэалізм беларускіх пісьменнікаў узнімаўся да ўмення перадаць індывідуальнасць чалавека, шматмернасць яго душэўнага жыцця. Гэта ўменне тыпалагічна можна суаднесці са шматгалоснасцю талстоўскай прозы.

Мастацтва Талстога, аналізуючы духоўна-эстэтычныя суадносіны «чалавек і свет», валодала ўменнем заўважыць і паказаць індывідуальныя магчымасці чалавека. На гэтай падставе ён адкрываў новыя спосабы мастацкага абагульнення. Асабовасць, індывідуальнасць Талстой звязваў са шчырасцю. «Індывідуальнасць — гэта шчырасць,— гаварыў ён.— Калі будзеце шчыры, тады заўсёды будзеце індывідуальны».

З індывідуальнасці і вынікала шматгалоснасць. Так, проза Талстога рабілася шматгалоснай. Гэтую якасць потым назвалі яго «саборнай акусцікай».

Яго аналітызм узнавіў усю разнастайнасць і неаднароднасць жыцця і залежнасць чалавека ад буржуазнай рэчаіснасці, якая абмяжоўвала яго сілы і магчымасці. Беларуская літаратура таксама развіваецца па лініі ўзбуйнення духоўных маштабаў чалавечай асобы, супрацьпастаўлення яе буржуазнай рэчаіснасці. Гэтаму нашы пісьменнікі маглі таксама вучыцца ў Талстога.

Асабліва шырока да вопыту Талстога беларуская літаратура звярнулася недзе з сярэдзіны 20-х гадоў і пазней. Яна, насуперак усім цяжкасцям, ішла да вялікай, капітальнай прозы, да спалучэння псіхалагізму з сацыяльна-гістарычным аналізам рэчаіснасці.

Алесь Адамовіч у многіх сваіх работах доказна гаворыць аб уплыве Дастаеўскага на творчасць К. Чорнага, некаторых іншых беларускіх пісьменнікаў. З ім нельга не згадзіцца. Аднак уплыў Талстога быў не меншы, а магчыма, і большы. Прынамсі, ён быў больш арганічны.

Кузьма Чорны шмат чым абавязаны Л. М. Талстому. А найперш высокай культурай псіхалагічнага аналізу ў яго арганічнай спалучанасці з сацыяльным. Чорны, пачынаючы з кнігі «Пачуцці» (1926), свядома ставіць перад сабой як мастаком задачу «непрыкметна душой увайсці ва ўсе таямніцы, што ў жывых істотах захаваны, увайсці ласкава і ціха, з чыстымі думкамі і адчуваннямі». І гэта яму ў многім

удаецца. У 30-я гады ён захапляецца творамі Талстога, калі працуе над цыклам раманаў пра лёс роднага народа ад скасавання паншчыны да нашых дзён.

«Вайна і мір» і беларускі раман — гэта асобная, надзвычай змястоўная тэма. «Вайна і мір» аб'яднала ўсе разнавіднасці буйной празаічнай формы — філасофскую, гістарычную, сямейна-бытавую, публіцыстычную і г. д.

Я. Колас, М. Гарэцкі, К. Чорны, М. Лынькоў, І. Мележ, Я. Брыль, І. Шамякін, В. Быкаў, І. Навуменка, А. Адамовіч, А. Асіпенка, І. Чыгрынаў, Б. Сачанка, В. Адамчык, І. Пташнікаў — гэтыя і іншыя пісьменнікі адчувалі ў сваёй рабоце безумоўны ўплыў талстоўскага шэдэўра, у якім знаходзілі універсальны спосаб мастацкага пазнання. Талстой у сваім рамане-эпапеі даў новае ўяўленне аб мастацкім часе і прасторы. Талстоўскія супастаўленні вялікага і малога, спалучэнні выключнай дакладнасці назірання з шырынёй гістарычнага фону і ўнутранай прасторы, пераход ад аднаго да другога — усё гэта стала новым словам у развіцці паэтыкі і тэхнікі сусветнага рамана.

Яго ўрокі і вопыт яскрава бачны ў раманах І. Чыгрынава «Плач перапёлкі» і «Апраўданне крыві», у «Хатынскай аповесці» А. Адамовіча. Здавалася б, публіцыстычна напружаны, суб'ектыўна афарбаваны стыль А. Адамовіча не вельмі блізкі да эпічнай паэтыкі Талстога-раманіста. Аднак унутранае, глыбінна-філасофскае судакрананне ёсць. Яно — у руху, напрамку мастацкай думкі аўтара «Хатынскай аповесці», у тым, што ён з талстоўскай засяроджанасцю і бескампраміснасцю аналізуе свет чалавека, суадносіны ў ім розных пачаткаў, сцвярджае здольнасць яго на подзвіг. «Хатынская аповесць» належыць да тых твораў, якія — працягваючы духоўна-эстэтычныя традыцыі Л. М. Талстога — адкрываюць новыя далягляды ў асэнсаванні велічы народнага подзвігу, у пазнанні чалавека.

Каналы ўплыву Талстога на сучасную літаратуру ўвесь час павялічваюцца і пашыраюцца. У сучасных умовах — на новай сацыяльна-грамадскай аснове — паўстае пытанне аб самаўдасканаленні асобы, аб рабоце чалавека над сабой, аб яго непрымірымасці да ўсіх праяў сацыяльнага эгаізму — уласніцтва, спажывецтва, кар'ерызму, ханжаства — да ўсяго, што прыніжае чалавека, замінае яго росту, перашкаджае людзям быць людзьмі. Тут вельмі можа дапамагчы талстоўскі крытэрый бязлітаснасці раскрыцця чалавека, спасціжэння праўды аб ім. «Мастацтва,— паводле Талстога,— ёсць мікраскоп, які мастак наводзіць на таямніцы сваёй душы і паказвае гэтыя агульныя для ўсіх таямніцы людзям».

Ён разбурыў традыцыйныя мадэлі і каноны паказу чалавека. Ён адкрыў дынаміку, новыя суадносіны паміж зменлівым і ўстойлівым пачаткамі. «Адно з найвялікшых заблуджэнняў пры меркаванні пра чалавека,— казаў ён,— у тым, што мы называем, вызначаем чалавека разумным, дурным, добрым, злым, моцным, слабым, а чалавек ёсць усё: усе магчымасці, чалавек — плыннае рэчыва».

Станоўчы герой Талстога востра адчуў сваю асабістую адказнасць за свет, якая выявілася ў яго ў адзінстве маральных адносін да навакольнага. Гэтую адказнасць выхоўвае ў сабе герой нашай маладой прозы. Уплыў талстоўскай традыцыі адчувальны, напрыклад, у апавяданнях В. Гігевіча, героі якога часта пакутліва задумваюцца над сэнсам жыцця і сваім месцам у сучасным свеце.

У кожнага пісьменніка — «свой» Талстой, «свае» любімыя творы, ідэі і праблемы. Талстой натхняў беларускіх пісьменнікаў на самастойныя мастацкія адкрыцці, вучыў і вучыць не задавальняцца дасягнутым.

Сучасная наша літаратура ўсё паслядоўней пераходзіць ад статычных апісанняў да дынамікі, асацыятыўнасці, больш значнай духоўнай ёмістасці. У гэтым ёй дапамагае Л. М. Талстой.

З традыцыяй «Талстой — Гарэцкі» стылёва звязаны многія творы сучаснай прозы аб вайне. Гераічны летапіс народнага жыцця яны часцей і часцей спалучаюць з пазнаннем унутраных глыбінь чалавечай асобы.

Ад «Хаджы-Мурата» можна правесці сцежачку да прозы В. Быкава, да «жорсткага стылю» сучаснай ваеннай прозы. Перачытаем эпізод смерці Хаджы-Мурата: «Ён сабраў сілы, падняўся з-за завалу і стрэліў з пісталета ў падбягаўшага чалавека і пацэліў у яго. Чалавек упаў. Потым ён зусім вылез з ямы і з кінжалам пайшоў проста, цяжка кульгаючы, насустрач ворагам. Грымнула некалькі стрэлаў, ён пахіснуўся і ўпаў... Але тое, што здалося ім мёртвым целам, раптам заварушылася. Спачатку ўзнялася акрываўленая, без папахі, голеная галава, потым узнялося тулава, і, ухапіўшыся за дрэва, ён узняўся ўвесь. Ён здаваўся такім страшным, што падбягаўшыя спыніліся. Але раптам ён уздрыгнуў, адхіснуўся ад дрэва і з усяго росту, як падкошаны лопух, упаў на твар і ўжо не рухаўся... Больш ужо ён нічога не адчуваў, і ворагі тапталі і рэзалі тое, што не мела ўжо нічога агульнага з ім...»

Гэты эпізод прыгадваеш, чытаючы многія рэчы В. Быкава, нават самыя раннія — апавяданне «Смерць чалавека»:

«Чалавек ведаў, што трэба паўзці, а сіл ужо амаль не было. Некалькі доўгіх хвілін ён ляжаў ніцма, не варушачыся. Нялёгкі шлях і

страшнае відовішча мёртвай прагаліны зусім знясілілі яго. На момант кранухўшыся свядомасці, недзе ў адчуванні мільганула непрытомнасць, памутнела ўваччу. Чалавек спалохаўся, што зноў пазбавіцца пачуцця, і намогся зрабіць яшчэ некалькі рухаў.

Ішлі хвіліны. Заміраючы ад бяссілля, чалавек пасоўваўся крыху наперад, а потым зноў доўга ляжаў без руху. Пачуўшы, як слабее супраціўленне, смерць зноў насела на яго, і чалавеку не было чым абараняцца. Раз-пораз урываліся ў голаў пякельныя здані, і адчуванне рэчаіснасці чаргавалася з кашмарамі...

І раптам, нібы ад знешняга штуршка, чалавек схамянуўся і ачнуўся. Нейкае трывожнае прадчуванне назаляла яму, і чалавек не адразу ўцяміў, што яно азначае. А потым, не ведаючы яшчэ, тое гэта было ці не, ён намацаў рукою кішэню і выняў гранату. Прывычным рухам пальцы адагнулі чаку, а зубы, у якіх больш захавалася моцы, выцягнулі яе з запала. Зноў адчуўшы набліжэнне млосці, чалавек, не адпускаючы планкі, сунуў гранату ў пясок пад свае грудзі...»

І паміраючы чалавек змагаецца, кладзе сабе пад грудзі гранату, на якой узрываюцца ворагі.

Літаратура,— вучыў Талстой,— павінна адстойваць гераічны кірунак у нашым жыцці. В. Быкаў якраз вельмі блізкі да яго сваім уменнем ствараць моцныя, паўнакроўныя характары герояў, якія дапамагаюць нашаму сучасніку ў яго роздуме аб быцці, прызначэнні чалавека, сэнсе яго існавання, жыцці і смерці, разуменні дабра і зла. Важнасць гэтай праблематыкі сёння незвычайна ўзрасла.

Адсюль пажаданне — каб у нашай літаратуры ярчэй выяўляўся асабовы пачатак — і ў пісьменніка, і ў яго героя. Узмацненне гэтага пачатку звязана з больш смелым зваротам пісьменнікаў да складаных і адказных тэм і праблем і ў такой жа ступені з інтэнсіўнымі мастацка-стылёвымі пошукамі новых для беларускай літаратуры павесцiйных структур, элементаў складанай паэтыкі, узмацненнем суб'ектыўнасці пісьма, падпарадкаванага выхаду на праблемныя мастацка-філасофскія абагульненні.

Андрэ Маруа меў рацыю, і сучаснае наватарства лагічна і заканамерна многімі сваімі вытокамі карэніцца ў спадчыне, якую пакінуў нам Талстой.

«Кнігі Талстога,— пісаў Якуб Колас,— гэта не проста кнігі, нашы добрыя сябры, гэта само жыццё, поўнае страсцей, дзеянняў і перажыванняў, гэта сама праўда, мастацкая настолькі, што выходзіць за межы мастацтва, каб заўсёды заставацца сапраўды чыстай праўдай... Мы з гордасцю сцвярджаем, што Леў Талстой з'яўляецца настаўнікам беларускай літаратуры».

## Думкі пра Мележа

Ведаў я Івана Мележа, як і ўсе, даўно — па творах. Кнігу апавяданняў «У завіруху» прачытаў яшчэ ў 1947 годзе. Помню марозны зімні вечар, сяджу на цёплай печы, цьмяна свеціць падвешаная да столі газнічка (кнот «укручаны» — ашчаджаем газу), сачу за лёсам герояў, за цікавымі падзеямі.

Бабка (яна была непісьменная) просіць:

— Чытай уголас!

І я чытаю:

«— ...Цяпер ён быў у нейкім забыцці ад нечалавечай стомы. Спатыкнуўшыся, ён упаў у снег і ляжаў колькі хвілін нерухома і маўкліва. Конь пастаяў крыху, пачакаў, потым занепакоіўся, шмаргануў повад раз, другі. Засмужац бяздумна павярнуўся і ўбачыў над сабою храпу каня: галава каня здавалася незвычайна вялікай. Каштан пазіраў круглымі вачыма трывожна і нецярпліва...»

Гэта было цікава. Пісьменнік надзвычай праўдзіва, пераканаўча паказваў чалавека ў жорсткіх абставінах вайны. Праўда выклікала давер, суперажыванне. Гадоў праз дзесяць — пятнаццаць яна стане галоўным крытэрыем ваеннай літаратуры, узніме ў ёй «другую хвалю». Але моцныя, маральна забяспечаныя парасткі гэтай праўдзівасці былі ўжо ў ранняга Мележа.

Убачыў упершыню Івана Паўлавіча ў годзе 1962-м, у клубе Саюза пісьменнікаў па вуліцы Энгельса. Быў вечар апавядання (зараз такія мерапрыемствы чамусьці забыты), вёў Мележ. Здзівіла яго тактоўнасць, павага да творчасці таварышаў, што чыталі свае апавяданні, натуральнасць паводзін і рухаў.

З гэтага часу, здаецца, і пачало ўмацоўвацца наша знаёмства.

Бывае, пры сустрэчы чалавек пытаецца: «Як жывеш?!», «Як сям'я?» Хочаш нешта адказаць: жывыя, маўляў, і здаровыя пакуль што. А ён, аказваецца, цябе не слухае, хоць і трымае за гузік. Спытаўся, відаць, для «ветлівасці» і пачаў гамонку пра іншае, пра сваё.

Іван Паўлавіч быў не з такіх. Ён любіў пытаць і ўмеў слухаць. Слухаць не раўнадушна, а актыўна, зацікаўлена.

— Як жывяце? Як сям'я?

— Пакуль што адзін, халасцяк.

— А колькі вам?

— Ды за трыццаць ужо...

— Калі ж тады застаецца жыць,— спакойна, філасофскі мудра ўшчувае ён мяне.

У 60-я гады ён, інтэнсіўна працуючы над палескімі раманамі, час ад часу заходзіў у Інстытут літаратуры імя Я. Купалы абмяняцца думкамі пра апублікаванае, паслухаць братоў-літаратуразнаўцаў.

Мяне і маіх таварышаў вабілі ў Мележу яго мастакоўскі аўтарытэт, самастойнасць, самавітая асоба з незалежнасцю думкі і ў той жа час жаданне зразумець цябе, праверыць тваю думку, стаўшы на твой пункт погляду.

Абсяг яго турбот і клопатаў быў надзвычай шырокі. Але перш за ўсё ён быў аддань літаратуры.

Літаратура была яго і клопатам, і радасцю, як для селяніна поле. У гэтым паняцці, здаецца, сыходзілася ўсё.

І галоўным, трэба сказаць, была якасць! Ён нязменна дбаў пра высокі ідэйна-маральны ўзровень нашага мастацтва, пра тое, каб літаратура заставалася літаратурай, г. зн. сапраўдным мастацтвам — без скідак на архісучасную тэму ці праблематыку, без палёгкі... І даваў прыклад — сваёй творчасцю, сваімі раманамі.

Мемуары — жанр цікавы. Яго мажлівасці — значныя, але ўсё ж такі абмежаваныя. Успаміны ёсць успаміны. Але да ўспамінаў далучаюцца вобразы прачытанага, вобразы мележаўскай духоўнай спадчыны, пры гэтым многія з іх праз тое, як яны адбіліся ў люстры крытыкі, літаратуразнаўства,— і ўсё гэта разам — як штрыхі да партрэта — вымалёўвае, выхоплівае з бягучага часу непаўторную постаць мастака і чалавека.

Мележ — цэлы этап беларускай раманістыкі. Пры гэтым — новы этап, які разам з тым мае не малыя традыцыі ў нашым рэалізме, у даследаванні складаных чалавечых характараў, псіхалогіі — асабліва псіхалогіі сялянства.

Ён ганарыўся сваім вялікім настаўнікам — Кузьмой Чорным, які паспеў прачытаць першае ягонае апавяданне «У завіруху» (і прысвечанае, дарэчы, К. Чорнаму), разгадаў яго талент, прымусіў пачаткоўца паверыць у свае сілы. Мне згадваюцца яго ўспаміны пра Чорнага — удзячныя і пяшчотныя. Не без уплыву чорнаўскай школы ён стаў развіваць сацыяльна-псіхалагічны падыход да жыццёвых з'яў, знаходзячы для яго сваё стылёвае ўвасабленне — эпічна грунтоўнае і шматграннае.

Чорны — Мележ — адна з самых рэальных і плённых традыцый у нашай прозе. «Чалавек — гэта цэлы свет» — сцвярджае яна.

Каб глыбей зразумець сучасніка, Мележ звяртаўся да мінулых дзесяцігоддзяў, да лёсу сялянства ў пераломны момант гісторыі. Яго зварот па часе быў першым, які шмат апярэдзіў творы іншых савецкіх пісьменнікаў 60-х гадоў, блізкіх яму сваёй праблематыкай.

«Мы вярталіся да мінулага,— гаворыць ён пра вяртанне літаратуры да тэмы калектывізацыі,— зусім не для таго, каб паўтарыць тое, што казалі іншыя... Мы спрабавалі зрабіць новы крок уперад і ўглыб».

І спроба аказалася ўдалай.

Сёння шмат гавораць пра асабісты пачатак у літаратуры, які выяўляецца ў ёй шматпланава і надзвычай разнастайна. «Маё жыццё», «мая вёска», «мая вайна» — сваё, перажытае, адчутае розумам і сэрцам. Свет, узноўлены ў мастацкім творы, атрымлівае пячаць пісьменніцкай асобы. Як частка асабістага жыццёвага і духоўнага вопыту, узведзенага ў ступень агульназначнага, агульнанароднага.

Мележаўскія Курані ўвайшлі ў вялікую літаратуру, як Грамячы Лог М. Шолахава, Дзівайская воласць (Скрыверы) А. Упіта, акруга Іокнапатофа У. Фолкнера, графства Уэсэкс вядомага англійскага раманіста Томаса Гардзі, Льгоў І. С. Тургенева. Далёка вядомы за межамі Беларусі мележаўскія Курані, у якіх адлюстраваўся цэлы свет сацыяльных і індывідуальных страсцей, думак, перажыванняў.

Сапраўдная і ўсебаковая культура, вытокі якой карэняцца ў роднай палескай глебе, вельмі характэрна Мележу. Ён ішоў да яе вышынь, не забываючы пра свае «родавыя» пласты марэльных каштоўнасцей. Яго светапогляд уключаў, у шэрагу іншых вельмі важных аспектаў, успрыняцце і разуменне ім жыцця як вялікага і неацэннага дару, якога чалавек павінен быць варты. Адчуванне паэзіі жыцця, чалавечага асяроддзя — адна з самых прываблівых рыс «Палескай хронікі» — садзейнічае духоўнаму напаўненню твора, узбагачае яго гуманістычную канцэпцыю.

Гэты, вобразна кажучы, «селянін» з'яўляўся ў асяроддзі беларускіх літаратараў (большасць з якіх — з сялян) узорам сапраўднага інтэлігента. Быццам бы пра яго — пра Івана Паўлавіча — пранікнёна сказаў яго сучаснік Васілій Шукшын: «Явление это — интеллигентный человек — редкое. Это — неспокойная совесть, ум, полное отсутствие голоса, когда требуется — для созвучия — «подпеть» могучему басу сильного мира сего, горький разлад с самим собой из-зэ проклятого вопроса: «Что есть правда?», гордость... Если все это в одном человеке,— он интеллигент. Но и это не все. Интеллигент знает, что интеллигентность — не самоцель... Какой он такой, интеллигентный человек?.. Образ его создал сам народ. Только он называет его — хороший человек. Умный человек. Уважительный. Не мот, не пропойца. Чистоплотный. Не трепач. Не охальник. Работник. Мастер».

Неяк давялося мне быць разам з Барысам Сачанкам у Івана Паўлавіча дома. Было гэта напрадвесні, здаецца, 1976 года. Трэцяя

частка хронікі — «Завеі, снежань» — была ўжо здадзена ў «Полымя», думка сягала далей, у наступнае. Іван Паўлавіч любіў паслухаць меркаванні чалавека пра свае творы — пра «Палескую хроніку» асабліва. Гаворка зайшла пра перыяд калектывізацыі, пра яе ходу ў Беларусі, пра творы, прысвечаныя ёй (Шолахаў, Панфёраў і інш.). Перад гэтым мне давялося прачытаць цікавыя, багатыя жыццёвымі фактамі ўспаміны Н. Ф. Губскага, якія меліся друкавацца ў выдавецтве «Беларусь». Факты, аднак, не дужа цікавілі Івана Паўлавіча. Яго думка даўно ўжо спасцігла знешне эмпірычны пласт эпохі і к таму часу дасягала новых даляглядаў — гістарычных, сацыяльных, філасофскіх.

Пісьменнік рухаўся да надзвычай маштабных абагульненняў, яркіх мастацкіх адкрыццяў.

Адно з такіх адкрыццяў — Іван Анісімавіч Апейка. Ён, між іншым, больш, чым іншыя героі, нагадвае мне постаць самога Мележа, яго характар і асобу. Апейка ў значнай ступені — вынік аўтарскага самавыяўлення, сцвярджэння сваіх асабістых гуманістычных ідэалаў.

Мае рацыю Дз. Бугаёў, калі падкрэслівае, што ў асобе Апейкі Іван Мележ «паказаў маштабны характар камуніста-ленінца, сфармаваны складанымі ўмовамі рэвалюцыйнага часу. У гэтым сапраўды народным па сваіх глыбінных вытоках характары знайшла сваё яркае ўвасабленне гуманістычная сутнасць сацыялістычнага грамадства».

А хіба не падобны на яго сам Мележ?

Здзіўлялі яго мяккасць і ўпартасць, партыйнасць і грамадзянская прынцыповасць пазіцыі, выклікала павагу адзінства думкі і ўчынку. Яно — гэтае адзінства, цэласнасць — адлюстравалася ў выступленнях, у творах.

Іван Паўлавіч часта наведваў ЦК Кампартыі Беларусі, Вярхоўны Савет, Савет Міністраў БССР па неадкладных дзяржаўнага значэння справах, раіўся, і з ім раіліся таксама. Паважалі.

У лістападзе 1969 года адбыўся пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечаны падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Мне давялося быць сведкам, як І. П. Мележ — у той час сакратар праўлення беларускай пісьменніцкай арганізацыі — працаваў над дакладам, з якім выступіў на пленуме. «На шырокай плыні жыцця і часу» — так называлася гэтая яго работа, у якой знайшлі глыбокае асвятленне гістарычныя шляхі беларускай савецкай літаратуры, роля ленінскіх ідэй у яе станаўленні як літаратуры савецкай, непарыўна звязанай з народам і партыяй камуністаў. Даклад Мележа захапіў прысутных.

«Думаецца,— казаў ён,— нельга не падтрымліваць права кожнага пісьменніка пісаць пра тое, што яго хвалюе, што ён ведае, калі гэта толькі мае значэнне для літаратуры, для народа. Трэба падтрымліваць і цяпер усе значныя творы, над якімі працуюць таварышы, і жадаць з поспехам завяршыць іх. Трэба бачыць шырока наша літаратурнае поле. Але ёсць і другі бок справы. Ёсць жыццё, якое ідзе і якое дыктуе свае права, і ёсць чытач, які таксама патрабуе кніг пра новае.

А мы гэтых кніг даём вельмі мала. Трэба быць больш чулым да жыцця. Быць у ім, у самым яго віры. Сярод тых, хто робіць яго,— калгаснікаў, рабочых, інжынераў, салдат».

Чалавечае асяроддзе вабіла яго.

Іван Паўлавіч умеў уважліва выслухаць чалавека, умеў і любіў «адкрываць» чалавека.

— Цікавы чалавек! — гаварыў ён пра каго-небудзь з новых знаёмых і дадаваў:— А мы і не прыкмячалі...

Радаваўся, калі новы знаёмы спраўджваў яго спадзяванні.

А колькім літаратарам ён даў у свет дарогу!

Добра помніцца, як ён падтрымаў крытыка Серафіма Андраюка з выданнем кнігі артыкулаў.

Дапамагаў ён і многім іншым. Калі ў часопісе «Маладосць» з'явіліся ў поўным, нескарочаным выглядзе мележаўскія ваенныя дзённікі (у першым зборы твораў у шасці тамах былі змешчаны ўрыўкі), я надрукаваў рэцэнзію. Іван Паўлавіч жартаваў: «Вы напісалі рэцэнзію на мой самы першы твор». Свае дзённікі ён лічыў першым творам.

З рускіх савецкіх раманістаў асабліва любіў Шолахава. Памятаю, калі на VI з'ездзе савецкіх пісьменнікаў у Маскве (1976 год), на адной з творчых секцый госць з Польшчы Ежы Путрамант сказаў пра «Ціхі Дон» не столькі як аб з'яве сучаснага літаратурнага працэсу, колькі як пра факт гістарычны, так сказаць, непаўторны, які мала ўплывае на цяперашнія пошукі мастакоў, Іван Паўлавіч быў асабіста незадаволены, нават, мне падалося, пакрыўджаны. Хацеў выступіць, але не адчуваў сябе здаровым, устрымаўся. Талент эпічнасці, эпічнасць мыслення ён заўсёды ставіў вельмі высока. У яго ўяўленні гэта была адзнака народнасці мастацтва.

У Івана Паўлавіча было шмат шчырых сяброў.

Не раз даводзілася адчуць меру народнай любві, якой Іван Паўлавіч быў акружаны пры жыцці, меру любві і памяць аб ім, якія жывуць і будуць жыць.

Засталося ў памяці святкаванне 50-годдзя Івана Паўлавіча ў 1971 годзе. Вечар адбыўся ў Доме акцёра, які, вядома, не мог змясціць усіх мінчан — прыхільнікаў таленту аўтара «Палескай хронікі», а

таксама яго землякоў, усіх, хто прыехаў, каб ушанаваць народнага пісьменніка.

Колькі памятаю Івана Паўлавіча — ён быў заўсёды задумёны, пагружаны ў сябе, «з думаю на чале», маўклівы.

Шмат пісаў...

Прыгадваецца сказанае яму Кузьмой Чорным напрыканцы вайны, у Маскве:

«— Прыеду ў Мінск — абавязкова пасялюся дзе-небудзь на ціхай вуліцы. У драўляным дамочку. Каб ціха было і каб можна было пісаць, пісаць, пакуль аж рука не забаліць. Як у касца...»

Глыбока засталося ў памяці апошняе выступленне І. П. Мележа — на VII з'ездзе пісьменнікаў Беларусі ў маі 1976 года (надрукаванае потым у «Маладосці»). Ён доўга вагаўся і выступіў толькі на другі дзень, у канцы. Але з такога выступлення можна было б пачаць работу з'езда. Мележ задаваў тон — з'езду, літаратуры ў цэлым.

Клопатам яго было — паспець усё сказаць. Пры гэтым ён кіраваўся максімалісцкім маральна-эстэтычным патрабаваннем, якое пакінулі нам выдатныя майстры мінулага: «Пішы, як жывеш, пішы, быццам бы пішаш тэстамент, завяшчанне». Гэта значыць, пішы, не адхіляючыся ад праўды, будзь ёй верны. Верны жыццю!

Гэтае патрабаванне засталося і ягоным запаветам.

Такім я яго помню.

1978 г.

## «Я — сведка ўсіх падзей»

У паэзіі Аркадзя Куляшова час ад часу ўзнікае хвалюючы вобраз бязмежнага акіяна — то рэальнага, Атлантычнага, якім паэт вяртаўся некалі на радзіму (пасля ўдзелу ў рабоце сесіі ААН у 1962 годзе), то метафарычнага, пад якім трэба разумець жыццё, сучаснасць, вірлівую эпоху сярэдзіны і другой палавіны дваццатага стагоддзя. Творы нашага паэта даюць, на мой погляд, праўдзівую карціну нашага веку ў «акіянскай» складанасці яго востраканфліктных супярэчнасцей і глабальных праблем, менавіта ім, дваццатым векам, народжаных. І адразу хочацца дадаць, што гэтая куляшоўская карціна прасякнута глыбокай верай у гістарычны аптымізм, які заўсёды жывіў лепшыя творы савецкай паэзіі і якім заўсёды быў да канца апладненні светапогляд паэта, яго актыўнае баявое сцвярджэнне чалавечнасці, бескампраміснае непрыняцце зла, крывадушша і нявернасці.

«У ліку неабходных умоў, якія складаюць ісціннага паэта, павінна абавязкова быць сучаснасць. Паэт больш, чым хто-небудзь, павінен быць сынам свайго часу». Так патрабаваў В. Бялінскі. Куляшоў — адзін з тых паэтаў, якія асабліва востра адчуваюць свой час. Яго ідэйна-грамадзянская пазіцыя заўсёды была надзвычай выразнай:

Сцягам патрэбен вецер, мне — сцягі.
Але не тыя, што на літасць сцюжам
Здаюцца, сустракаючы зіму...
Ні перад злом, ні перад крывадушшам
Сцяг белы я ніколі не ўзніму...

У апошніх кнігах і творах паэта 60-70-х гадоў вельмі ўзбагаціўся лірычны характар паэта, яго гуманістычны змест. «За всіх скажу, за всіх переболію»,— гаварыў некалі Паўло Тычына. Такое адчуванне свайго месца ў сённяшнім свеце і сваёй сацыяльна-гістарычнай адказнасці за яго лёс характэрна і для Куляшова. Трывожным набатам гудуць у яго паэзіі званы Хатыні, а ў памяці жывуць загінуўшыя на вайне сябры, «салдаты веку».

Сябры, каго вайна скасіла кулямі,
Дыханне ваша чую за спіной.
Зноў грозна, разварушанымі вуллямі
Гудуць франты... Не ціхне вечны бой.
Вам цяжка дыхаць, вы ў адчаі просіце
Зямлю, каб адпусціла вас назад
На вольны свет. Я знаю, вы зайздросціце

Жывым. А ім хіба лягчэй нашмат?

З верша ў верш, непасрэдна і апасродкавана, ён нястомна сцвярджае ваяўнічасць сваіх ідэйных і маральных пазіцый у сучасным свеце, калі «снайперская куля крывадушна на мушку сэрца ловіць кожны міг». Адсюль зразумела і маральнае самаадчуванне паэта і яго патрабавальнасць да самога сябе: «Сябе я адчуваю як на фронце — не ў медсанбаце, не ў трафейнай роце, а пехацінцам на перадавой».

Глыбокая сувязь са сваім часам памножыла маштабы асобы паэта і яго героя, абумовіла і завастрыла праблемнасць лірыкі. Праблемнасць у дадзеным выпадку — галоўны фактар паэтычнай творчасці як працэсу пазнання і асэнсавання жыцця. У гэтым сэнсе звяртае на сябе ўвагу, напрыклад, верш «Сасна і бяроза», які, мне здаецца, вельмі характэрны для сённяшняй беларускай паэзіі з яе напружаным роздумам аб часе і чалавеку:

Трымаюць Зямлю без падважнікаў тых,
Без мудрага троса
Жывымі радкамі карэнняў сваіх
Сасна і бяроза.

Гэты касмічны па сваёй форме вобраз змяшчае вельмі зямныя, чалавечыя перажыванні — трывогу за лёс зялёнага свету прыроды, бо «могуць пад крыжам закончыць свой век сасна і бяроза», і наогул неспакой за лёс зямной цывілізацыі і самога чалавека другой паловіны XX стагоддзя: «А што, як Зямлю нашу выпусцяць з рук сасна і бяроза?»

Паэт добра ведае, што ва ўмовах сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі пытанні ўзаемадзеяння чалавека і прыроды набываюць асаблівую вастрыню не толькі ў сацыяльна-эканамічных або тэхнічных адносінах, але і ў маральных. Так, чалавек дзейнічае як магутная сіла, ствараючы новыя вадасховішчы, мяняючы плыні рэк, выкарыстоўваючы нетры зямлі, будуючы плаціны, ствараючы гіганцкія прамысловыя комплексы і г. д. Яго навукова-тэхнічная дзейнасць сягнула далёка за межы планеты, набыўшы глабальны характар. Але прырода не пасіўны аб'ект панавання чалавека, і гэтае яго «панаванне» зусім не бязмежнае. На ўсякае ўмяшанне ў натуральны ход сваіх працэсаў прырода пэўным чынам рэагуе. Чалавек нясе адказнасць за Зямлю з сасной і бярозай на ёй. Гэтая думка выказана паэтам праз «біяграфію» дрэў:

Ад дыму да пары ў пякельных катлах
Судна, паравоза
Прайшлі яны поруч гарачы свой шлях,

Сасна і бяроза.
Лягла на іх плечы цяжарам вайны
Акопная проза:
Служыла салдатам сасна — для труны,
Для крыжа — бяроза.
Знікала з тузоў, гандляваўшых крывёй,
Пыхлівая поза,
Калі перад імі ўставалі з пятлёй
Сасна і бяроза.
Ад явы крывавай не вынайшлі лек...
І ўзнікла пагроза,
Што могуць пад крыжам закончыць свой век
Сасна і бяроза...

Меў рацыю П. Панчанка, які адзначаў у свой час, што «Куляшоў, як ніхто, любіць паэтычную дэталь, шліфуе верш, каб ён іскрыўся ўсімі гранямі чалавечых пачуццяў, ён чуйны да самых тонкіх рухаў чалавечай душы. Але дэталі, падрабязнасць паказу чалавечага жыцця ніколі не засланяюць асноўную гуманістычную ідэю».

У вершы «Сасна і бяроза» яна абагульнена ў наступным пытанні:

Над імі ракетны ўзрываецца гук
І гул бамбавоза...
А што, як Зямлю нашу выпусцяць з рук
Сасна і бяроза?

Паэзія Куляшова здаецца нам вельмі сучаснай сваім зместам, яна сцвярджае глыбіню і маштабнасць чалавечай думкі, роўнай свайму веку, блізкай да ягоных трывог і клопатаў. Гэта своеасаблівы глыбока філасофскі роздум мужнага чалавека над карэннымі праблемамі сучаснага быцця, над праблемамі ўзаемаадносін часу і чалавека. Яна красамоўна сведчыць аб тым, наколькі пашырыўся мастацкі свет Куляшова і абнавілася адчуванне часу і прасторы ў яго кнігах і, з другога боку, як узбагацілася лірычнае «я» паэта і яго героя, здольнага думаць глыбока і арыгінальна.

З гэтага пункта гледжання А'. Куляшоў — выдатны прыклад паэта-наватара, які смела развіваў класічныя традыцыі нашай паэзіі.

Сёння шмат спрачаюцца пра сувязь паміж хуткаплыннай, зменлівай рэчаіснасцю і мастацкімі формамі і стылямі. Яна, безумоўна, існуе, але яна куды складаней, чым гэта ўяўляе сабе, скажам, В. Мыслівец у артыкуле «Зразумець чалавека» («ЛІМ», 9.VIII.1974 г.): «...як музыка пераходзіла ад запаволеных, стройных і ясных па гучанню мелодый да кароткіх, абрывістых ударных фраз, раскрываючы перажыванні чалавека ў наш тэхнічны, атамна-ракетны

час»,— піша ён, спасылаючыся на нейкіх музыказнаўцаў,— так, маўляў, «і літаратура не стаяла на месцы». Вядома, не стаяла і не стаіць. І той тэлеграфна-«адрывісты» стыль, пра які гаворыць Мыслівец, вядомы ёй даўно, і яго можна разглядаць як у пэўнай меры традыцыйны. Дарэчы, менавіта такога — «адрывістага», суб'ектывізаванага — стылю прытрымліваўся А. Куляшоў у сваіх паэмах пачатку 30-х гадоў «Крыўда» і «Аманал». Але з цягам часу вымушаны быў ад яго адмовіцца і звярнуцца да больш гарманізаванай паэтычнай мовы, у якой выяўляецца шматвяковая культурная традыцыя.

Паэтыка, майстэрства — важныя грані наватарства паэта. Мастацкае майстэрства, як і ўсе іншыя літаратуразнаўчыя паняцці,— з'ява рухомая. Помню, адзін час (хоць бы ў тыя ж 50-я гады) яно разумелася некаторымі літаратарамі неяк абвужана: мова, рыфма, рытм, алітэрацыя... Што й казаць, рэчы ў паэзіі надзвычай важныя, неабходныя, яе, можна сказаць, «першаэлементы», але не з іх пачынаецца паэзія і само майстэрства. Апошняе, на маю думку, больш звязана з майстрам. І не толькі з яго рамяством, умельствам, а ў першую чаргу з яго асобаю. У тым значэнні, як яго разумеў Гегель: «Тут (у паэзіі.— У. Г.),— казаў ён,— чалавек у сваёй суб'ектыўнай задушэўнасці сам робіцца творам мастацтва». Мы не гаворым пра талент, ён — рэч абавязковая, наяўнасць якой разумеецца сама сабой.

І калі мы сёння гаворым пра «сацыяльны заказ», то маем на ўвазе «заказ», прапушчаны праз сэрца мастака, зрошчаны з яго свядомасцю, ідэйна-творчымі перакананнямі.

Практычна майстэрства, на маю думку, якраз і пачынаецца з выбару тэмы. Творы кан'юнктурныя напісаны звычайна па-рамесніцку (маўляў, тэма вывезе), нягледзячы на тое, што сярод іх аўтараў нярэдка значацца імёны вядомых, і не без таленту, пісьменнікаў. Чаму так здараецца? А таму, што аўтар звярнуўся да гэтай тэмы не па ўласнай унутранай патрэбе (яна для яго, відаць, яшчэ і «не паспела»), не загарэўся ёю, не разгледзеў у ёй праблему, а падышоў да яе холадна, як да чужой, г. зн. па-рамесніцку, і толькі.

Што надае творчасці А. Куляшова ўнутраную цэласнасць і гарманічнасць? Перш за ўсё — наяўнасць і прысутнасць у ёй чалавечай асобы, якая «збірае» і змацоўвае перажыванні паэта ў значнае сацыяльна-мастацкае адзінства. Асоба мастака заўсёды азначала вельмі шмат. «Чаму Канцеміра чытаеш з асалодай? Таму, што ён піша пра сябе. Чаму Шалікава чытаеш з прыкрасцю? Таму, што ён піша пра сябе» — у гэтым жарце К. Бацюшкава шмат праўды. Важна, што складае змест асобы: народнасць і партыйнасць мастака, сувязь яго з

передавымі ідэаламі часу, вастрыня грамадзянскасці, духоўная напоўненасць.

Асоба — як сукупнасць пэўных грамадскіх адносін — гэта і свой духоўны свет, які ўключае пэўны комплекс ідэй, ідэалагічны матэрыял, багаты і разнастайны спектр пачуццяў, адценняў мыслення. Думаецца, гэта і дало падставу П. Панчанку назваць паэзію Аркадзя Куляшова «духоўнай энцыклапедыяй яго пакалення».

Асоба... У люстра яе ўнутранага свету ўважліва ўглядаецца сучасная літаратура і бачыць там «макрасвет» сацыяльных калізій і страсцей нашага стагоддзя.

Прыгадваючы вядомы верш М. Ушакова пра ластаўку («Полетела ласточка к Шекспиру, жду, когда вернется от него»), Аркадзь Куляшоў гаворыць аб гэтай асаблівасці сучаснай паэзіі (у сувязі з паэмай Д. Кугульцінава «Бунт розуму»): «У многіх вершах і паэмах, што напісаны за апошняе дзесяцігоддзе; выразна можна адчуць гэтую сувязь з той паляцеўшай да Шэкспіра ластаўкай. Выклікана гэта, вядома ж, не адважным намерам паэтаў пацягацца ў адзінаборстве з неперапераўзыдзенымі творамі, а патрабаваннем часу. Надзелены, па выразу Бялінскага, «светаабдымным розумам», Шэкспір з'явіўся перад нашым векам у новай якасці. Мы раптам адкрылі ў ім сябе, убачылі ў яго трагедыях і санетах нешта такое, што было недасягальна для вякоў мінулых. Трагедыі Рамэо і Джульеты, караля Ліра, Гамлета, пераступіўшы сямейныя парогі, выявілі, як ніколі раней, свой сапраўды глабальны маштаб і сэнс. Злачынствы герояў Шэкспіра не паменшыліся перад злачынствамі ў Бухенвальдах і Асвенцімах, у Хірасіме і Нагасакі, а толькі паказалі нам іх нечасовую злавесную сутнасць. Адкрыты Шэкспірам свет моцных чалавечых пачуццяў, здольных, у крайнім іх праяўленні, як на высакародныя ўчынкі, так і на ганебнае чорнае зло, зліўся ў нашым уяўленні з найвялікшымі дасягненнямі сучаснай навукі — адкрыццём атамнай энергіі. Свет непакоіць неадчэпная думка аб новым Яга, які кіруе палётам ракеты, начыненай тэрмаядзернай смерцю...»

Заглыбленне ў свет асобы, спасціжэнне яе сутнасці вельмі характэрна для Куляшова 60-70-х гадоў. Яго вершы і паэмы, скіраваныя на асэнсаванне значных праблем сучаснасці, стварэнне дасканалых вобразаў, сведчаць аб пашырэнні магчымасцей паэзіі, лірыкі ў пазнанні свету і чалавека, які аказаўся ў складаных акалічнасцях другой палавіны XX стагоддзя.

Праблема сацыяльных шляхоў чалавецтва, грамадзянскай адказнасці асобы закранаецца ў яго паэме «Цунамі» — своеасаблівай філасофскай прытчы нашага часу, калі на карту пастаўлены лёс планеты,

лёс цывілізацыі. Паэт выступае супраць індывідуалізму, заклікае людзей добрай волі мацаваць адзінства, «каб раз'яднанасць не магла ў бацькоў бацькоўства адабраць, пазбавіць сына на хлеб і сонца спадчынных правоў».

Адзін з самых моцных твораў беларускай паэзіі апошніх год — паэма А. Куляшова «Варшаўскі шлях», напоўненая роздумам аб перажытым, аб гісторыі, вайне і міры, аб дружбе з А. Т. Твардоўскім. Яму і прысвечана паэма. Персаніфікаваны, «полівалентны» вобраз варшаўскага шляху — па якім не адзін раз каціліся страшныя, апусташальныя войны, у тым ліку апошняя, самая крывавая,— азначае для паэта і яго пакалення вельмі шмат. У ім драматычна абвастрыўся сам час.

Смерць здольны вынаходзіць век.
А лек
Ад смерці не знаходзіць чалавек.
Хварэем мы, хварэюць нашы рэкі,
Хварэе час, што чыніць гвалт і здзекі,
Планета, што пазбавілася сну
Ад вечных дум: чым адхіліць вайну —
Спыніць хваробу ў моманце крытычным?
Няпроста свет ад бед яго лячыць,
Пакуль цябе, дарога, стратэгічным
Аб'ектам не пакінулі лічыць.

З паэмы ў пераканаўчасці жыццёвых барваў паўстае постаць А. Т. Твардоўскага — паэта і чалавека. Зрэшты, у гэтым выпадку і паэт і чалавек уяўлялі сабой адно цэлае, знаходзіліся ў арганічнай згодзе і адзінстве. «З рукамі каваля, з душой жняі»,— кажа пра яго Куляшоў, падкрэсліваючы салдацкі лёс і прарочую долю паэта, яго заўсёдную прыналежнасць да людскіх спраў.

У радку на поўную моц пульсуе думка паэта-гуманіста, жыццялюба, працаўніка. Ён застаецца менавіта ваяўнічым гуманістам, аднак зараз у аснове гэтай яго гуманістычнай ваяўнічасці пабольшылася простага і шчырага — любві і ўдумлівасці, пяшчотнасці і самаахвярнасці, асабістай зацікаўленасці і глыбокай чалавечнасці да ўсяго, што абазначае прагрэс, будучыню.

Кожны твор А. Куляшова з'явіўся ў выніку нечага асабіста перажытага, часам балюча адчутага, узнятага ў працэсе мастацкай тыпізацыі да ўзроўню агульнацікавага і неабходнага. Нябачныя, але якія яны моцныя — тыя ніці, што звязваюць паэта з другімі людзьмі. Нават калі ён гаворыць пра выключна асабістыя падзеі, напрыклад, пра хваробу, якая на паўгода прыкавала яго да бальнічнага ложка. І

тут, у такой выключна, здавалася б, прыватнай сітуацыі, ён выходзіць на праблемы сённяшняга дня:

Я нарадзіўся зноў на свет...
Як свет пасля цяжкой хваробы —
Кійком абмацваючы тропы,
Пішу трывожны запавет.
Пішу: я ўстаў не для таго,
Каб дыхаць пыльным тлом магільным,
А каб, мінаючы яго,
Сачыць за смерцю вокам пільным,
Пішу: я, сведка ўсіх падзей,
Сірочых слёз, вайны, разлукі,
Жадаю шчасця для людзей...
Я знаю, што такое мукі.

Мастацкая індывідуальнасць Аркадзя Куляшова — цудоўная і непаўторная з'ява савецкай паэзіі. Яго мастацкі вопыт і творчыя прынцыпы ў многім і многім павучальныя. У кожным творы паэт імкнецца выказацца да канца, верш для яго сапраўды як запавет, як завяшчанне людзям стаяць на варце жыцця, праўды, справядлівасці.

Адзін час у нас шмат гаварылася пра «галоўную кнігу» пісьменніка, да якой ён ідзе часам вельмі доўга, праз гады, а то і праз усё жыццё. У сваёй «галоўнай кнізе», мне здаецца, пісьменнік сустракаецца з самім сабою, найбольш поўна і дакладна ўвасабляе свой вопыт, самае запаветнае з пражытага і перажытага. Тут праўда жыцця становіцца першым і галоўным крытэрыем ідэйна-мастацкай дасканаласці, крытэрыем майстэрства. «Апошнімі ўсе мае кнігі былі ў часе свайго напісання». Гэта адзін з галоўных эстэтычных прынцыпаў А. Куляшова, у якога ўсё на грані, думка і пачуццё страшэнна напружаны, быццам бы ўсё робіцца раз і назаўсёды — такі свет паэта.

Вершы Куляшова наскрозь палемічныя, страсныя сваім эмацыянальным напалам. Аднак паэт амаль не звяртаецца да публіцыстычных інтанацый, як гэта, напрыклад, было ў яго раней («Слова да Аб'яднаных Нацый» і інш.). Сёняшні Куляшоў— паэт-філосаф, яго паэзія жывіцца моцнай аналітычнай думкай, выражанай па-рознаму, але заўсёды глыбока і арыгінальна.

Ён быў і застаецца выдатным прадстаўніком лірыка-філасофскага стылю ў савецкай паэзіі. Яго мастацкае мысленне — парадаксальнае паводле формы. Яно рухаецца і развіваецца ў сваіх супрацьлегласцях і супярэчнасцях па законах паэтычнага мыслення. У Куляшова заўсёды натрапіш на нечаканасць, на незвычайны ракурс

паэтавага бачання і разумення — пачынаючы ад вобразаў сасны і бярозы, што трымаюць сваімі каранямі Зямлю, да верша пра палын, дзе думка паэта, выказаная выключна пластычна, набывае філасофскую вартасць:

Палын — і клопат матчын, і дарога,
І слёзы, і ўспамін сіроцкіх меж,
І горыч малака таго, якога
Ніякай смагай з вуснаў не сатрэш.

Дыялектычнасць, унутраная супярэчлівасць як адзінства супрацьлегласцей, якое часам нібы падкрэсліваецца,— у гэтым мне бачыцца своеасаблівасць куляшоўскага паэтычнага мыслення, што ідзе ад жыццёвай паўнаты і складанасці. Эстэтычная змястоўнасць мастацкага вобраза, мне здаецца, намнога паглыбілася ў параўнанні з ранейшымі (скажам, другая палавіна 40-х гадоў) вершамі. І гэта перш за ўсё таму, што ў многім змяніўся лірычны характар яго паэзіі, узбагаціўся філасафічнасцю і разважлівасцю, удумлівасцю і праўдзівасцю, шчырасцю і спавядальнасцю. Гэтыя рысы характару і мыслення паэта дапамагалі яму адкрываць сапраўдны пафас сучаснасці.

Так, паэзія Куляшова па-філасофску складаная і адначасова шчырая і вельмі даверлівая. Яна разлічана на вельмі засяроджанае ўспрыманне, бо звязана з глыбокім роздумам аб жыцці, якое бачыцца паэту ў дыялектычнай складанасці.

«Я — сведка ўсіх падзей»,— гаворыць паэт у адным з вершаў. Праўдзіва сведчыць аб сваім часе — абавязак мастака. Але наш паэт быў не толькі сведкам, скажам мы сёння. Ён заўсёды заставаўся і застаецца воінам, байцом, які змагаецца пад чырвонымі сцягамі нашай эпохі, адстойваючы яе гуманістычныя каштоўнасці.

Спадчына Аркадзя Куляшова — выдатная з'ява сучаснай беларускай літаратуры, сведчанне росту яе шматгранных магчымасцей актыўнага ўзаемадзеяння з сучаснасцю.

1977 г.

## Майстар

Майстар... Гэта самае агульнае і, відаць, найбольш трапнае вызначэнне пісьменніцкай індывідуальнасці Максіма Лужаніна, своеасаблівасці яго стылю, творчай культуры, таго паважнага месца, якое ён займае ў сучаснай беларускай і ўсёй савецкай літаратуры, а таксама ў нашым чытачоўскім уяўленні.

Ён і сам, здаецца, перакананы: майстэрства можа ўсё, усё яму падуладна.

У гэтага чалавека шчаслівы лёс... Зрэшты, пачуўшы такое пра сябе, ён, напэўна, мог бы напачатку здзівіцца: хапіла ж усяго! Аднак толькі напачатку. Бо шчасце паэта — шчасце ўсіх людзей. А ён без людзей, без радзімы, здаецца, ніколі сябе не мысліў, не ўяўляў, крочыў з імі адной дарогай, рабіў сваю нялёгкую, але любімую работу...

Творчасць Лужаніна — адна з вельмі змястоўных граней развіцця беларускай савецкай літаратуры амаль ад яе нараджэння да сённяшніх дзён, летапіс нашага жыцця, фарміравання савецкага чалавека.

Ён быў сведкам і актыўным удзельнікам складанага працэсу станаўлення новага свету.

У аўтабіяграфіі, прыгадваючы першыя паслякастрычніцкія часы, першыя дэкрэты Савецкай улады, пісьменнік расказвае: «Выслухаўшы ўвечары ленінскі дэкрэт аб зямлі, прусцы (М. Лужанін нарадзіўся ў вёсцы Прусы, што на Случчыне.— У. Г.) назаўтра ж, не чакаючы загадаў і каморнікаў, пазбівалі з тычак крываногія сажні і ўзяліся надзяляць кожны двор прырэзкаю ад памешчыцкіх палеткаў».

Потым, праз гады, гэтая падзея адгукнулася ў вершах:

Выводзіў дзядзька лысым-лысы
Сяло ў скарбовыя палі:
— Наконт яе дэкрэт падпісаў
Пайшлі дзяліць! —
І ўсе ішлі. Натоўп сачыў тады спаважна,
Як беларускі чалавек
Абмерваў саматужным сажнем
Шырокі клін.
Сабе.
Навек.
*(«У Кастрычніку», 1937)*

Традыцыйная для беларускай паэзіі (успомнім Якуба Коласа) тэма «сваёй зямлі» стала тэмай беларускай дзяржаўнасці, новага лёсу

роднага народа, узбуйніўшы і сацыяльны, і мастацкі маштаб мыслення паэта.

М. Лужанін увайшоў у літаратуру на хвалі ўзнятага і акрыленага Кастрычнікам «Маладняка», удзельнічаў у першым з'ездзе гэтай літаратурнай арганізацыі ў лістападзе 1925 года, дзе разам з сябрамі — маладымі літаратарамі слухаў прамову А. Р. Чарвякова — старшыні ЦВК Беларусі:

«Мы творым, таварышы, сацыялізм...— гаварыў усебеларускі стараста,— у пераважна сялянскай краіне... трэба дапамагчы беларускаму селяніну ідэалагічна зрасціся з задачамі Кастрычніка, і гэта павінен зрабіць наш новы пясняр, радзіўшыся разам з Кастрычніцкай рэвалюцыяй, пранікнуты сам ідэямі Кастрычніцкай рэвалюцыі».

Задача — што і казаць — складаная. Асабліва калі ўлічыць маладосць літаратуры і саміх літаратараў. Аднак і час быў незвычайны. У 1928 годзе, калі выйшла першая кніжка вершаў «Крокі» (якую «хрысцілі», успамінае аўтар, Янка Купала і Цішка Гартны), паэту было ўсяго васемнаццаць год, ён толькі што паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт, але здавалася, што юнацтва засталося далёка ззаду. Моладзь надзвычай сур'ёзна ставілася да жыцця.

Усё ж такі адсутнасць вопыту не магла не адбіцца на творчасці пачаткоўцаў. Першыя вершы нашага паэта і яго маладых сяброў не столькі лірычныя, калі так можна сказаць, колькі проста эмацыянальныя. Гэта — вершы настрою, душэўнага ўздыму, акрыленасці, лірызму, якім яўна не хапала індывідуалізацыі перажывання, сацыяльна-псіхалагічнай акрэсленасці.

Многае са спадчыны пісьменнікаў 20-х гадоў (і не толькі маладняකоўцаў) трапіла «пад цэп гісторыі», стаўшы яе дакументам, аплаціўшы далейшае развіццё літаратуры. Але шмат што і сёння жыве паўнацэнным мастацкім жыццём.

Яны — маладыя 20-х гадоў — спяшаліся расказаць пра тыя аграмадныя рэвалюцыйныя перамены, якія нараджалі ў людзей радасць, захапленне, настройвалі на асаблівае, эмацыянальна-рамантычнае ўспрыняцце рэчаіснасці. Яно якраз і складае, на нашу думку, непаўторную паэтычную атмасферу таго часу, сутнасць лірызму як стылю, характэрнага ўсім літаратурным жанрам таго часу.

Нам здаецца, што падобны ўсплёск эксперыментаў і пошукаў з наступным пераходам да больш паглыбленага эстэтычнага спакою беларуская паэзія перажыла і недзе ў пачатку і сярэдзіне 60-х гадоў, але ўжо на новым вітку свайго развіцця, у новых сацыяльна-гістарычных умовах. У літаратуру ўвайшло пакаленне маладых не «ад сахі і касы», яно прыйшло з вышэйшых навучальных устаноў, з зусім

іншым запасам уражанняў, маючы за плячыма ваеннае юнацтва альбо маленства. І іх пошукі таксама потым увайшлі ў больш роўнае рэчышча. Розныя эпохі, розныя перыяды — яны розныя па свайму абліччу, але рух тут і там ішоў па аналагічнаму цыклу, хоць і нельга разумець такі працэс як паўтарэнне пройдзенага. Новы ўзровень развіцця грамадства, інтэлектуалізацыя працы, рост адукацыі, навукова-тэхнічны прагрэс — усё гэта прыдало іншы характар паэтычным пошукам 60-х, 70-х гадоў.

Лірызм 20-х гадоў, асабліва на пачатковым этапе, характарызуецца перавагай абстрактна-пачуццёвага элементу, які далёка не заўсёды быў узважаны на шалях сталага вопыту. Творчаму росту маладых літаратараў 20-х гадоў — «першаму прызыву — часта шкодзіла рамантычная адцягненасць, дэкларацыйная агульнасць стылю, касмізм (асабліва ў першай палавіне), уплывы Пралеткульта і «Кузницы».

Такімі яны былі — «сонцавы дзеці і сонцу адданыя», як называе іх М. Лужанін у сваёй «Песні бадзёрасці» (1928).

Гэта нагадвае свайго роду літаратурны «авангардызм» у яго беларускім варыянце. Ускладненасць мовы, стылю, уласцівая ў аднолькавай ступені і паэзіі, і прозе, характэрна і беларускаму «маладнякізму».

Праўда, ідэалагічна і светапоглядна маладое беларускае мастацтва было надзвычай далёкім ад авангардызму з яго індывідуалізмам, самацэннасцю формы. Мова ў нашай паэзіі ніколі не губляла сваю грамадскую функцыю, не станавілася самамэтным прадметам творчасці, крыніцай для абстрактных пабудоў.

Дарэчы, М. Лужанін з поўнай падставай лічыцца адным з лепшых пісьменнікаў-мовазнаўцаў. Майстэрня слова, кузня слова — гэтак можна сказаць пра яго творчую лабараторыю. Нездарма цікавасць да В. Хлебнікава ён пранёс праз гады. Не раз даводзілася яму выслухваць дакоры «за архаізмы». Але яны ніколі не былі для яго самамэтай. Глядзіце, з якім бляскам палемізуе ён са сваімі апанентамі:

Старое слова! Ах ты,
Якая ж тут бяда?
А продак мой пра нафту
Казаў: гарывада.
Стаймуйцеся з імпэтам,
Шаноўны ягамосць!
Галоўнае не ў гэтым,
А ў тым, што нафта ёсць.

(1972)

Талент, сур'ёзнасць стаўлення да жыцця, фармавання светапогляду, настойлівыя пошукі свайго голасу бачны былі ўжо ў першых кнігах, першых творах паэта. Вучачыся ў іншых, ён намагаўся расказаць пра сваё, роднае, пражытае, падзяліцца набыткамі свайго ўнутранага вопыту. Літаратура, як вядома, на гэтым і стаіць...

Першыя ўдачы паэта звязаны з тэмай вёскі, тэмай Радзімы, Беларусі, усяго таго, што яму было да болю блізка.

Яркі вясновы дзень.
Слаўна, пагодна!
Сонца плыве па вадзе —
Беляць палотны...
Вербы глядзяцца ў стаў.
Прайнікавыя гамонкі.
Травень над полем стаў,
І на лугах — рамонкі.
От і расу відно...
— Мамка, халодна!
Хутка прыкрочыць ноч...
Беляць палотны...

*(«Беляць палотны», 1929)*

Тут усё — паэзія, звязаная з народнай працоўнай этыкай, народным светаўспрыманнем. У кожным радку, у кожным вобразе, што прасякнуты надзвычай высокім і чыстым маральным пачуццём, адлюстраваўся індывідуальны стыль Лужаніна, эстэтыка ягонага слова.

У мяне заўсёды выклікала павагу гэтая вельмі шчырая, глыбінная любоў паэта да чалавека працы, уменне глядзець на свет яго вачыма, веданне таго, што чалавеку трэба, чаго ён прагне.

І — шчымлівая любоў да роднага краю, сціплага, не экзатычнага, але такога роднага.

«У добрага пісьменніка заўсёды ёсць свой край, свой горад, свая рака — гэта адметныя рысы сапраўднага мастака».

Так разважаў А. Т. Твардоўскі.

Блізка ля Прусаў ракі не было, але, можа, якраз таму любасць да вады, «сны аб моры» паэт пранясе праз усё жыццё...

Першыя творы — вершы, паэмы, апавяданні, навелы, нарысы, артыкулы — друкаваліся у газетах «Савецкая Беларусь», «Звязда», «Беларуская вёска», «Чырвоная змена» (і ў шматлікіх літаратурных дадатках да іх), у часопісах «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», «Работніца і сялянка» і інш. Сёння з хваляваннем гартаем пажоўклыя старонкі перыёдыкі 20-х гадоў: як жа! на яе старонках у надзвычай

вострых спрэчках нараджалася новае мастацтва — беларуская савецкая літаратура!

Літаратурная моладзь, разам з усімі і Максім Лужанін, зведала шмат рознабаковых уплываў. На паэтаў уздзейнічала не толькі магутная лірыка Сяргея Ясеніна і творчасць вядучых рускіх савецкіх паэтаў, у тым ліку У. Маякоўскага, не гаворачы ўжо пра Купалу і Коласа. Уважліва чыталіся і Гейнэ, і Гамсун, і Блок, і Леанід Андрэеў... Пераадольваючы эклектыку, малады паэт дамагаўся арганічнасці свайго стылю, дбаючы пра высокі ўзровень творчай культуры. Гэта, дарэчы, і паспрыяла ў свой час яго пераходу ў літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша» (1926 год).

Калі сёння перачытваеш яго вершы таго, пачатковага, перыяду, калі ён шукаў сябе, свой голас і месца ў літаратуры, кідаецца ў вочы настойлівая работа паэта над павышэннем майстэрства. Хаця многім з тых даўніх вершаў уласціва характэрная маладнякоўскай паэзіі эмацыянальная расплывістасць, пэўная неаформленасць пачуцця і г. д., тым не менш яны, калі ставіцца да іх гістарычна, чымсьці сімпатычныя нам і сёння: яны, як своеасаблівы лірычны летапіс, даносяць у наша сёння непаўторны каларыт тых год, вясновыя рытмы і настроі, тагачаснае светаўспрыняцце маладога чалавека. Вельмі прынцыповай для паэта — у ідэйных і мастацкіх адносінах — была не толькі нізка «Дома», напісаная свабодным вершам. У гэтай сувязі можна гаварыць пра шэраг ягоных твораў.

Узяць хоць бы такую яго рэч канца 20-х гадоў, як «Галасуе вясна за вясну», знешне, здавалася б, і не надта арганізаваную, але прасякнутую новым, сацыялістычным светаадчуваннем, цэласную ў сваім лірычным пафасе, у якім супалі і спалучыліся маладосць паэта і маладосць краіны.

Уздымаюцца вейкі зямлі,
Парны водар павеяў з далін,
І пачула здалёк аблонь
Поступ трактаравых калон.
Паварочвай, чыгунны бык,
У прасторы былой журбы,
На рагі плугоў узвярні
Спаконвечныя дзірваны!

А напоўнены жыццём «Рух таварных цягнікоў»! Рытмы яго вельмі сугучныя часу — стваральным рытмам першай пяцігодкі. Верш насычаны дынамікай, энергіяй, ён надзвычай аптымістычны па свайму эмацыянальнаму тонусу. Думка і пачуццё па-майстэрску перадаюцца самім рухам верша...

Сёння за спіной у пісьменніка больш паўсотні кніг — у розных жанрах — на роднай мове і ў шматлікіх перакладах.

Дарэчы, жанравая шматстайнасць вылучала яго на самым пачатку творчага шляху. Яго проза падабалася К. Чорнаму. «Багун», «Мяцеліца», «Бабіна лета» і іншыя — апавяданні 20-х гадоў. У іх аўтар імкнуўся выявіць новы погляд на жыццё, змены ў беларускай вёсцы, шмат увагі аддаваў аналізу душэўных настрояў, псіхалогіі чалавека. Гэта не магло не адлюстравацца ў стылі і спосабе мыслення мастака. Лужанінская проза 20-х гадоў рытмізаваная, яна засведчыла схільнасць пісьменніка да «арнаментальнай» паэтыкі, здольнай пластычна ўзнавіць рух жыцця. Стыль яго — суб'ектыўна-экспрэсіўны, унутрана ўсхваляваны, аднак яму не хапае дынамікі, сацыяльнай напоўненасці, актыўнага сюжэтнага пачатку.

«Як соладка любіць, моцна любіць: людзей, жыццё, сваю кароткую маладосць і зямлю з блуканнямі і агнямі ў асенніх садах» (апавяданне «Бабіна лета», 1929) — хіба не нагадвае гэта раннія апавяданні К. Чорнага, В. Каваля і іншых?!

Потым давялося на пэўны час закінуць прозу. Пісьменнік вярнуўся да яе ўжо у 50-я, 60-я гады. У 1976 годзе выйшла кніга прозы «Людзі, птушкі, прастор». А. Вялюгін зазначыў пра Лужаніна: «За што б ён ні браўся — усюды, і ў прозе, і ў кінадраматургіі, перш за ўсё адчуваецца, што аўтар гэтых твораў — паэт». Магчыма, у нечым гэта і так. Толькі цяперашняя яго проза нічым не падобная на паэтычную прозу 20-х гадоў. Яна стала сацыяльна аналітычнай, больш рэалістычнай і актыўнай у стылёвых адносінах. Светаўспрыманне пісьменніка дазваляе — як і тады — убачыць і адчуць натуральную прыгажосць навакольнага свету, у якім ён умее знаходзіць і адкрываць на дзіва прыгожых людзей, рабіць іх героямі сваіх аповесцей, навел, замалёвак...

Максім Лужанін рана (раней, думаецца, чым многія літаратары — яго сябры і равеснікі) зразумеў, што паэзія — у жыцці, што яно — галоўная яе крыніца. Пра гэта думаеш, чытаючы даўнія і навейшыя яго кнігі, якія ствараліся на быстрыні часу, у шматлікіх паездках і камандзіроўках.

«Перад вачыма праходзіць Беларусь,— пісаў ён у адным з нарысаў 20-х гадоў.— Усё столькі разоў перагледжанае. І ўсё ж такі нейкае новае.

Поле, лес, узгорак, балота...

Новую паэзію прынесла ім меліярацыя і трактар.

Радасць жыцця. Невялічкія шматочкі новага, яшчэ не даступнага воку, але дух волі распасцёр крыллі над краінай».

У дарозе, «на трактах, на шляхах чыгуначных», нарадзілася адна з яго арыгінальнейшых кніг «Дванаццаць вячорных вогнішчаў» — роздум, навелы, замалёўкі, назіранні, партрэты, імпрэсіі, вершы... Ні дня без радка!

30-я гады насычаны не меншым драматызмам рэвалюцыйна-класавага змагання, героікай барацьбы за сацыялізм, чым мінулы перыяд. Аблічча новай явы станавілася ўсё больш акрэсленым.

Усё гэта не магло не адбіцца на творчых пошуках М. Лужаніна, які таксама стаяў перад неабходнасцю перабудовы, эстэтычнага засваення новага матэрыялу.

Асаблівы аўтарытэт набываюць у гэты час традыцыі Маякоўскага, інтанацыі якога выразна загучалі і ў Лужаніна, у яго паэме 1930 года «Неаплочаны рахунак», прысвечанай подзвігу партызан-барацьбітоў за Савецкую ўладу на Случчыне ў гады грамадзянскай вайны.

Многія творы Маякоўскага перакладаюцца на беларускую мову.

«Увесь пачатак 30-х гадоў,— сведчыць сам паэт у аўтабіяграфіі,— праходзіць для мяне пад знакам вучобы ў Маякоўскага». Вынік — кнігі «Кастрычнікам! Ліпенем! Маем!» (1931), «Галасы гарадоў» (1932), сціпла названыя «матэрыялы на паэму». Гэтыя кнігі адкрывалі новыя далягляды індустрыяльнай Беларусі. Паэт, апярэджваючы час, углядаўся ў абрысы будучыні, пераймаў метад вялікага савецкага паэта. Прачула і шматзначна, на высокім эмацыянальным напале гучаў зварот да Веры Харужай, якую пілсудчыкі кінулі за турэмныя краты:

Я самым цёплым,
самым добрым,
што
ўзгадавалася ва мне,
з-за крат
у свет
вяду
твой вобраз,
настрэчу песні
і вясне.
Ён самы лепшы —
дзень той —
стане,
калі я
межы пасяку,
табе у вочы
блізка гляну

і сцісну
горача
руку.

Лужанін плённа вучыўся ў Маякоўскага газетнаму агітацыйнаму вершу. Аднак паводле сваёй паэтыкі, ладу творчасці і лірычнага тэмпераменту яны былі паэтамі розных творчых індывідуальнасцей і традыцый. Да таго ж трэба сказаць, што традыцыі Маякоўскага ў той час і нават пазней нярэдка разумеліся даволі спрошчана і абмежавана. У «Песнях будаўніцтву» не заўсёды бралася пад увагу асоба будаўніка, яго ўнутраны свет. Паэзія больш цікавілася падзеямі, фактамі, «цэхавымі буднямі» і была ўпэўнена пры гэтым, што яна ідзе за Маякоўскім...

Жыццё шчодра надарыла М. Лужаніна багатай біяграфіяй. Яна і стала асноўным зместам яго творчасці. Не заўсёды па сваёй ахвоце даводзілася яму пажыць у аддаленых кутках нашай неабсяжнай краіны. Хапіла ваеннага ліха. «Гула, як раздражнёны чмель»,— сказана ў яго пра кулю. Хтосьці ў друку дакараў, нібы паэт «не чуў кароткага слоўца «свісь-свісь», якім размаўляе куля». Чуў! Але «на ізлёце, трацячы прабіўную сілу, калі канчаецца змога ляцець далей, куля пачынае гусці, «жужжать»,— тут таксама праявілася дакладнасць мастакоўскага бачання.

У Вялікую Айчынную вайну знаходзіўся на фронце пад Масквой і Сталінградам, супрацоўнічаў у беларускіх выданнях, якія выходзілі тады ў Маскве.

Творы ваеннага перыяду сабраліся потым у кнізе «Шырокае поле вайны» (1945), якая расказала, чым жыў паэт у гэтыя гады: «Нас любіла жыццё, мы любім жыццё і стаялі насмерць за яго». Паэзія ваеннага ліхалецця, першых пасляваенных год па-рознаму ацэньвалася крытыкай. Бясспрэчна, аднак, што ў лепшых сваіх узорах яна праўдзіва адлюстравала вышыню чалавечага духу і тое, на што здольны быў савецкі народ. Ад таго часу помняцца цудоўныя вершы «Прысяга», «Пачатак», «Франтавік», «Шынель», «Васілёк», «Драч»...

Эпічнымі мазкамі малюе паэт гаркоту расстання з роднай зямлёй:

Каржакаватымі нагамі,
Карэнне вырваўшы з зямлі,
Лясы пайшлі ўслед за намі,
І ўслед нам рэкі паплылі.

(«Пачатак»)

Народнасць, міфалагізм мыслення праявіліся ў многіх яго рэчах, паглыбіўшы іх канцэптуальнасць, патрыятычны пафас.

Эпічнасць — адна з галоўных стылёвых рыс лужанінскай паэзіі. Ён адыходзіць ад маналагічнай лірыкі. Душэўнае жыццё праступае ў яго вершах апасродкавана, у «формах самога жыцця» — праз аб'ектывізаваныя вобразы, дэталі і падрабязнасці. Цікавыя і змястоўныя, яны набываюць важнае значэнне ў эстэтычнай сістэме М. Лужаніна. У адным выпадку гэта салдацкі шынель, у другім — вобраз васілька ці, скажам, асколак у сасне, дождж, «невялічкая птушка драч» і г. д.

Такі прыём, дзівоснае ўменне адным штрыхом, абрысам выклікаць у чытача цэлую карціну,— характэрны яму і сёння.

«І ў шорганні рыбацкіх роб затоен акіянскі вецер» — па адным гэтым мазку можна ўявіць нялёгкую працу рыбака. Або ў вершы «За штатам штат...» (з нізкі «Няблізкая вандроўка») — паэт, вандруючы па Амерыцы, углядаецца ў чалавечыя твары: «Гляджу і сам сябе пытаю: ці то лятункаў, ці надзей, чаго ў іх тварах не хапае?» Вачам паэта сапраўды адкрываецца нешта ненармальнае:

Бягуць патокі гарадоў,
Бяжыць жыццё — арол і рэшка! —
Бягуць шляхі і пагатоў
Бягуць натоўпы —
без усмешкі.

Гэтае «без усмешкі» сведчыць пра вельмі многае. Куды яна падзелася з чалавечых твараў — мілая госця ўсмешка? І паэт малюе «змарнелы твар краіны беднай, без усмешкі».

Усмешка — нібы сама жывая істота — аддалілася ад чалавека, пакінула яго, знікла: «Пакрысе на луг бы ёй сысці, разуцца, прысесці ў цень і — па расе! А можа ўдасца пасміхнуцца». Усмешцы — пасміхнуцца!

Такую паэтычную інтэрпрэтацыю атрымлівае праблема адчужэння чалавека ў буржуазным грамадстве, заснаваным на прыватнай уласнасці, прыватных інтарэсах, дзе кожны «сам па сабе».

Гады аддаляюцца, памяць застаецца, вярэдзіць душу.

Перажытае ў час вайны не раз натхняла і натхняе паэта на стварэнне моцных антываенных вершаў. Памятаючы аб ёй, паэт узнімае голас у абарону міру:

Я дзесьці прачытаў:
*Тэатр ваенных дзей* —
І ўбег
у бег атак,
У крык,
у кроў людзей...

Ён быў у гэтым «тэатры», ведае, які ён...

«Бясспрэчны поступ» — так назваў Пятро Глебка сваю рэцэнзію на адзін з пасляваенных зборнікаў М. Лужаніна «Поступ» (1950).

Поступ (гаворка ідзе пра пасляваеннае дзесяцігоддзе) быў, але, думаецца, не такі бясспрэчны, як здалося рэцэнзенту. Творам паэта, нават лепшым з іх, бракавала лірызму, асабовасці, той здаровай, спелай суб'ектыўнасці, якая дазваляе знайсці свой, глыбока індывідуальны аспект у асэнсаванні рэчаіснасці сродкамі лірыкі. Зрэшты, гэта вядомы перыяд у развіцці нашай паэзіі, адзначаны падобнымі агульна-«тыпалагічнымі» недахопамі, характэрнымі для многіх. Аднак М. Лужанін належыць якраз да такіх майстроў мастацкага слова, якія і на літаратурным «бязрыб'і» дарма не марнуюць час. Пра гэта сведчыць, скажам, такая кніга, як «Моваю сэрца» (1955), шэраг вершаў, змешчаных у ёй.

Кожны раз, на кожным этапе паэту даводзілася нанава адольваць шлях да свайго «я». У гэтым сэнсе важнае месца на творчым шляху паэта займае зборнік 1958 года «Прасторы», у якім падзеі знешняга свету, аддаленыя ад паэта, паўстаюць як ягонае, асабіста ім перажытае. Перад паэтам яшчэ шырэй расхінуўся свет, узмацніліся пачуццё гістарызму, інтэрнацыянальныя сувязі.

«Прасторы» пачынаюць сучасны этап у творчасці М. Лужаніна, этап багаты і разнастайны.

«Пісьменнік, мне здаецца, павінен працаваць у самых розных галінах літаратуры — пісаць вершы і прозу, быць драматургам або кінасцэнарыстам, а калі трэба, то і газетчыкам, карэспандэнтам, публіцыстам...» Так лічыць выдатны савецкі пісьменнік М. С. Ціханаў, і здаецца, што сказана гэта ім менавіта пра М. Лужаніна, яго шматграннае ўмельства.

Паэзія, проза, дакументалістыка, кінадраматургія, мастацкі пераклад — сёння творчасць даўно знаёмага табе паэта пашырае свае мажлівасці. Паўнейшым і больш маштабным аказаўся характар паэта: яго эпічная непаспешлівасць можа пераўвасабляцца ў востранадзённую публіцыстычнасць, бліснуць тонкім лірызмам, рамантычнай узнёсласцю, здольна праўдзіва перадаваць высокі пафас драматычных падзей. Не без поспеху ён выступае ў якасці сатырыка, які таленавіта скарыстоўвае розныя адценні гумару, іроніі, усмешкі.

Вытокі такой разнастайнасці бачацца ў багацці жыццёвага вопыту і ў шматграннасці яго таленту, у тым, што паэт, відаць, ні на хвіліну не спыняе работу творчай думкі («Бо сам не зраблю — не даробіць ніхто»), але аддае твор «у людзі» толькі тады, калі перакананы, што ён закончаны. Таму ў яго кнігах і сустракаем нярэдка рэчы,

напісаныя з даволі вялікай разбежкай у часе. Адно з'яўляецца амаль па гарачых слядах часу, другое чакае на рабочым стале пісьменніка свайго завяршэння доўгія гады...

Вельмі своеасаблівым, істотным паводле зместу паказаўся мне замежны цыкл «Няблізкая вандроўка» (зборнік «Росы на коласе», 1973) — адзін з самых лірычных рэпартажаў, прывезеных нашымі паэтамі з-за мяжы.

Незадоўга перад гэтым выйшла яго публіцыстычная кніга «Рэпартаж з рубцом на сэрцы», прысвечаная, як і «Няблізкая вандроўка», паездцы ў Злучаныя Штаты Амерыкі ў 1969 годзе. Лужанінскі «Рэпартаж...» — палітычна востры, публіцыстычны — з'явіўся красамоўным аргументам у крытыцы буржуазнай дэмакратыі і спосабу жыцця. У той жа час ён напоўнены сімпатыяй да простых амерыканцаў, з якімі ён сустракаўся некалі на Эльбе.

У амерыканскім цыкле вершаў «Няблізкая вандроўка» на ўвесь рост бачны сучасны савецкі чалавек з уласцівым для яго ладам маральна-палітычнага мыслення, з адчуваннем гонару за сваю краіну і высокай асабістай годнасці. Гаворачы пра лірычнага героя «амерыканскіх» вершаў Лужаніна, трэба падкрэсліць, што гэта вобраз тыпізаваны: паэт імкнецца перадаць праз яго грамадскі змест чалавечых паводзін і адчуванняў.

Вось, скажам, яму, як члену дэлегацыі БССР, даводзіцца выступаць на асамблеі ААН, і, вядома, пачаць трэба словам «Гаспада!». Аказваецца, аднак, што гэта не проста. Так, яму не проста паступіцца сваім гонарам савецкага чалавека. І далей паэт тлумачыць, у чым справа, раскрываючы грамадска-палітычныя погляды — свае і свайго героя:

Дык набірайце сілы, людцы,
Дык слухай, захад і усход,—
Я гэтак думаю звярнуцца
Да ўсіх паноў, ці то гаспод.
Ці зварым кашу, ці не зварым,
На тым пагодзімся, бадай:
Я вам, вядома, не таварыш,
Вы мне, тым больш, не гаспада.
Адзіны ёсць зямны ўладыка,
Каго шаную, не таю,
Ён — гэта мой народ вялікі,
Яму служу, яго пяю...

Ён — чалавек гэты — вельмі даражыць тымі сваімі каранямі, якія глыбока ўваходзяць у народную глебу.

Справа, зразумела, не толькі ў гэтым дэкларацыйным «яму служу, яго пяю», але і ў своеасаблівасці яго «генетычнай» памяці (памятае вось, як «дзеда пан лупіў па карку»), у немітуслівасці душэўнай думкі, нязмушанасці паэтычнай інтанацыі, у высокім адчуванні ўласнай годнасці, гордасці за тую краіну і лад, якія ён прадстаўляе. Адзін з калег паэта не без падстаў зазначыў: «У ім адначасова жывуць паэт і селянін».

Рысы народнасці не цяжка заўважыць у самой лексіцы і сінтаксісе паэзіі Лужаніна, ва ўменні сказаць проста і мудра, хутка знайсці — прынамсі, такое ўражанне — патрэбнае і адзіна прыдатнае на гэты раз трапнае слова, зварот.

Чытаючы Лужаніна, ловіш сябе на думцы, што ў складзе мыслення яго лірычнага героя ёсць нешта ад Тараса з Пуцявішча — героя слаўнай паэмы «Тарас на Парнасе», ад яго народнага гумару і ўсмешкі, умення востра назіраць і параўноўваць.

У той жа час мастацкае мысленне паэта ў сваіх сацыяльных і эстэтычных якасцях вельмі сучаснае. Яго інтэлектуалізм — у адчуванні бясконцасці працэсу пазнання, у несупыннай аналітычнай рабоце думкі, у падчас пакутлівым роздуме над вечнымі пытаннямі чалавечага жыцця.

Замежныя вершы Лужаніна яскрава сведчаць аб узмацненні праблемнасці, даследчага пачатку ў яго паэзіі. Падобная тэндэнцыя кранула і яго інтымную, пейзажную лірыку, якая займае ў «Няблізкай вандроўцы» прыкметнае месца: настальгічныя матывы суму па Радзіме, унутранага самаадчування, самааналізу.

Асобна хочацца сказаць пра тое, якое вялікае месца ў творчасці, у жыцці М. Лужаніна займаюць Янка Купала і Якуб Колас.

Класічнаю працаю коласазнаўства стала яго надзвычай арыгінальная кніга «Колас расказвае пра сябе», якую аўтар не перастае дапаўняць новымі і новымі раздзеламі.

М. Лужанін, як ужо гаварылася, эпічны, аб'ектывізаваны ў сваёй лірыцы. Часцей за ўсё пераважае «аб'ектыўны» сюжэт, персанажы, рэчы. Яго паэзія — у большай ступені паэзія апісання, чым manaлагічнага выказвання. Нават у тых выпадках, калі паэт публіцыстычны. Але тым не менш яго паэзія не перастае быць лірыкай, у якой пульсуе душэўнае жыццё паэта, яго асабістыя перажыванні. У гэтым пераконвае цудоўная нізка вершаў «Па дарогах Купалы», якая ўяўляецца нам невялікай, але эмацыянальна насычанай паэмай. Па ёй відаць, як напружана жыў Лужанін у дні вайны паэзіяй Купалы, наколькі патрэбная, неабходная была яна яму.

Тут, як і ў іншых творах, заўважна плённая вучоба ў класікаў — імкненне да прастаты, лаканізму, праўдзівасці.

Пачатак вайны, гарыць Мінск... У Лужаніна пра гэта адна фраза: «Скрычаліся, просячы рады, гудкі» — і яе дастаткова, каб уявіць абставіны прыфрантавога горада, налёт за налётам, пажары, руіны... Або ў другім месцы — званочкі, што «пад бамбёжкай беглі, кульгалі на збітыя ножкі, следам за ім, за патокам машын»; яны кранаюць самыя трапяткія струны сэрца:

Сінія...
Выбеглі на курганы...
Вочы зямлі...
Пазірае сырая!
Вочы дзядоў яго праз дзірваны,
Сінім зацвіўшы, маўчком
дакараюць.

Сучасныя творчыя абсягі Лужаніна ўбіраюць у сябе і мінулае. Эпічная ёмістасць стылю і вострае пачуццё гістарызму дазволілі яму напісаць унікальную ў сучаснай беларускай літаратуры паэму «Як нараджаўся Новы Свет», у якой дадзена шырокая панарама пасляка-стрычніцкай гісторыі савецкага грамадства, велічных здзяйсненняў нашага чалавека...

Мяне спачатку нават здзіўляла тая глыбокая, я б сказаў, страсная цікавасць паэта да эканомікі, статыстычных зборнікаў, лічбаў, выставачных каталогаў, дакументаў. Думалася,— ну, калі цікавіцца празаік, яго яшчэ можна зразумець. А паэт? Паэт жа жыве эмоцыямі, перажываннямі, пафасам. Лічбы для верша не патрэбныя! Не, аказваецца, патрэбныя: з іх якраз і нараджаецца пафас. Мастацкая пераканаўчасць паэзіі Лужаніна абумоўлена сувяззю яго твораў не проста з жыццём, з фактамі жыцця, гісторыі, нашай рэчаіснасці. Але факт у яго часцей за ўсё пераасэнсаваны, узведзены ў ступень, вылучаны, абагульнены, як, скажам, у паэме «Бяссонны тэлефон».

Паэт умее паказаць яго шматмерна, узмацніць шматпланавасць, сцісла расказаць пра многае, пераканаць.

Пастаяннай у Лужаніна стала Ленінская тэма, якая гучыць у яго як радасць росквіту роднай зямлі, што ўвасобіла «жывыя рысы Ільіча», здзяйснення думак і планаў правадыра, раскрыцця ленінскай любові да чалавека, клопату аб ім, умення бачыць далёка наперад. Такія рэчы, як «Жывыя рысы Ільіча», «Хадок», «Бяссонны тэлефон», сталі яго важкім укладам у беларускую паэтычную Лeнініяну.

Паэзія — творчасць, у якой сыходзяцца натхненне і ўменне, трызненне душы і тонкае майстэрства снайпера, які павінен быць надзвычай дакладны.

М. Лужанін даўно вядомы як нястомны працаўнік над словам, які любіць «абрабіць яго з цярпеннем», адкрыць патаемныя глыбіні сэнсу. Гэта непаўторна-своеасаблівая лужанінская «кладка»: слова ў вершы, становячыся ў новы рад, захоўвае ўсе жыццёвыя барвы і пластыку, застаецца такім жа смачным, жывым, гаваркім, як і ў жыцці. І вельмі ёмістым.

Майстэрства паэта арганічна зрошчана з яго асобаю. Нейкага абстрактнага, прапіснога майстэрства не можа быць. Яно заўсёды канкрэтнае, бо звязана з вопытам асобы, яе светапоглядам, тэмпераментам, веданнем жыцця, своеасаблівасцю яго ўспрымання, стылем. Таму майстэрства Броўкі і Танка ці Панчанкі і, скажам, Куляшова (у кожным выпадку, безумоўна, вельмі высокае) — настолькі не падобнае, наколькі неаднолькавы іх стыль, наколькі не падобныя яны як асобы.

Тое ж самае можна сказаць і пра Лужаніна.

1978 г.

## Праўда перажытага

Непаўторнасць... З гэтым паняццем, з гэтай якасцю, з гэтай праблемай мы абавязкова сустракаемся, калі гаворка заходзіць пра сапраўдную паэзію, пра сапраўдны талент.

Чым найперш прывабіў нас талент Еўдакіі Лось? Думаецца, не памылюся, калі скажу: сваёй арганічнай народнасцю, шчырасцю і непасрэднасцю — эстэтычна вельмі змястоўнымі, глыбока насычанымі праўдай перажытага.

І цяпер, калі Еўдакія Якаўлеўна так нечакана і заўчасна пайшла ад нас, гэта асабліва добра відаць. Яе творы нібыта нанова засвяціліся для нас яшчэ ярчэйшым святлом самабытнай паэзіі — сціплай і цёплай, як паўночны беларускі пейзаж, мужнай і геранчнай, як гісторыя народа...

Асабіста ў маю свядомасць яна ўвайшла першым сваім зборнікам «Сакавік» — было гэта недзе амаль дваццаць год назад, у 1958-м. Па ўзросту і духоўнай прыналежнасці яна з таго пакалення, дзяцінства якога адабрала вайна і якое мужнела ў цяжкія пасляваенныя гады. Пра гэта расказвалі вершы: суровае дзяцінства, трагедыя вайны, цяжкасці пасляваеннай пары...

І якой толькі ў свеце бяды
Не спазнала я ў тыя гады!..
Што такое бяздом'е сцюжнае,
Што такое бяссонне мужнае,
Што такое, як есці хочацца,
Што такое, як раны сочацца...

У лепшых творах паэтэсы выразна бачылася сувязь чалавечага лёсу і лёсу народнага. Гэтае зліццё стала асноўным зместам яе лірычнага перажывання, сацыяльнай асновай творчасці.

З першых крокаў ёй спадарожнічала разнастайнасць тэм, матываў, настрояў, якая адпавядала шматстайнасці жыцця.

Былі іншыя матывы — мірныя, светлыя...

Над Звонню — звон, ля Звоні — сінь:
Званочкі ладзяць карагоды...
Пад Звонню шапку ў грэчку кінь —
І шапка ўраз прапахне мёдам!

Шчырасць, асабовасць, аўтабіяграфічнасць — тэматычныя і стылёвыя рысы многіх, найбольш удалых вершаў паэтэсы — складалі жыццёвую сілу і моц яе таленту. Нездарма ж ёй асабліва, на маю думку, удаваліся вершы, прысвечаныя сыну, родным — «сынок, сынок, бялюткі бацянок!..» (кніга «Перавал»). Адна з першых удач Е. Лось —

верш «Маці» (зборнік «Сакавік»): «Дзякуй, маці, што мне падарыла ты любоў да зямлі маёй роднай, дзе ўсміхаецца сонца так міла, дзе бягуць хвалі рэк мнагаводных...»

Першая кніга называлася «Сакавік» — у месяцы сакавіку паэтэса нарадзілася, нават у гэтай акалічнасці, у гэтым супадзенні адбілася ўнутраная, душэўная ўстаноўка на непрыдуманае, перажытае, сваё.

На гэта яе натхніў і Пётр Усцінавіч Броўка, калі ў канцы саракавых, ці не ў сорак восьмым нават, наведаў Глыбокае, дзе, сустракаючыся з выбаршчыкамі, спаткаў маладую паэтэсу — студэнтку Глыбоцкага педвучылішча Еўдакію Лось, паслухаў яе вершы, паверыў у яе творчыя сілы і падтрымаў. І Еўдакія Якаўлеўна засталася на ўсё жыццё ўдзячнай яму за гэта, вучылася ў яго чэснаму і добраму погляду на жыццё...

Адзіная тэма, адзіны прадмет паэзіі (лірычнай у асаблівасці) — чалавек, ягонае ўнутранае жыццё ў яго агульным значэнні для ўсіх. Сакрэт поспеху «Сакавіка», наступных кніг быў просты: аўтар даверылася свайму ўнутранаму жыццю, пісала пра асабіста перажытае, адчутае. За радком стаяла праўда.

Разам з тым яе паэзія не стала вузкім самавыяўленнем аўтара. Душэўны свет паэтэсы быў раскрыты для чалавечых радасцей і трывог, для ўсяго, што адбывалася навокал.

У творах сапраўднага мастака не можа не адлюстравацца яго час, лёс пакалення, гісторыя, усё, чым жыве народ. У гэтым дыялектыка творчасці. І тое, што паэтэса адразу вырашыла — як яна сама дакляравала — быць сама сабой і што гэта ёй шмат у чым удалося,— добра. Грамадзянская шчырасць без натугі паядноўвалася з асабістым, прыватным, чужое са сваім, агульнае з інтымным. Гэта стала добрым грунтам развіцця, разгортвання таленту.

Таму, пэўна, голас яе не загубіўся ў хоры маладых, свежых галасоў пасляваеннага пакалення паэтаў — П. Макаля, У. Нядзведскага, М. Арочкі, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча, А. Бічэль, А. Вярцінскага, С. Гаўрусёва, А. Лойкі, Я. Сіпакова, У. Караткевіча, Ю. Свіркі і многіх іншых. Вось колькі цікавых, розных, таленавітых паэтаў, з сур'ёзнай жыццёвай школай і загартоўкай, дало гэтае пакаленне (а я ж не сказаў аб празаіках, драматургах, публіцыстах, крытыках — іх таксама багата) — пакаленне, да якога добра стасуюцца словы Л. Талстога: «У мастацтве самае галоўнае — сказаць нешта сваё...»

Яны з самага пачатку праявілі значную грамадскую, творчую, эстэтычную актыўнасць. Гэта былі гады казахстанскай цаліны, шматлікіх новабудоўляў, асваення космасу, творчасці, росту народнай

ініцыятывы, дынамічнага духоўнага жыцця. Е. Лось была адной з выказніц свайго пакалення.

З натруджаным добра крыллем...
Яму не было ля чаго пагрэцца —
Бо каміны не дымілі...
А ўсё-такі раслі, прыгажэлі на дзіва!
Калі не было і хлеба,
Вершы пісалі пра дзень шчаслівы...
Напэўна,
гэтак і трэба...
Загартаванае наша натхненне,
Яно адгарыць няскора!
Кажуць, шчаслівае пакаленне
Тое, што зведала гора.

У далейшым паэтэса яшчэ не раз будзе звяртацца — у вершах, паэмах — да тэмы лёсу свайго пакалення, аналізаваць яго ўклад у грамадскае жыццё, яго шматгранную стваральную дзейнасць.

Паэзія 60-х гадоў жыла вялікім творчым неспакоем. Яна ўсюды хацела пабываць, усюды паспець, да ўсяго дакрануцца.

У кожным імгненні паэзія ёсць,
У кожным здзяйсненні —
яе прыгажосць.
У кожнай істоце — яе хада,
У кожнай бядоце — яе бяда.

Вось так — мужна, адкрыта і шчыра звярталася паэтэса да жыцця.

Адкрыццё хараства жыцця ў адзінстве маральнага і эстэтычнага, праўды і прыгажосці стала яе галоўнай творчай патрэбай. Яна ўмела за асобным фактам, падзеяй, справай разгледзець веліч рэчаіснасці, стваральны характар жыцця.

Здаралася, не ўтоім, часам і так, што паэтэса абмяжоўвалася адлюстраваннем знешніх прыкмет жыцця сваіх герояў (асабліва ў некаторых так званых партрэтных вершах), не заўсёды выходзіла на значную думку, абагульненні.

Вярнуўшыся з дарогі, паэтэса гаворыць:

І клопат мой пасля дарогі ўвесь —
Забыла на спружынавым сядзенні
Пірог пшанічны, што далі мне дзесь!

Пасля гэтага думаеш: ці варта было ехаць? Так, думка выдавалася часам драбнаватай — і не толькі ў яе адной. Але побач з гэтым нельга было не заўважаць другога: крытыка ў артыкулах пра Е.

Лось адзначала, што «яе лепшыя творы... народжаны сапраўдным натхненнем і кранаюць сэрца арганічным спалучэннем маляўнічасці, шчырасці і музычнасці» (С. Гаўрусёў). Сапраўды, паэзія Е. Лось усё больш насычалася сацыяльнымі, маральна-этычнымі праблемамі, грамадзянскай страсцю, што бачна і ў «Палачанцы» (1962), і ў такіх кнігах, як «Людзі добрыя» (1963), «Хараство» (1965), «Галінка з яблыкам» (1969), і іншых, у тым ліку самай апошняй — «Лірыка ліпеня» (1977),— адзначаных тым лірычным пачуццём, якое праўду жыцця ўзнімае да ўзроўню сэрца.

Паэтэса ўмела пісаць буйнымі мазкамі, эмацыянальна:

Ах, Беларусь, мая ты доля,
Мая сляза і пацалунак,
Маё ў бярозках белых поле,
Мой песнямі набіты клунак!..

Тэма Радзімы — скразная ў творчасці паэтэсы» Трывалая повязь злучала яе з роднай зямлёй, продкамі, народным бытам і культурай. Яе паэзія прасякнута пачуццём гістарызму — стыхійнага і глыбока ўсвядомленага. Часта ў вершах згадвала яна сівую даўніну і працавітых продкаў. І не дзеля таго, каб «уміліцца» іх самабытным укладам жыцця. У сваіх продках — крывічах («Продкі») яна цэніць і захапляецца іх майстэрствам, уменнем рабіць «зрубы залатыя, нарогі, гонкія чаўны і сцены белыя Сафіі над плынню быстрае Дзвіны». Дыханне гісторыі чутно ў яе маштабных лірычных абагульненнях:

Мая радзіма —
Жытні колас,
Сінь мурагу, язміну цвет.
Яна —
Пілы гарачай голас,
Калёс цяжкіх глыбокі след...

Паэтыка яе ў многім была традыцыйнай. Такой, у значнай ступені, яна заставалася да апошняга дня.

Характэрная ёй задушэўнасць інтанацыі ўвасаблялася ў вершы напеўным, разлічаным на непасрэднае эмацыянальнае ўздзеянне, звычайным, часцей за ўсё з канкрэтным вобразам, рэалістычнай дэталлю. Той жа С. Гаўрусёў пісаў, што Е. Лось — «паэтэса мяккіх фарбаў, і прыгажосць душэўнага аблічча нашага сучасніка ёй лепш за ўсё ўдаецца перадаць у лірычным плане, без непатрэбных перавелічэнняў...». Паэтэса імкнулася даказаць, якімі значнымі магчымасцямі валодае гэты плаўны, напеўны верш, здольны выказаць розныя інтанацыі. І трэба сказаць, што ў асноўным, за рэдкімі выключэннямі, гэта ёй удавалася. Ратаваў талент, дапамагала праўда жыцця, праўда

перажытага, якая павялічвала магчымасці верша. Назаўсёды запомніўся (з кнігі «Людзі добрыя» — 1963) яе выдатны верш «Я зусім не баюся старасці...»:

Я зусім не баюся старасці,—
Хай прыходзіць, калі захоча...
Я была ўжо бабулькай хілай
На дванаццатым годзе жыцця...

Страшныя ўспаміны з вайны, роздум над перажытым — у форме белага верша, рыфмы маглі аказацца тут лішнімі...

Хто не верыць — няхай уявіць
Чалавека жаночага роду
Ў рызмане на плячах сагнутых,
У атопках на кволых нагах.
Чалавек жаночага роду,
Жабрачка з душой галоднай
Пад кустамі шукае шнітку,
Падбірае на полі «рулі»...

Паэтэса адкрытай душы, яна не маніла ў сваіх вершах: пісаць, як дыхаць — было яе правілам. Асабовасць, аўтабіяграфізм, мяккасць фарбаў — адзнакі яе паэзіі, унутрана звязанай з жыццём, з роднай зямлёй.

Разам з тым, відаць, памылкай было б спрашчаць творчы шлях паэтэсы, уяўляць яго роўным і гладкім — ад перамогі да перамогі. Не, ён — як у кожнага сапраўднага паэта — быў драматычным, унутрана канфліктным і мала лагодным. Дзесьці ў сярэдзіне 60-х гадоў яна адчула, што залішняя «замілаванасць» і «задушэўнасць» шкодзяць некаторым вершам, што напеўнасць традыцыйных паэтычных форм не ўзмацняе выразнасць думкі. Застаючыся паэтэсай — гэта яе галоўнае і адзінае прызванне як літаратара,— яна паралельна звярнулася да іншых жанраў, да прозы.

З'яўляюцца кнігі апавяданняў, навел «Пацеркі» (1966), «Травіца брат-сястрыца» (1971), шматлікія кнігі для дзяцей.

Проза Е. Лось — проза паэтэсы, вельмі лірычная і асабовая па сваёй стылістыцы, з рысамі «інтыму» і той своеасаблівай жаночай тонкасці ў пачуццях, якая саграває творы, робіць іх адметна шчырымі і прывабнымі. Мне добра запомнілася апавяданне «Яська».

У Яські — так называлі ў вёсцы сямейнага чалавека Івана Казіміравіча — здарылася бяда: памерла жонка, пакінуўшы яму чатырох дзяцей — адно другога, як кажуць, не падніме: «Стасі — дзесяць, Галюсі — шэсць, Юзіку — пяць гадкоў, а малодшай Ірэнцы ўсяго два з хвосцікам». І сам бацька нямоглы: «Пасля смерці жонкі аслабеў Яська

на вочы. Прачнецца раніцай — і аж галавой круціць, як певень: левым вокам ці правым глядзіць на рэч, каб разабрацца, што перад табой — кашуля ці парткі, чапяла ці качарга. З дзецьмі цяжка. Паспрабуй, спраўся з імі ледзь не сляпы: апрані ранічкай, навары есці і накармі...» Тым-сім памагалі суседзі. Пісьменніца нібыта правярае характар свайго героя, меру яго чалавечых магчымасцей, наколькі ён «чалавечны», гэта значыць, наколькі ён адчувае сваю адказнасць за сябе і за іншых.

Яська не аддае малых на выхаванне ў дзетдом. Ён добра разумее, што пры дзецях ніхто яго не можа замяніць, што бацька ў дзяцей адзін.

У гэтым героі адлюстраваліся ўяўленні пісьменніцы пра чалавечнасць, пра хараство чалавека.

Так, яе мастацтва сагрэта актыўнай любоўю да чалавека. Мне добра помніцца яе верш «Косы» — пра жанчын, дзяўчат, што не дачакаліся з вайны сваіх мужоў і каханых:

Вясновы дым
Над горадам малым...
Кіно — дзядам,
Дзіцячы сад — малым...
А што сярэднім — з косамі, як лён,
І нават пасівелымі з тых дзён,
Калі каналі ў полымі сады
І за вінтоўку браўся малады?
«Сярэдніх» пашкадуйце, салаўі...
Ні шчасця ў іх, ні людскае сям'і,
Ні паратунку ад таемных слёз,
Ні радасці ад кос,
цудоўных кос,
Бо тыя, для каго яны раслі,
Ляжаць, непакароныя, ў зямлі.

Подзвіг народа, гераічнае мінулае, Айчынная вайна не пераставалі хваляваць паэтэсу. «На ваенную тэму пачала пісаць куды раней, чым на ўсе іншыя»,— гаворыць яна ў артыкуле «На магіле брата». Старэйшы брат Еўдакіі Якаўлеўны Сяргей загінуў на фронце пад Кіевам, у Фаставе. «Імкнуся сказаць,— прызнаецца яна,— не толькі пра свайго брата, а і пра ўсіх братоў і бацькоў, што ваявалі на фронце і ў партызанах, цаной сваіх жыццяў здабылі перамогу, абаранілі ўладу Саветаў. Так была напісана брэсцкая рэч — «Гаворать бессмяротныя», і фастаўскі вянок, і паэма пра Хатынь, і партызанскія рэчы, і маналог пра Сотую дывізію...»

Да вайны ва Ушацкім раёне было 54 тысячы жыхароў, пасля вайны засталося 20 тысяч, паведамляе яна ў эпіграфе да аднаго з вершаў. Услаўленню народнага подзвігу паэтэса аддала шмат сіл. Хто не памятае яе вершаў «Абеліскі», «На магіле бацькі Міная», «Вёскі, якія не ўсталі», «Беларускія хлопчыкі», «Пісьмо ў Фэстаў» або «Дзяўчаты мінулай вайны».

Праўда жыцця, праўда перажытага, што шырокай плынню ўвайшла ў творчасць Е. Лось, рэзка павялічыла магчымасці яе паэтыкі і інтанацыі.

Узросшая на народнай глебе, творчая індывідуальнасць паэтэсы сфармавалася ў першых жа кнігах. Багаты жыццёвы вопыт, пафас чалавечнасці, высокі і непаўторна асабісты ўзровень майстэрства — усё гэта неад'емныя ўласцівасці яе паэтычнай постаці.

Народнасць, праўда жыцця — вось што апладняла яе песню, рабіла яе непаўторнай і цікавай далёка за межамі рэспублікі. Голас беларускі чуецца мне ў пяшчотным вершы «Беларускія хлопчыкі»:

Найсціплейшыя вочы
ў хлапчукоў з Беларусі,—
да работы ахвочых і
спагадных у скрусе...
Мне з маленства вядома,
як вы, хлопцы, каналі,
як у лесе і дома
вас пяском засыпалі...
Беларусь галасіла,
і пыталі дарожкі:
— Што ж вас гэтак скасіла,
дзе вы, босыя ножкі?

Ужо ў самых першых сваіх кнігах Е. Лось спрабуе сілы ў больш маштабным жанры — паэме. «Гаворацць бессмяротныя» — гэтая паэма, напісаная ў 1961-1962 гадах, прысвечана абаронцам Брэсцкай крэпасці. Аўтар у дыялогах з абаронцамі хоча раскрыць іх мужнасць, ідэйны і маральны змест подзвігу.

«Вянок», «Мая Хатынь», «Слова пра вечныя зоркі», «Мінчанка», «Высакосны год», «Мой свет», «Матчына трывога» — такія здабыткі Е. Лось у галіне паэтычнага эпасу. Паэма — адзін з самых тонкіх і складаных жанраў, які патрабуе не толькі майстэрства. Сённяя, трэба сказаць, ён перажывае не самы плённы перыяд у сваім развіцці.

Паэмы Е. Лось наскрозь лірычныя, спавядальныя. Сюжэтна-апісальны элемент у іх амаль адсутнічае. Гэта шчырая размова з сучаснікам пра набалелае, мінулае і будучае, пра тыя духоўныя карані, што лучаць чалавека з народам.

Калі я стала гараджанкай?
Пытаюся ў самой сябе.
Расла рахманай ушачанкай,
Пры ворыве і пры сяўбе.

Так, у паэме «Мінчанка» паэтэса ставіць праблему «каранёў», вытокаў, якія не павінны губляцца альбо забывацца ў наш час.

Паэзіі Е. Лось уласціва вострае адчуванне сучаснасці, клопат аб захаванні і памнажэнні нашых душэўных набыткаў.

Гледзячы на цяперашняе жытнёвае поле, яна раптам засумавала, што «ўжо не жнуць сярпамі жыта»:

Падумаюць: зашкадавала
Ды супраць тэхнікі пайшла...
А я таму, што сумна стала,
Што песня з нівы уцякла.
Камбайнер свішча зухаваты,
Валкі нячэсана ляжаць...
Ужо не зведаюць дзяўчаты
Адвечнай асалоды — жаць...

Прыкметна расло псіхалагічнае майстэрства, майстэрства змястоўнага падтэксту. Вось якую цудоўную мініяцюру прывезла паэтэса ў свой час з братняй Польшчы (ёй шмат даводзілася ездзіць па роднай краіне і за яе межамі):

Звіслі ад кропель голькі,
мокра лістам і пашам...
Шэпча мне дожджык польскі:
«Пшэпрашам, пшэпрашам!»
І я пазіраю ўрачыста
на воблакі дажджавыя,
і сэрца выстуквае чыста:
«Нех жые, нех жые!..»

Уся яго інтанацыя, стылістыка, пачуццё такту, сардэчнасці — у духу непаўторнай творчай індывідуальнасці Е. Лось...

Апошняя кніга Еўдакіі Якаўлеўны Лось — кніга вершаў і паэм «Лірыка ліпеня» (1977). Яна разнастайная па зместу, думках і пошуках, але і тут паэтэса засталася вернай памяці сэрца, успамінам пра пару ваеннага ліхалецця, якую немагчыма выкрасліць з памяці — «Гарань гарады, стогне зямля, захлынаюцца рэчкі крывёй... Я развяжуся з вайной пасля, калі стану сама зямлёй...».

Паэзіі Е. Лось суджана доўгае жыццё, бо яна была перакананы: праўда вышэй за ўсё.

1977 г.

## Як само жыццё

Адзін з крытыкаў у пачатку 50-х гадоў, цытуючы тагачасны верш Пімена Панчанкі «На шашы» —

Дзьмухне вецер — і лісце клёнаў
Далонямі цёмнымі стукне ў месяц,
І месяц звоніць празрыстым звонам,
Аж ходзіць рэха па цёмным лесе,—

выказваў сваю незадаволенасць такім чынам: «...не хацелася б сустракаць у паэта такія цяжкія для разумення радкі».

А між тым паэт проста паспрабаваў спраецыраваць на прыроду асабісты псіхалагічны стан з мэтай больш глыбокага раскрыцця ўласнага ўнутранага свету (і свету лірычнага героя), застаючыся пры гэтым верным сабе, свайму паўнакроўнаму адчуванню жыцця.

Лічачы Панчанку вядучым паэтам грамадзянска-публіцыстычнага напрамку нашай лірыкі, мы часам пакідаем па-за ўвагай яго метафорыка мастацкую сілу і яе багаты эстэтычны арсенал, словам, той магічны крышталь паэзіі, яе таямніцу, якую не заўсёды можна вытлумачыць логікай, але якая вабіць.

Неяк у размове Нічыпар Пашкевіч сказаў, што лірыка П. Панчанкі ў плане гістарычнага ідэйна-маральнага станаўлення яе героя нагадвае яму раман. Тут ёсць сэнс: гэта адзін з самых шчырых, самых псіхалагічных нашых лірыкаў, які валодае талентам настолькі падрабязна, настолькі істотна і адначасова з захаваннем усіх адценняў расказаць пра сябе і пра свой час, што знікае характэрнае для паэзіі адчуванне сумарнасці характару героя. Характар героя выступае жыва, цэласна, аб'ёмна, упрытык набліжаючыся да характару самога аўтара. У сапраўднай лірыцы так і бывае!

Гэта — гарачы паэт і гарачы чалавек. Яго творчасць — чуйная, вострападзейная — крочыла і крочыць у нагу з часам. Пры гэтым ён ніколі не паступаўся мастацкасцю, не ахвяраваў талентам. Наадварот, сувязь з часам узбуйняла яго талент і эстэтычную вартасць паэзіі.

Цікава і слушна пісаў нядаўна пра Панчанку ў прадмове да кнігі яго вершаў у перакладзе на рускую мову Я. Хелемскі:

«Відаць, я не памылюся, калі скажу, што Панчанка самы тэмпераментны з беларускіх паэтаў. Чытачу з ім ніколі не нудна. Вершы яго прыстрасныя, ён ад нараджэння схільны да спрэчкі, ён нікога не пакідае раўнадушным. Яму не ўласціва ідылічнасць і танны аптымізм. Ён нярэдка сумуе. Але затое які светлы і пераканальны яго аптымізм. Размоўная інтанацыя яго гранічна верагодная і даверлівая».

Панчанкаўская паэзія ведала свае прылівы і адлівы. Надзвычай высокага напалу дасягнула яна ў Вялікую Айчынную вайну. «Я кроў да апошняе кроплі пралью, каб толькі табе палягчэла»,— звяртаўся ён да роднай краіны, ідучы салдацкімі дарогамі вайны.

У 1955 годзе выйшла кніга яго вершаў «Шырокі свет». Яна і сапраўды перадавала фарбы і своеасаблівасць свайго часу. І фарбы яе з цягам часу не згаслі, свецяцца і сёння. А між тым паэт у ёй прызнаваўся:

Пра ўсё расказаць бы з суроваю ласкаю —
Пра шчасце і смутак, пра радасць і гнеў,
А слова часамі прыглушана бразгае,
І песні няма той, якой бы хацеў.

Новы прыліў пачаўся ў сярэдзіне 50-х, калі лірызм паэта ўзмацніў сваё сацыяльнае гучанне. Свяжэй і паўнакроўней сталі пачуцці, узняўся настрой.

Усё гэта ён выдатна перадаў у «Кнізе вандраванняў і любові», выхад якой у 1959 годзе быў сапраўднай літаратурнай падзеяй.

Трэснула, грукнула, грымнула з покатам,
Хлынула цёплае неба на дол.
(Вось і сімфонію слухаем, покуль там
Творцы сядзяць за музычнай нудой).
І бліскавіцы без нудных лічыльнікаў
Суткі ўсхвалёвана паляць сябе.
(Прыстасаванцы хаваюцца ў шчыліны,
Слон кабінетны трывожна сапе).
Травы ачысцяцца, дрэвы памыюцца,
Лівень не зломіць іх — стануць дужэй.
(Кажуць, што крытыкі больш не памыляцца.
Бог беражонага не зберажэ).
Я навальніцы люблю ачышчальныя,
Што працінаюць да донца душы.
(Кажуць, не прымуць больш касы ашчадныя
Ў сейфы свае махляроў барышы).
Смолкія почкі маланкай палушчаны,
Свежа і зелена. Ясныя дні.
(Кажуць, што заўтра усе алілуйшчыкі
Выступяць супраць сваёй балбатні).

Тыповы верш Панчанкі гэтага часу. Я ўспамінаю яго, калі гаворка ідзе пра ёмістасць і шматзначнасць паэтычнага слова, пра яго сацыяльнасць, праблемнасць — па-мастацку плодную, насычаную гуманістычным зместам. У гэтым вершы якраз добра відаць магічны

крышталь панчанкаўскай індывідуальнасці — яго шырокае дыханне, уменне жывапісаць гукам, мелодыяй, асвяжаць позірк на свет, амалоджваць яго, узнімаць настрой.

Грымотнае рэха чуваць нават у гэтых вось перакатах складанай рыфмы «з покатам — покуль там», «лічыльнікаў — у шчыліны», «памыюцца — не памыляцца» і г. д.

Вастрыня сацыяльнага зроку ў Панчанкі спалучаецца з паэтызацыяй рэчаіснасці, духоўных магчымасцей чалавека. Яго паэзія дае нам багацце і разнастайнасць інтанацый, якія ў яго нязменна суадносяцца з жыццём, з нашымі ідэаламі. Лірычны характар паэта (і ўсё, што гэты характар выяўляе,— і праблематыка, і творчыя інтарэсы, і эмацыянальны напал і г. д.) непаўторны ва ўсіх сваіх праявах і адначасова духоўна вельмі цэласны, маналітны.

Гарсіа Лорка трапна заўважыў: «Паэзія — гэта своечасова сказанае слова». Такіх — своечасовых — слоў Панчанка сказаў шмат. Пагартайце яго новыя кнігі — «Снежань» (1972), «Крык сойкі» (1976), «Вячэрні цягнік» (1977). Яны насычаны неспакоем, роздумам над глабальнымі праблемамі сучаснасці, над будучыняю чалавецтва, над яго «зялёным гняздом» — зямлёю.

Вельмі характэрны для сённяшняга Панчанкі (як, дарэчы, і для многіх іншых паэтаў) засяроджаны роздум над узаемадзеяннем чалавека і навакольнага асяроддзя, прыроды. Прырода чуйна рэагуе на чалавечыя дзеянні, за дабро плаціць дабром, а на зло — калі мы яе «то шротам, то вострай пілою, то труцім, то палім жыўцом...» — таксама адказвае адпаведным чынам.

Асоба — грамадства — прырода — у межах гэтага трохкутніка якраз і знаходзіцца тая праблематыка, што хвалюе паэта, які, прызнаючы гуманістычны сэнс працэсаў НТР, не церпіце павярхоўна-спажывецкіх адносін да жывой і нежывой прыроды.

Смерць лясоў для мяне непрымальна,
Як і гібель павольная рэк...
Людзі, людзі, жывіце нармальна
І пра будучы думайце век.

Вядомы аўстрыйскі пісьменнік XX стагоддзя Р. Музіль сцвярджаў, што сутнасць паэзіі — гэта барацьба за больш высокую чалавечнасць; таму — яна даследуе рэчаіснасць. Талент П. Панчанкі, не паступаючыся сваім лірызмам, развіваецца сёння ў бок праблемнасці, даследавальнасці, смелага аналізу. «Крык сойкі» — так называецца адна з нядаўніх яго кніг — метафара, у якой прадметна абагульняюцца яго ўяўленні аб паэзіі і яе абавязку. Гэта — эмацыянальны ключ да паэзіі самога Панчанкі.

Яго лірызм, выяўляючы шырыню і актыўнасць творчай пазіцыі аўтара,— шматгранны. В. Зуёнак вызначыў яго як драматычны лірызм. Метаду Панчанкі ўласціва сатырычнае завастрэнне, роздум, страснасць.

Сёння паэт жыве напружаным духоўным жыццём. Аптымісту па самой сутнасці характару і светапогляду, яму менш за ўсё ўласцівы танны, легкаважкі аптымізм. Як чалавек глыбокіх ідэйных перакананняў ён ведае, што дарога ў будучыню не пасыпана аднымі ружамі, што нярэдка на ёй трапляюцца немалыя перашкоды. Такія, як, напрыклад, тое ж самае мяшчанства, да якога паэт заўсёды быў непрымірымы, вытраўляў яго з жыцця і з чалавечай душы. І ў новай кнізе паэта знаходзім яркі публіцыстычны «антымяшчанскі» верш «Ілюзіі, ілюзіі...»

Сады. Сланечнік з макам.
Кругом асабнякі.
Не сенам — пухам мяккім
Набіты сеннікі.
Мяшчанства атлусцелае
І тук, і сок тут чэрпае.
І думаю дзень цэлы я:
Пра гэта племя чэрствае.

Паэт заўважае, што няўхільны рост матэрыяльнага дабрабыту (а гэта — вялікае дасягненне сацыялізме, адна з галоўных мэт эканамічнай палітыкі партыі на сучасным этапе) хоць і стварае неабходныя аб'ектыўныя прадумовы для развіцця асобы, але далёка не ва ўсіх выпадках суправаджаецца такім жа інтэнсіўным накапленнем і засваеннем кожным членам грамадства духоўных і маральных каштоўнасцей, якія адпавядаюць нашаму камуністычнаму ідэалу. У пэўнай частцы людзей — і гэта наглядаецца даволі часта — выяўляецца прыкметная несуадпаведнасць паміж мэтамі грамадскага і індывідуальнага быцця, паміж ростам матэрыяльных выгод і магчымасцей і ступенню асабістай духоўнай сталасці і свядомасці.

З'ява гэта надзвычай сур'ёзная.

Панчанка-франтавік помніць пра ўсё. Сучаснае мяшчанства ён судзіць судом нашай гераічнай гісторыі, судом свайго салдацкага сумлення.

Сумую я па тых,
Што згаслі, нібы свечкі.
А тут і б'юць пад дых
З усмешкаю, па-свецкі.
Там свечак не было,

Свяцілі нам ракеты.
Сляпіла і гуло
Усюды без прасвету.
Успомню тых людзей —
Гатоў хвастаць па мордзе
Таго, хто бой вядзе
З-за імпартнай камоды.
Такому не відно
Красы зямнога шара.
Ён верыць у адно:
Манеты ўсё рашаюць.
Я іншай веры сам:
Бліжэй было б да шчасця,
Каб удалося нам
Хутчэй суняць мяшчанства.

Што і казаць, не ўсе вытрымліваюць выпрабаванне бытам з яго матэрыяльнымі атрыбутамі і каштоўнасцямі. Для некаторых адчуванне ўладання рэчамі стала амаль што галоўным сэнсам жыцця, засланіўшы сабой сапраўдную радасць развіцця творчых сіл і здольнасцей у працы, служэння высокім грамадскім мэтам і інтарэсам.

Гэта — адна з даўніх трывог паэта. Успомнім яго верш «Здарэнне ў гасцях», напісаны ў сярэдзіне 50-х гадоў, і больш позныя творы, у якіх ён бічуе «рэчавую хваробу», мяшчанскі індывідуалізм ва ўсіх, нават самых тонкіх яго праявах. Паэт складае «оду пешаходу» — «ідзеш, знаёмых сустракаеш, з табой усе турботы дня, жывеш, працуеш, адчуваеш, што землякам ты ўсім радня» — і з'едліва высмейвае знаёмага «аўтамабіліста»:

За дэфіцытныя запчасткі
Гатоў ён жонку залажыць.

Паэт даводзіць, што «рэчавая» хвароба не такая бяскрыўдная, як здаецца на першы погляд. Бацыла карысталюбства разбурае душы людзей, прыводзіць да сур'ёзных перакосаў у іх паводзінах і поглядах, збядняе свядомасць асобы, збядняе само жыццё. Літаратура абавязана супрацьстаяць гэтым працэсам. Меў падставы Васіль Быкаў у адным з інтэрв'ю сказаць: «Літаратура павінна не перастаючы біць у свае званы, настойліва абуджаючы ў людзях патрэбу ў высокай духоўнасці, без якой любы самы высокі прагрэс матэрыяльнай культуры будзе не радасным («Вопросы литературы», 1975, № 1, стар. 129).

Б'е ў «звон» Пімен Панчанка.

У яго паэзіі лірычнае злілося з сацыяльным. Яна — жывы элемент сённяшняга духоўнага жыцця.

Уражлівы, з надзвычай чуйным «болевым парогам», дынамічны, востраканфліктны, П. Панчанка ў той жа час вельмі цэласны і арганічны ва ўспрыманні жыцця. Уважліва ўслухоўваецца ён у шум жыццёвага мора. Сёння ў яго вершах, бясспрэчна, пабольшала роздуму, рэфлексіі. Усё гэта ідзе, відаць, ад багацця жыццёвага вопыту Панчанкі — паэта, грамадзяніна, камуніста, ад сталасці яго светапогляду. Аб вышыні сацыяльных, маральных, эстэтычных ідэалаў паэта сведчыць, скажам, такая дэкларацыя: «Мне хочацца бачыць зямлю з'яднанаю працай, дружбай, любоўю і сонцам, і песняй «З Інтэрнацыяналам...». Таму я і выбраў сабе ў настаўнікі Леніна, праўду і родны народ: ім толькі і можна даверыць зямлю, рэвалюцыю і дзяцей».

У творах Панчанкі ясна відаць светлае аблічча сённяшняй індустрыяльнай Беларусі з яе «крышталічным хрыбтом палескім» — раўнапраўнай у сузор'і савецкіх рэспублік-сясцёр.

Між іншым, публіцыстычны стыль — гэта не толькі фарсіраванне голасу. Публіцыстычная паэзія можа гучаць сцішна, але з вялікай напружанасцю падтэкставай думкі. Інтанацыйнае багацце паэзіі Панчанкі бясспрэчнае. Яго дыяпазон — ад інтанацый прамоўных, клічных (як у вершы «Наша энцыклапедыя», прысвечаным П. Броўку, дзе паэт вітае выхад «першых вішнёвых тамоў») да задушэўнай, амаль інтымнай размовы з самым родным, дарагім: «Сонца маё, сосны мае, людзі мае, дазвольце хоць раз зажурыцца. У чабор твой, Радзіма, хачу я прытомленым тварам зарыцца» («Я аб дзецях, аб дзецях...»).

Да болю кранае верш пра маці, што страцілі дзяцей «на тым далёкім беразе вайны». Здаецца, колькі пра гэта напісана — вершаў, апавяданняў, аповесцей, а Панчанка знайшоў для іх свае словы — «адны сярод вялікай цішыні старыя маці ў печах старасвецкіх штодзённа паляць вечныя агні».

Уюцца каснікі агню і
скачуць,
І твары узнікаюць з
небыцця.
Цалуюць іх кабеты, ціха
плачуць
І не клянуць самотнага
жыцця.

Цікавыя вершы-ўспаміны з мінулага — з вайны («Беларускія шрыфты»), з дзяцінства, юнацтва («Вухналі», «Грыфельныя дошкі»). Паэт яшчэ і яшчэ раз вяртаецца туды, да вытокаў, каб выразней

зразумець сучаснасць і сучасніка. Тут, трэба сказаць, ён выступае пераважна як лірык.

Сёння лірызм паэта асабліва прасякнуты павагай да жыцця, рознагалоссе якога чуваць у яго вершах.

Мне даўно падабаецца яго верш «...Паўвека?.. Гэта шмат — паўвека...».

Спрэчка са скептыкам — адзін з пастаянных матываў паэзіі Панчанкі; адгалоскі яе чуваць і ў гэтым вершы. Першы ўзяў слова скептык:

Паўвека?.. Гэта шмат —
паўвека.
Сплылі, змялелі сотні рэк.
І ўжо адно твае павека
Нібы закрылася навек.
Ты аднавокі, аднаногі
І аднарукі, небарак;
І задуменныя дарогі
Чакаюць іншых у барах...

На такой мінорнай ноце пачынаецца размова. Што і казаць, пяцьдзесят — не трыццаць, і ў кнізе ёсць радкі, дзе паэт не надта хваліцца добрым здароўем («і мяне хвароба тузанула...»). Але Панчанка не быў бы Панчанкам, калі б здаўся ў падобнай спрэчцы, згадзіўшыся са сваім апанентам. І ён бярэ слова:

Пляткарце, мілыя,
пляткарце,
Што нехта ў крук мяне
сагнуў.
А я улёгся на плацкарце
І правадніцы падміргнуў.

Шырыня і паўнакроўнасць эмацыянальнай палітры лірыкі Панчанкі, яго чалавечай натуры вядомыя даўно, і як хораша і праўдзіва разгарнуўся неспакойны, па-юначаму няўрымслівы характар паэта ў гэтых і наступных радках. Колькі тут сапраўднага, хоць і крыху журботнага, гумару, жарту!

Эх, праваднiца, праваднiца,
Люблю я твой вандроўны
дом.
Хачу з табою парадніцца,
Зрабіцца паўправадніком.
Каб ад паглядаў чалавечых
І загарацца, і гарэць,

І хоць далёка, хоць пад вечар,
Што не сустрэў яшчэ,
сустрэць.

Думка развіваецца і ўдакладняецца далей. Хораша, дакладна, як вагонныя колы на стыках рэек, пераклікаюцца (і кожны раз з пэўным «сэнсам») на рыфмах словы. І я б сказаў, што змястоўна-аптымістычны погляд усталёўвае сябе паслядоўна і да канца, сыходзячыся, як у фокусе, на разуменні грамадскай каштоўнасці і гуманістычным сэнсе жыцця:

Каб на людскім дарожным
сходзе
Патрэбным гэтым людзям
быць
І ведаць, дзе каму
сыходзіць,
Якія станцыі любіць.

І нарэшце:

І каб на той, на канчатковай,
І не пазней, і не раней,
Сысці не ў табар Канчаковы,
А ў свет бяроз, што ўсіх
радней!

З добрага (а кніга — адразу скажу — вельмі змястоўная) выбраць лепшае таксама не проста. У працытаваным вышэй вершы яскрава адбіліся светапогляд паэта, яго знітаванасць з жыццём, чалавечнасць, палымянасць, рызыкоўнасць як вельмі прывабныя рысы героя, а таксама ўласцівыя Панчанку дыялектыка тонкіх паэтычных перажыванняў, змена лірычных адценняў, узаемапераход настрояў — адным словам, своеасаблівасць яго мыслення, складанага, як само жыццё.

Узровень майстэрства П. Панчанкі надзвычай высокі. Але гэта своеасаблівае майстэрства — не абстрактнае, а звязанае з сацыяльным вопытам паэта, з ім самім як майстрам. Маецца на ўвазе не столькі рамяство, умельства, талент, колькі сама асоба паэта, яго светапогляд.

Пытанне «як пісаць?» гучыць у яго хутчэй «як жыць?». Адчуваецца, што ён не проста «дапрацоўвае», «шліфуе» свае радкі, а «дажывае» іх. Менавіта ў гэтым яго майстэрства.

Паэзія Панчанкі нясе ў сваіх вобразах непаўторны воблік нашага часу з яго шматлікімі «напластаваннямі», нечаканым суседствам: «асліны голас электрычкі, і старажытны маладзік, і аўтаматыкі шарады, і хітрай хіміі гушчар, і чарнаморскія шаланды, і лісця восеньскага

жар». Паэт правільна «сінтэзуе» праблемы і супярэчнасці эпохі, бо апіраецца на партыйны, камуністычны светапогляд. Камунізм у яго разуменні супадае з гуманізмам. Як гуманіст паэт трывожыцца за тых, «каму нялёгка у жыцці».

Сіла і вабнасць паэзіі Панчанкі ў тым, што ён — сын свайго часу — імкнецца сказаць праўду аб ім, нястомна клапоціцца аб тым, «на якой вышыні мой сцяг».

Такая паэзія варта любві і павагі.

1978 г.

## Быць чалавекам на зямлі

Творчы дыяпазон Кастуся Кірэенкі надзвычай шырокі. Вершы, паэмы, проза, мастацкі пераклад, творы для дзяцей, публіцыстыка, сатыра... Пры ўсім гэтым ён перш за ўсё паэт. Лірыка, інтэнсіўны лірызм — асноўная, усёабдымная стыхія яго творчасці — арганічна ўласцівы бадай што ўсім жанрам, у якіх ён выступае.

«...Кожны, хто пабываў на берагах Сажа, згодзіцца са мною, што гэта зямля — не перабольшваючы — незвычайная. Як бы ні бралася рыба, усё роўна не стрывае рыбак, пакіне вуду, узыдзе на гару, сядзе на чабаровы грудок між арэшнікамі і соснамі і аддасца ва ўладу малюнкаў, фарбаў і гукаў цудоўнай надсажоўскай зямлі. Цягне мядовым настоем з пакошаных у расцяробах лугавін, над грывамі вучацца лятаць маладзенькія падворлікі, Сож уздыхае на поўныя грудзі пад шчодрым сонцам, а недзе збоку ацяжэлая сцяна жыта пахне маладым, найсмачнейшым у свеце свежым хлебам... Аднекуль, нечакана і зіхотна, з'явіцца перад вачамі рыбака чароўная постаць — казачная каралева летуцення, празрыстая, як Сажова вада, і бязгучная, як размова прамянёў...»

Гэта — радкі з яго буйнога твора, паэмы ў прозе (я б такім чынам вызначыў яе жанр) «Вандроўнае шчасце», у якіх відзён Кірэенка-лірык, яго тонкае і надзвычай дзейснае, «да верху» напоўненае эмоцыяй паэтычнае ўспрыняцце рэчаіснасці, прыроды. Адразу ж хочацца адзначыць, што лірызм паэта па-сапраўднаму насычаны духам жыцця, грамадзянскімі страсцямі і парываннямі, якімі пазначаны яго жыццёвы і творчы шлях.

«Я — паэт. Гэтым і цікавы. Аб гэтым і пішу»,— казаў пра сябе У. Маякоўскі. З поўным правам мог бы паўтарыць гэтыя словы К. Кірэенка. Доказ таму — дзесяткі ягоных кніг, у якіх адлюстравалася актыўная біяграфія паэта. Свой жыццёпіс ён апублікаваў у кнізе «54 дарогі» (Мінск, 1963), але, магчыма, з-за сціпласці не сказаў пра тое, наколькі аўтабіяграфічныя яго вершы. Аднак я, перачытваючы яго кнігі, падумаў перш за ўсё пра гэта, пра тыя відавочныя, спраўджаныя праз асобу паэта сувязі паміж яго творчасцю і часам, у якім ён жыве...

Біяграфія Кірэенкі, калі гаварыць у цэлым, склалася вельмі шчаслівa. Равеснік рэспублікі, ён аказаўся ўдзельнікам многіх гістарычных падзей у жыцці краіны, многае, прайшоўшы праз яго сэрца, праз паэтычную свядомасць, адгукнулася ў вершах. У прадмове да зборніка Леаніда Гаўрылава — сябра свайго юнацтва, які загінуў на вайне,— паэт успамінае, як той «вельмі настойліва рыхтаваў сябе да

ўступлення ў жыццё. Яго адзінай марай было як можна паўней і карысней аддаць свае сілы і здольнасці служэнню савецкаму народу». Можна з упэўненасцю сказаць гэта аб усім пакаленні «равеснікаў Кастрычніка», чый грамадскі воблік фармаваўся ва ўмовах савецкага ладу, у 30-я гады.

Паэты гэтага пакалення вылучаліся нейкай асаблівай мэтаімкнёнасцю і шчырасцю, фанатычнай адданасцю літаратуры, з якой звязваліся думкі на будучыню. «Бяссонныя інстытуцкія ночы за кнігамі,— успамінае Кастусь Ціханавіч гэтыя гады,— сяброўскія сустрэчы, гутаркі, спрэчкі і расчараванні... Мы станавіліся дарослымі, а на жыццё насоўвалася хмара ваеннай трывогі...» Набліжалася вайна, біяграфія і паэзія пайшлі адной цяжкой дарогай...

Сёння шмат гавораць і спрачаюцца пра першую кнігу паэта — якой яна павінна быць,— нярэдка скардзяцца на тое, што вось, маўляў, цяперашнія маладыя дэбютуюць не з той сілай, як іхнія папярэднікі. Не бяруся катэгарычна сцвярджаць, што гэта сапраўды так, але першыя кнігі Я. Купалы, М. Багдановіча, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі і многіх іншых паэтаў з'явіліся выдатнымі з'явамі свайго часу. Вельмі яркай, важкай і, безумоўна, таленавітай аказалася першая, выйшаўшая з некаторым спазненнем (перашкодзіла вайна) кніга К. Кірэенкі «Ранак ідзе». Паявілася яна ў 1945 годзе, аднак і сягоння адзін мой добры знаёмы, вядомы паэт, гаворачы аб ёй, сказаў: «У гэтай кнізе не было ніводнага слабога радка!» Відаць, ён быў не зусім дакладны, мой знаёмы, даўно не перачытваў кнігу і мяркуе па тым даўнім уражанні, але кніга на самой справе стала значнай грамадскай падзеяй у многіх адносінах. Міхась Ларчанка пісаў: «Гэта толькі пачатак, ранак, які ідзе і які абяцае светлы сонечны дзень». У ёй былі сабраны некаторыя раннія вершы — 1939-га, 40-га, 41-га гадоў, па-юнацку шчырыя і ў нечым яшчэ кволыя, няспелыя. Тым не менш ужо тады бачны былі парасткі незвычайнага лірычнага тэмпераменту, які абяцаў раскрыцца ў будучым.

Пачынаў паэт знешне стрымана, але ў падтэксце яго песні адчувалася глыбокае эмацыянальнае хваляванне. Першыя вершы Кірэенкі і іншых паэтаў яго пакалення — гэта вершы-прадчуванні. У іх адчувальна тая інтэнсіўная ідэйна-маральная падрыхтоўка, якая аказалася вельмі і вельмі неабходнай перад тварам будучых выпрабаванняў, якія выпалі на долю гэтага пакалення.

Ужо ў самым пачатку творчага шляху паэт паказаў сябе рамантыкам, бязмежна закаханым у жыццё, родную, блізкую сэрцу прыроду, у сяброў, якія разам з ім сустракаюць ранак жыцця. Яго — нават самыя першыя вершы — вылучала нейкая асаблівая

закаханасць, бязмежная пяшчота, эмацыянальнасць, якая спалучала ў адзін, часам, магчыма, недастаткова канкрэтны вобраз асобныя дэталі, штрыхі, перажыванні.

Галоўны ж змест зборніка «Ранак ідзе» складалі творы, напісаныя ў грозныя ваенныя гады, калі родная зямля была ахоплена агнём. Вайна застала К. Кірэенку ў арміі, дзе ён праходзіў службу. «Калі б пачаў успамінаць усё, што ўбачыў і што перажыў за чатыры гады вайны,— патрэбна было б пісаць тоўстую кнігу мемуараў»,— гаворыць паэт аб сабе...

Перажытае адбілася ў вершах:
Галасілі салдаткі не дзень і не два,
Жабравалі па свеце малыя сіроткі.
А на лузе шумела, як мора, трава,
І жыга налівалася сокам салодкім.
Даспявалі суніцы ў зялёных барах,
На шыпшыне звінелі пчаліныя гуслі.
А дзяўчыну з бацькоўскага бралі двара
І ў Нямеччыну гналі — па ўсёй Беларусі.

Так, праз рэальнасць гэтага кантрастнага супастаўлення трагічнасці вайны і прыгажосці спеючай прыроды, перадаецца вобраз часу.

Вайна ў Кірэенкі мае вельмі будзённы выгляд. Вершы пісаліся ў палявых умовах, літаральна на хаду. Быў відзён паэт раскаванага стылю, пераважна размоўна-інтанацыйнага ладу, «вуснай» рытмамелодыкі. Ён валодаў гнуткай пластычнай інтанацыяй, здольнай перадаць прастату і складанасць думкі, тонка яе акцэнтаваць, данесці само дыханне радка.

Каля пажараў прыкурвалі,
У касках варылі гарбату.
Спявалі з вачмі пахмурнымі
Аб нівах сваіх і хатах...
Над брацкай магілай шчырую
Слязіну зганялі без слова.
І цяжка — як птушкі з выраю —
Спяшаліся ў шлях суровы.

Яго вершы, напісаныя ў тыя дні і, відаць, перш за ўсё для тых дзён, даносяць у наша «сягоння» перажыванні савецкіх людзей, што ўзняліся супроць фашысцкай навалы, атмасферу напружаннейшага змагання і ўсю суровасць абставін той цяжкай пары. Імкнучыся не адстаць ад падзей, паэт расказваў пра будні вайны, ратную працу салдата, пра дваццаць восем герояў-панфілаўцаў, пра тое, як «жывыя ідуць наперад», пра смерць салдата-пехацінца на полі бою, пра тое, як

рана ў гэты час прыходзіла да людзей сталасць і пакрывала скроні сівізна.

Надзвычай моцна, шматгалосна гучала ў творах Кірэенкі ваеннага перыяду тэма Радзімы, стаўшая з таго часу адной з галоўных у яго творчасці. Слова «Радзіма» ён піша з вялікай літары. Радзіма — гэта родная зямля і глыбіні народнай гісторыі, дарагія імёны і подзвігі вялікіх продкаў. Патрыятычныя пачуцці паэта ўзбуйняюцца гістарычнай перспектывай. З'яўленне гістарычных матываў у лірыцы Кірэенкі ваеннага часу ўспрымаецца як узмацненне сувязей з гераічным мінулым свайго народа, з «продкамі-салдатамі», што аддана баранілі сваю Радзіму ад чужынцаў. Яго лірычны герой — прадаўжальнік іх справы, пераемнік іх вялікіх гераічных традыцый.

У час вайны Кірэенка-паэт паўней і арганічней, чым да гэтага (а часам, магчыма, і пазней), праявіўся як асоба. Паказчык прысутнасці асобы — шчырасць яго слова, праўдзівасць, высокі ідэйны пафас і мастацкі ўзровень.

Так, баі сціхлі, але ўспаміны аб вайне працягвалі жыць. Слядамі трасіруючых куль прашываюць яны свядомасць былога воіна. Тады, адразу пасля вайны, і сягоння. У творчасці паэта і сёння чэсна і пранікнёна гучыць голас салдацкага сумлення, сум па высакароднай франтавой мужчынскай дружбе, вернасці. Голас гэты мае яркую рамантычную афарбоўку.

Таварышы, хлопцы,
Героі бясконцага штурму,
Няўжо так далёка —
Ужо за легендамі вы?
Прышліце ж, прышліце
Хоць голас мне велічных сурмаў,
Прыміце ж, прыміце
Хоць спеў мой у строй баявы.

Горкія, трагічныя, сумныя ўспаміны аб вайне застануцца назаўсёды. Яшчэ доўга вясенні гром будзе нагадваць яму ваенную кананаду. Нават з марознай зімой у яго асацыіруюцца жорсткія ваенныя ўспаміны.

Кірэенка першых сваіх кніг — гэта напор страсцей, выбух эмоцый, напружанне псіхалагічных сітуацый. Не зменшылася гэтых якасцей у яго і зараз, але яны сталі, мне здаецца, больш асэнсаваныя, перайшлі ў маральна-этычны аспект гаворкі. Творчасць паэта ўсім сваім лірычным пафасам сцвярджае высокі лад пачуццяў савецкага чалавека, яго ідэйныя і маральныя перакананні, адказнасць перад

часам, перад нашчадкамі, грамадзянскую патрабавальнасць паэта: «Не жывіце — абы...» Паэт, думаецца, мае права на ўсю бескампраміснасць такой размовы, яго жыццёвы, душэўны вопыт грамадска значны, багаты, і сваю паэзію ён імкнецца насыціць духам творчасці, сацыяльнай актыўнасці, чалавечнасці.

Паэтыцы яго амаль неўласцівы паўтоны, адценні. Калі звон — то аглушальны, раса — цяжкая, навальніца — бязлітасная, удар — люты, хмара — чорная і г. д. І ў гэтым мне таксама бачыцца своеасаблівасць яго стылю, у якім арганічна спалучыліся маральна-валявы і песенны пачаткі.

Апорныя паняцці вобразнай паэтыкі К. Кірэенкі — радзіма, маці, родны край, жыццё, чалавек... За гэтымі выключна багатымі па свайму сацыяльна-эстэтычнаму зместу паняццямі для паэта заўсёды стаялі вялікія духоўныя каштоўнасці, якія даводзілася абараняць і адстойваць у суровых бітвах.

Родавая рыса яго паэзіі — рамантычнасць, якою можна растлумачыць многія асаблівасці яго мастакоўскага бачання. Зрэшты, гэта не раз адзначалася крытыкай. Кірэенка-рамантык хораша адчуваецца ў вершах «Караблі», «Конь Даватара», «Перад вясной», «Ля агню», «Слухайце ластавак» і іншых, паэмах, якія даўно і справядліва лічацца лепшымі рэчамі паэта. Рамантызм, апрача ўсяго іншага, азначае, што паэт не баіцца стыхійнай магутнасці жыцця, смела выходзіць яму насустрач, імкнучыся авалодаць ім, замацаваць у творы.

У яго кнігах чутны трывожны шум лесу і зімовыя завеі, паэт прагна ўслухваецца і ўглядаецца ў жыццё прыроды, звяроў, птушак. Унутраная патрэба «пакланіцца прыродзе» заўсёды жыла ў яго душы. Тэма прыроды, успрыняцце якой у яго пранікнута своеасаблівым, пасвойму глыбокім пантэізмам, скразной лініяй праходзіць праз творчасць паэта. Ён умее тонка і разам з тым вельмі моцна адчуваць шматколерны і шматгалосы свет прыроды. Паважаць і шкадаваць яе. Адносіны да прыроды звязаны ў паэта з пэўным маральным пачаткам: «Баюся словам лішнім, неўпапад, парушыць дарагое сугалоссе крынічных звонаў і лясных рулад, дыхання зор і шэпату калосся». У яго вершах прырода поўная таямнічасці. Яна можа ўзбуджаць у чалавеку нейкія нават першабытныя адчуванні, элементы «пралагічнага» мыслення:

Ізноў адчуваеш ты,
Што ў цемры сядзіш не адзін:
Там цягнуцца ў рост кусты
Алешніку і крушын,
Там ціха трызніць рака;

Ільсняцца зоры ў высі,
А збоку, у лазняках,
Пасуцца ў статку ласі.

Нарадзіўся К. Кірэенка на Слаўгарадчыне (Магілёўская вобласць). «Мая родная вёска Гайшын,— гаворыць ён у сваёй аўтабіяграфіі,— даволі ладная і шматлюдная, раскінулася на высокім правым беразе Сожа. Нічым асаблівым яна, безумоўна, не славілася, акрамя як тымі палямі і пералескамі, крыніцамі і сцяжынкамі, дарогамі і рачулкамі, якія ёсць усюды і якія з маленства застаюцца дарагімі для кожнага па-свойму...»

Вось адкуль, думаецца, бяруць выток «прыродныя» адчуванні паэта, яго высокая «хвароба», пра якую ён надзвычай хораша напісаў у адной з нядаўніх кніг:

Я захварэў на пах лясных сутонняў —
З дымком слязы смалістай на карчах.
І гэта, мусіць,
нават і пры сконе
Зазіхаціць, засвеціцца ў вачах...

Чытаючы «Сіні вырай», іншыя кнігі К. Кірэенкі, заўважаеш новыя матывы і ідэйна-эмацыянальныя моманты сённяшніх твораў паэта, новыя грані яго рамантызму. Павысіўся болевы парог яго лірыкі, узмацнілася шчымлівая любоў да ўсяго жывога, безабароннага, аўтара ўладарна пацягнула ў свет прыроды. Яго паэзія ў лепшых творах — калі ўжыць сучасны выраз — ускрывае «дадатковыя» рэзервы душэўных запасаў паэта, скарбніцу яго ўнутраных набыткаў.

Гартаючы старонкі яго кніг, нельга не заўважыць, як мяняецца, развіваецца маральна-этычны воблік героя. Сутнасць яго — высокая ідэйнасць, партыйная прынцыповасць і перакананасць — застаюцца тымі ж самымі, але пашыраецца тэматыка, узбагачаецца гуманізм, з новай сілай вядуцца эстэтычныя пошукі. У мяне такое ўражанне, што чалавечнасць радка, яго інтанацыя пабагацела на новыя фарбы, адценні, стала больш шчымлівай, хвалюючай, не страціўшы ранейшага маральнага напору, сацыяльна-этычнай перакананасці.

Мне імпануе, што паэт прыходзіць да вельмі істотнага разумення тых простых маральных каштоўнасцей, з якіх складаецца чалавечы побыт, жыццё, настрой.

Нельга не бачыць, што побач з працэсам «пацяплення» лірычнага характару працягваюць спець і паглыбляцца грамадзянскія матывы.

Публіцыстычнасць — тэматычны і стылёвы стрыжань паэзіі К. Кірэенка Паэт жыў і жыве на суровых скразняках часу, ён не можа быць раўнадушны да вострых пытанняў дня. Ён актыўна закранае іх

у сваіх вершах, спрабуе па-свойму — тэмпераментна і бескампрамісна — асэнсаваць, дамагаецца відавочных поспехаў. У новых творах узмацніўся праблемны, аналітычны падыход да рэчаіснасці. Хвалюючыя інтанацыі роздуму пранікаюць у самую тканіну верша. Паэт стаў больш засяроджаны, удумлівы, разважлівы, абвастрылася маральнае асэнсаванне жыцця.

Значнай падзеяй сучаснай беларускай паэзіі стала яго паэма «Трыпутнік».

Без мар, без мэт, без спадзяванняў,
Без суцяшэння і надзей,
Нібы якісь чужы выгнаннік
Сярод чужых яму людзей,
Спыніўся я на плошчы люднай,
Схіліў на грудзі галаву,
І думаў —
горка і няўклюдна:
Куды ісці, нашто жыву?

У гэтым творы аўтар асвятляе складанасць асобы сучасніка. Лірычнымі сродкамі ён малюе буйны, хоць і супярэчлівы чалавечы характар, жыўцом выхаплены з нашых дзён. Герой — чалавек сталага веку — раптам задумваецца над пражытым і перажытым. Гэта ўласціва натурам моцным і мужным, якія час ад часу вельмі патрабавальна і самакрытычна аглядаюцца на пройдзены шлях, каб упэўніцца ў правільнасці абранага кірунку.

Такая маральная рэтраспекцыя — у духу паэзіі Кастуся Кірэенкі.

Паэма пазбаўлена вонкавай падзейнасці. Яна ўнутрана канфліктная, дынамічная, уся прасякнута напружаным духоўным, маральным пошукам, пачатак якому паклаў лісток трыпутніку, што расце на шматлюдных вясковых каляінах. Ён нагадаў паэту даўнія гады і паклікаў яго ў маладосць, у той куток, адкуль пачыналася жыццё, дзе знаходзіцца родная вёска, дзе пахавана маці. Адзін на адзін з матчынай магілай ён учыняе сабе бязлітасны суд. Ці ўсё ты зрабіў для людзей? Ці жыў ты ўпоравень з векам? Ці быў ты сынам сваёй маці? — такія пытанні ён адрасуе самому сабе, мучыцца і ачышчаецца імі...

У вобразе сціплага трыкутніка скандэнсавана ідэя твора — чалавек, нават пакрыўджаны, не павінен губляць веры ў людзей, а быць гатовым, як той трыпутнік, «гаіць чужыя раны, сцішаць агонь чужой бяды».

«Трыпутнік» — пераадоленне супярэчнасцей і парыванне паэта ў новы стан.

Гэта — паэма-споведзь сына веку, прыклад таго, як паэт умее па-філасофску ўзнімацца над канкрэтнасцю жыццёвай сітуацыі, імкнуцца і дасягаць значных абагульненняў, не абмінаючы складанасці, шматмернасці маральных праблем, якія стаяць перад сучаснікам.

Разам з тым эмацыянальная і тэматычная палітра паэта багатая. Яго лірыка не замыкаецца кругам тэм публіцыстычнага характару, яна імкнецца перадаць усю паўнату жыцця, хуткую яго плынь, бег часу, яго прыгажосць і непаўторнасць.

І ў тым, што асабістае, чалавечае, інтымнае арганічна стыкуецца з грамадзянскім, эстэтычна апладняючы яго, а ў публіцыстычным выяўляюцца разнастайныя чалавечыя, душэўныя якасці лірычнага героя,— добрая прыкмета паэзіі К. Кірэенка усёй яго творчасці, новых кніг, у якіх усё паўней знаходзіць мастацкую рэалізацыю і ўвасабленне ідэйна-маральная пазіцыя паэта:

Мой абавязак камуніста — Быць чалавекам на зямлі.

1976 г.

## Шлях паэта

Больш сарака год працуе ў беларускай паэзіі Сяргей Дзяргай. Важкім — у чатыры сотні старонак — аднатомнікам выбранага «На вогненнай сцяжыне» сустрэў ён сваё сямідзесяцігоддзе. (Не ўвайшлі сюды, на жаль, яго мастацкія пераклады. А сярод іх нямала надзвычай удалых...)

Кожны верш пазначаны годам напісання — і гэта добра: на твор быццам бы падае водсвет гісторыі, пэўнай эпохі, надаючы яму кожны раз нейкае новае адценне ў сэнсе.

Першы верш, з якога кніга і пачынаецца,— «Мая мэта» — паэт пакінуў без даты. І зрабіў так, па ўсім мяркуючы, свядома. Бо верш гэты — на ўсе гады, як эпіграф да біяграфіі і творчасці паэта, як яго «мэта»:

Асушыць —
дзе яшчэ забалочана,
Даплаціць —
дзе яшчэ не даплочана,
Там прайсці —
дзе было недазволена,
Дасаліць —
дзе было недасолена,
І разбавіць —
дзе перасаладжана,
Распагодзіць —
дзе нераспагоджана,
Развесяліць усё,
што засмучана,
І злучыць,
што калісьці разлучана,
І апець
усё яшчэ неапетае...
Вось такую
паставіў мэту я.

Хоць гэты «эпіграф» да кнігі выбранага друкуецца без даты, мы ведаем, што верш напісаны быў у пачатку 60-х гадоў, калі паэтычная думка С. Дзяргая (і не аднаго яго) значна пашырала свае грамадскія абсягі, удакладняла творчыя пазіцыі, паэт прагна і нястомна шукаў.

А да гэтага?

Калі — рэтраспектыўна — паглядзець далей, у гады 1937-ы, 1938-ы, 1941-ы, 1949-ы (імі адзначаны хранаалагічна найбольш

аддаленыя, раннія вершы), то давядзецца прызнаць, што творы і тых часоў у цэлым адпавядаюць ідэйна-гуманістычнай праграме, «сфармуляванай» пазней у вершы «Мая мэта», што творчы неспакой ніколі не пакідаў паэта.

Добра памятаю выдадзены ў 1962 годзе зборнік вершаў і паэм С. Дзяргая «Чатыры стыхіі». Назва навеяна, як сведчыць сам паэт, карцінамі французскага мастака Франсуа Рэнье, што знаходзяцца ў Дрэздэнскай галерэі,— «Паветра», «Вада», «Агонь» і «Зямля». С. Дзяргай зрабіў спробу перадаць у адпаведных вершах жывапіс праз слова. Так з'явіўся аднайменны цыкл «Чатыры стыхіі». Ёсць у ім, на маю думку, некаторая зададзенасць, свядомая ўстаноўка на філасафічнасць. Лепшы з чатырох вершаў — «Зямля», у якім паэт услаўляе жыццядайную сілу зямлі...

Тады ж падумалася і пра іншае — пра разнастайнасць стылёвай палітры паэта, пра непадобнасць тых «стыхій», што знутры жывяць яго творчасць. У гэтым сэнсе паняцце «чатыры стыхіі» можа стасавацца і да ўсёй паэзіі С. Дзяргая, да яе вобразна-стылёвай панарамы. Праўда, такіх «стыхій» будзе, відаць, не чатыры, а болей. Народная глеба яго мастацтва — перш за ўсё. Свежасць мовы, сувязь з народным складам думкі, маральнымі ўяўленнямі. Сюды ж я аднёс бы стыхію (таксама народную) сатыры і гумару, добрай усмешкі. Дзяргаю арганічна эпічнасць інтанацыі, імкненне да філасофскага асэнсавання жыцця і значных абагульненняў.

Р. Барадулін трапна назваў творчасць С. Дзяргая «паэзіяй інтэлекту і пачуцця». Яна — высокая па сваёй мастацкай культуры — прасякнута гарачым патрыятызмам, глыбока партыйная па свайму духу, нацыянальная па зместу і мастацкіх фарбах. Паэт прайшоў вялікі творчы шлях.

Пачатак...

Дзеля паўнаты праўды трэба сказаць, што пачынаў ён з «ружовых», амаль ідылічных вершаў. Зрэшты, шчырых і непасрэдных, якія ўжо тады вылучаліся народнасцю сваёй мовы, яе сакавітасцю. Дар жывога сузірання — у гэтым яму нельга было адмовіць.

Провады ў армію (верш Дзяргая так і называецца «Провады») — традыцыйная для даваеннай савецкай паэзіі тэма. «У дарогу маці сына выпраўляла. Восень клёны ледзь прыкметна пазлацала». Сын, адыходзячы ў армію, слухае матчын наказ добра і чэсна служыць Радзіме, народу. «Буду я ліста твайго чакаць, Дзянісе! Ды на павароце мельгам азірніся!»

Ужо ў ранні перыяд творчасці паэт звярнуў увагу на асацыятыўныя магчымасці рыфмы, на яе сілу і свежасць.

Іншыя з ранніх вершаў — шырока вядомае «Над краем зоры рубіновыя...», «Карабель» — таксама пацвярджалі трывалую сувязь з народнай мовай і паэтыкай і, шырэй, з народна-духоўнымі асновамі быцця. Дарэчы, на маю думку, адчувалася тут і схільнасць да ідэалізацыі як найбольш блізкага паэту спосабу лірычнай тыпізацыі, абумоўленай разуменнем тагачаснага жыцця, настроенасцю ўсё апяваць.

Словам, народная «закваска» таленту С. Дзяргая праявіла сябе ў самых першых вершах. І духоўна, і «тэхнічна» (у сэнсе ўмельства, майстэрства) ён гатовы быў да далейшага росту — сталага і сур'ёзнага.

Усё ўскладніла вайна... Зрэшты, гэта асобая старонка творчасці С. Дзяргая, напісаная ім ужо пасля вайны, на ёй мы спынімся далей.

Пасляваенныя гады былі цяжкія, неспакойныя, але мірныя. Асалода ад міру адчуваецца ў вершах гэтай пары: «І мір сыходзіць у душу мне, сыходзіць у душу спакой, бо час жывы, савецкі, шумны цячэ няспыннаю ракой». Уражлівая і добрая душа паэта бачыць прыгожае ва ўсім. «Вітаю радаснай усмешкай прыгожасць роднай старанвы»,— гаворыць ён у адным з пасляваенных вершаў. У гэтае вельмі адказнае пасляваеннае дзесяцігоддзе савецкая паэзія вельмі шмат зрабіла, каб зберагчы мір.

У агульным хоры гучаў голас Дзяргая. Тэматычна яго творчасць была даволі разнастайнай, але сваю, унутраную тэму паэт, відаць, адчуваў яшчэ слаба. Чытаючы сёння многія вершы паэта пачатку пяцідзесятых гадоў, добра бачыш іх недахопы. Сёння нескладана крытыкаваць іх за «нарысавасць», залішнюю ідэалізацыю, стылізаваную фальклорнасць, за некаторую аддаленасць ад праўды жыцця.

У сваім «Выбраным» паэт падышоў да гэтага перыяду вельмі патрабавальна, нават сурова, змясціў толькі самае лепшае, у тым ліку сваю цудоўную «Вішаньку» (1951), якая ўзрасла на глебе народнай паэтыкі і ўспрымаецца як пяшчотная калыханка. Аўтару ўдалося стварыць надзвычай пластычны, псіхалагічна рухомы, абаяльны вобраз лірычнай гераіні. Вельмі мілы верш, у якім заяўляе аб сабе індывідуальны пачатак, без якога лірыка як від творчасці немагчыма.

Першая паэма С. Дзяргая — «Песня пра Туркменскі канал» (1952). Сёння наўрад ці можна аднесці яе ў творчы актыў паэта. Тут, як ні дзіўна, няма людзей. Ёсць працэсы, вытворчасць, рух, краявіды, а канкрэтных людзей няма. Такая акалічнасць адмоўна ўплывала на твор, збядняла яго гуманістычны пафас. Паэма гучала задужа «афіцыйна». Яе эпічнасць патрабуе, так сказаць, лірычнага «пацвярджэння», большай асабістасці перажывання. Словам, няма падстаў думаць, што творчая індывідуальнасць паэта складвалася лёгка. Яго

пасляваеннай творчасці ўласціва стракатасць стылю, яўныя сляды ўплываў розных паэтаў — ад Пушкіна да Купалы і Маякоўскага.

Дзесяць год (1948-1958) працаваў Дзяргай над паэмай «На шашы энтузіястаў» — пра жыццёвы шлях А. С. Пушкіна. Паэма і напісана пушкінскім чатырохстопным ямбам, і стылёва аўтар нярэдка набліжаецца да Пушкіна. Усё гэта выдае даўнюю закаханасць беларускага паэта ў Пушкіна. Некалі ён спрабаваў — так, «для сябе», як успамінае Р. Бярозкін,— перакладаць «Яўгенія Анегіна». Добрае веданне біяграфіі паэта, яго творчасці, часу і асяроддзя — усё гэта ёсць у паэме, якая эпічна непаспешліва вядзе нас, ад падзеі да падзеі, па жыццёвай канве вялікага паэта. Шмат, надзвычай шмат працы ўклаў аўтар у гэта сваё (любімае, па ўсім відаць) дзецішча. Беларускі паэт вучыўся ў Пушкіна, наследаваў культуру яго верша.

У раздзеле «Паэмы» некалькі рэчаў. Некаторыя з іх — фрагменты з буйнога твора, у якім аўтар распрацоўваў тэму былой Заходняй Беларусі. Перш за ўсё звяртае на сябе ўвагу стыль, сам верш, непаўторная «дзяргаеўская кладка», яго гаворкае слова. Эпічнасць — унутраная ўласцівасць стылю гэтага паэта, самой яго інтанацыі. Даўно помніцца яго вялікі верш «Над спакоем крыніц», прысвечаны «светлай памяці Янкі Купалы». Пераасэнсоўваючы яго думку з магутнага «А хто там ідзе?», твор С. Дзяргая, здавалася б, літаратурны па сваім паходжанні, набывае эпічнасць гучання і нездарма змешчаны ў гэтым раздзеле.

З сярэдзіны пяцідзесятых гадоў пачынаецца, на маю думку, новы перыяд у творчасці Дзяргая. Размова ідзе аб шырокім і рашучым пераадоленні ранейшага «нарматыўнага» эстэтычнага канону, пра абвастрэнне пачуцця часу. «Час апавядае, песню час складае»,— скажа пра гэта сам паэт.

Духоўны кантакт з часам даваўся не лёгка.

С. Дзяргай заўсёды шмат думаў, разважаў пра сваё «рамяство», пра паэзію. Вн рос, мяняўся разам з часам. Мяняўся, захоўваючы і аберагаючы свой маральны стрыжань — вернасць высокаму прызванню савецкага паэта. З гэтай вышыні многае было відаць.

Зненавідзеў
    паэзію-амброзію,
Зненавідзеў
    паэзію-карозію —
Гугнявую,
    як казань прапаведніка,
Сухую,
    як старонка даведніка,

З думкаю
мёртванароджанай,
Дзе наплецена,
дзе нагароджана,
Як шляхцянку да фэсту
прыбраную,
Бразгатлівую,
барабанную:
Языкатую,
без'языкую,
Што жыве крадзяжом
і пазыкаю,
Звышрахманую,
звышпалымяную,
Дырыжорам усім
паслухмяную...

Аўтар расказаў, здаецца, пра ўсе хваробы сучаснай паэзіі, нават, магчыма, перабольшыў іх. І як расказаў! Жывым, гаваркім народным словам! Прадметна, канкрэтна, эмацыянальна...

Пра Дзяргая шмат пісалі, адзначалі яго высокую моўна-філалагічную культуру.

Народнасць мовы — выдатная вартасць яго паэзіі. Але не толькі ў слове, жывым народным слове, чэрпаў ён натхненне, хоць заўсёды любіў і любіць пацешыцца ім. Ён імкнуўся да глыбокага раскрыцця ўнутранага свету свайго лірычнага героя, ішоў ад жыцця. У С. Дзяргая — як і ў многіх яго сяброў-паэтаў — нібыта адкрылася другое дыханне.

Дарэчы, з «Выбранага», выдадзенага ў 1977 годзе, відаць, якім надзвычай плённым аказаўся для паэта 1957 год. Гэта быў год сапраўднага творчага неспакою. «Неспакойная ноч без сну. Неспакойная кроў віруе. Лёд ірвуць. Услаўляюць вясну. Неспакойны ў гэту пару я»,— так перадаваў ён свае адчуванні ў вершы «Неспакойная ноч».

Нездарма ў гэту замець бурштыну,
Ў цьмяным золаце восеньскіх строяў
Зацвіла пад акном шыпшына
Не прызначанай ёй парою.
(«Шчасце», 1957)

Узмацняецца маральны, гуманістычны пафас, што характэрна ўсёй паэзіі таго перыяду.

Значны ўплыў на творчасць С. Дзяргая рабіла яго праца ў сатырычным часопісе «Вожык», дапамагаючы яму трымаць руку на

пульсе жыцця. З «Вожыкам» няйначай звязана гумарыстычная, сатырычна-выкрывальная плынь у яго творчасці — байкі, вершаваныя фельетоны, апавяданні вершам і г. д.

Сувязь з народным жыццём паглыблялася.

У 1957 годзе былі напісаны проста выдатныя і розныя па стылістыцы вершы — «Сапраўднае», «Словы», «Хірасіма», «Сад», «Ой, дзяўчо!..», «Родная мова...». У паэта намеціўся паварот да верлібра, утварылася новая стылёвая плынь у яго творчасці, выкліканая свежымі павевамі жыцця.

Не знікаў і «рэгулярны» верш. У рамках традыцыйнай паэтыкі створаны (усё той жа 1957 год) выдатны цыкл інтымнай лірыкі — «Восень», «Бура», «На ростані», «Прабач», «Сіняя бездань», «Роздум»... Яна глыбокая, канфліктная, псіхалагічна праўдзівая.

Па-ранейшаму бруіўся лірычна-песенны струмень, які раней развіваўся пераважна ў народна-музычным ключы («Казка», «Бульба», «Гультай» і інш.). Цяпер ён вабіць больш арганічнай з'яднанасцю народнага пачатку і высокай культуры псіхалагічнага верша.

Адзін з самых лепшых вершаў — «Ой, бяда салаўю, бяда!», які, бясспрэчна, узнік на народнай аснове. Гэты верш — вельмі асабісты (хоць і алегарычны) па сваёй ідэі — сцвярджае надзвычай важную агульную думку аб мастаку, яго месцы ў жыцці, вернасці свайму мастацтву. Ні на што і ні за што не прамяняў салавей сваёй песні.

Думаў, думаў шэры бядак,
Думаў, думаў... прыдумаў так:
Ці пагораю я бяду,
Ці насенне сваё звяду,
Салавей толькі песняй дуж,
Дык і гэту сваю бяду ж
Ці не песняй... І грымнуў, гэй,
Песню звонкую салавей.

Верш мае глыбокі сэнс.

Зварот да асваення новых элементаў паэтыкі, да свабоднага верша супаў (ці, хутчэй за ўсё, быў выкліканы) з узмацненнем аналітызму, філасафічнасці думкі, з павелічэннем маштабаў лірычнага абагульнення.

Значны талент Сяргея Дзяргая ўяўляе ў сучаснай беларускай паэзіі тое яе крыло, якое звязана з развіццём філасофска-аналітычнай, інтэлектуальнай лірыкі. Многія яго вершы — прыклад удалага, арганічнага асваення свабоднага верша. Праўда, інтэлектуалізм і філасафічнасць выступаюць не толькі ў форме верлібра. «Ой, бяда салаўю, бяда!» — пры ўсёй паўнагучнасці яго рыфмы — верш мена-

віта філасофскі. Такім яго робіць ёмістае сацыяльнае абагульненне, якое ў ім заключана. Адмовіцца ў некаторых вершах ад рыфмы і традыцыйнай для беларускай прасодыі рытмікі паэту падказала ўзросшая эмацыянальная напружанасць лірычнага перажывання, якая патрабавала новай інтанацыйнай арганізацыі.

У 60-х гадах у С. Дзяргая з'явіўся цэлы шэраг вершаў — «Крыніца жыцця», «Згубленая мысль», «...Каб соль не страціла...», «...Не плач ніколі...», «Радасць... Смутак...», «Рацыянальнае зерне», «Навыперадкі», «Акупацыя» і інш.— выразна філасафічнага тыпу, моцна звязаных са сваім часам.

Паэта менш за ўсё цікавілі знешнія прыкметы часу. Аб'ектыўны свет раскрываецца ў яго паэзіі ў сваіх унутраных тонкіх і складаных працэсах, прапушчаных праз прызму асобы паэта. Лёсы чалавечых каштоўнасцей — сацыяльных і маральных — нязменна знаходзяцца ў цэнтры ўвагі С. Дзяргач. Глыбокая вера ў камуністычныя ідэалы, у чалавечы розум і справядлівасць, у сацыяльны прагрэс чалавецтва, у гуманізм і чалавечнасць — натуральны і асабісты вывад паэта з перажытага, з назіранняў за гістарычнымі тэндэнцыямі сапраўднасці. Гэта яго светапогляд, творчы прынцып, на якім засноўваецца яго грамадская і эстэтычная актыўнасць.

Прыйдзіце, словы, да мяне:
Трывалыя,
Прачулыя,
Разумныя,
Ласкавыя;
Прыйдзіце, шчырыя,
Як сэрца, трапяткія;
Вы так патрэбны!
Так патрэбны!..

І такія — разумныя і трапяткія — словы прыходзяць да паэта і пасяляюцца ў яго вершах.

Адзін з лепшых вершаў пачатку 60-х гадоў — «Акупацыя». Ён адлюстраваў перажытае самім паэтам у вайну. У час вайны ён прымаў удзел у Гомельскім партыйна-патрыятычным падполлі, супрацоўнічаў у партызанскім друку.

Святло згінула раптам...
Цемра не падпаўзала спакваля,
Не падкрадалася завуголлямі,
Не засылала наперад змрок і цені.
Цемра — паглынула.
Невідушчая, яна ўглядалася:

Што там, яшчэ бліскае надзея ў вачах?..

Фашысцкая акупацыя — «цемра». Яна — «нерухомая і важкая», «нямая і гугнявая» —

...выла сірэнамі,
Глушыла выбухамі,
Высявала мёртвыя словы,
Якім не дадзена было ўзысці.
Белая бяроза стаяла пашчапаная.
Раса ў полі — высахла.
Жытні колас асыпаўся.
Голад звіў гняздо ў нашым чэраве.
Мінулае было так далёка,
Што цяжка было яго ўспомніць.
Будучыня... Замест яе была Вера...

«Акупацыя» С. Дзяргая стылёва — па аналогіі з выяўленчым мастацтвам — нагадала мне некаторыя творы папярэдніка экспрэсіянізму нарвежскага мастака Эдварда Мунка. У прыватнасці, яго палатно «Крык» — чалавечая фігура на першым плане з перакошаным ад жаху тварам, ззаду нехта за ёю ідзе следам ці сочыць... І ў вершы, і ў карціне незвычайная шчыльнасць эмацыянальна-псіхалагічнай атмасферы, адчуванне разарванасці свету.

Да «Акупацыі» прымыкаюць вершы «Трое ўначы», «Хірасіма», «...Дружа мой!..», «...Вецер, вецер!..», «Слухаю твае вочы». Яны таксама прасякнуты напружаным драматызмам. Гаворка ідзе пра адвечныя катэгорыі — Жыццё, Мужнасць, Страх, Смерць...

А побач — на гэту ж тэму — верш іншага плану. Замест верлібра тут традыцыйная напеўнасць. Маю на ўвазе верш «Патруль»:

Восень цёмная...
            Ноч туманная...
Страх жывёліны
            ў хрыплым «хальт!».
Боты сталлю ў іх
            падкаваныя.
Чуеш —
            з ляскатам
                        шкрабуць асфальт...

Верш надзвычай цікавы, змястоўны, але той, характэрнай для «Акупацыі», «Трое ў начы», эмацыянальнай сілы і напружанасці паэт у ім не дасягае.

Талент паэта-філосафа рэдкі. Бо для гэтага мала аднаго эмацыянальнага адчування жыцця, мала ўмення пісаць вершы, думаць

вобразамі... Філасофская лірыка патрабуе вялікага жыццёвага вопыту, яна заснавана на ісцінах, глыбока перажытых, праверaных і сэрцам, і розумам, і гадамі.

Сляза заўсёды горкая,
А пот — салоны,
А кроў — чырвоная,
А гора — чорнае.

Ісціны, да якіх прыходзіць паэт, простыя і значныя. Яны чалавечныя ў самым дакладным сэнсе гэтага слова. За імі — вялікае, поўнае роздумаў чалавечае жыццё, дзе было ўсё — гора і радасці, перамогі і няўдачы, узлёты і падзенні, пад'ёмы і спады: паэт крочыць упоравень з суровым векам.

Не, слова, што ў муках
Народжана мною,
Павінна быць праўдаю,
А не маною.

Гэта — перакананне паэта, яго эстэтычная пазіцыя і маральны вывад з вялікага жыццёвага вопыту. Такім чынам, пра рацыяналізм С. Дзяргая трэба гаварыць у станоўчым сэнсе. Яго ісціны — плён перажытага: «Жыццё ж мы спазнаём праз боль, праз боль душы і цела».

Прыгадваецца ў сувязі з гэтым думка Рамэна Ралана: «Ісціна — гэта не зацвярдзеўшы дагмат, які выдзяляецца і ўтвараецца мозгам, як сталактыты скляпеннямі пячоры. Ісціна — гэта жыццё».

С. Дзяргай дасканала авалодаў жанрам паэтычнай мініяцюры. Кожная з іх — вынік глыбокага роздуму над жыццём, над спрадвечнымі маральнымі каштоўнасцямі.

Праехаць вельмі лёгка
ці прайсці
Шашой асфальтавай
за плынню руху.
Але
як цяжка часам нам брысці
Па вогненнай
сцяжыне
духу.

Сцяжына духу — вернасць высокім ідэалам, вернасць сабе, свайму прызванню, перакананням. Гэта тая сцяжына (калі звярнуцца да паралеляў з суседняга жанру — прозы), па якой прайшоў Сотнікаў — герой аднайменнай аповесці В. Быкава.

Вернасць паэта і вызначае яго творчую актыўнасць, эмацыянальнасць, стылістыку.

Вершы 70-х гадоў, самыя свежыя, здзіўляюць прагай жыцця, вострым адчуваннем яго неадольнасці, кроўнай далучанасцю асобы паэта да свету чалавечых трывог, чалавечых надзей. Паэзія С. Дзяргая на рэдкасць своеасаблівая: фальклорны пачатак паяднаўся ў ёй з філасофскім, ідэалізацыя з псіхалагізмам.

Песня... дзяўчына... А ну, падцягну!
Песня, дзяўчына гукаюць вясну.
Дрэва... І вецер... А ну, страсяну!
Дрэва і вецер гукаюць вясну.
Длубае дзяцел упарта сасну...
Длубае дзяцел — гукае вясну.
Трактар у полі арэ цаліну...
Трактар грукоча... гукае вясну.
Ўсё прачынаецца ўвесну ад сну...
Чуеш, народ мой гукае вясну!

Сувязь з фальклорам, з ладам народнага мыслення па-ранейшаму вельмі моцная. Паэт далёкі ад капіравання ўзораў народнай творчасці. Ён няспынна павышае культуру сувязей з фальклорам. У чым сакрэт плённасці гэтых сувязей? Думаецца, найперш у тым, што, удала выкарыстоўваючы элементы фальклорнай формы, ён не паступаецца псіхалагічнай насычанасцю сваёй лірыкі, яе індывідуальнай непаўторнасцю.

Паэзія С. Дзяргая з усімі яе ідэйна-стылёвымі «стыхіямі» — гэта паэзія надзвычай плённага мастацкага сінтэзу. Няма падстаў гаварыць пра стылёвую неаднароднасць і стракатасць індывідуальнага стылю паэта. Індывідуальны стыль, адзінства якога заключаецца ў ідэйным, маральным змесце асобы паэта, яго мастацкага свету, «здымае» гэтую стракатасць. Грамадзянскае, творчае аблічча яго — цэласнае, адзначанае вернасцю пастаўленай мэце, якую ён накрэсліў у вершы — «эпіграфе», запеўцы да кнігі — «асушыць — дзе яшчэ забалочана...».

1978 г.

## Паэзія інтэлекту

Думаю, не перабольшу і не вельмі памылюся, калі скажу, што творчасць Петруся Макаля, які працуе ў літаратуры ўжо больш дваццаці пяці год, будучы сама па сабе з'явай глыбока індывідуальнай і непаўторнай, у нечым паказальная для развіцця сучаснай нашай паэзіі. Гэта своеасаблівая анталогія яе духоўных і эстэтычных пошукаў і неспакою.

Вакол кнігі «Акно» ў 1968 годзе на старонках «ЛіМа» завязалася адна з вастрэйшых літаратурных дыскусій 60-х гадоў. Паэта і некаторых яго калег абвінавачвалі ў неарганічнасці майстэрства, у раз'яднанасці эстэтычнага і маральнага ў паэзіі, вузкасці тэматыкі і інш. Трэба сказаць, што крытыка ў некаторых закідах мела падставы... Недастаткова ўлічвала яна адно: паэзія 60-х гадоў актыўна, напружана, часам залішне шумліва, экспрэсіўна, шукала — шукала новы змест і новыя формы.

П. Макаль — асаблівa.

Ягоны «Першы след» (так зваўся першы зборнік вершаў — 1955 год) ужо выветрыўся з памяці. І не толькі ў чытачоў. З тае пары ў нядаўнюю кнігу выбранага ўвайшлі толькі лічаныя вершы. Самыя лепшыя. Напрыклад, «Сустрэча з братам» (1952). У Закарпацце на магілу да помніка загінуўшаму ў вайну брату прыехаў разам з сябрамі паэт — з паклонам «ад далёкіх гродзенскіх прысад».

А ён рукой нас прывітаць не можа:
Трымае зброю воіна рука,
Бо чуе ён
За морам брэх варожы
І палец не адводзіць ад курка.

Логіка думкі — сапраўды паэтычная. Ужо ў гэты час П. Макаль выявіў густ да мастацкага пошуку, да ідэйнага ўзбагачэння сваёй паэзіі. За фактам стаяла абагульненне.

Добры верш «Гамоняць калоссі», прасторны свет адкрываецца ў ім:

Гамоняць калоссі,
Шугаючы хвалямі,
З блакітнымі высямі,
З сінімі далямі...

Гэта ўбачана паэтам, сялянскім сынам...

Найбольшая ўдача чакала П. Макаля там, дзе ён не адступаў ад праўды, грунтаваўся на ўласным асабістым вопыце, як, скажам, у вершах «Маё маленства», «Святло», ён успамінае сваю Радзіму —

давераснёўскую Беласточчыну, плач пастуховага ражка, дарогу, «якая вяла з бацькаўскай хаты ў батракі...».

Следам за першай кнігай выходзяць другая («Вятрам насустрач» — 1958) і трэцяя («Вечны агонь» — 1960). Аўтар пісаў пра тое, што і ўсе. Ён імкнуўся расказаць аб велічным поступе нашай дзяржавы, славіў творчую працу савецкіх людзей, барацьбу за мір, апяваў каханне. Але значнага якаснага росту яны не паказалі. Бракавала сваёй унутранай тэмы, асабістага падыходу. Хоць асобныя вершы былі вельмі ўдалыя.

Напрыклад, «У паход», у якім па-сапраўднаму паэтычна перададзена пачуццё адказнасці, глыбока ўсвядомленае савецкім салдатам: «Не, не ад ранца прыліпае кашуля да плячэй маіх. Сягоння цэлы свет, я знаю, абапіраецца на іх». Які ёмісты, насычаны і эстэтычна перспектыўны вобраз!

У пазнавальным і эстэтычным сэнсе творчыя абсягі паэта былі досыць сціплыя. Яму шкодзіла інфармацыйнасць, статычнасць. Новыя якасці мастацкай думкі накопліваліся спакваля. Існавала памылковае перакананне (тады, а часткова нават і цяпер), што ў лірыцы, у адрозненне ад эпасу і драматургіі, не можа быць канфліктнасці. Аказалася, што гэта не так. Жыццё прымушала задумвацца, ставіць, хай сабе пакуль што ў агульнай форме, пытанні: «Гранітныя камення кропля дробіць — чаму ж глядзець на кроплю як на дробязь?» Не цяжка зразумець: гаворка ідзе пра чалавечую асобу.

Грамадзянскасць і бесканфліктнасць у лірыцы — рэчы несумяшчальныя. Ісціна гэта ўсё глыбей адкрывалася ў неабвержнасці свайго значэння.

Служба ў арміі (1954-1956) — у сэнсе набліжэння да жыцця, пашырэння грамадскіх далягладаў — дала вельмі шмат. Пра гэта сведчаць вершы, што перадаюць «адчуванне локця», ідэйную і маральную вышыню абавязку, калектывізм, пяшчоту салдацкай суровасці, пачуццё чалавечай годнасці. Паступова фармавалася свая, унутраная тэма, звязаная з большай адказнасцю героя, узбуйненнем яго асобы. Выспяванне паэтычнага майстэрства ішло адначасова з тымі вялікімі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі зрухамі, якія адбываліся ў нашай краіне і якія выклікалі хвалю незвычайнай творчай актыўнасці народных мас. Людзі імкнуцца пранікнуць у самую сутнасць жыццёвых з'яў.

Паэт праз сваё асабістае перажыванне хацеў перадаць сацыяльна-грамадзянскі рост асобы савецкага чалавека на глебе пашырэння сацыялістычнай дэмакратыі, узмацнення сувязей з грамадствам і яго велічнымі справамі — апалітычнымі, вытворчымі, навукова-тэхнічны-

мі поспехамі і дасягненнямі. «Сёння нас да нябёс усё вышэй зямля ўзнімае. Неба — мошчаны зорамі брук,— хутка ляжаш пад ногі прахожым». Гэта — з кнігі «Вечны агонь» (1960). Там былі і такія радкі: А я...

Я на зямлі стаю,
Зусім маленькі ростам,
Ды галавою дастаю
Да яснай зоркі проста!

Гэта былі першыя гады асваення космасу, пачатак «касмічнай эры», актывізацыя навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. У святле гэтых маштабных з'яў па-іншаму сталі бачыцца праблемы чалавека. Яны запатрабавалі ўнутранай перабудовы, новай паэтыкі, больш таго — новай пазіцыі.

П. Макаль, дарэчы, валодае пахвальным уменнем маўчаць, не друкавацца, калі бачыць, што напісанае яго не задавальняе, што па-ранейшаму працаваць нельга, ці, правільней, не трэба. Ён, відаць, адчуў вычарпанасць ранейшай сваёй манеры.

Новае ў паэзіі П. Макаля не адразу было зразумета. «Стаў паэт на хадулі,— пісаў адзін з яго калег,— і абвяшчае ўрачыста: «Глядзіце, вось які я волат! Галавою дастаю да яснай зоркі проста!» Наіўна і смешна. Гэта літаратуршчына. Мноства паэтаў яшчэ да П. Макаля галовамі зоры даставалі». Крытыку турбавала, што пазіцыю Макаля пакідала прастата і душэўнасць. А сам ён думаў пра іншае, пра новыя дарогі... Адносіны да свету станавіліся ўсё больш зацікаўленымі, радок рабіцца больш энергічным.

Поспехі маладых паэтаў канца 50-х — пачатку 60-х гадоў залежалі не толькі ад вывучэння самога жыцця, але і ад інтэнсіўнасці мастацкіх пошукаў, арганічнага засваення і ўдалага выкарыстання разнастайных форм і прыёмаў раскрыцця ўнутранага свету чалавека. Паэзія асвойвае асацыятыўную вобразнасць, сімволіку, умоўнасць. Перажыванне робіцца інтэнсіўным, нават з пэўнымі перахлёстамі: «я — дажджавая кропля...», «я — нафта...», «я — акіян...»

Пасля выхаду чацвёртай кнігі «Круглы стол» (1964) крытыка ў адзін голас сказала: «Макаль стаў пісаць інакш». Яна мела рацыю. Шмат у чым змяніўся характар вобразнасці, узрасла яе канкрэтнасць, пластычнасць, эмацыянальнасць. Узбуйняецца метафара.

Адзін з цікавых вершаў кнігі — «Футбол», верш-прытча, узор шматпланавай лірыкі, з пэўным асацыятыўным напаўненнем. Перапоўнены стадыён паэт параўноўвае з раскроеным кавуном («і вось-вось, здаецца, як зярняткі, выпырснуць балельшчыкі з трыбун»), футбольны мяч нагадвае зямны шар. Ідзе гульня. І паэт выступае

супраць бяздумнасці, безадказнасці, калектыўных псіхозаў, калі знікае чалавечая пільнасць.

Паэт высокай думкі аб чалавеку і яго прызначэнні. «Адбіткі пальцаў» чалавека на ўсіх выніках стваральнай працы. Па чалавечай далоні ён прарочыць наступны лёс зямлі. Падобныя матывы хораша чыталіся ў кантэксце кніг Э. Межэлайціса, А. Куляшова, М. Танка, А. Вазнясенскага і іншых паэтаў.

Узмацненне «я» вяло за сабой паскораны працэс станаўлення яго творчай індывідуальнасці. Паэзія Макаля набывала сучаснае гучанне. З сённяшняга ён рабіўся сучасным, бо выходзіў на важныя, сацыяльна важкія праблемы народнага жыцця, грамадскай свядомасці, на тое, што найбольш хвалявала чалавека.

Хацелася б выказаць адно назіранне: нягледзячы на характэрную некаторым вершам маналагічную форму, лірычнае «я», лірычны герой з уласцівымі для яго біяграфічнымі рысамі (пададзенымі хаця б сумарна) у паэзіі Макаля амаль не відзён. Яго «я» вельмі абагульненае, яно імкнецца змясціць турботы ўсёй планеты.

П. Макаль у адным з артыкулаў пачатку 60-х гадоў назваў наш век векам думкі. Такі вывад вынікаў з сацыяльнага аблічча часу: «рэактыўныя хуткасці скарацілі адлегласці паміж кантынентамі і народамі. Аднак яшчэ больш акрэсліваўся водападзел паміж двума сусветнымі лагерамі, паміж: двума светамі. З аднаго боку — праграма небывалага росквіту грамадства. З другога — пагроза ядзернай катастрофы. У гэтым адна з галоўнейшых супярэчнасцей эпохі. У гэтым крык часу. Быць ці не быць?..»

Праз своеасаблівасць часу паэт хоча зразумець яго веліч, поступ наперад, выявіць яго ўнутраныя працэсы, зрабіць іх сваім асабістым адчуваннем. Так ён асэнсоўвае тэму Кубінскай рэвалюцыі — свабоды, свята «З кабурой на пояску» («Кубінскі танец»).

Гаворачы ў адным са сваіх артыкулаў пра А. Пысіна, П. Макаль перш за ўсё адзначыў маштабнасць яго паэтычнага мыслення, якая вынікае не з моды, а грунтуецца на імкненні асэнсаваць складанасць часу, памагчы свайму сучасніку «адказаць на пытанне, як жыць, каб быць вартым прызначэння». І ў самога Макаля ўсё галасней гучыць тэма чалавечага сумлення, тэма праўды («Сікейрас»), рэзка павышаецца каэфіцыент мастацкага абагульнення. У свеце знікаюць сцены і схованкі, чалавек аказваецца навідавоку ўсіх. Паэзія А. Куляшова працягвае руку «з дваццатага ў трыццатае стагоддзе». Падобны душэўны рух выказвае герой П. Макаля: «Мае радкі — працяг маёй рукі, якой мне столькі рук паціснуць трэба».

Своеасаблівасць «Круглага стала» вельмі дакладна адчуў Г. Бураўкін, які перш за ўсё адзначыў інтэлектуальнасць паэта. «Яна, безумоўна, не ў тым,— пісаў ён,— што П. Макаль даволі часта і свабодна аперыруе імёнамі Бетховена, Баха, Шэкспіра, Гамера, Галілея. Яна ў тым, што паэт стараецца ў кожным вершы думаць, аналізаваць, стараецца асэнсоўваць кожную драбніцу жыцця. Імкненне да роздуму заўсёды прываблівае, а калі яшчэ бачыш і ўменне мысліць шырока і паэтычна, дык, я думаю, ёсць падстава радавацца».

У гэты час (1962) быў напісаны цікавы верш «Мера», у якім аўтар беглым штрыхом робіць накід сучаснай панарамы свету, «безразмернага» веку, як ён яго называе (хоць, відаць, не зусім удала).

Дні, як белыя ватманы,
Перачэрчвае быт.
Прагнуць людзі і атамы
Непамерных арбіт.

У зборніку «Круглы стол» паэт узнімае голас супраць мяшчанскага быту, які абмяжоўвае чалавечыя магчымасці. Гэта тэма будзе замацоўвацца ў наступных кнігах і ў першую чаргу — у «Акне» (1976).

Кніга «Акно» (менавіта кніга!) — рэч надзвычай цэласная, праблемная, падкрэслена антрапалагічная. Яе эпіцэнтр — чалавек, яго зямное існаванне, яго сучаснасць і будучыня.

Вышыня крытэрыяў, ідэйны маштаб, значнасць і маральная насычанасць абагульненняў — усё гэта было ў кнізе. Яна гаварыла пра інтэнсіўнасць інтэлекту паэта.

Няўжо мы толькі камяні ў фундамент,
Каб іншыя дабудавалі гмах,
Каб здолелі вышынны дах пакласці?..
Але ж і мне
               не потым, а цяпер,
Таварыш бог,
                              адрэж акраец шчасця
І долю чалавечую адмёр!

Міжвольна спыняешся на радках, якія, здаецца, выдыхнуты паэтамі адразу, за адзін раз: «Яснасці, яснасці, яснасці! — хочацца пацвярозаму яснасці — чэснай уласнасці, незакілзанага розуму».

Мне думаецца, што ў індывідуальным вопыце П. Макаля адлюстравалася душэўная прага яго сучаснікаў, «грамадзян XX стагоддзя».

У новай кнізе паэт вядзе страсную спрэчку з сабой учарашнім. І выйграе спрэчку паэт сённяшні! Свет наш не настолькі ўладкаваны, хоча сказаць паэт, каб сядзець склаўшы рукі. Паэт адчувае адказнасць за яго ўдасканаленне. На гэтым грунтуецца яго душэўная

актыўнасць. «Я, сапёр, спяшаю, каб у час абясшкодзіць беды, як тарпеды, што здаля нацэлены на нас». Інтымнае і грамадскае ў кнізе нельга размежаваць, пастолькі яны сплаўлены.

Што П. Макаль выдатны майстар верша — несумненна. Паэт, скажам, бездакорна валодае самай разнастайнай і багатай рыфмай:

Хвала напятай хвалі, што пяе!
Хвала ўзбярэжным дзюнам,
што як горы!
На пляжы спляжу немачы свае
І змору патаплю
ў бяздонным моры.

Рыфмуюцца не толькі паралельныя радкі, але і словы ўнутры радка, верш набывае выключную гнуткасць і музычнасць. Прадметы паўстаюць з верша Макаля пластычна, аб'ёмна. Паэт амаль не адмаўляецца ад строгіх класічных рытмаў, аднак верш яго не мае старамоднага выгляду, бо само багацце мастака, яго паэтычнае мысленне ў аснове сваёй вельмі сучаснае.

Здараецца, аднак, што ў асобных вершах майстэрства існуе само па сабе, не падпарадкоўваючыся задачам ідэйнай задумы, праблематыкі. Так здарылася, скажам, з вершам «...Хоць клалі сосны ў зруб...». Прыкладна ж такія заганы ўласцівы вершу «Балгарскія памідоры» і некаторым іншым, дзе адчуваецца, што вершу папярэднічала не пэўная задума, а выпадкова знойдзены цікавы радок. «Мы — ноты, мы — ноты, мы — ноты» — сказ сам па сабе выразны, пацягнуў за сабой наступны радок, страфу і цэлы верш.

«Акно» — сучасны этап работы паэта. Таму важна падрабязней сказаць пра недахопы.

Пачуццё, на жаль, не заўсёды ўвасабляецца ў жывым, дакладным слове і яркім вобразе. Адкуль у яго верш трапіла «карона збожжа, што на стале ўвянчае мазалі» — прыгожы газетны штамп? А ў другім выпадку паэт піша пра каханую так: «Я чытаю цябе запоем, усю — ад загалоўка валасоў і да шматкроп'я пацалункаў...» Небяспечная блізкасць з радкамі Б. Пастэрнака.

У кнізе «Акно» адчуваецца, што аўтар быў уважлівым чытачом паэзіі Марыны Цвятаевай, Максіма Танка... І гэта добра, настаўнікі аўтарытэтныя.

Майстэрства, тэхніка надта спатрэбіліся Макалю ў перакладчыцкай працы. Буйнейшая яго работа — кніга вершаў сучасных славацкіх паэтаў «Татры пяюць» (1976), якая ўжо атрымала станоўчую ацэнку.

З кожным годам паэт працуе асабліва інтэнсіўна. Вельмі сучаснай і сур'ёзнай кнігай уяўляецца мне зборнік «Дотык да зямлі» (1975), якая сведчыць, што паэт трымае руку на пульсе жыцця. Яна нагадала мне адно са шматлікіх метафарычных вызначэнняў паэзіі, якое сцвярджае, што паэзія — гэта «адчуванне зямлі босай нагой».

«Дотык да зямлі» — выраз гэты ўзяты паэтам у яго вобразным значэнні, але абапіраецца ён на свой пачатковы, самы непасрэдны сэнс, укладзены ў звычайныя словы:

Ёсць словы, што прасцей, чым двойчы два:
Зямля,
Вада,
Паветра
І трава...

Што ж гэта — паэзія простых слоў, простых рэчаў?

Так. Але паэт — як і яго сучаснікі — па-новаму адчуў гэтыя «рэчы», іх каштоўнасць і значнасць у святле вядомай супярэчнасці нашых дзён:

Ракеты і аўтамабілі
У нас адлегласць узялі,
А мы, здаецца, разлюбілі
Хадзіць нагамі па зямлі.
А мы забылі, як у полі,
Калі ступаеш басанож,
Ласкава дражніцца і коле
Травінка вострая, як нож.

Паэзія гэтых радкоў падказана і нашым днём і памяццю. Нельга не заўважыць, што найбольш удалыя вершы Макаля будуюцца на арганічным сінтэзе асабістага і грамадскага, калі час прадстае як частка яго жыццёвай і духоўнай біяграфіі.

«Я з вёскі» — прызнаецца ён у адным з вершаў: «Я выйшаў з вёскі, выйшаў з баразны,— і ворывам мае далоні пахнуць».

Паэт на новым этапе вяртаецца да зямных вытокаў свайго лёсу. Памяць праз гады захавала тонкі пах сырадою, што быў хлебам дзіцячых год. Але разважанні паэта не абмяжоўваюцца аднымі ўспамінамі. Сёння, калі трава «жылплошчу аддае бетону» і гудок глушыць галасы птушак, калі штучна сінтэзавана нават малако, ён сцвярджае першапачатковую натуральнасць і свежасць быцця, яго неабходнасць у светаадчуванні сучасніка. У яго паэзію прыходзяць вобразы нівы, баразны, плуга, хлеба, нават вобраз каровы, з якой ён звязвае «млечны шлях» свайго лёсу.

Але гэта толькі адна з граняў вялікай тэмы «дотыку да зямлі». Грань вясковая, звязаная з яго духоўна «экалагічным» роздумам над «фатальнай» цвёрдасцю бетону, які бярэ ў свой шэры палон планету. Гэта думка мае шмат адценняў, матываў, якія гучаць па-грамадзянску пераканаўча і наступальна.

Матыў, так характэрны сучаснай паэзіі: «У травы забіраюць правы — хіба гэта не бачыце вы?»

Гаворачы пра першапачатковыя, так сказаць, каштоўнасці, бласлаўляючы «зялёны бунт, зялёны ўзлёт травы», паэт далучае нас да духоўных крыніц эпохі. «Стаім у чарзе за небам, як у вайну за хлебам».

Свет «простых слоў» разглядаецца аўтарам у самых разнастайных планах, у спалучэнні, так сказаць, матэрыяльнага і духоўнага. Ён адкрывае складанасць свету і сцвярджае яго гарманічнасць: «Калі б, зямля, ты не дала мне хлеба, ці змог бы дацягнуцца я да неба, аб зорны келіх губы апячы?»

«Дотык да зямлі» — формула грамадзянскага мыслення паэта, формула яго рэалізму, скіраванага супраць «паветраных замкаў», супраць тых, хто «ману з туману лепіць». «Страцім сілу мы, адарваўшыся ад зямлі»,— непакоіцца ён.

Думка аб несумяшчальнасці грамадзянскасці і бесканфліктнасці вельмі характэрна для сённяшняга Макаля. Ён — майстар канцэптуальнага, так сказаць, верша, дзе выяўляецца не проста душэўны жэст паэта, а разуменне жыцця.

Сацыяльна-філасофская аснова яго паэзіі — шырокая. Ён — вострасучасны, праблемны. Дэталі і падрабязнасці вясковага побыту часцей за ўсё патрэбны яму для асэнсавання больш агульназначных пытанняў. Паэта хвалюе чалавек, яго быццё і ўзаемаадносіны са светам, накіраванасць яго актыўнасці, будучыня. Якраз менавіта гэтыя матывы складаюць змест напружанага роздуму.

Своеасаблівасць яго вершаў у тым, што яны спалучаюць публіцыстыку з філасафічнасцю. Гэта надае ім эстэтычную аб'ёмнасць, глыбіню. Часта звяртаецца ён да духоўнага вопыту народа.

«Шчаслівейшы не той, хто жне, а той, хто сее»,— нагадвае ён даўнюю сялянскую мудрасць, хаця і ведае, што адлегласць да жніва іншы раз бывае даўжэй за чалавечы век. Але сеяць трэба. Паэт славіць урадлівасць зямлі, ніву, поле, якія насычаны для яго вялікім духоўным сэнсам.

Сплю ў каменным сховішчы кватэры.
Але што там бухае,
як цэп?
Хто так гулка стукаецца ў дзверы?

Гэта ты,
пасланнік поля —
Хлеб.

Як бачым, пластыка яму таксама не чужая. Але не ў ёй справа. Яна падпарадкавана больш агульным паэтычным ідэям. Макаль здольны ўзбуйняць рэчаіснасць, бачыць касмічныя рысы ў фарбах асенняга саду: «Адсвечвае галактыкаю сад, у барвы шчодрай спеласці адзеты». Ён — майстар ёмістай, маштабнай метафары. Славячы важкасць «пладоў, зярнят і дум, цяжкіх ад сонца», паэт бачыць, як

Сам космас,
быццам просьбіт, басанож
Сыходзіць ноччу да
Зямлі з паклонам,
Дрыготка падстаўляе зорны кош
Пад яблыкі, што падаюць са звонам.

Садовая груша — звычайная слуцкая «бэра» — уяўляецца яму малой планетай. Паэт настойліва імкнецца да маштабных вобразаў, смелых абагульненняў, у якіх сінтэзуецца дзень сённяшні з глыбокімі пластамі народнага вопыту.

У яго светаадчуванні спалучаны сацыяльнае і асабістае, зямное і «нябеснае», «дзелавое» і духоўнае, бытавое і інтэлектуальнае. Свет яго ідэй стаў значна шырэйшы. Паэт сцвярджае сувязь галін і каранёў, што так глыбока пранікаюць у родную зямлю, сувязь часоў і пакаленняў. Сённяшняе ён хоча зразумець у аспекце гісторыі. Такія катэгорыі, як гісторыя, народ, нацыянальны характар, пастаянна прысутнічаюць у яго паэзіі. Адсюль — змястоўнасць і шырыня паэтычных абагульненняў.

Высокую паэзію адкрывае ён у вобразе свайго зялёнага друга — лесу. Наш лес — наша гісторыя. У ім адлюстраваўся характар народа, яго мужнасць, высакародства. У вайну пад шматпавярховыя лясныя шаты лезлі з факеламі чорныя карнікі. Але лес выстаяў. У ягонай жывіцы і дасюль стынуць кулі.

Я дрэвам самую бездакорную
Характарыстыку выдаць гатоў.
Выстаялі.
Не адступілі.
У акупацыі
Не былі.
Вось што значыць як след акапацца,
Укараніцца на роднай зямлі!

«Мой лес — мой лёс»,— кажа паэт. У такой вось маштабнасці вобразу, метафары — аснова паэтыкі Макаля. Такія паняцці, як поле, лес, хлеб, бетон, трава і г. д., ён разглядае буйным планам, у багацці іх сацыяльных сувязей і жыццёвага зместу. Не рэдкія ў яго выразы тыпу «я — кола», «я — выйшаў з баразны».

Бачна велізарная цяга да падкрэсленай метафарычнасці, прытчавасці, мастацкай умоўнасці. Гэта вельмі відаць у вершах «Прас», «Маналог сабакі», «Песня заваднога салдаціка», «Пласцінка», «Кумір» і інш. Яны працягваюць лінію «Скаргі цвіка» з папярэдняй кніжкі.

Умоўнасць Макаля — пры ўсёй нечаканасці формы — не супярэчыць зместу, бо накіравана на асэнсаванне пэўных рэальных з'яў. Агульны напрамак яго пошукаў у галіне маштабнага мыслення правільны. Сумяшчаючы малое з вялікім, звычайнае з незвычайным, ён па-свойму абжывае свет, у многім дабіваецца жаданага выніку.

Хацелася б засцерагчы ад аднаго.

Эстэтычная, грамадская актыўнасць паэта адзначана ў лепшых яго дасягненнях пячаццю непаўторна асабістага ўспрыняцця рэчаіснасці, адносін да яе з'яў. Гэтым талентам варта даражыць і не аддаваць яго ў ахвяру паэтычнаму прыёму, хай нават самаму сучаснаму. Інакш цяжка будзе дасягнуць маральнай і эмацыянальнай цэласнасці і адзінства, так неабходных у паэзіі. Тым больш што ягонае лірычнае «я» надта абагульненае, часам пазбаўлена сваіх біяграфічных рысаў. Што ж, такая асаблівасць Макаля, які імкнецца больш расказаць пра час (прапусціўшы яго праз сваё мастакоўскае ўспрыняцце), чым пра сябе. Яго паэзія — паэзія інтэлекту, не пазбаўленага рацыяналістычнасці. У гэтым няма нічога благога, але яму трэба быць пільным, каб інтэлектуальнасць не ператварылася ў сухасць, знарокавасць, каб паэзія не аддалялася ад чалавека.

Людзьмі, што «адзінока ідуць у пустыні», называюць некаторых сучасных паэтаў на Захадзе. Нашы ўяўленні пра паэта і яго місію — супрацьлеглыя: быць з чалавекам, наталяць яго духоўную прагу. І да гэтага імкнецца П. Макаль.

## След пракладае першы

У кніг свой, неаднолькавы лёс...

Адны адразу займаюць паважнае месца ў літаратуры, набываюць аўтарытэт сярод чытачоў і надоўга, а то і назаўсёды захоўваюць яго.

З'яўленне другіх спачатку выклікае шумны поспех, ажыятаж у крытыцы, а з цягам часу становіцца відавочна, што іх ацэнка нашмат завышана.

Трэція так і застаюцца незаўважаныя.

Ёсць, аднак, кнігі, вартасць і значэнне якіх, не адразу зразуметыя ў поўным аб'ёме, праясняе і ўзбуйняе сам час. Гэта — кнігі-ўчынкі, у якіх заключаны каштоўны ўрок грамадзянскасці...

Да ліку апошніх належаць дакументальныя рэчы Івана Новікава, у першую чаргу яго трылогія «Мінскі фронт».

Дакументальная проза ўзнікла ў беларускай літаратуры даўно. «На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага (напісана ў снежні 1915 года) — яе класічны ўзор. Аднак тым не менш канец 50-х і асабліва пачатак 60-х гадоў з поўнай падставай можна лічыць перыядам яе інтэнсіўнага адраджэння, якое звязана з плённай працай цэлага шэрага беларускіх празаікаў — прадстаўнікоў гэтага надзвычай патрэбнага і папулярнага жанру.

Буйнейшы з сучасных беларускіх пісьменнікаў-дакументалістаў — Іван Новікаў.

«Гавораць, што камені мёртвыя.

Не, гэта не так, зусім не так!

Камені, палітыя чалавечай крывёю на месцах баёў за вялікую ўсенародную справу, ажываюць. Яны вечна напамінаюць жывым пра мёртвых герояў, пра тых, чыё імя стала неўміручым.

Такія камені майго Мінска» — так пачынае І. Новікаў сваю галоўную кнігу, трылогію «Мінскі фронт». Веру, што і наперадзе ў яго — значныя творчыя здзяйсненні, але «Мінскі фронт» застанецца кнігай асобай, да якой ён доўга ішоў і якая мае прынцыповы характар для беларускай мастацка-дакументальнай літаратуры, закліканай не адступаць ад жыццёвай праўды, павялічваць свой маральны патэнцыял.

Біяграфія Івана Рыгоравіча Новікава — гэта біяграфія журналіста з даваенным стажам, салдата Вялікай Айчыннай, што прайшоў баявы шлях ад Сталінграда да венгерскага горада Секешфехервара, дзе быў паранены (перамогу сустрэў у Аўстрыі), і, нарэшце, пісьменніка, мастака з салідным жыццёвым вопытам.

Балгарыя, Югаславія, Венгрыя, Аўстрыя — шмат якія краіны і гарады давялося ўбачыць за вайну, многае прайшло перад вачыма...

Багатая, змястоўная біяграфія — незаменная ў літаратуры. Пра свой лёс І. Р. Новікаў піша: «Ён даў мне паспытаць усяго: і радасці, і смутку, і цяжкасцей, і асалоды, якую прыносіць дасягнутая мэта. Ён кідаў мяне па свеце, часам не клапоцячыся аб тым, выплыву я ці не з бурнага мора жыцця». Але свой жыццёпіс (у кнізе «Пра час і пра сябе») пісьменнік назваў — «Сярод добрых людзей». Гэта гучала зусім не дэкларатыўна: шмат іх было — добрых людзей — на яго жыццёвым шляху. Некаторых з іх ён успамінае ў сваёй біяграфіі. Супрацоўнікі клімавіцкай раённай газеты «Камуна» Аляксей Кулакоўскі (цяпер — вядомы пісьменнік), журналісты Васіль Мінаў, Артур Гардзіевіч, сябар па Ленінградскім КІЖы Мікалай Емяльяненка, з якім разам пайшлі на фронт, дзяліліся і думкамі, і апошнім кавалкам хлеба, такія вядомыя людзі, як К. В. Кісялёў (былы кіраўнік беларускай дэлегацыі на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН) — гэта пра іх пісьменнік гаворыць: «Я меў справу з такім мноствам цудоўных людзей, што нават пералічыць усіх немагчыма».

Потым, у час працы над кнігамі пра Мінскае падполле, іх нашмат пабольшала.

Вучобу спыніла вайна.

Не пашкадавала яна маладосці, перакрэсліла ўсе планы. Яго пакаленне, сярод якога былі і будучыя героі пісьменніка, людзі адной з ім маральнай загартоўкі, стала ў строй абаронцаў Радзімы.

У 1955 годзе прыйшлося ўжо завочна канчаць аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Праца і вучоба... Івану Новікаву ўсё жыццё даводзіцца іх спалучаць. Зрэшты, як і кожнаму мастаку, для якога жыццё — гэта і ёсць вучоба, пошукі, праца, творчасць...

Першая кніга Івана Новікава — «Дзесяць тыдняў у Злучаных Штатах Амерыкі» — з'явілася вынікам яго паездкі ў якасці карэспандэнта «Советской Белоруссии» на XI сесію Генеральнай Асамблеі ААН. Здаецца, ён трапіў туды першым з беларускіх журналістаў. Кніга была выдадзена ў 1958 годзе і мела поспех як праўдзівае сведчанне пра амерыканскую рэчаіснасць, буржуазны спосаб жыцця. Літаратуры пра ЗША, жыццё і побыт амерыканцаў у той час, пасля нядаўняй «халоднай вайны», востра не хапала, і гэтая журналісцкая работа аказалася вельмі дарэчы.

Вярнуўшыся дадому, журналіст Іван Новікаў атрымаў новае прызначэнне — пасаду карэспандэнта газеты «Правда» па Беларускай

ССР. На гэтай пасадзе — загадчыка карэспандэнцкага пункта «Праўды» па рэспубліцы — ён знаходзіцца і сёння.

Журналісцкая школа ў біяграфіі сучаснага пісьменніка — надзвычай важная і сур'ёзная. Значэнне яе проста нельга перабольшыць. Праца ў газеце, гаворыць ён пра аднаго са сваіх герояў Валодзю Амельянюк, навучыла яго «любіць людзей, распазнаваць шчырых і няшчырых, чэсных і подлых, навучыла беспамылкова разбірацца ў мностве падзей і знаходзіць у маленькіх фактах вялікі сэнс». Нешта падобнае можна сказаць і пра самога аўтара гэтых слоў, для якога работа журналіста дала не адзін урок чалавеказнаўства.

Лёс І. Новікава складваўся сапраўды па-пісьменніцку: ставіў яго тварам да жыцця, кідаў у самую яго гушчыню. Пачатак 50-х гадоў быў для савецкай літаратуры перыядам асаблівага ўздыму нарыса ва ўсіх яго разнавіднасцях, ён паказаў сябе актыўным і аператыўным сродкам пазнання і адлюстравання рэчаіснасці, даследавання яе востра-надзённых праблем. В. Авечкін, Г. Траяпольскі, Я. Дораш, І. Звераў, з нашых — І. Дуброўскі, В. Палтаран, Я. Сіпакоў, некаторыя іншыя — гэтыя імёны многае гавораць кожнаму, хто чытаў іх праўдзівыя кнігі. Пэўная сацыяльная тэма лягла пісьменніку на сэрца як яго асабістая праблема, якую трэба што б ні стала рашыць, дакапацца да каранёў, зразумець. Гэта асаблівасць творчай пазіцыі вызначыла пісьменніцкі поспех, абумовіла жанрава-эстэтычную спецыфіку новай прозы, якая імкнулася даследаваць глыбінныя сацыяльна-эканамічныя заканамернасці жыцця, паказвала яго ў руху, у сувязі гістарычнага і чалавечага.

І. Новікаў зацікавіўся вядомым у рэспубліцы калгасам імя Беларускай ваеннай акругі Любанскага раёна (пра які Янка Купала напісаў сваю вядомую паэму «Над ракою Арэсай»), часта наведваў яго. Давялося блізка пазнаёміцца са старшынёй, Героем Сацыялістычнай Працы Цімохам Смірновым. Чытачы атрымалі цікавы нарыс (ён выйшаў асобнай кніжкай) — «Палескае золата» (1959).

Вабіў і завод. Пісьменніка можна было часта бачыць у маладым тады (50-я гады) калектыве Мінскага завода аўтаматычных ліній, дзе ў яго з'явілася шмат сяброў (работа з людзьмі заўсёды вабіла яго, перакананага, што нецікавых людзей на свеце няма).

«Побач сябры» (1960), як і папярэдняя — «Палескае золата»,— кнігі нарысавага характару, напісаныя свежа, нетрадыцыйна. Яны перадаюць дух часу, яго каларыт, і гісторыкі несумненна будуць да іх звяртацца, бо нарысы гэтыя яскрава сведчаць пра свой час. Нас цікавіць іншае: у чым быў іх асноўны недахоп, які перашкодзіў ім стаць высакаякаснымі мастацкімі творамі? Не толькі і не столькі,

думаецца, у нястачы майстэрства. Галоўнае ў тым, што тэма гэтых кніг не стала да канца ўнутранай тэмай пісьменніка, набыткам яго мастацкай свядомасці, асобы. Цень ілюстрацыйнасці, які ляжаў на іх, зацямняў і асобу аўтара, мастака.

«Усё гэта былі толькі подступы да літаратуры»,— так надзвычай строга і самакрытычна ён ацэніць потым свае першыя кнігі.

«Свая» тэма — цяпер гэта добра відаць — была наперадзе.

Якасны паварот у творчай біяграфіі Івана Новікава звязаны з тэмай гераічнага подзвігу савецкага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны. Чым далей у глыбіню гісторыі аддаляецца гэты час, тым ярчэй і выразней прадстаюць перад усім чалавецтвам веліч і маштабы нашай сусветна-гістарычнай перамогі над фашызмам. Пісьменнік адчуў прагу сучасніка сэрцам дакрануцца да народнага подзвігу, спазнаць аб ім усю праўду.

Як часта здараецца, усё пачалося нечакана.

Яму выпадкова трапілі запісы слаўнай герaіні нашага народа Веры Харужай. Матэрыял быў вельмі цікавы. Ён усхваляваў чытачоў, калі быў падрыхтаваны да друку і з'явіўся ў 1959 годзе ў «Правде». «Запіскі Веры Харужай» выклікалі шырокі паток пісьмаў з усіх куткоў краіны — з роздумам, просьбамі, прапановамі, са словамі ўдзячнасці. З «Запісак» нарадзілася цікавая аповесць пра Веру Харужую «Сэрца інакш не можа», надрукаваная ў «Маладосці» і прыхільна сустрэтая і ўхваленая грамадскасцю і крытыкай. Потым яна выходзіла асобнай кнігай на рускай мове — у Маскве.

На мой погляд, гэта, відаць, і быў той момант, калі пісьменнік адчуў, што яго творчае поле — дакументалістыка, а прызванне — тэма гераізму. У яго творчасці з'явіліся сур'ёзныя прыкметы сваёй, унутранай тэмы, працу над якой, дарэчы, стымулявала «Правда». Яна арыентавала свайго сабкора на працяг работы ў дакументальным жанры.

Якраз у гэты час ён у складзе спецыяльна створанай ЦК КП Беларусі камісіі пачаў работу над матэрыяламі аб Мінскім падполлі. Яго, былога франтавіка, глыбока ўсхвалявалі і зацікавілі гераічная барацьба, здзіўляючыя подзвігі і розныя лёсы ўдзельнікаў Мінскага і Віцебскага падполляў, усіх тых, хто меў да яго адносіны — беларускіх партызан, разведчыкаў, вайскоўцаў.

Сёння мы ведаем іх імёны.

Іван Кабушкін, Уладзімір Амельянюк, Захар Гала, Вікторыя Рубец, Фёдар Жывалёў, Саша Макаранка, Барыс Бывалы, Дзмітрый Караткевіч, Георгій Фалевіч, Сцяпан Заяц, Сяргей Благаразумаў, Ядзя

Дубіцкая, Валодзя Шчарбацэвіч, Іван Казлоў, Анатоль Ляўкоў, Варвара Мацюшка, Аляксандр Камінскі...

Вуліцы Ісая Казінца, Васіля Жудро, Яўгена Клумава, Івана Матусевіча, Георгія Сямёнава, Міколы Кедышкі...

Іх шмат. Усіх пералічыць немагчыма.

Сягоння гэтыя імёны знаёмыя і дарагія кожнаму мінчаніну, кожнаму беларусу, усім савецкім людзям. Размова ідзе пра герояў Мінскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра герояў буйнога дакументальнага твора — трылогіі Івана Новікава, якая цяпер атрымала агульную назву «Мінскі фронт».

Гэтая вялікая даследчая, а па сутнасці падзвіжніцкая, работа мастака-дакументаліста пачалася дваццаць год назад, у канцы 50-х, пасля заканчэння працы над кнігай пра Веру Харужую. Яна была першай, як адзначала крытыка, грунтоўнай спробай расказаць пра Мінск у дні вайны, пра тых канкрэтных людзей, якія рабілі неўміручую гісторыю горада ў яго самы цяжкі час.

Дваццаць год назад пра гэта мала хто ведаў, а ацэнкі і звесткі былі недакладныя і супярэчлівыя. Больш таго, пракідалася думка, што Мінскае падполле было створана фашыстамі ў правакацыйных мэтах. Словам, суб'ектывісцкіх наслаенняў хапала.

Партыя рашуча павяла курс на вялікую, паглыбленую работу па ўсебаковым, падрабязным высненні, вывучэнні і асэнсаванні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, неўміручага подзвігу савецкага народа ва ўсім багацці яго жыццёвай праўды і маральнай прыгажосці, па аднаўленні, дзе гэта неабходна, гістарычнай справядлівасці. Усё шырэй пачало гучаць «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Іван Новікаў быў піянерам гэтага высакароднага руху. Сама гістарычная справядлівасць патрабавала сцвердзіць ва ўсім, ва ўсёй жыццёвай праўдзе неабвержную ісціну аб тым, што Мінскае падполле з'яўлялася неад'емным звяном шырокага і паслядоўнага актыўнага супраціўлення фашысцкім захопнікам на Беларусі, арганічнай часткай усенароднай барацьбы з акупантамі. Трэба было вярнуць людзям іх чэснае імя.

Пісьменнік па-грамадзянску чуйны, з абвостраным адчуваннем часу, па роду дзейнасці — газетны работнік, які заўсёды імкнецца ў гушчыню жыцця, пастаянна сустракаецца з рознымі людзьмі, мае шырокую магчымасць шмат бачыць на свае вочы, чуць і нярэдка знаёміць чытачоў упершыню, усёй душой, не шкадуючы сіл, аддаўся гэтай справе. Яго ўклад — уклад мастака-дакументаліста — важкі, значны. Блізка да сэрца прыняў ён абавязак савецкіх пісьменнікаў, журналістаў ствараць праўдзівы мастацкі летапіс незабыўных дзён змагання з ворагам. Чуццём грамадзяніна ён зразумеў яго як магчы-

масць актыўна ўдзельнічаць у выхаванні маладых пакаленняў на геraічных традыцыях, у духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, высокай пільнасці, пастаяннай гатоўнасці абараняць Айчыну. Выхаваўчая сіла рэальных фактаў незвычайна вялікая.

Першая кніга трылогіі «Мінскі фронт» — «Руіны страляюць ва ўпор» — з'явілася асобным выданнем у 1962 годзе. Тэма Мінскага падполля трывала замацоўваецца ў творчасці І. Новікава. Другая частка — дакументальная аповесць «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» — выйшла ў 1964 годзе. У 1965 годзе абедзве кнігі адзначаны літаратурнай прэміяй імя Якуба Коласа. Апошняя, завяршальная, аповесць «Да світання блізка» выдадзена ў 1975 годзе. (Працуючы над «мінскай» тэмай, ён паспеў выдаць кнігу пра віцебскіх падпольшчыкаў — Мікалая Нагібава, Таццяну Шчукіну і іх баявых сяброў — «Тварам да небяспекі», 1968 год). Праца — гэта важна кожнаму, а пісьменніку асабліва — давала вялікае маральнае задавальненне.

Меў, безумоўна, рацыю Г. Бураўкін, калі — пасля выхаду кніг «Руіны страляюць ва ўпор» і «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» — пісаў, што з'яўленне іх «было прыкметнай падзеяй грамадскага жыцця рэспублікі». Пачуць такую ацэнку палічыў бы за гонар кожны!

Кнігі І. Новікава — гістарычныя даследаванні і мастацкія творы аднначасова.

Аўтар строга прытрымліваецца фактычнай канвы. Даўно вядома, што самае цяжкое мастацтва — бачыць прадмет у яго натуральнасці, які ён ёсць. Гэта — зыходны прынцып пісьменніка. Самі героі, паводле яго слоў, патрабавалі, «каб было напісана толькі так, як было ў жыцці, без якіх-небудзь адхіленняў, каб не парушалася храналогія, каб дакладна апісваліся абставіны, характары, патрэбы людзей. Усякае адхіленне выклікала пратэст саміх герояў або людзей, якія іх ведалі». Нельга не заўважыць, што часам пісьменнік свядома пазбягае залішняй моўнай вобразнасці, якая надае слову шматзначнасці. Вобразы трылогіі строга акрэслены, лінія іх жыцця абгрунтавана дакументальна. Строгасць, дакладнасць, лаканізм, нават некаторая сухасць дазваляюць лепш перадаць сутнасць факта. Пераважаюць апісальныя характарыстыкі.

Разам з тым дакументальныя рэчы І. Новікава — ні ў якім разе не звычайны пералік фактаў і прозвішчаў. Яны адпавядаюць самым адказным крытэрыям мастацкасці, таму што аўтар імкнецца як найглыбей асэнсаваць кожны факт, кожную драбніцу, адкрыць іх унутраную і знешнюю сувязь, ставячы ў цэнтр чалавечы характар. Хай гэта будзе Захар Гала, Ісай Казінец або хто іншы. Таму даку-

менталізм, як не толькі жанравая, а і стылёвая асаблівасць, не зніжае мастацкага эфекту прозы І. Новікава, бо галоўнай сваёй мэты ён дасягае. А галоўная мэта пісьменніка якраз і ёсць стварэнне характараў з багатым, змястоўным духоўным жыццём. Будучы дакументальнымі, яны ў той жа час тыповыя, абагульненыя. Звычайныя, яны адначасова незвычайныя.

Добра, з апорай на разнастайную дакументальную аснову, выпісаны вобразы І. Казінца, У. Амельянюка, І. Кабушкіна, Я. Клумава, Д. Караткевіча, К. Хмялеўскага, З. Галы, І. Казлова — нават пры пэўнай і непазбежнай сумарнасці некаторых з іх. Большасць з іх належалі да пакалення, народжанага пры Савецкай уладзе і выхаванага ёю. Яго цвет, яго гонар. І тое, што ўсе яны — людзі рэальныя, нявыдуманыя, мае свае перавагі. Вядомы літаратуразнаўца Н. Бяркоўскі тонка заўважыў, што «дакументальная манера ставіцца да людзей павялічвае пачуццё чалавечай каштоўнасці кожнага з іх». Гэта відаць на прыкладзе герояў І. Новікава. І хацелася б калі «выправіць» якое-небудзь іх памылковае рашэнне (нярэдка яно аказвалася трагічным) — ды нельга.

Захар Гала — Зорык — любоў пісьменніка. У падполлі ён з першага года вайны. Тройчы падполле зведала трагедыю разгрому. Зорык загінуў перад самым вызваленнем горада, яго выдаў здраднік. Гестапаўцы перахапілі заяву, якую Зорык перадаваў — праз сувязную — з горада ў партызанскі атрад. Сотні раз ён выконваў самыя складаныя даручэнні падполля, і вось фатальны збег акалічнасцей, правал... І нідзе пісьменнік не адступае ад праўды. Ён будуе вобразы, зыходзячы з праўды іх паводзін, учынкаў, псіхалогіі. Ён добра адчувае патрэбу сучаснай літаратуры ў максімальнай забяспечанасці сапраўднасцю — страсцю, мужнасцю, болем.

Спалучэнне вернасці факту з мастацкасцю, якая перш за ўсё азначае стварэнне багатазмястоўных характараў,— каштоўная рыса творчай манеры аўтара, якому не чужыя традыцыі добротнага сацыяльна-аналітычнага рэалізму, шматграннасці.

Праяўленнем няскоранасці, вышыні духу было жыццё Ісая Казінца — кіраўніка гаркома партыі ў акупаваным фашыстамі Мінску. «Гэта быў каўказскага тыпу чалавек з выразнымі рысамі твару. Вялікія цёмныя вочы яго пранікліва заглядвалі ў самую душу субяседніка»,— так, абапіраючыся на сведчанні тых, хто ведаў Слаўку Пабядзіта (падпольная клічка Казінца), аўтар апісвае яго знешнасць. І. Казінец паказаў выдатны талент арганізатара, быў абраны сакратаром падпольнага гаркома першага складу. Ён заўсёды бадзёры і энергічны, унутрана гатовы на подзвіг. Аўтар даследуе вытокі, генезіс

выключнага гераізму гэтага чалавека, яго адданасць партыі, Савецкай уладзе. Робіць гэта асабліва пераканаўча яшчэ і таму, што сам аднаго пакалення з ім, адной духоўнай біяграфіі. Разам з тым «лінія жыцця» Казінца дакументальна вывераная, дакументальна адпавядае яго паводзінам. Ён нікога не выдаў, калі яго схапілі, страшэнна катавалі гестапаўцы. На яго раўняліся таварышы. «Прыводзілі на вочную стаўку Міколу Дземідзенку, Георгія Глухава, Георгія Сямёнава, Міколу Герасімовіча, Сцяпана Зайца... Усе яны, убачыўшы свайго знявечанага важака, адмоўнаківалі галовамі:

— Не ведаю...

— Не бачыў такога...

— Не знаёмы...

Малайцы хлопцы! Па-чалавечы прымаюць мукі, захоўваючы сваё высакародства. Сапраўдныя патрыёты!

І хоць многія з іх былі старэйшыя за яго, Ісай па-бацькоўску радаваўся за сваіх баявых таварышаў і ў душы ганарыўся імі».

Дакументаліст, як бачым, скарыстоўвае факты, абапіраецца на іх сукупнасць нават тады, калі піша пра ўчынкі герояў, іх думкі, дыялогі, якіх ён, зразумела, ніколі не чуў. «Перш чым герой зробіць той ці іншы ўчынак,— гаворыць ён,— я павінен уявіць, што ён мог сказаць у такі момант, у такой сітуацыі». Уменне «ўжыцца» ў героя, суперажываць з ім — адно з галоўных у пісьменніцкай працы. І. Новікаў валодае такім уменнем.

Кідаецца ў вочы адна надзвычай прыкметная асаблівасць: гераічнае ў гэтай барацьбе не толькі не выключала ў яе ўдзельніках чалавечага, а здаецца, яшчэ больш падкрэслівала і садзейнічала яго праяўленню. Савецкі чалавек-змагар жыў усёю сваёю істотаю, высока ўздымаўся над бытам, пасля ўсяго перажытага не траціў бадзёрасці і веры. Адзін з герояў падполля — Іван Казлоў (да вайны — артыст, спявак). Трапіўшы ў фашысцкі засценак, ён не разгубіўся, а рыхтуе ўцёкі з няволі. І нават калі ўжо немагчыма было нічога зрабіць, заставаліся лічаныя гадзіны жыцця, Іван Харытонавіч знаходзіў у сабе сілы падтрымаць таварышаў — ён заспяваў.

«Спяваў чалавек, асуджаны на смерць, перад людзьмі, асуджанымі на смерць, спяваў аб жыцці. Пасля арыі Ленскага ён выканаў яшчэ некалькі арый, а затым пачаў спяваць баявыя, рэвалюцыйныя савецкія песні. І толькі пасля гэтага ахраннікі пачалі крычаць:

— А ну, замоўкні!

Тады ў суседняй камеры падхапіў песню Косця Хмялеўскі...

— Замаўчы!

Эстафету песні падхапіла нейкая жанчына, што сядзела ў суседняй камеры...

...Людзі паміралі з песняй».

Так, маё жыццё на валаску, у вочы мне глядзіць смерць, але ў бязлітаснай сутычцы з ворагам, у пераадоленні страху я веру ў светлае і высокае, я веру ў Перамогу, я люблю, я спадзяюся, таму што я — чалавек, савецкі чалавек.

Align Рознабакова адоранай, багатай натурай паказаны ў кнізе партызан Іван Кабушкін — чалавек рэдкай адвагі.

«Хто ён, гэты таямнічы Жан? Яго ведалі ўсе падпольшчыкі Мінска, але ніхто з іх не мог назваць ні сапраўднага імя яго, ні прозвішча, ні спецыяльнасці, ні месца нараджэння. Для адных ён быў проста Жан, для другіх — Жан Назараў, для трэціх — Аляксандр Назараў або Сашка, для чацвёртых — Аляксандр Бабушкін.

Адны сцвярджалі, што ён з-пад Масквы, другія — што з Казані, трэція — што з Калінінскай вобласці, а той-сёй мог запэўніць, што Жан — пастаянны жыхар Ленінграда.

Чалавек — загадка.

Як адшукаць ягоны след?»

Бліскучы канспіратар, няўлоўны Іван Кабушкін адным з першых уключаецца ў гераічную барацьбу з ворагам, падрывае аўтамашыны з гітлераўцамі, забівае салдат вермахта, расклейвае лістоўкі. Праяўленні яго чалавечага духу разнастайныя.

У складаных абставінах дзейнічае Уладзімір Амельянюк, востры, смелы, таленавіты, здольны па-партыйнаму рашаць жыццёвыя пытанні. Са смяртэльнай рызыкай група падпольшчыкаў выносіць з друкарні шрыфты. Гэта іх першае заданне. Пісьменнік паказвае, як людзі, верныя свайму абавязку, перамагаюць страх смерці. Пад кіраўніцтвам Амельянюка выдаюцца лістоўкі, набіраецца падпольная «Звязда».

І. Новікаў абапіраецца на народную памяць аб вайне, дае ёй выйсце ў сваіх кнігах, перадае пульс падполля, разнастайнасць яго будзённай гераічнай дзейнасці. У кнізе — назвы вуліц, кварталаў, раёнаў Мінска з іх гістарычнымі асаблівасцямі. Непаспешліва, у своеасаблівым, стрыманым рытме расказвае аўтар пра жыццё падняволенага, акупаванага фашыстамі Мінска. «За хаванне беглых, ваеннапалонных — смерць!», «За хаванне зброі, боепрыпасаў, радыёпрыёмнікаў — смерць!», «За знявагу германскай арміі — смерць!» Смерць, смерць, смерць — інакшым фашызм і не мог быць.

Аднак Мінск заставаўся няскораным. Ён прыціх, стаіўся. Але ў ім горача і гнеўна біліся сэрцы дзесяткаў тысяч савецкіх патрыётаў,

якія не паспелі па розных прычынах эвакуіравацца ў армію. Яны шырока разгарнулі падпольную барацьбу. Са старонак трылогіі паўстае яркая карціна народнага гераізму, пераадолення цяжкасцей, цярпення, волі да перамогі, не зломленай ніякімі выпрабаваннямі і ахвярамі. Непрыняцце прыстасавальніцтва, баязлівасці і прадажніцтва — арганічная рыса светапогляду герояў Мінскага падполля.

Пра аднаго са сваіх герояў — Захара Гала (Зорыца), які да вайны паспеў толькі скончыць дзесяць класаў,— аўтар гаворыць:

«Гэта быў зусім малады хлопец, у якім гарманічна спалучаліся фізічная сіла і далікатнасць. З усімі ён быў вельмі ласкавы, уважлівы.

— Даруйце, Зорык, за нясціплае пытанне. Чаму вы ўсё ж пайшлі туды працаваць?

— Так трэба было. Я — камсамолец».

Удзельнік тых падзей Аркадзь Ступін успамінае першую сустрэчу з Захарам Галам — як прадстаўніком падпольнай арганізацыі — восенню сорак першага года: «Я разлічваў убачыць мажнага, сталага чалавека, а перада мной стаяў высокі, нібыта спешчаны юнак, абаяльны, сціплы, з мяккімі і, як мне тады здалося, часам баязлівымі рухамі. Глядзеў ён адкрыта, добразычліва, па-дзіцячы чыста... Неўзабаве мы пасябравалі. З ім нельга было не пасябраваць. Такі ўжо ён быў чалавек. З ім заўсёды лёгка і проста, сам сябе адчуваеш лепшым, чыстым, гатовым на любую справу ў інтарэсах Радзімы. Ды і ласкавае імя Зорык вельмі пасавала яму».

Пісьменнік уважлівы да абставін, у якіх дзейнічаюць яго героі. Часцей за ўсё гэта абставіны выключныя. Жахлівым было аблічча фашызму ў акупаванай ім Беларусі, у Мінску. Жорсткі тэрор, уціск, праследаванні, пастаянныя здзекі з мірнага насельніцтва. Паказваючы панараму акупаванага Мінска праз успрыняцце падпольшчыка Уладзіміра Амельянюка, І. Новікаў нічога «ад сябе» не дадае, поўнасцю абапіраецца на рэальныя факты:

«Валодзя чуў, як стукалі цяжкія боты фашысцкіх патрулёў. Болей нішто не парушала цішыню ў замёршым горадзе. Здавалася, за акном — могілкі. А можа, яно так і было. Праз некалькі кварталаў адсюль, у Цэнтральным скверы, жудасны нерухомы месяц абліваў халодным святлом целы павешаных Казінца, Дземідзенкі і іншых падпольшчыкаў. На Суражскім рынку, на Камароўцы, на Чэрвеньскім рынку — па ўсяму гораду тоўсты дрот сціскаў горла тым, хто да апошняга дыхання захоўваў вернасць сваёй Радзіме. Гулкія крокі патрулёў разносіліся па вуліцах, быццам нехта забіваў цвікі ў пустую труну».

«Людзі, якія наблізілі світанне»,— справядліва сказаў пра герояў «Мінскага фронту» Іван Шамякін. З любоўю выпісаны ў трылогіі

светлыя дзявочыя і жаноцкія абліччы — Вікторыя Рубец, Соня Куніцкая, Ядзя Дубіцкая, Маруся Каладзінская, Надзя Рабушка... Бясстрашша, мужнасці, вынаходлівасці ў іх не менш, чым у мужчын. Але ім было цяжэй. І ўсё ж такі яны годна змагаліся, высока неслі званне савецкага чалавека.

Абставіны падполля на кожным кроку стваралі сітуацыі, у якіх правяраліся маральныя прынцыпы. Афіцыйны тэарэтык нацызму Розенберг, які прыязджаў у Мінск, прапанаваў дацэнту Яўгенію Міхайлавічу Зубковічу, вядомаму сваімі работамі па праблемах паходжання рас, пісаць навуковы твор аб перавагах арыйскай расы. Але вучоны катэгарычна адмовіўся, сказаўшы, што такую кнігу напісаць не зможа, бо трымаецца іншай канцэпцыі. Выпадкаў падобных паводзін нашых людзей было шмат.

Дакументальны жанр у Новікава дае падставы для пастаноўкі і абмеркавання шэрага важных сацыяльна-філасофскіх, маральных пытанняў. У чым каштоўнасці жыцця? З якіх учынкаў складаецца лёс? Яму далёка не ўсё роўна, скажам, што прыводзіць да велічы чалавека і да яго падзення. Або яшчэ: як чалавек усведамляе свае магчымасці? Адкуль яго здольнасць пераадолення трагедыі, пераадолення смерці? У чым вытокі яго фізічных і маральных сіл? «Мінскі фронт» — твор высокага гуманістычнага гучання. Гераізм чалавечнасці, хараство чалавечнасці, сцвярджэнне веры ў чалавека — вось ягоны пафас. Механічнай бяздумнасці, фашысцкаму культу «звышчалавека» тут супрацьпастаўлена сацыяльна-актыўная, гераічная асоба, што жыве ўсёй паўнатой свайго душэўнага свету, багаццем пачуццяў.

Кнігі І. Новікава абвяргаюць разважанні буржуазных філосафаў пра тое, што чалавек сляпы і бяссільны перад тварам абставін. Героі трылогіі глыбока ўсведамляюць усю меру адказнасці. Пісьменнік даказвае, што чалавек, выхаваны сацыялізмам, партыяй Леніна, застаецца патрыётам сваёй Радзімы нават у самых цяжкіх выпрабаваннях.

І. Новікаў не абыходзіць тыя канфлікты, што ўзнікалі ў асяроддзі ўдзельнікаў падполля. Як, напрыклад, паміж гаркомам і ваенным саветам, які ігнараваў правілы канспірацыі, прысвойваў сабе поспехі. Такія канфлікты часцей за ўсё маглі прывесці і прыводзілі да трагічных вынікаў...

«Цяпер,— справядліва гаворыць аўтар,— пасля доўгіх пражытых год, у мірных умовах, мы можам сурова асудзіць многае з таго, што тады рабілася падпольшчыкамі. Мы можам жорстка папракнуць іх за празмерную даверлівасць, за няўменне трымацца элементарных правіл канспірацыі, за многія арганізацыйныя промахі ў рабоце. І ўсё

гэта будзе справядліва». Несумненна галоўнае: вышыня іх маральнага абавязку, адданасць савецкай Радзіме.

Не мелі рацыі тыя, хто папракаў І. Новікава, што ён быццам бы «белетрызуе» свае кнігі, тым самым, маўляў, адступае ад дакументалізму. А між тым галоўная і адзіная ўстаноўка мастака — на праўдзівае і сапраўднае. І ўсё-такі розніца паміж тым, што было, адбывалася ў сапраўднасці, і светам мастацкай думкі застаецца.

Таму што мастацтва — у тым ліку і дакументальнае — заўсёды патрабуе пэўнай арганізацыі. Спатрэбілася літаратурная кампаноўка дакументальнага матэрыялу. Трэба было паказаць, як зараджалася і мацнела барацьба патрыётаў. На трылогіі «Мінскі фронт» І. Новікаў вырас як мастак.

«Руіны страляюць ва ўпор» друкавалася ў 1961 годзе ў часопісе «Полымя» ў рубрыцы «Нарыс». Аднак гэта ўжо быў не нарыс, а мастацкая проза новай эстэтычнай якасці, у якой факт, дакумент арганічна зрошчаны з мастацкай думкай, асобай пісьменніка. У гэтым яе сіла.

Звяртае ўвагу сур'ёзны ўзровень псіхалагічнай культуры.

Факты, даты, падзеі бяруцца ў іх псіхалагічнай насычанасці.

Сцэна ў засценку гестапа:

«І вось яны стаяць побач — Кавалёў і Караткевіч — аднолькава змучаныя, акрываўленыя, але і розныя. Поўны злосці і нянавісці Караткевіч і размяклы, як выкручаная ануча, Кавалёў. З гэтага часу пачалі разыходзіцца іх дарогі.

Героем аднаго подзвігу, калі дастаткова аднаго парыву сэрца, можа быць амаль кожны. А вытрымаць працяглыя, распрацаваныя па пэўнай сістэме катаванні ўдаецца не кожнаму».

Калі б Новікаў абмежаваўся падрабязным апісаннем, канстатацыяй фактаў, падзей, з якіх складваецца біяграфія абставін, у якіх даводзілася дзейнічаць людзям, то выхаваўчае ўздзеянне яго работы было б, відаць, невысокае. Ён ідзе ў глыб факта, намацвае сувязі, імкнецца да абагульненняў.

Пераканаўчага абагульнення ён дасягае і ў гэтым выпадку, раскрываючы неаднолькавасць лёсу Караткевіча і Кавалёва.

Сёння гавораць аб узрастанні ролі аўтарскай асобы ў творчым працэсе, унутранай самааддачы мастака, яго грамадзянскай сталасці. І гэта, думаецца, не супярэчыць сцвярджэнню дакументальнага пачатку ў сучаснай прозе. Адно дапамагае выявіцца другому. Асоба мастака відавочна выступае ў рабоце І. Новікава, у творчай гісторыі яго кніг.

Творчая гісторыя работы над трылогіяй — асобная тэма. Яна настолькі складаная і цікавая, што аўтар, паводле яго слоў, мог бы

напісаць пра яе асобную кнігу. Ён таксама, здаецца, не пазбег тых цяжкасцей, з якімі сустрэўся герой рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні» журналіст Шыковіч у канфлікце з Гуканам. Сучасны чытач хоча ведаць не толькі вынік пошукаў, але і сам працэс пазнання і даследавання. Будзем спадзявацца, што І. Новікаў некалі апіша гісторыю сваіх пошукаў. Яна вартая таго. «Мінскі фронт» стаіць сярод такіх выдатных твораў, як «Брэсцкая крэпасць» С. Смірнова, «Я — з вогненнай вёскі...» А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка і іншых шырока вядомых узораў дакументальнай літаратуры. «Смірноўскую» якасць аповесцей І. Новікава падкрэслівалі многія. Маючы на ўвазе гэту грань таленту пісьменніка, І. Чыгрынаў пісаў:

«Не сакрэт, што ў наш час быць добрым пісьменнікам-дакументалістам іншы раз нават цяжэй, чым быць аўтарам аповесці ці рамана, якія мы прывыклі называць «мастацкімі» (але ж дакументальная аповесць І. Новікава таксама мастацкая)».

Шкада, што пра некаторых падпольшчыкаў (часцей за ўсё па незалежных ад аўтара прычынах) расказана менш, чым яны таго заслугоўваюць, што некаторыя эпізоды асветлены недастаткова. Аўтар ведае гэта і працягвае даследчую работу, дапаўняе свае кнігі, вядзе пошук.

След пракладае першы. Тэму Мінскага падполля пачалі распрацоўваць іншыя.

У пачатку 60-х гадоў асобнай кнігай выйшлі запіскі ўдзельніка Мінскага падполля Уладзіміра Казачонка «Калі Радзіма ў небяспецы». Найбольш цікавыя старонкі кнігі тыя, дзе аўтар расказвае аб перажытым і ўбачаным ім асабіста — аб выпуску газеты «Звязда», аб выданні лістовак.

Зняты мастацкі фільм.

З'явіліся новыя апавяданні, аповесці...

Дакументалізм пранікае нават у паэзію, актыўна ўплываючы на станаўленне некаторых яе жанравых асаблівасцей і ўтварэнняў. Прыклад таму — паэма А. Русецкага «Покліч» (1975), у якой таксама распрацоўваецца тэма Мінскага падполля ў гады вайны. Цікавы твор — паэму «Матулям з Расой» (1979) — напісаў слынны ўкраінскі паэт Мікола Нагнібеда, прысвяціўшы яго дакументальным фактам гераізму і бясстрашша беларускіх жанчын у перыяд ваеннага ліхалецця (паэму пераклалі Пімен Панчанка і Анатоль Вялюгін).

У апошнія гады ўсё больш заўважна імкненне літаратуры да паглыблення нашых уяўленняў аб значэнні перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў сацыяльным і духоўным лёсе чалавецтва. Для новых і новых пакаленняў савецкіх людзей гераізм народа, які

выратаваў сусветную цывілізацыю, заўсёды будзе патрыятычным прыкладам, прыкладам мужнасці і высакародства.

Трылогія «Мінскі фронт» сведчыць аб Іване Новікаве як аб пісьменніку-першаадкрывальніку. Ён адкрыў шмат. Ён зрабіў вялікую справу, якая патрабавала грамадзянскасці, смеласці, настойлівасці.

Мінуць гады і дзесяцігоддзі, а гераічныя пласты народнага жыцця, накшталт невычарпальнай крыніцы, заўсёды будуць жывіць нашу літаратуру. І няма сумнення, што новыя пакаленні мастакоў (і не толькі літаратараў) створаць выдатныя палотны пра герояў Мінскага падполля, пра вялікі подзвіг народа. Лепшыя з іх будуць перадаваць як эстафету, з пакалення ў пакаленне, ад сэрца да сэрца, залатыя россыпы яркіх характараў, гераічных подзвігаў, неўміручых патрыятычных здзяйсненняў нашага народа...

Не сказаў яшчэ свайго апошняга слова ў літаратуры пра вайну і Іван Рыгоравіч Новікаў.

1977 г.

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

**Змест**

Гары, агонь Кастрычніка, гары!
Пісьменнік і навізна жыцця
Героіка — дакумент — літаратура
Традыцыі Талстога і шляхі беларускага мастацкага слова
Думкі пра Мележа
«Я — сведка ўсіх падзей»
Майстар
Праўда перажытага
Як само жыццё
Быць чалавекам на зямлі
Шлях паэта
Паэзія інтэлекту
След пракладае першы

Гніламёдаў У.

Як само жыццё: Кніга бягучай крытыкі.— Мн.: Маст. літ., 1980,— 208 с.

Уладзімір Гніламёдаў актыўна працуе ў беларускай крытыцы і літаратуразнаўстве. Выйшлі ў свет яго кнігі «Традыцыі і наватарства» і «Упоравень з векам». У кнізе «Як само жыццё» ён звяртаецца да творчасці А. Куляшова. П. Панчанкі, С. Дзяргая і іншых сучасных беларускіх пісьменнікаў, раскрывае іх творчую індывідуальнасць, своеасаблівасці стылю і мастацкага майстэрства.